аўтарская серыя

Валеры Дранчук

# БЕЛАВЕЖСКАЯ ПУШЧА

## РЭЗАЛЮЦЫЯ SOS



Хроніка красы і змагання

1995–200?

Звычайна выданні пра Белавежскую пушчу пачынаюцца з анатацый прыкладна аднолькавага кшталту: «Аўтары»






на мове самой прыроды

Духоўнай сувязі
вялікіх людзей і вялікай прыроды
п р ы с в я ч а е ц ц а

**Ф**акт, што філосаф і пісьменнік
Жан Жак Русо меў намер пераехаць у
Белавежскую пушчу ды пражыць тут на
адзіноце рэшту гадоў, сёння варты
перш-наперш таго, каб не так уразіцца
эпізоду з вялікай біяграфіі,
як надаць увагі стану вялікага
еўрапейскага лесу.





Афармленне аўтара

Валеры Дранчук

# БЕЛАВЕЖСКАЯ ПУШЧА

## РЭЗАЛЮЦЫЯ SOS

Хроніка красы
і змагання



Мінск
ТАА «Каўчэг»
2004

УДК 502.4 (476.7)
ББК 20.1 (4 Беи)
Д 72

# Змест

*Паказальнік імёнаў* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 6
*Паказальнік назоваў і тэрмінаў* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 7

1995–1999 . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 11
2000–2002 . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 91
2003–200? . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 177
З дзённікаў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 219

*Дадатак*
Пра аўтара . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 282
Пра газету «Белавежская пушча» . . . . . . . . . . . . . . . . . 283
Экалагічныя ініцыятывы В. Дранчука (1998–2004) . . . . . 285

*Summery* (пераклад Марка Бэнца) . . . . . . . . . . . . . . . . . 291

ISBN 985-6056-76-4

© Дранчук В., 2004

**В**ыказваю ўдзячнасць
і прызнанне вялікай павагі
Вячаславу Адамавічу
З а р а н к о в у ,
які дапамог здзейсніць
гэтае выданне.

*А ў т а р*

# Паказальнік імёнаў

Алексіевіч С. – 134, 135, 158, 277
Валкавыцкі Г. – 72
Галдзянкоў А. – 77
Гедравічус Л. – 45, 46
Гор А. – 55
Дацкевіч Ул. – 25, 101, 134, 158, 163, 168, 224, 237, 242, 263
Жукаў В. – 100
Жураўкова Г. – 111, 187, 240, 254, 256
Зеніна І. – 134
Ельцын Б. – 170, 228
Казулька Г. – 237, 238, 259, 266, 273
Козел М. – 67
Куталоўскі І. – 259, 265, 273, 275, 279
Леапольд О. – 60
Лукашэнка А. – 13, 241, 247
Лучкоў А. — 64, 65, 67, 111, 187, 188, 256, 265
Мазгова А. — 237, 240, 259, 263
Максімовіч А. — 111, 188, 241
Мікуліч А. — 117, 134
Мураўёў З. — 57, 92, 134, 203, 232, 233, 247, 248, 257
Нікіфараў М. – 221, 222, 264, 265, 267, 269
Нікольскі А. – 36
Нявераў А. – 16
Парфёнаў В. – 120, 121, 170, 171, 234, 244
Пугачэўскі А. – 264, 265, 267
Русы М. – 56, 105, 106, 107-110
Савіцкі Б. – 12
Семакоў В. – 48, 141
Смактуновіч Я. – 100, 111, 121, 150, 222, 237, 262, 273
Сушчэня Л. – 170, 225
Харужык Л. – 93, 122
Худая М. – 201, 231, 233, 236, 237, 240, 244, 247
Ціцянкоў І. – 79, 100, 111, 137
Швейцар А. – 36
Шостак С. – 22
Шушкевіч С. – 158, 163, 224, 227
Шчасны У. – 251, 252, 253, 254, 255, 256, 258, 264, 265, 277, 279

# Паказальнік назоваў і тэрмінаў

Асацыяцыя беларускіх зялёных — 112, 115
Ахова птушак Беларусі, грамадская арганізацыя — 125
БелаПАН — 236, 246, 251, 258
Беларускі сацыяльна-экалагічны союз «Чарнобыль» — 91, 113, 259, 265, 279
Біялагічная разнастайнасць — 58, 127, 139, 152, 186, 257
«Браслаўскія азёры», нацыянальны парк — 58, 59, 61, 73, 75, 81
Валюнтарызм кіравання — 189, 271
Відэафільм «Вялікі лес» — 18, 45
Гаспадарчая дзейнасць — 12, 13, 22, 25, 27, 36, 40, 42, 48, 50, 65, 73, 86, 95
Гістарычны (першабытны) лес — 19, 24, 25, 29, 30, 75, 139, 154, 230
Еўрапейская прэмія Генры Форда «За захаванне культурнай спадчыны і навакольнага асяроддзя» — 68, 69
Еўрапейскі год аховы прыроды — 54, 55, 56
Еўрапейскі дыплом — 13, 87, 88, 95, 104, 117, 126, 132, 143, 144, 166, 173
Заканадаўства — 13, 34, 74, 81, 85, 86, 106, 169, 222, 248
Зубр — 11, 14, 15, 18, 24, 26, 64, 83, 84, 218
«Зялёныя» ў Беларусі — 53, 99, 112, 114, 116, 124, 212
Імітацыя прыроды — 131
Канвенцыі — 53, 56, 85, 99, 106, 127, 129, 143, 178, 179, 185, 248
Канвенцыя на ахову сусветнай культурнай і прыроднай спадчыны — 157, 165, 180, 189, 271
Капітал экалагічны — 16, 59
Караед-тыпограф — 137, 142, 152, 153, 194, 199, 243
Кіраўніцтва спраў прэзідэнта — 13, 42, 48, 64, 87, 92, 93, 94, 100, 105, 110, 136, 169, 180, 187, 241, 269
«Комсомольская правда в Беларуси» — 73, 193, 194
Маяк, гара — 58, 59
Меліярацыя — 12, 13, 18, 26, 102, 130

Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя — 51, 56, 67, 93, 105, 118, 120, 122, 161, 209, 213, 242, 260, 269

Навука, навуковая дзейнасць — 23, 28, 30, 31, 51, 85, 86, 92, 124, 143, 158, 173, 222, 225, 228

Навуковы турызм — 40, 171, 173, 216

Нацыянальны парк (статус) — 22, 28, 31, 41, 43, 60, 61, 77, 94, 120, 225

Орхуская канвенцыя — 56, 85, 112, 116, 133, 233

Пакт на абарону Белавежскай пушчы — 145, 217

Паляванне — 23, 32, 44, 49, 59, 76, 77, 83, 86, 230

Парламент — 12, 127, 163, 192, 201, 216, 231, 236

Прадстаўніцтва ААН у Мінску — 48, 91, 113, 125, 177, 181, 185, 200

«Прыпяцкі», нацыянальны парк — 17, 49, 61, 65, 66, 67, 73, 75, 76, 81, 83, 92, 105-109, 123

Прырода ў выяўленчым мастацтве («ЭкаАрт») — 129, 131

Прэсавая канферэнцыя — 51, 55, 178, 203, 231, 254, 256, 257, 279

Рада Еўропы — 13, 60, 87, 88, 95, 127, 132, 141, 143, 197, 230

Сусветная прыродная спадчына — 40, 44, 68, 71, 84, 88, 126, 127, 140, 147, 154, 160, 163, 202, 211, 253, 261, 263, 268, 269

«TERRA-Канвенцыя» — 165, 179, 186, 190, 193, 201, 203, 231, 236, 241, 258, 272, 279, 280

Шоў — 256

Экалагічны турызм — 29, 30, 35, 43, 47, 57, 62, 63, 75, 126, 140, 230

Экалагічны тэрор — 159, 160, 171

«Экаправа», няўрадавая арганізацыя — 125

Этыка — 27, 30, 36, 41, 43, 82

Этыка багавейлівасці перад жыццём — 37, 38, 44

ЮНЭСКА — 140, 154, 159, 162, 166, 197, 198, 224, 230, 249, 250, 251, 277

# 1

**З** аднаго боку, Пушча як ацалелы першавобразны лес, класіка прыроды, камертон і гонар нацыі, з другога – цяжкая спадчына лесаздабывання і меліярацыі, хцівасць уладных структураў, грэбаванне законамі і міжнароднымі нормамі ў адносінах да знакамітага рэзервату.

**Б**елавежская пушча ператварылася ў нацыянальны парк. Дзяржава падтрымала і паскорыла курс на яе далейшую эксплуатацыю, на здабыццё валюты з ахоўнай тэрыторыі. Падтрымаў, у рэшце рэшт, і прэзідэнт краіны.

**П**ушчанская драма адбываецца не ўвачавідкі, бо гэта вялікі лес.

**«Будзем жыць…»** *З нагоды першага нумару газеты «Белавежская пушча»* . . 11

**Беларускія каналакапальнікі хочуць вярнуцца ў Белавежскую пушчу.** *Меліярацыйны праект у трох варыянтах абмеркаваны ў Акадэміі навук* . . . . . 12

**Грамадскае хваляванне ўлада пакрыла маўчаннем.** *На Зварот грамадскіх аб'яднанняў да Аляксандра Лукашэнкі.* . . . . . . . . . . . . . 13

**Геа-зубр.** *Сілуэт, які фігуральна супадае з контурамі суверэннай краіны.* . . . . 14

**Колькі гэта каштуе, або Як жыць, не праядаючы Пушчы.** *Меркаванне прафесара А. Няверава.* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 16

**Шлях Пушчы на мяжы тысячагодзьдзяў.** *Заяўка відэафільма.* . . . . . . . . . 18

**Еўрапейскі безвізавы фэст адбудзецца ў Белавежскай пушчы?** *Культуро-лаг з Нямеччыны спадзяецца.* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 19

**Удзячны лёсу, ён плаціў сваю долю ўзаемнасці. In memorium.** *Апошняе інтэрвью на скрыжаванні дабра і зла.* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 22

**Падзенне Белавежскай пушчы.** *«Гістарычнага лесу няма, і яго не заменяць ні рэстараны, ні тэнісныя корты», – цвердзіць пушчанскі знаўца.* . 25

**«Паляванні» на зубра.** *Зацемкі з патаемнага дзённіка.* . . . . . . . . . . . . . . . 32

**Альберт Швейцар у… Белавежскай пушчы.** *Этыка прыродапашаноты і багавейлівасці перад жыццём закладвалася ў ідэю нацыянальнага парка.* . . 36

**Калі гэта «поспех» і «творчая ўдача», дык што такое сумленне?** *Слова на прэзентацыі дакументальнай відэастужкі «Вялікі лес».* . . . . . . . . . . 45

**«У Пушчу прыйшлі камэрсанты і авантурысты».** *Інтэрв'ю карэспандэнту радыё «Свабода» М. Стэльмаку.* . . . . . . . . . . . . . . . . 48

**«Terra vita» або Дзе «той крык, што жыве Беларусь…»?** *Ліст міністру.* 51

**Рахункі ўладнага прагматызму: не даць, а ўзяць!** *Беларуская бюракратыя стрымлівае развіццё рэкрэацыі за межамі падахоўных тэрыторый.* . . . . . . . . 57

**Беларусь-адыёзус, ці Беларусь – краіна зялёных вартасцяў?** . . . . . . 63

**Спраўнікі па «бревну».** *Незалежны эколаг адказвае апаратнаму чыноўніку з акадэмічным мінулым.* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 64

**Еўрапейская прэмія Генры Форда «За захаванне культурнай спадчыны і навакольнага асяроддзя».** *Слова на цырымоніі ўручэння.* . . . . . . . . . . . 68

**«Дрымучая справа» з хронікі Белавежскай пушчы застаецца актуальнай праз 138 гадоў.** *Дзве ўвагі на акалічнасці публікацыі.* . . . . . 72

**Калі мы працягваем рукі – запаведнікі працягваюць ногі.** *Інтэрв'ю газеце «Комсомольская правда в Беларуси».* . . . . . . . . . . . . . . . . . 73

**Стралянiна на запаведнай тэрыторыі – гэта нонсенс.** *З нагоды аднаго афіцыйнага меркавання.* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 77

**Краіна Іванаў.** *Лесапілка імя Ціцянкова.* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 78

**Будзем памятаць і сведчыць.** *Ліст у газету «Беларуская маладзёжная».* . . . 80

**Лицензия на отстрел символа.** *Інтэрв'ю «Белорусской деловой газете».* . 82

**Дзейнасць беларускіх запаведных тэрыторый сёння пастаўлена з ног на галаву.** *«Справа часу», якая не ўпісваецца ў месца.* . . . . . . . . . . . 86

# 1995–1999

## «Будзем жыць»

СЛОВА ДА ЧЫТАЧОЎ З НАГОДЫ ПЕРШАГА НУМАРУ

Газета «Белавежская пушча» 1995

...Вітаючы Вас, дарагія сябры, мы з доляю аптымізму прамаўляем словы паэткі Ларысы Геніюш: *«Будзем жыць, бо яны жывуць»*. Сёння, калі чарнобыльская бяда прыйшла на Беларусь, паэтычны радок як бы нарадзіўся наноў. Будзем жыць... Пушчанскі волат *з у б р* падтрымае нас сваёю моцаю, прагаю выжывання. А мы, хто жадаў і прыйшоў да Вас, падтрымаем яго.

Сёння газетай нікога не здзівіш. Але гэта не азначае, што нараджэнне «чарговага» выдання, тым больш, прыродалюбнага, як наша — справа аднае «тэхнікі». Зусім не. «Белавежская пушча» нараджалася доўга і цяжка. І пакуль што не мае ні тае самае «тэхнікі», ні сталага фундатара, ні даху над галавой, апроч Пушчы.

Але Бог дасць, запаможамся, усё прыдбаецца, і ў рэшце рэшт ратаўніча-замоўнае «будзем жыць» спагадна абвесніць і лёс нашага выдання...

# Беларускія каналакапальнікі хочуць вярнуцца ў Белавежскую пушчу

Газета «Белавежская пушча» 1996

Асушэнне ў недалёкім мінулым пушчанскіх урочышчаў, як і палескіх балотаў, не пакінула пасля сябе нічога, апроч горычы ды расчаравання. Сканала векавое балота, значна панізіўся ўзровень грунтовай вады, пагінулі абшары белавежскіх ельнікаў. Лічаныя дрэвы засталіся ад знакамітай Цісоўкі — піхтавага ляску. Свой першавобраз і берагавую прывабнасць страціла рэчка Нараўка.

Аднак цягам часу, пакуль меліяратары асвойвалі іншыя куткі Айчыны, спускаючы ваду ў акіян, Пушча з уласцівай ёй настойлівасцю зацягвала раны, вяртала тое, што ў яе па-дзікунску забралі. Зарасталі глыбокія каналы, пакрысе забалочваліся асушаныя дзялянкі.

Схамянуўшыся, каналакапальнікі ўзнялі сапраўдны «алярм»: забалочваецца асушаная тэрыторыя, страцілі якасць меліярацыйныя сістэмы. Значыць, давай рэканструкцыю, пачынай ад пачатку. З'явіўся і адпаведны праект у трох варыянтах, сэнс якога зводзіцца да ўзнаўлення занядбаных каналаў, іх ачысткі і паглыблення, будаўніцтва новых аб'ектаў. На практыцы гэта значыць, што ўся неўміручая пераўтваральная шаць зноў вернецца ў Пушчу. З бульдозерамі, экскаватарамі, пахам саляркі...

Запушчаны ўжо і механізм узгаднення праекта. Прыняцце рашэння, аднак, прадугледжвае не адно думку вучоных, інжынераў, але і мясцовага насельніцтва. Ёсць звесткі, што нацыянальны парк «Белавежская пушча» не дасць згоду на правядзенне меліярацыйных работ, бо лічыць іх экалагічна шкоднымі. Прафесар Барыс Савіцкі, які змяніў крэсла старшыні парламенцкай экалагічнай камісіі на пасаду намесніка дырэкта-

ра нацыянальнага парка па навуцы, так выказаў сваю пазіцыю падчас разгляду праекта ў Акадэміі навук 22 сакавіка: «Калі зноў пусціць меліярацыю ў Пушчу, заняпад яе наступіць вельмі хутка, і ад велічнага запаведніка застануцца адны ўспаміны».

Да гэтага варта дадаць, што Рада Еўропы збіраецца ўшанаваць Белавежскую пушчу Еўрапейскім Дыпломам. Пры гэтым маецца на ўвазе не адно захаванасць прыроднага комплексу, але і эфектыўнасць заканадаўства, здольнага засланіць яе ад вынішчальных дзеянняў.

## Грамадскае хваляванне ўлада пакрыла маўчаннем

НА ЗВАРОТ ГРАМАДСКІХ АБ'ЯДНАННЯЎ ДА АЛЯКСАНДРА ЛУКАШЭНКІ

Газета «Белавежская пушча» 1996

У рэдакцыі маюцца звесткі, што Зварот 18 грамадскіх арганізацыяў Беларусі, сярод якіх такія як Асацыяцыя прафесійных эколагаў, фонд «Дзеці Чарнобыля», Саюз моладзі Беларусі ды іншыя, застаўся ў рэшце рэшт няўважаным з боку высокага адрасата. Прадстаўнікам моладзевай суполкі «Некст Стоп — Нью Лайф» (гэта ейныя хлопцы і дзяўчаты першымі паднялі трывогу) давялося шукаць хіба што магчымасці сустрэцца ды перамовіцца з адказнымі асобамі Адміністрацыі. Сустрэча, паводле словаў Святланы Каралёвай (Саюз моладзі Беларусі), не высветліла пазіцыі Аляксандра Лукашэнкі адносна парушэння заканадаўства, як, дарэчы, і іншых пытанняў, што паўсталі з выпадку спушчанага адміністрацыйнага цыркуляра пра нарыхтоўкі ў беларускіх нерушах «руднічнай стойкі»*.

* Жэрдзе ў якасці падпорак на рудніках (тэхнічны тэрмін).

Відаць, мы яшчэ не тая краіна, дзе грамадскае хваляванне ўспрымаецца раўнаўважна. Не з фанабэрлівай абыякавасцю ды прыхаванай пагардай, а з належнаю ўвагаю — як падстава сапраўды разабрацца, давесці да людзей дзяржаўны погляд, праявіць гатовасць пайсці на шчыльны дыялог. Калі ж пытанні павісаюць, а «дыялог» заканчваецца інфармацыяй, так бы мовіць, «да ведама» начальнікаў, тады застаецца ўражанне, што ўлада гэтых начальнікаў здольная пайсці далей, на што заўгодна, і ў рэшце рэшт — грамадства застаецца не застрахаванае ад чарговых «смелых» рашэнняў прэзідэнцкіх службаў.

Незаконная гаспадарчая дзейнасць у запаведніках тым часам прыцішаная. Грамадскія арганізацыі робяць цяпер намаганні атрымаць з рук незалежных экспертаў заключэнні пра ўрон, які, на іх думку, быў зроблены пад час дзеяння «распарадчага» цыркуляра. Шчыра кажучы, гэтай інфармацыі не хапае. Калі яна з'явіцца, рэдакцыя зробіць усё магчымае, каб надаць ёй галоснасці.

## Геа-зубр

Газета «Белавежская пушча» 1997

Калі вяртаешся з Белавежскай пушчы, у цябе пытаюцца, ці бачыў зубра. Бачыў ці не, зусім няважна — трэба казаць, што бачыў, і гэта будзе праўда, бо Пушча — з'ява ягонай прысутнасці.

Зубр можа стаяць, адліты з паветра. Злеплены з снегу, калі гэта зіма. Альбо з лісця, калі буяе лета, з замшэлага дрэва — у часе бясснежжа.

Можна ўбачыць і зусім рэальнага ў вальеры. Калі стаіш побач з ім, ягоная веліч і сіла найбольш пераканальныя.

Вачамі мераеш ягоную вагу. Любуешся прапорцыямі цела, спрабуеш зазірнуць у старожкую, зласна-

ватую цемень вачэй. Неруш таемнай стыхіі міжволі палоніць і дзейнічае на чалавечыя органы амаль магічна.

Ягонае існаванне ўжо сталася знакам планетарнае велічы.

Ягоны поступ па зямлі вымяраецца стагоддзямі. Сучаснік маманта, ён ацалеў, выжыў, застаўся прыгожым і дужым. Час не паменшыў ягонай вагі і памераў.

Арэал зубровага панавання параўнальна з сярэднявеччам звузіўся да небяспечнае рысы. Калі мы кажам, што зубр жыве паміж намі — пашчыпвае зялёны кустоўнічак, ласуецца ягаднікамі, пасецца на лясных імшаніках — дык маем на ўвазе перш-наперш Белавежскую пушчу, дзе ягоныя статкі налічваюць сёння блізка 300 галоваў.

Тым часам з'явілася колькі новых зубрасялібішчаў.

Кажучы фігуральна, зубр паступова апаноўвае Беларусь, запаўняе сваёй прысутнасцю геаграфічныя контуры тэрыторыі суверэннай краіны, якія на дзіва супадаюць з ягоным сілуэтам.

Сёння гэта больш чым сымбалічна. Змена ці размыццё контураў, так бы мовіць, з папраўкай «на Ўсход» пагражае рэальнай дзяржаўнасці, інтарэсам новай самастойнай геапалітыкі, у рэшце рэшт нацыянальным інтарэсам.

Зубр як бы сцвярджае сваю каштоўнасць у прыродзе і часе, ідучы на змену ядравым арсеналам змілітарызаванай за дзесяцігоддзі Беларусі, прапануючы чалавецтву іншыя вартасці на схіле другога тысячагоддзя.

Так, мы павінны застацца разам, бо нашыя лёсы — зуброў і беларусаў — узаемазнітаваныя, перавітыя. Хоць бы ў тым сэнсе, што першыя патрапілі ўжо ў Чырвоную кнігу...

З усіх найбольш вядомых ды ўстойлівых сымбаляў Беларусі як дзяржавы пушчанскі волат застаецца найпапулярным. Зважаючы на Год зубра, які рэ-

дакцыя газеты абвяшчае перш-наперш для сваіх чытачоў, варта ўсім нам падумаць ды так абзадачыць, каб свет ідэнтыфікаваў Беларусь не з рогам раз'ятранай злыгі, а з прыгожай рагатаю галавою белавежскага зубра ў квяцістым вянку першароднае флоры.

## Колькі гэта каштуе, або Як жыць, не праядаючы Пушчу

Газета «Белавежская пушча» 1997

Якой цаной вымяраюцца багацці Белавежскай пушчы? Эканамісты і эколагі задумаліся і назвалі прыкладную суму 500 мільёнаў даляраў як найбольш абгрунтаваную. Тым часам гэта не адзіны цэннік, які з'явіўся на прыродным аб'екце за апошні час. Называюцца таксама іншыя сумы, часам намнога большыя, што выяўляе інакшыя меркі ды метады ацэнкі.

Прафесар Аляксандр Няверaў, адзін з аўтараў «прагматычнай канцэпцыі» і адзін з распрацоўшчыкаў Плана аховы біяразнастайнасці Белавежскіх лясоў, лічыць, што найлепш, калі вызначаная сума будзе адзінаю, а яшчэ — прызнанаю і ўзаконенай на дзяржаўным узроўні.

Падлічыць экалагічны капітал Белавежскай пушчы, зазначыў прафесар, цікава і з пазнавальнага боку. «Мы часта гаварылі і, напэўна, будзем казаць заўсёды, што каштоўнасць Белавежскай пушчы нязмерная, што сама па сабе Пушча цаны не мае. Гэта, безумоўна, так. Аднак, трэба бачыць і прагматычны, утылітарны бок: якую каштоўнасць мае Пушча ў параўнанні з іншымі лясамі Беларусі або суседніх еўрапейскіх краін. У якой канкрэтнай суме выражаецца яе сённяшні капітал?»

Такое параўнанне і зрабілі эканамісты і эколагі ў рамках праекта, фінансаванага міжнародным фондам

дзеля развіцця біялагічнай разнастайнасці Белавежскай пушчы. Паводле іхніх разлікаў, адзін гектар пушчанскага лесу прыкладна ў 5-10 разоў перавышае каштоўнасць звычайных лясоў Беларусі.

Спадар Нявераў падкрэсліў рынкавы момант падлікаў. Са сваім капіталам Пушча як рэгіён можа ўвайсці ў тую ці іншую рынкавую структуру, і трэба ведаць дакладна, якімі памерамі вызначаецца яе доля. Важна і тое, каб велічыня «экалагічнага капіталу» арганічна ўплялася ў сістэму коштавых зносін як прыродакарыстання, так і агульна-грамадскіх, каб яна, урэшце, спрыяла захаванню тае самай «бясцэннасці», стымулявала гэтае захаванне эканамічна. Адным словам, трэба жыць, не праядаючы капіталу Пушчы.

Цікавая ўвага Няверава і на такі момант: калі будзе вызначаны экалагічны капітал усіх ахоўных тэрыторый, напрыклад, Бярэзінскага біясфернага запаведніка, Нацыянальнага парка «Прыпяцкі» і іншых, тады на падставе канкрэтнай цаны, пэўнага капіталу павінна вызначацца і доля фінансавання іх з боку дзяржавы, грамадства на ўзнаўленне, ахову і г.д. Нявераў назваў гэта «неабходным і аб'ектыўным механізмам. Чым большая каштоўнасць, тым большая доля фінансавання. Кожны аб'ект пачне клапаціцца пра тое, каб ягоны капітал падвышаўся».

Белавежская пушча, на думку Няверава, ва ўмовах усталявання рынку паказала сваю годнасць, сваю вартасць як аб'ект, як асаблівы рэгіён. Яна цяпер мае і сваю цану ў грашовым варыянце, хай сабе яшчэ не канчатковым. «Я не выключаю іншыя ацэнкі, лічу толькі, што яны не павінны быць завышаныя, узятыя невядома адкуль. Яны мусяць быць рэальнымі, на рэальным грунце, каб маглі рэальна працаваць у эканамічных варунках. Не выключаю і дыскусіі на гэтую тэму. Я буду адстойваць свае пазіцыі, але гатовы і саступіць, пайсці на кампраміс, калі нечая методыка разлікаў будзе больш пераканальная».

Карыснасць такой дыскусіі Аляксандр Няверзаў патлумачыў такім чынам. «Каб нармальна гаспадарыць і захоўваць экалагічны капітал Пушчы, яе прадукацыйную здольнасць і росквіт, нам патрэбна адна лічба, якую варта ўзаконіць, адна методыка, якую трэба прызнаць».

## Шлях Пушчы на мяжы тысячагодзьдзяў

ЗАЯЎКА ВІДЭАФІЛЬМА НА ЗАМОВУ ТВОРЧАГА АБ'ЯДНАНЬНЯ «ТЭЛЕФІЛЬМ» НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ТЭЛЕРАДЫЁКАМПАНІІ*

1997

Як вядома, старажытных прыродных лясоў на зямлі засталося няшмат. Гэта ўжо палічаныя выспачкі-асяродкі, паміж якіх, несумненна, і Белавеская пушча — найкаштоўная частка лясных абшараў Беларусі, зялёнага поясу пушчаў Эўропы.

Сёньня сама Пушча — гэта ня толькі найбольш захаваны стары лес, біялягічны рэзерват сьвету, але адметная кропка на палітычнай мапе плянэты. Спалучэньні «Белавеская пушча», «Белавескі зубр» маюць новы і часам ня менш прыцягальны сэнс. Тут, у Віскулях, затрашчаў геапалітычны лёд, у выніку чаго сьвет зрабіўся іншы, а былая савецкая частка Пушчы стала каралявай яшчэ адной суверэннай краіны.

Гістарычны шлях Белавескай пушчы, яе нядаўні ды сёньняшні дзень стануць галоўнаю тэмай фільма. З аднаго боку, Пушча як ацалелы першавобразны лес, клясыка прыроды, камэртон і гонар нацыі, з другога — цяжкая спадчына лесаздабываньня і меліярацыі, хціваcьць уладных структураў, грэбаваньне

* друкуецца на мове арыгінала

законамі і міжнароднымі нормамі ў адносінах да знакамітага рэзервату. Мяжа, за якой першабытны Лес становіцца былым, колішнім, памяткай стагодзьдзяў, — бадай, няўлоўная. Фільм зробіць спробу «падгледзець», у чым выяўляецца сындром дэградацыі, рызыкоўнай хады чалавека, небясьпекі ягонай прысутнасьці.

Хто ён, гэты чалавек — карэнны лясны жыхар, верны прыслужнік сыстэмы, сталічны апаратны чыноўца? Так ці інакш, фільм павінен сьцьвердзіць: гульня ў прыгожыя ходкія словы можа бязьлітасна скончыцца, калі ў свой час не апамятацца, ня скінуць гіпнатычныя чары, не абтрэсьці пыл ды ня зьняць павуціну з слоў і паняткаў. Пра гэта ў відэафільме скажуць мясцовыя жыхары ды навукоўцы з багатым досьведам працы ў Пушчы.

Аднак гэтая стрыжнявая лінія будзе прасочвацца спакваля, нітуючы станоўчую эмацыйную аснову фільма з нэгатыўнымі плянамі-кантрапунктамі.

Шлях Пушчы — з стагодзьдзя ў стагодзьдзе — працягваецца.

Здымкі на натуры плянуюцца пераважна ў чэрвені-ліпені, аднак у шырокай маляўнічай панараме фільма спатрэбяцца таксама «эпізоды» астатніх часінаў года.

## Еўрапейскі безвізавы фэст, магчыма, адбудзецца ў Белавежскай пушчы?

Газета «Белавежская пушча» 1997

Калі гавораць пра дзяржаўныя межы і працэдуру іх пераадолення, перавагу аддаюць надзейнасці кардонаў перад магчымаю небяспекай. Але пры гэтым чамусьці ўбаку застаюцца нязрынутыя бар’еры на шляху дабра і даверу, чалавечых зносін, культурнага абмену.

Зыход тысячагоддзя схіляе на тое, што ўсе мы павінны адчуць мудрасць нажытага досведу пакаленняў, стаць па-над тлумам, скінуць цяжар падазронасці й недаверу адзін да аднаго. Нарэшце, успомніць пра вялікае ды вечнае — тое, што лучыць людзей, дорыць цяпло і надзею, дапамагае знайсці ў сабе грунт на наступнасць — сваю і дзяцей. Гэта культурны набытак народаў, свет творчасці, духоўны скарб.

Выкладаючы матывы магчымага правядзення Еўрапейскага безвізавага фестывалю, кіраўнічка Нямецкага культурнага цэнтра імя Гётэ ў Мінску спадарыня Вера Багальянц вылучае колькі істотных момантаў свайго праекта.

Фестываль, гаворыць яна, як бы вянчае другое тысячагоддзе сустрэчай людзей без віз, што само па сабе ёсць знакам асобага кшталту, бо віза для творцаў, людзей мастацтва азначае найперш граніцы, кардон. І цэнтр Еўропы, які палягае на беларуска-польскім памежжы, калі не ў самой Белавежскай пушчы, — тут надзвычай да месца, хочацца бачыць Еўропу без межавых перашкодаў. Сама задума, ідэя сустрэчы дыктуе і адпаведныя анонсы: як мастакі, творцы вызнаюцца ў справах навакольнага асяроддзя, духоўна-культурных дачыненнях. Маючы асаблівае бачанне свету, яны, вядома ж, не прымаюць яго перагароджаным бар’ерамі з калючага дроту. Яны, бадай, першыя, і менавіта яны, як ніхто іншы, выяўляюць кожны сваімі сродкамі надзею на свабодны трансфер матэрыяльных і — асабліва — нематэрыяльных каштоўнасцяў, на пераадоленне эканамічных перагародак. Гэтую надзею яны пасяляюць у душах людзей, сваіх суайчыннікаў. У гэтым сэнсе бачыцца не рэвалюцыя, а менавіта надзея на свабодны абмен, перш-наперш у пытаннях зберажэння прыроднага асяроддзя, дзе, як вядома, ні межаў, ні «візавага рэжыму» не існавала і не існуе.

Спадарыня Багальянц гаворыць, што ейны праект абмяркоўваўся з калегамі і сябрамі з Германіі, Польшчы, Расіі, Прыбалтыкі. Называючы краіны, яна згадвае прозвішчы вядомых людзей — палітыкаў, культуразнаўцаў, эколагаў, якія далі згоду і ўжо гатовыя брацца за падрыхтоўку праекта.

Калі ўважыць, што Белавежская пушча ёсць нацыянальным здабыткам перш-наперш Беларусі і Польшчы, а канец тысячагоддзя наступіць не заўтра раніцай, пытанні канкрэтнага месца і часу застаюцца пакуль што адкрытымі. Хутчэй за ўсё гэта можа быць польска-беларускае памежжа. А найпрыдатны час выпадае, бадай, на лета-99.

На пытанне, чаму перавага аддаецца Белавежскай пушчы, Вера Багальянц адзначыла яе сусветную вядомасць, геаграфічнае размяшчэнне і асаблівае месца ў сістэме чалавечых каштоўнасцяў на рубяжы стагоддзяў. «Я мяркую, што Белавежская пушча — адметны помнік прыроды, разам з тым паказальна і тое, што людзі яго падзялілі мяжой. Гэта толькі падкрэслівае актуальнасць і прыдатнасць Белавежскай пушчы як унікальнага месца сустрэчы».

Калі праект адбудзецца, сюды з'едуцца прадстаўнікі культур, творчых школ, плыняў, перш-наперш заклапочаных пошукам духоўнасці, культурнага развіцця. Рамкі фестывалю не будуць цеснымі для мастацкіх выстаў, пленэраў, тэатральных відовішчаў, кінапаказаў, конкурсаў, дыскусій і г.д. «Каранёвая сістэма» Белавежскай пушчы дапаможа ўдзельнікам не толькі азірнуцца назад, паглядзець у глыбіню стагоддзяў, але таксама ўбачыць будучыню культурнага супрацоўніцтва народаў, устойлівага развіцця і духоўнага ўзбагачэння. «Я, магчыма, ужо не буду працаваць у Мінску, але на фестываль у Белавежскую пушчу спадзяюся прыехаць. Гэты раз без візы», — кажа на развітанне Вера Багальянц і жадае нашай газеце зрабіць важкі ўнёсак у рэалізацыю праекта безвізавага фестывалю.

# Удзячны лёсу, ён плаціў сваю долю ўзаемнасці

Газета «Белавежская пушча» 1997

У адзін з восеньскіх дзён у рэдакцыю газеты прыйшла запозненая вестка, што не стала руплівага навукоўца, таленавітага інтэрпрэтатара — нястомнага пашыральніка ведаў пра Белавежскую пушчу, навуковага супрацоўніка нацыянальнага парка Сцяпана Віктаравіча Шостака. Перасцярогай і болем, якія адчуў я ў апошнюю нашу сустрэчу сёлетнім летам, былі ягоныя словы: «Белавежская пушча не заслужыла, каб сёння пісаць пра яе дрэнна...»

Таму і размова атрымалася з паўзамі.

Сцяпан Віктаравіч разумеў неабходнасць крытычнага слова ў газеце і той меры галоснасці, якая б не давала ідэалізаваць прадмет усенароднай пашаны, паказвала і трывожныя тэндэнцыі. Пушча ёсць абшарам вялікай дзяржаўнай гаспадаркі, якая хоць і называецца нацыянальны парк, аднак тут вядуцца інтэнсіўныя нарыхтоўкі драўніны, гучаць паляўнічыя стрэлы і толькі на асобных парцэлах запаведана цішыня...

«Што казаць, мне сорамна часам... — ціха прызнаўся Сцяпан Віктаравіч. — Сорамна весці экскурсію, калі вакол пні, драўніна, сляды тэхнікі. А пні, як вядома, «растуць» вельмі доўга».

Праз паўзу, частуючыся тытунёвай зацяжкай, працягваў: «Але я не магу пра гэта пісаць. Я схільны больш апяваць Пушчу, пісаць пра тое, што гучыць для мяне як паэма, як гімн. — Сцяпан Віктаравіч гаварыў, пазіраючы ў акно кабінета, за якім зусім побач красаваў пушчанскі лес. — Вось звычайная елачка. Але тут яна не звычайная. Таму што тут не звычайнае гэта паветра, сонца. Тут шмат прасторы і асаблівага водару, тут усё запаведнае».

Была суботняя раніца, і ў будынку, дзе месціцца навуковы аддзел нацыянальнага парка, панавала нязвыклая цішыня. Сцяпан Віктаравіч прыйшоў спарадкаваць паперы, да якіх даўно не даходзілі рукі, ды заадно сустрэцца са мной, сёе-тое перадаць для газеты.

«Што датычыць палявання... — зноў глыбокая зацяжка і паўза. — Я давяраю вам сваё пачуццё занепакоенасці і магу з адказнасцю заявіць, што рэкамендацыі вучоных у запаведніку ігнаруюцца. Іх ніхто практычна не ўлічвае. Той жа загонны метад. Замежнік са стрэльбай едзе сюды, каб страляць у лепшыя экземпляры, — якая ж гэта селекцыя?! Яму патрэбны прыгожыя рогі, ён аплаціў іх валютай. Таму і бярэ на мушку аленя-самца. Тымчасам суадносіны самцоў і самак у Пушчы досыць крытычныя. Ды і ўзрост у самцоў такі, што з паляваннямі трэба даўно канчаць».

І праз кароткую паўзу, заціскаючы ў попельніцы рэшткі цыгарэты, дадаў: «Навука навукай, а жывы долар робіць сваю справу, асабліва на фоне нашай галечы...»

Наогул, у сваіх артыкулах і замалёўках Сцяпан Віктаравіч не кранаўся праблематычна-жорсткіх бакоў гаспадарчай дзейнасці на тэрыторыі запаведнай Пушчы. Негатыўная канкрэтыка вымагала іншага жанру, іншых абставін. Натуры вучонага-папулярызатара больш імпанавала рамантычнае захапленне красой і веліччу Пушчы, лірыка-філасофскае асэнсаванне навуковага матэрыялу. Дый пераслед за крытыку тут ніхто не адмяняў... Шмат пісаў Сцяпан Віктаравіч пра лясных жыхароў, асабліва капытных, якіх сам адмыслова вывучаў на працягу доўгіх гадоў.

Ён называў Пушчу самым велічным беларускім музеем, марыў пра час, калі Беларусь будзе адкрывацца свету Белавежскай пушчай, хараством ацалелай прыроды.

У гэта вельмі хацелася б верыць і нам. Напраўду, Белавежская пушча не заслужыла, каб пра яе «дрэнна» пісалі, каб добрая слава яе змянілася на благую. Але найперш Пушча не заслужыла, каб у ёй гаспадарылі чужыя, без роду і племені, людзі, каб у ёй панавала невуцтва і гібела навука, не заслужыла бядотнага стану, які ўжо зазнала астатняя беларуская прырода: тыя ж лясы, рэкі, флора і фаўна, зямля і нетры. Тымчасам чарга падышла да апошняй мяжы: Пушча таксама занепадае, зведвае жорсткі наступ чалавечай дзейнасці знутры і звонку.

Я хачу зразумець Сцяпана Віктаравіча: удзячны лёсу, які 40 гадоў таму звязаў яго, выпускніка Кіеўскага універсітэта, з Белавежскай пушчай, ён плаціў сваю долю ўзаемнасці, заўжды ганарыўся пушчанскай прапіскай

Дзякуй, Сцяпан Віктаравіч, за апошняе інтэрв'ю, за Вашу прыродалюбнасць і веру ў светлы лёс беларускай святыні.

## Падзенне Белавежскай пушчы

Газета «Белавежская пушча» 1997

На пачатку тысячагоддзя Еўропа была пакрыта суцэльным дрымучым лесам. Яшчэ не стукалі па рэйках цягнікі, не куродымілі заводы, пад скляпеннямі храмаў не гучалі велічныя харалы. Усё гэта будзе. І ўявіць, бадай, цяжка, што гэтага магло не быць. Там, дзе сёння стаяць гарады і няспынна віруе людскі натоўп, залаціліся сонцам паляны, у халадку глухіх ельнікаў хаваліся ў спёку дзікі ды ў маладой зяляніне грабавага лесу цёхкаў салоўка.

Важкай прыкметай першародных мясцін быў зубр — «сучаснік маманта і пячорнага мядзведзя», якія таксама вадзіліся тут з незапомных часоў. Усім хапала травы, вады і паветра.

Жыццё чалавека моцна пацясніла адвечны лес.

Прыладамі наступу былі агонь і сякера. Разлога дзікай прыроды цягам стагоддзяў адступала, драбілася на выспы-атокі, якія ў рэшце рэшт ці знікалі з аблічча зямлі, як з пагоркаў вясновы снег, ці абачліва ашчаджаліся дзеля зберажэння буйнога звера — на выпадак паляўнічых забаў альбо проста былі недаступныя прагнасцям чалавека і ацалелі.

Белавежская пушча — самы вялікі ў Еўропе лясны абшар, што застаўся ад пагінулай зялёнай Атлантыды Старога Свету... Гэта, аднак, не значыць, што лёс Пушчы быў бясхмарны. Нагадаем горкую ісціну: на працягу гісторыі Пушчу пілавалі, вывозілі і сплаўлялі. Усімі даступнымі сродкамі хацелі скарыстацца дзеля асабістага ўзбагачэння ці папаўнення заняпалай дзяржаўнай казны. Шалёны ўзятак з «залатога дна», якім бачылі Пушчу, шмат каму кружыў галаву. Кружыць і сёння.

Уладзімір Апанасавіч Дацкевіч з тых людзей Пушчы, хто даўно не мірыцца з дзікунствамі яе эксплуатацыі, застоем навуковага доследу, маўклівым сузіраннем замест слова праўды і перасцярогі. Ён мае сваю, адрозную неспакойную думку і ўважае за абавязак даводзіць яе іншым. Ён гаворыць так, як думае. Даводзіць тое, у чым перакананы. Бог мой! Што можа быць больш удзячнае для журналіста, як не магчымасць данесці да чытачоў пазіцыю абазнанага абаронцы, нераўнадушнага чалавека! У нашым выпадку — патомнага жыхара Пушчы, вучонага-арнітолага, аўтара шматлікіх манаграфій і даследванняў на карысць захавання Пушчы.

* * *

— Трэба глядзець схему і бачыць, як адгалінаванні палескіх балотаў «зайшлі» ў Пушчу. Цэлая сістэма балотаў. Цікава і люба. Усё цесна, хораша спалучана: багны далі жыццё рэкам, рэкі далі жыццё Пушчы. Але ўвесь грунт цікавасці ў тым, што гэтыя багны маюць адрознае «грамадзянства»: рэкі адных цякуць

у Балтыйскае мора, рэкі другіх — у Чорнае. Знакаміты водападзел, які робіць пушчанскі рэгіён яшчэ больш унікальным, што, дарэчы, заўжды адзначаюць батанікі. Тут зямная тайніца, адвечны гістарычны ланцуг: найперш паўстаў раслінны свет, затым жывёльны, у тым ліку зубр, а пасля ўжо і чалавек прылучыўся. Кніга вечнасці!

І вось цяпер, прыканцы ХХ стагоддзя мы на ўсім ставім кропку. У тое, што зрабіла вынішчальная меліярацыя, розум адмаўляецца верыць. Але гэта факт. Белавежская пушча атрымала ад так званых меліяратараў з поўнае жмені. Усе рэкі, за выключэннем Нарава, асушаны. Альбо спраставаныя. Цэлая сетка малых ручаінак, рачулак, якія насычалі гэты лес, навечна знішчана. Наступствы ў нас на вачах. Прапалі шматлікія тыпы лесу: ольсы, груды, сасьнякі. Няма падросту сасны, пладаноснасць сыходзіць на нуль. Лес не ўзнаўляецца. Калі нешта недзе трохі вырастае — адразу ж вытоптваецца, паядаецца. Паглядзіце, год за годам катастрафічна падае ельнік. Лясніцтвы ўжо ледзь спраўляюцца з гэтым абвалам. Але каб адзін толькі ельнік... Людзям даводзяць, што, маўляў, засушлівы год. Несур'ёзна. Засухі бывалі і раней. І не такія. След меліярацыі — дэфіцыт вады. Дарэчы, не толькі ў лясах, але і на сельскагаспадарчых землях. Парушыўся колазварот грунтовай вады. А гэтыя механізмы дзейнічаюць як помпа. Ледзь што — пачынаецца. Атмасферныя ападкі не засвойваюцца як раней, а па сотнях прарытых каналаў коцяцца ў мора. Людзі здзіўляюцца: раней было ўсё нармальна...

Я не гідролаг і не ведаю рэцэптаў, што зрабіць, каб вярнуць нашы багны і рэкі, насыціць лясы вільгаццю. Магу толькі сумна канстатаваць: вады ў Пушчы, па вялікім рахунку, няма. Рэкі «селі» зусім, перасыхаюць; мяркую, так званым водным артэрыям прыйшоў поўны канец. Азёраў няма. Ёсць штучныя сажалкі, якія ў рэшце рэшт могуць застацца з сухім дном. Вось вам яскравы прыклад. Зіма 1996 года. На

рэдкасць мнагаснежная, не хутка такая будзе зноў. Вясна — з вялікай вадой, ападкамі. А стары, вялікі вадаём у Перарове так і не набраў патрэбнага ўзроўню. Пра што гэта гаворыць? Дэфіцыт вільгаці ўжо такі вялікі, што лясныя штучныя сажалкі папросту нежыццяздольныя, на іх няма падстаў спадзявацца.

Асушаны землі і вакол Пушчы — а гэта тысячагектарныя плошчы. Сёння там, бадай, нічога не родзіць. Нават шматгадовыя травы расці не хочуць. Адны сітнікі. Гэта ўжо апустыньванне тэрыторыі. А навокал толькі жывёлагадоўчых фермаў больш за сотню. Уся нагрузка кладзецца на пушчанскія ўгоддзі, на гэтыя рэшткі, на гэты ацалелы прыродны пласт.

* * *

— Пушчанская драма адбываецца не ўвачавідкі, бо гэта вялікі лес. Аднак тое, што паддаецца назіранням, хвалюе і абурае.

У Пушчы з 50-х гадоў пануе разбойны тып высечак. Лес валяць спрэс, без пэўных правіл і падыходаў. Адзін распаўсюджаны падыход — слановы. Па запаведным лесе сноўдаюцца-гудуць шматтонныя «Кіраўцы». Лес радзее і спусташаецца: за дзесяцігоддзі планавых высечак Пушчы нанесена такая вялікая траўма, што падняцца з ёй, бадай, немагчыма.

Бывае, пасля якога-небудзь чарговага наезду ў Пушчу высокага прыдворнага гаспадарніка на слыху яшчэ доўга застаецца адна і тая ж фраза пра «залатое дно» Пушчы. Уяўляеце, як гэта развязвае рукі планавікам-карыстальнікам! І як балюча б'е па экалагічнай, ашчаджальнай этыцы, па людзях, якіх «лясгасаўскае мысленне» яшчэ не адолела.

Ёсць падставы спытаць: ці мае права лесагаспадарчае ведамства секчы помнік прыроды, які нам пакінулі продкі? Патрэбны чалавецтву такі помнік ці не? І чаму за чалавецтва адказваюць часовыя людзі? Сёння яны ёсць, заўтра няма.

Праўда, каб рашэнні выглядалі знешне прыстойна, часам падключаюць абслугу — навуковыя арганізацыі, розныя інстытуты, кафедры. Але ўсё гэта вельмі далёка ад незалежных ацэнак. Ёсць палітыка, курс, напрамак — іх трэба падтрымаць тэорыяй, абслужыць практыку. Так нараджаюцца праекты, канцэпцыі — усё тых жа неўтаймоўных карыстальнікаў.

Я ўжо казаў пра навакольны ціск на Пушчу. Фермы валяцца. Калгасы абанкручваюцца. Таму ёсць задума гэтыя сумежныя тэрыторыі далучыць да Пушчы, стварыць нейкі гаспадарчы кангламерат кшталту канцэрна. На чый рахунак гэта ўсё робіцца, вы бачыце. Нічога ж прыродаахоўнага тут няма абсалютна! І не прадбачыцца.

Цяпер што да назвы нацыянальны парк. Прабачце, гэта падман грамадскай думкі. Ніхто ў толк не ведае, што такое нацыянальны парк. Разбілі маналітны лясны абшар на чатыры зоны. Навошта такое чыніць, калі хочам зберагчы для нашчадкаў гэты вялікі лес? Ён жыве адным біялагічным жыццём — дык і няхай жыве! Іншая справа, што гэта дае ўладам магчымасць гаспадарыць так, як ім хочацца. Менавіта — працягваць лесанарыхтоўкі, а грамадства падманваць ідэяй нацыянальнага парка.

Я бачыў на схемах вылучаныя дзялянкі — так званая абсалютная запаведнасць. Маўляў, вось вам тое, што вякамі не забіраюць у прыроды, не кранаюць і пальцам. Але і тут ашука і крывадушнасць. Гэта былыя забалочаныя мясціны, куды не здолеў прабіцца трактар. Пакуль не здолеў. Хутка здолее, як толькі падыдзе чарга. Сёння тыя мясціны маладаступныя і пакуль што не надта патрэбныя — чорнаальшанікі, малатаварны лес уздоўж граніцы на водападзеле Ясельды і Нарава і гэтак далей. Астатняя частка Пушчы — больш як 80 адсоткаў — эксплуатуецца. Вы паглядзіце. Лясны абшар абдымаюць тысячы кіламетраў цвёрдапакрытых дарог, трубаправодныя

шляхі — нафта, газ. Тры вайсковыя базы, адна, кажуць, з радыяцыяй. Вакол Пушчы — сорак пiларамаў, апроч галоўнай, што на сядзібе. Не паветра ж яны рэжуць, праўда?

Але паслухайце, што кажуць гаспадарнікі. Не міргнуўшы вокам, яны заяўляюць, што могуць узнавіць тыпы гістарычнага лесу. Яны, бачыце, могуць! Лепш назавіце, дзе, калі, у якой кропцы планеты гэта здолелі зрабіць. Справа ў тым, што нідзе і ніколі. Калі Заходняя Еўропа засталася без гістарычных лясоў, там што, скажыце, калі ласка, не знайшлося разумных людзей, каб вярнуць іх? Фокус у тым, што яны і не збіраюцца гэта рабіць, бо гэта ўжо немагчыма. А нашы зухавата пахваляюцца. Маўляў, можна секчы Пушчу. Больш за тое. Не толькі можна, кажуць яны, але трэба секчы. Гэта што — школа запаведнасці?

Відавочныя рэчы — невуцтва і вайна.

* * *

— Цяпер службы адміністрацыі досыць варухліва ўзяліся развіваць турызм. Скажыце, калі ласка, каму гэта трэба? І што тут можа атрымацца?

Ёсць, напрыклад, Карпаты. Іх пакуль што ніхто з месца не зрушыў. Іх там маглі апаганіць, загадзіць, абкрасці — але яны яшчэ горы. А як з Пушчай?

Я скажу вам самыя горкія, самыя крыўдныя, можа, самыя балючыя словы, якія мушу сказаць. Старажытная Пушча засталася ў мінулым. Той лес, які мы нядаўна ўважалі за пракаветна-казачны, велічны, першародны, — сёння ўжо страчаны. З пункту гледжання турыста Пушча не ўяўляе асаблівай цікавасці. Пра сапраўдны турыстычны прадукт гаварыць вельмі позна. Не будзем крыўдзіць астатні лес, які расце ў Беларусі, — у чым розніца паміж тым, што пад Мінскам ці Асіповічамі, і гэтым? Я ўтрырую, бо ў мяне ёсць падставы баяцца: тэмпы збліжэння абодвух гэтых тыпаў надзвычай імклівыя.

Цяпер пра іншае. Тое, што зараз тут робяць Ціцянкоў і ягоныя службы, спрабуючы паставіць турызм на шырокую нагу, — гэта ўсё другі план. Яны рупяцца як мага пашырыць сервісную базу, абслугу, але не захоўваюць самае дарагое — Пушчу. Бо дзеля чаго гэта рабіць, калі першародны гістарычны лес вось-вось упадзе канчаткова? Ды яго ўжо няма. Я лічу, што няма. Паўвеку я прахадзіў тут, праездзіў і хоць сёння магу даказаць любой камісіі, што ўсё тут затурзана і спаганена. Найарыгінальныя тыпы лесу ўсе ўпалі, а што ацалела — працягвае падаць катастрафічна.

А што робяць яны? Налягаюць на гасцініцы, рэстараны, тэнісныя корты і гэтак далей. Ды ёлкі-палкі! Хто сюды паедзе? Усё ж непамерна дарага. Ну паедзе наш ценявік, каб гульнуць, развеяцца ў ціхім лесе. Збольшага ён будзе задаволены. Для «новых» тут нешта робіцца. А што для дыдактыкі, для выхавання, для дапытлівых дзіцячых душ? Дзе культура, этыка, веды, любоў да прыроды? Ёсць вальеры, музей. Але ўсім зразумела, што гэтага да ўбогасці мала параўнальна з тым, што можна рабіць, каб Белавежскую пушчу паказаць сапраўды як еўрапейскі рарытэт. А галоўнае — дзе намаганні па яе захаванні як аб'екта нумар адзін нашай прыроднай спадчыны? Я вельмі шкадую, але павінен сказаць: у Белавежскай пушчы ўжо няма чаго паказваць турысту.

* * *

— Так мяркую не я адзін. Выказваюцца многія, але неяк цішком, не высоўваючыся. Астатнія не зважаюць або маўчаць. Прычым, маўчаць нашы аўтарытэты, акадэмікі. Вы ад іх не пачуеце больш-менш вымоўнага, па-грамадзянску смелага адказу, таму што над імі пануе палітычная абстаноўка. Яны пазбаўлены магчымасці ўголас, адкрыта казаць пра тое, што думаюць. Асцерагаюцца праследу. А разумець — разумеюць, наколькі катастрафічнае становішча ў Пушчы. Часам гэтае разуменне глыбокае і роспач-

нае. Але каб званіць у званы — не. Яны таксама прыстасоўваюцца, нават тыя, здавалася б, каму стае мужнасці. Можа, не ведаюць, што рабіць, або разумеюць, што гэта будзе дарэмнай справай. Што нічога не зрушыш, а толькі сабе зробіш горш. У кожнага свая рацыя, людзі ёсць людзі, бог ты мой...

Дарэчы, спроба вучоных адваяваць Пушчу для навукі была. Спрабавалі надаць ёй статус запаведніка, не дапусціць ідэю нацыянальнага парка. Але гэта былі адзінкі. На палітычным узроўні іх меркаванне было адхілена, усё распланавалі так, каб Пушчу не аддаваць.

Канешне ж, клімат у Пушчы павінен ствараць эколаг, вучоны, а не нарыхтоўшчык з бензапілой ды сякерай. Бо пытанні, вартыя глыбокіх навуковых даследванняў, паўстаюць адно за адным. Аднак яны ўбаку ад навукі. І навука за іх не хапаецца. Вазьміце гідралагічны рэжым Пушчы, аб чым я казаў. Ці тое ж высыханне ельнікаў, заняпад расліннасці... Маўчанне. Маўчыць навука.

Я не ведаю, ці можна яшчэ што-небудзь зрабіць, каб спыніць абвал Пушчы, запаволіць працэс дэградацыі і збяднення. У мяне вельмі мала надзеі. Перамены да лепшага магчымыя хіба што ў выпадку, калі ў Беларусі наступяць палітычныя змены. Стварэнне нацыянальнага парка было рэжымна-палітычным рашэннем і ніяк не навуковым, не дэмакратычным. Пушчы не патрэбны нацыянальны парк. Тут павінен быць запаведнік, дзе б гаспадарыла навука. І не такая, каб сядзець ды шчыкаць паціху што-кольвек для дысертацый. А навука сапраўдная, моцная, з імёнамі і аўтарытэтамі. Не служка, а ўсяцэлае гаспадарства. Дзякуй Богу, сёння нашыя інстытуты клепяць памалу маладыя кадры. Вось хай яны і прыходзяць у Пушчу. З іншымі падыходамі і задачамі. З надзеяй захаваць Пушчу. Перш-наперш захаваць. Карыстацца, але ж не так. Секчы, але сем разоў адмераўшы. Няхай яны, эколагі, скажуць лесагаспадарнікам: «Калі

ласка, вазьміце. Але тое, што можна». Трэба, каб кіраванне было ў руках эколагаў. Я веру ў сумленне новых людзей у Пушчы. Я веру ў розум тых, хто атрымае тут сапраўдную свабоду дзеянняў на зберажэнне Пушчы.

## «Паляванні» на зубра

З НАЧНОГА ДЗЁННІКА.
ГАСЦІНІЦА НАЦЫЯНАЛЬНАГА ПАРКА
«БЕЛАВЕЖСКАЯ ПУШЧА»

1999

У Камянюках, сядзібе нацыянальнага парка, мне параілі завітаць на размову да чалавека, які сёе-тое хацеў бы сказаць журналісту незалежнага выдання. Я выказаў узаемнасць, і назаўтра мы сядзелі насупраць адзін аднаго. Я спытаў, ці магу рабіць запіс на дыктафон. Мой суразмоўца адказаў, што ён не супраць, але прозвішча ў друк папрасіў не даваць. «Зрэшты, глядзіце самі, я не баюся».

— У мяне ёсць дакладныя звесткі, калі забівалі незбракаваных зуброў, — пачаў суразмоўца. — Усё дакументальна зафіксавана: дзе, як і што адбывалася. І хто пры гэтым прысутнічаў. Усё ж рабілася ў іх на вачах, у гэтых сяброў-прыродаахоўнікаў, некаторых Вы ведаеце. Яны зверху атрымалі дазвол, а пасля ўжо дазвалялі самі.

— Як, з Мінску, з міністэрства ніхто не прысутнічаў? А з Брэста, з камітэта прыроды?

Суразмоўца на гэта развёў рукамі. Маўляў, так, нікога.

— Мае запісы маюць крыху спецыфічны характар, — працягваў ён. — Гэта зацемкі ў дзённіку. Вы спачатку паслухайце. Гэта, мяркую, важна для Вас. Ёсць канкрэтныя даты, калі забівалі менавіта незбракаваных жывёлін. Афіцыйна — як збракаваных і безнадзейных. Я гэта фіксаваў для сябе. А расказваю Вам.

— Добра. Страляць здаровых — навошта? Гэта нейк падвышае трафейныя кошты?

— Канешне. Цана можа быць стандартная, але таму, хто дазволіў забіць здаровага зубра... Вы разумееце?

— А хто мог дазволіць гэты гешэфт? Дырэктар парка?

— Навошта? Бярыце ніжэй.

— Усё на такім, загонным узроўні?

— А я Вам пра што? Яны ж з гэтага маюць!

— У сваю кішэню, вядома?

— Канешне. А навошта ж было б яму гэтым займацца? Немцу якому аддаваць — за проста так?

— А немцу выгадней забіць менавіта здаровую жывёліну?

— Дзіва што! Гэта яму даспадобы — застрэліць на выбар.

— На выбар? Страляць у здаровага зубра?.. Значыць, з'ява гэтая мае месца? Шчыра кажучы, я заўсёды пісаў пра гэта з аглядкай, да канца не верыў.

— Каб гэта быў факт, трэба мець нейкі дакумент.

— Які ж дакумент? — сцяміў я. — Адкуль ён можа быць? Гэта выключна на асабістай дамоўленасці...

— Ёсць крыніца інфармацыі, але я не магу назваць, хто. Дый ці так гэта важна? Я Вам кажу выключна як журналісту, Вы павінны такое ведаць. Мы можам пайсці дахаты, калі Вы скажаце... Калі захочаце запэўніцца. Ён пацвердзіць гэты факт. Я папярэдзіў яго.

— Ці можна з гэтай падставы казаць, што выбіваецца эліта зуброў?

— Іменна так. Чамусьці пад кулю трапляюць часцей за ўсё самкі, здаровыя і маладыя.

Суразмоўца роспачна ўздыхнуў, падліў у кубачкі духмянай гарбаты з пушчанскіх зёлак. Я падтрымаў паўзу, стараючыся асэнсаваць пачутае.

— Гэта што! — Махнуў рукой суразмоўца як на падставы не самыя істотныя і тут жа дадаў з цвёрдым

акцэнтам: — Хутка зверу тут месца зусім не будзе.

Я чакаў працягу.

— Колькасць аленя імкліва падае. Як бачыш будзе каля нуля. Гэта я вітаю. Ён тут, можа, і не патрэбны.

— Выядаецца Пушча? — здагадаўся я. — А кабан?

— Кабан? Ён будзе выбіты таксама. Папуляцыя моцна папсаваная. Гэта ўжо, так бы мовіць, не кабан, а паркавая жывёліна. Яго ж тут круглы год кормяць. Ён перайначыўся экстэр'ерна. Ужо з дамешкамі свойскай свінні. Масавыя метысы. Іх тут разгадавалі на мяса. Метысы смачнейшыя.

— Для начальства разгадавалі?

— І для начальства. Для Машэрава і Кісялёва, напрыклад, смалілі маладых метысаў, я ведаю дакладна. Хутка іх перастануць карміць, бо не стае ўжо корму, на гэта грошай няма. Збожжа яшчэ трохі заставалася, але яго крадуць на самагон. Кабан пойдзе з Пушчы. У поле, на культурныя пашы, на асушаныя лугі — шукаць пракорму. А як выйшаў... Словам, дзікоў не будзе ні ў Пушчы, ні за яе межамі. Вы ведаеце, вышкі цяпер не працуюць, у Пушчы голадна. З восені, на пачатку зімы яны пачнуць выходзіць. А як выйшаў... Там іх, канешне ж, пастрэляюць.

У вокны глядзела густая шэрая цемень. Мой суразмоўца запаліў святло, заторгнуў фіранку.

— Наогул, гэта дзікае паляванне. Ніякія законы не дзейнічаюць. Паляўнічага таварыства няма. Было, цяпер няма. Гадоў дзесяць да гэтага ішло. Поўны гармідар. Людзі ўжо маюць добрую зброю, ёсць нарэзныя стрэльбы, з оптыкай, з прыборамі начнога бачання — адным словам, рабі што хочаш, абы файна страляла... Так што размалоцяць як бачыш! А яны выходзіць пачнуць... Якіх не застрэляць, тыя здохнуць. Бо не прыстасаваныя, ім цяжка. Паміраць будуць самкі, хоць іх засталося і так няшмат. Вяпрук не мае такога значэння як самка, а самку лягчэй зда-

быць: хто ж страляе ў падсвінка, якога яна вядзе? — страляюць у самку.

Ахвотных цяпер — каб хацеў, не схаваешся. Зараз хлынулі гэтыя наваяўленыя. Тая самая партнаменклатура, якую ўзняла хваля бізнесу. Дарожкі сюды ходжаныя. Раней ехалі босы, а цяпер і ўся шараговая хэўра валіць. Год-два пасядзелі ў офісах, машну набілі — давай шукаць прыгодаў. Я наогул не ведаю, калі яны працуюць. Мясцовыя ж гэта ўсё бачаць, дзівуюцца з таго, што такія вялікія грошы ў гэтых малакультурных, ачмурэлых з багацця людзей. Адны староняцца, іншыя наадварот, ідуць да іх у абслугу.

Сёння гэта — Вы ведаеце — усё часцей называецца мудронымі словамі «экалагічны турызм». Але мне нічога такога не трапілася пакуль што на вочы, каб сказаў: ну во, экалагічны турызм. Ніводнага факта! Хацеў бы — не ўбачу.

— Чаму ж? Пахадзіць каля вальераў ахвотныя заўсёды знаходзяцца. Дый на экалагічны турызм ставіць Еўропа.

— Можа, гэта і неблагая перспектыва, але Еўропа не хоча бачыць сапраўднага стану рэчаў. Каго ўважаць за такога турыста? Багатага бізнесоўца або забяспечанага чалавека, што прыехаў сюды з шалаўлівай кампашкай пап'янстваваць, забіць таго ж кабана або палавіць рыбу? У гэткім разе хіба што... Але пікнік у Белавежскай пушчы — гэта ўсё, да чаго дайшлі мазгі нашага начальства. Што ні робіцца, то ўсё ж пад гэтую марку. І бяруцца смеласці называць гэта «экалагічным турызмам». Пушча ўся ў пілавінні. Піларамы кругом. На добры лад, трэба ўсю гэтую гаспадарку разам з адміністрацыяй гнаць адсюль у тры шыі, калі хочам захаваць Пушчу.

Суразмоўца ўважліва паглядзеў на мяне, запытаў:

— Вы са мной згодныя? Можа, я ўжо надта размахаўся, як гаворыць сусед?

— Наадварот, Вы кажаце святую праўду. Працягвайце. Гэта мужная пазіцыя сапраўднага белавежца.

— Акупацыя, разумееце. Не прадыхнуць. Куды гоняць наш лес? Трэба як мага адлучыць ад Пушчы ўсю гэтую набрыдзь. Лесагаспадарку і лесагаспадарнікаў — прэч з Пушчы! Камерсантам, якія прыйшлі сюды з піламі, лесавозамі, бізнес-планамі і ўсім сваім гэтым прыладдзем, — прэч з Пушчы! Паказаць на дзверы і паставіць жалезны шчыт. Паляванні, замежныя туры — прэч з Пушчы! Інакш не застанецца ні звера, ні... страшна сказаць — нас, саміх белавежцаў тут не застанецца. Уяўляеце, нам, карэнным пушчанцам, не знойдзецца месца ў вялікай Пушчы. На пнеўі пачнуць вырастаць дачныя селішчы, у лепшых месцах — асабнякі наваяўленых. Пойдзе такі гандаль!

— Каб гэты вялікі гандаль не здарыўся, што мне зрабіць? Сёння, калі вярнуся ў гасцініцу?

— Напішыце, што я сказаў.

Мы дапілі гарбату. Час быў позні. Я рушыў за дзверы, за ганак пад'езда, у цемру восеньскай ночы.

## Альберт Швейцар у... Белавежскай пушчы

ГУТАРКА З ПРАФЕСАРАМ
АЛЯКСАНДРАМ НІКОЛЬСКІМ (МАСКВА)

Газета «Белавежская пушча» 1998

Лёс вялікага гуманіста наўрад ці калі перасякаўся з вялікім лесам. Пра гэта нічога нам невядома. Прынамсі, з даступных крыніцаў. Аднак ёсць выдатныя падставы значыць такую повязь. Погляды А.Швейцара, акумуляваныя ў панятак «багавейлівасць перад жыццём», вельмі надзённа пераклікаюцца з сучаснай практыкай прыродаахоўнасці, асабліва што датычыць запаведнікаў — асабліва «багавейлівых» тэрыторыяў.

З Аляксандрам Нікольскім, маім суразмоўцам і

даўнім знаёмым, прафесарам кафедры сістэмнай экалогіі Расійскага універсітэта Дружбы Народаў я сустрэўся ў Кіеве падчас міжнароднай школы-семінара «Любоў да прыроды», якую прыканцы мінулага года ладзіў мясцовы культурна-экалагічны цэнтр. Аляксандр Аляксандравіч гэты раз аказаўся не толькі носьбітам «багавейлівай канцэпцыі», але нечакана патрапіў у цэнтр дыскусіі вакол гэтай самай канцэпцыі, якая пачалася акурат з артыкула вучонага ў часопісе «Пра эка» («Ахова дзікай прыроды») пад назвай «Этыка багавейлівасці перад жыццём як канцэпцыя запаведнай справы». У ёй спадар Нікольскі піша:

*«Запаведнікі і нацыянальныя паркі ёсць тым месцам, дзе любое жыццё мае асаблівы статус і пануе дух багавейлівасці перад жыццём...»*

*«Аналіз дзейнасці запаведнікаў і нацыянальных паркаў паказвае, што існуюць тры напрамкі, калі дапускаецца знішчэнне жывёл або раслін на іх тэрыторыі: 1) дзеля навуковых мэтаў; 2) дзеля мэтаў рэгулявання колькасці асобных відаў і 3) дзеля рэкрэацыйных мэтаў, звычайна ў форме арганізацыі платнага палявання. ...У большасці выпадкаў такая аргументацыя не вытрымлівае крытыкі: 1) збор навуковага матэрыялу ў запаведніках зазвычай не больш апраўданы, чым на суседніх, неахоўных тэрыторыях (...); 2) іерархія відаў паводле іхняй «карыснасці» прынцыпова супярэчыць задачам запаведнікаў і нацыянальных паркаў, бо іхняя рэпрэзентатыўнасць вызначаецца найперш не тым, колькі ў іх «карысных» відаў, а тым, наколькі поўна захаваная прыродная экасістэма; 3) арганізацыя паляванняў, якая заахвочвае насалоду забойства, справа не больш прыбытковая, чым шматлікія іншыя формы баўлення часу наведнікаў, хоць нярэдка і менш турботная».*

*«Хочацца напомніць некаторым рухавым дырэктарам, што запаведнікі — гэта не акцыянерныя таварыствы. Не віна шараговых падаткаплацельшчыкаў, што вам мала плацяць. Але мы плацім падаткі не дзеля таго, каб вы эксплуатавалі прыродныя рэсурсы, якія мусіце самі ж ахоўваць».*

*«Прынцыпова і важна, каб мясцовае насельніцтва ведала, што на ахоўнай прыроднай тэрыторыі пануе дух багавейлівасці перад жыццём, каб... ставілася да запаведніка так, як у традыцыйна рэлігійных краінах ставяцца да храма».*

*«Асновай канцэпцыі арганізацыі запаведнікаў і нацыянальных паркаў павінна стаць этыка багавейлівасці перад жыццём, найбольш глыбока распрацаваная ў Альберта Швейцара».*

В. ДРАНЧУК. *Чую знаёмае, Аляксандр Аляксандравіч. Не знаходзім «прарока» ў сваёй Айчыне...*

АЛЯКСАНДР НІКОЛЬСКІ. Швейцар выказаў тыя словы, якія я хацеў пачуць. Мая пазіцыя была дзесьці блізкая. Магчыма, не хапала пэўнасці. Што надзвычай істотна, тут не проста багавейлівасць перад жыццём, а менавіта — этыка багавейлівасці.

І другое: патрэбен быў аўтарытэт. Швейцар несумнеўны аўтарытэт. Не толькі таму, што гэта выбітная асоба, а таму што ён подзвігам свайго жыцця даводзіў тое, пра што пісаў. Як ведаеце, ён паехаў у Афрыку і там арганізаваў дзіцячы шпіталь. З пункту гледжання «нармальных» жаданняў, гэтая акцыя была нібыта й залішняй. Здавалася б, чаго яшчэ не ставала чалавеку, талентаў якога хапіла б і на некалькіх. Ён быў выдатны багаслоў, бліскучы музыкант, філёзаф. Нарэшце, цудоўны лекар, які закончыў медычную ўстанову і меў шмат лекарскіх практык. Але, як бачым, гэтага яму было мала. Займала штосьці большае, абагуленае пасля ў этыку пашанотнасці перад жыццём. Вялікі прынцып ён

мусіў рэалізаваць на прыкладзе свайго лёсу: паказаць, што гэта не які-небудзь тэарэтычны, філязофскі пастулат, а лад жыцця.

В. Д. *Тым самым Швейцар займеў сабе поўнае права гэта даводзіць.*

А. Н. Так, на ўсякае слова трэба мець маральнае права. Мала сказаць, трэба падмацаваць яго дзеяннем. На гэты конт ёсць класічны прыклад Ісуса Хрыста, які свядома пайшоў на крыж. Стварэнне дзіцячай клінікі ў афрыканскай краіне — таксама свядомы, у нечым «крыжовы» акт. Швейцару мала было прамаўляць, ён пайшоў на канкрэтны прыклад.

В. Д. *Гэты прыклад Вы спрабуеце прывязаць да запаведнай справы. Як, на Вашу думку, тут словы стасуюцца з дзеяннем?*

А. Н. Мяркую, што ў запаведніках і нацыянальных парках павінны працаваць такія людзі, якія ў найбольшай ступені адпавядалі б гэтай канцэпцыі. Іхні лад жыцця павінен быць у поўнай згодзе з этыкай багавейлівасці перад жыццём. Нават у дробязях, без кампрамісаў і выключэнняў. Дарэчы, кампраміс, я лічу, немагчымы наогул. Неэтычныя ўчынкі нельга зрабіць больш альбо менш этычнымі. Іншая справа, што на тое ці іншае дзеянне яны вымушаныя ісці, але ў такім разе трэба адкрыта прызнацца ў яго неэтычнасці.

В. Д. *Мы закранаем, бадай, ці не самае балючае месца. Бываючы ў Пушчы, я сутыкаюся якраз з тым, што ёсць да дзёрзкасці грубым адступленнем ад этычных запаведзяў Швейцара. Адзін яскравы прыклад. Уявіце, што Вы ў музеі прыроды нацыянальнага парка. Агледзелі стэнды з экспанатамі, паслухалі шмат цікавага і, стараючыся не парушыць гэтае добрае ўражанне, спускаецеся з другога паверха на першы. І вось тут, лічыце, у самым сэрцы запаведніка, вам прапануюць*

*купіць шкуру зубра. Прычым, ніхто нічога не тлумачыць. Думай, што хочаш, вырашай сам...*

А. Н. Нельга так. І быць не павінна. Ёсць грань, якую нельга пераходзіць. Не маем права. Як бы цяжка не было. Хтосьці ўчора тут выступаў і казаў, што ўсё — ідзём на дно. Засталося выжываць. Я разумею, бо і сам не пачуваюся на вяршыні дабрабыту. Аднак з гэтага нічога не выцякае. Ёсць грань... Вам ужо знаёмы прыклад з Саяна-Шушанскім запаведнікам у Расіі. Дырэктар сам выступіў з ініцыятывай валютных паляванняў на сібірскага горнага казла. 1600 долараў за аднаго — і выйсце з тупіка. Але паглядзім інакш. Калі ты прадаеш тое, што павінен ахоўваць, — пакідай працу. Ты не прыгодны быць на гэтым месцы. Тут нельга дапускаць кампраміса.

Я не выключаю наогул камерцыйную дзейнасць у запаведніку. Арганізуй навуковы турызм, займіся выдавецкай працай, вырабам адзення з сімволікай — хустачак, маечак, шапачак і г. д. На здароўе! Падключы розум, круціся. Толькі не хавай сумлення, не страляй.

На жаль, бяда нашых запаведнікаў у тым, што да гэтага часу большасць іх ачольваюць людзі, загартаваныя на гаспадарцы, на рэсурсавым падыходзе — лесаводы, паляўніцтвазнаўцы...

В. Д. *Яшчэ — былыя старшыні калгасаў, саўгасаў, дырэктары «сельгасхіміі»...*

А. Н. Тое не іх віна. Іх так навучылі, ад іх патрабуюць, яны ўжо з такім светапоглядам. Але калі я пра гэта чую зноў і зноў, прабачце, мне нецікава. Нецікава, што ў Саяна-Шушанскім запаведніку дырэктар не знайшоў іншага спосабу знайсці грошы. Мне іх таксама не хапае, але ж я не крычу пра гэта на ўсіх скрыжаваннях. Я спрабую вырашыць гэтую праблему так, як можа дазволіць сабе вучоны...

Гадоў колькі таму я браў удзел, рыхтаваў заяўку на прысваенне Пушчы статуса аб'екта сусветнай пры-

роднай спадчыны. Польшча мела гэты статус, а Беларусь — не. Як жа так? Беларуская Пушча была і нашмат лепш захаванаю, і значна пераўзыходзіла польскую сваімі памерамі. На жаль, мушу сказаць, што ў Беларусі тады я не адчуў вялікага энтузіязму, каб гэтую ініцыятыву як мага рухаць, адкрывацца свету, хоць бяспройгрышнасць варыянта, здавалася б, была відавочнаю.

Дык вось, маючы сёння такі высокі статус, гандляваць шкурамі зубра вельмі нягожа. Калі ёсць, дапусцім, праблемы з колькасцю статку, знайдзіце магчымасць прадаць, падарыць, але не трэба страляць. Ды яшчэ ладзіць такі неэтычны продаж. Захавайце чыстымі рукі. Захавайце твар краіны!

Дарэчы, я ведаю, што сёння дэмакратыя ў Беларусі ўсяляк спрабуе адстойваць прынцыпы суверэнітэту як самастойнай еўрапейскай дзяржавы. У гэтай справе сімволіка мае выключна важнае значэнне, трэба толькі ўмела яе падаваць і ні ў якім разе не раскідвацца сімваламі...

В. Д. *Мы з Вамі крыху закранулі палітыку. Я прыгадваю, як нязгодныя вучоныя рашэнне аб перайначанні запаведна-паляўнічай гаспадаркі ў нацыянальны парк называлі палітычным рашэннем. Жыццё паказвае, што сапраўды ўладныя структуры, апелюючы да прыродаахоўных вартасцяў, адхілілі ідэю запаведніка, каб не надта саступаць у правах. Сёння Белавежская пушча цалкам падкантрольная вузкаму колу людзей, не абцяжараных швейцарайскім светапоглядам.*

А. Н. Калі я быў народным дэпутатам СССР і начальнікам главка, я сваім подпісам падтрымаў рашэнне ўрада, каб Белавежская пушча стала нацыянальным паркам. Так што ў гэтай гісторыі ёсць і мая несумнеўная доля вырашальнага голасу. У Беларусі, мне здавалася, былі рэальныя падставы, каб зрабіць усё годна і правільна. На той час Беларусь уяўлялася

рэспублікай, дзе лёгка засвойваюцца добрыя ісціны і прыжываюцца ўзоры цывілізацыі. Думалася, дзе, як не ў Беларусі нацыянальны парк раскрыецца ў сваіх лепшых якасцях. Можа, я дапусціў прастадушнасць і залішні аптымізм, але гэта рабілася шчыра, з вялікай сімпатыяй да вашай рэспублікі. Па-другое, на тэрыторыі былога Саюза і да гэтага часу застаецца дэфіцыт такой арганізацыі ахоўнасці, пры якой бы не адчужалася насельніцтва. Гэта як адзін з аргументаў «нацыяналізацыі» ахоўных тэрыторый. Але справа ў рэшце рэшт не ў тым, што і як называецца. Нацыянальны парк зусім не парк культуры і адпачынку. І тут, як і ў запаведніку, турысты маюць права хадзіць толькі тымі сцяжынамі, дзе ім дазволена. Праўда, пры ўмове — калі парк правільна і добра арганізаваны. Прызнаюся, гэтая ўмова была для мяне найістотнай.

В. Д. *Напраўду, справа не толькі ў тым, які статус надаць. Важна, як гэта ўвасабляецца на практыцы, у чыіх руках знаходзіцца тая ці іншая ахоўная тэрыторыя, наогул, якая ў краіне пануе палітыка.*

А. Н. Пытанне застаецца надзённым. З сённяшняй практыкі расійскіх нацыянальных паркаў я ведаю, што яны, на жаль, не выконваюць сваёй задачы. Як былі ў Федэральнай службе аховы лесу, так яны там і знаходзяцца, а гэта няправільна. Павінна быць адпаведнае ведамства пры Мінпрыродзе альбо камітэце, а найлепш — асобны дэпартамент па ахоўных тэрыторыях у структуры Кабінета міністраў. Я не ведаю, як у вас у Беларусі, а ў Расіі сітуацыя парадаксальная.

Праўда, даходзіла інфармацыя па нейкіх каналах і да нас, што на беларускія запаведнікі накінулі планы паставак, розных збораў, нарыхтовак і гэтак далей. Калі гэта так...

В. Д. *На жаль, так. Спускаліся адпаведныя цыркуляры з Кіраўніцтва спраў прэзідэнта, якому*

*цяпер падпарадкуюцца нашы эталонныя тэрыторыі.*

А.Н. Абсалютна бязграматная пазіцыя, што ў прынцыпе недапушчальна! І тут, дарэчы, не мае значэння, запаведнік гэта ці нацыянальны парк.

В. Д. *Ёсць і закон, які гэта выключае.*

А. Н. Насуперак Цыцэрону, пад законы трапляюць не ўсе. Уладная воля парушыла не толькі закон. Тут і мараль, і традыцыі. Ды і сама назва, імідж — нацыянальны парк. Нацыянальны ў тым сэнсе, што гэта нацыянальнае багацце. Здабытак, якому няма роўні. Я люблю расказваць пра стан і арганізацыю нацыянальных паркаў у Злучаных штатах. Асабліва, калі нашы спрабуюць рабіць грошы на ўсім, на чым папала. Вось, маўляў, арганізуем турызм і будзем з гэтага карыстаць. Там не так. Па нацыянальнаму парку ЗША сярэдніх памераў за год праходзіць прыкладна каля мільёна турыстаў. А інфраструктура, якая забяспечвае турыстычны канвеер, скіравана не на тое, каб рабіць грошы, а на тое, каб максімальна спрыяць зручнасці турыстаў, і на тое, каб яны не разнеслі, не растапталі гэты запаведны асяродак. У ЗША на турызме зарабляюць усяго 10 адсоткаў да свайго гадавога бюджэта. Астатняе адпускае федэральны бюджэт. Працуе таксама механізм размеркавання. Бо ёсць паркі менш дасягальныя і больш дасягальныя, у адных менш турыстаў, у іншых больш. Таму гэтыя 10 адсоткаў размяркоўвае адпаведная камісія кангрэса. Адным словам, галоўнае тут не ў зараблянні грошай, як памыляюцца многія, а ў тым, каб забяспечыць этычна ўзважаную, неадчужальную абслугу турыстаў. Я падкрэсліваю гэтае слова — неадчужальную. Трэба імкнуцца, каб людзі мелі належны доступ да нацыянальнай святыні і каб на запаведніках і нацыянальных парках улада рабіла не грошы, а прыродаахоўную палітыку.

В.Д. *Без паставак, нарыхтовак, стральбы...*

А.Н. Ніякай стральбы катэгарычна быць не павінна! Як не можа быць аніякіх дабравідных на тое падстаў. Гэта нонсэнс. Бо, зноў жа, і запаведнік, і нацыянальны парк ёсць тым месцам, дзе прынцып этыкі багавейлівасці перад жыццём мусіць захоўвацца неўнікнёна. Калі ты дырэктар і табе дрэнна і ты не можаш зарабляць ні на чым лепшым, апроч палявання ці іншай сумніўнай дзейнасці, — здай свае паўнамоцтвы, ты не адпавядаеш сваёй пасадзе.

В.Д. *Ваша рацыя, спадар Нікольскі! Я нічым не магу запярэчыць Вам і Ваш «экстрэмізм» падзяляю цалкам. Больш за тое. Я ўпэўнены, што бальшыня людзей, якія працуюць на ахоўных тэрыторыях, ёсць такімі ж швейцараносьбітамі. Але нам з Вамі трэба ведаць, як гэта ўсё выглядае ў жыцці. Вы ўжо часткова сказалі пра кадры, што праводзяць «генеральную лінію». Да таго ж, некаторыя не тое што пра этыку багавейлівасці перад жыццём — самую элементарную міжчалавечую цьмяна ўяўляюць. Бывае такое, кажу гэта з вопыту...*

А.Н. З часам многае зменіцца. Прыйдуць іншыя людзі. Важна падтрымаць волю да лепшага. І вось тут, памятаеце? — спачатку было слова... Шматлікія праблемы, а іх незлічонае мноства, абавязкова адступяць, будуць няўхільна высвечвацца прэсай. Вось і я трымаю Вашу газету, гэта таксама дае надзею. Вы заснавалі незалежнае выданне, абвясцілі яго прыродалюбным, асветна-публіцыстычным. Вельмі слушна, мяне гэта радуе. Я абавязкова пакажу Вашы нумары сваім студэнтам. Я хачу, каб яны верылі ў сілу слова і стараліся памнажаць яго, насычалі ведамі і эмоцыяй. Я жадаю ўсім Вашым чытачам веры і аптымізму. Будзеце ў Пушчы, нізка кланяйцеся за мяне сусветнай спадчыне. Але галоўнае — беражыце яе.

# Калі гэта «поспех» і «творчая ўдача», дык што такое сумленне?

СЛОВА НА ПРЭЗЕНТАЦЫІ ДАКУМЕНТАЛЬНАЙ ВІДЭАСТУЖКІ «ВЯЛІКІ ЛЕС» (РЭЖЫСЭР ЛЮД ГЕДРАВІЧУС). НАЦЫЯНАЛЬНЫ ПАРК «БЕЛАВЕЖСКАЯ ПУШЧА»

Люты 1998

Выбачайце, што я мушу гаварыць, перасільваючы хваляванне; можа, ніхто не хвалюецца зараз так, як хвалююся я. Але хвалююся не ад таго, што ўбачыў у кадрах хвалюючую праўду. Я б гэтага вельмі хацеў і шчыра вітаў — каб усіх нас магла ўсхваляваць праўда пра Пушчу, каб сёння мы радаваліся прарыву сумлення і добрай волі дзеля выратавання Вялікага лесу. Гэтай падставы, на жаль, у мяне няма, і я вельмі расчараваны. Я шкадую, што з-пад рукі таленавітага і чуйнага да прыроды і харАства рэжысэра выйшла фальшыўка, у лепшым разе — рэкламны ролік, якому б я не даў месца і ў школьнай фільматэцы з прычыны ягонай кан'юнктурнасці.

Я хвалююся з-за таго, што гэта быў проста выдатны шанец. Але ўлада, баючыся праўды, выхапіла яго з чужых рук, прымяніўшы стары метад: цэнзуру. Самае непрыстойнае і ганебнае — што аб'яднанне «Тэлефільм» і ўся яго творчая «брацыя» ўмыліся гэтым брудам. Сёння яны — і Гедравічус, і Жыгалка — прыехалі сюды, як нічога не адбылося. Спробу сказаць хоць слова, паўслова праўды прыдушылі, як душаць тут і саму Пушчу. А яны робяць выгляд прыстойнасці. Калі гэта «поспех» і «творчая ўдача», дык што такое для нас сумленне? Я рашуча адмяжоўваюся ад усіх віншаванняў, якія тут прагучалі. У лепшым выпадку — я спачуваю.

У цітрах вы бачылі, хто аўтары фільма. Рэжысэр тут выступаў. Такі рэспектабельны, герой дня. Ніхто не прадставіў, аднак, аўтара сцэнарыя. У цітрах гэта

Валеры Пушчын. Але ён тут. І зараз выступае перад вамі, гэта я і не я. Чаму нехта Пушчын, а не Дранчук? Таму што я ўратаваў сваё імя. Я выхапіў яго з ганьбы, якой пакрыўся гэты кінатвор. На сярэдзіне здымкаў я выказаў свой пратэст, адмовіўся ад далейшага ўдзелу і запатрабаваў зняць маё прозвішча. Я не прыняў і прызначанага мне ганарару.

Я разумею, можна, захацеўшы, уратаваць сваё прозвішча. Куды цяжэй уратаваць нашу Пушчу ад прыстасоўнікаў і лжацоў.

Дазвольце колькі слоў пра тое, што адбылося. Па прапанове творчага аб'яднання «Тэлефільм», дакладна галоўнага рэдактара Ўладзіміра Сцепаненкі, я напісаў да планаванага відэафільма сцэнарый. Яшчэ да таго, як брацца за пяро, паміж намі была ўмова ці джэнтльменскае пагадненне, што гэта будзе праўдзівая і непрыгладжаная стужка. З экалагічнымі пагрозамі, небяспекамі, драмамі, якія не толькі перажыла, але і перажывае Пушча. Я настойваў на гэтым пункце. Бо ведаў, адчуваў, што можа быць. Сцэнарый прынялі без заўваг, больш за тое, ацэнкі пераўзышлі мае чаканні, яны давалі мне гонару. Было падпісана і пагадненне. Двойчы сустракаўся з Гедравічусам. Былі нармальныя стасункі, гаворкі, як зрабіць стужку праўдзівай, вострапубліцыстычнай — на гэтым палягала ідэя.

Што задумвалася зрабіць? Якім бачыўся гэты фільм ад самага пачатку? Найперш праблематычным — філасофія жорсткіх стасункаў, так сказаў бы. Канешне, прыгожым — лірыка, маляўнічасць. Але галоўнае — прасачыць, паказаць шлях Пушчы на мяжы тысячагоддзяў. Да чаго прыйшлі, якая будучыня. У чым сіндром дэградацыі. Чаму бяднее, падае Пушча. І хто ў тым віноўца. Пра ўсё гэта трэба было казаць, падсумоўваць. Бліскучы шанец — сказаць на мове кінапубліцыстыкі. Сцэнарый не абыходзіў вострых вуглоў, прыкладам, лесанарыхтоўкі ў Пушчы, планавае знішчэнне біялагічнай унікальнасці — пытан-

не з пытанняў, быць або не быць... Замест гэтага — вы толькі што бачылі: багацце і веліч, вось гэта флора, а гэта фауна...

Я не мог нават блізка ўявіць, што партнёры здольныя ў любы момант апрануць фартушкі афіцыянтаў і гнутка дэфіляваць перад чыноўнікамі. Вельмі стараліся! Начальнікаў Пушчы мог задаволіць толькі чысты менуэт з калейдаскопам прыгожых кадраў. Добра атрымалася.

Мой сцэнар пачалі правіць, яго пачалі баяцца. У рэшце рэшт я зразумеў, што аб яго выціраюць ногі: уся публіцыстыка злятае, змест бязлітасна выпустошваецца, рэжысэр ад мяне хаваецца. Але я ішоў следам, кантралюючы працэс, дамагаючыся найперш таго, пра што дамаўляліся. Дыстанцыявацца ад мяне было цяжка. Часам у апошнія хвіліны я сядаў здымачнай групе «на хвост» і ехаў разам у Пушчу, патрабаваў прагляду адзнятага матэрыялу. Здзіўляў апаратар Іван, прозвішча не памятаю. Ён, мабыць, не разумеў, што да чаго і таму быў шчыры: «Не надо делать скандальный фильм, — радзіў ён мне. — Свар у нас много. На то и лес, чтобы его рубить. Посадят новый — будет расти».

Я спрабаваў адстаяць свае пазіцыі, думаючы, што роля сцэнарыста яшчэ належыць мне. Аднак яна ўжо належала іншым: прэзідэнцкім спраўнікам, мясцовай адміністрацыі ды дзялкам-рэкламшчыкам, якія перахапілі ініцыятыву, каб рухаць Пушчу ў напрамку турбізнесу. Я ім кажу: у Пушчы шмат пнёў, лесавозаў, асфальтавых дарог, меліярацыйных каналаў. Пушча хворая, трэба збіраць не турыстаў, а лекараў — магчыма, удасца ўратаваць рэшткі. Амаральна сёння глядзець на Пушчу як на залатое дно, заўтра яно можа аказацца пустым, — усё гэта, у рэшце рэшт, закладзена ў сцэнарыі.

Дзе там! Які ўжо тут сцэнарый! Рэжысэр здаўся так, што з яго і валасінка не ўпала. Гэтакі тып людзей. Бог яму суддзя.

Мне ўдвая прыкра, што гэтая афёра Беларускага тэлебачання сумесна з Кіраўніцтвам спраў прэзідэнта аплочана Арганізацыяй аб'яднаных нацый, яе Прадстаўніцтвам у Мінску. Я пра гэта дазнаўся зусім нядаўна, інакш бы спрабаваў уздзейнічаць. Мне шкада гэтых грошай, патрачаных вельмі марна. Няўжо Вы думаеце, шаноўная спадарыня Хостад, што відэакліп, які мы зараз пабачылі, адпавядае сучаснаму стану Белавежскага лесу як сусветнай спадчыны, якім, дарэчы, павінна апекавацца і міжнародная супольнасць? Няўжо такой структуры як ААН патрэбны гэтыя падцэнзурныя ролікі, гэты падлог наменклатурнага ўзору, гэтая ліпа і камбінатарства? Няўжо вы не хацелі б мець па-філасофску ўзнёслы праўдзівы фільм, які б паказваў рэальнае і надзвычай праблематычнае становішча рэзервата ўсясветнага ўзроўню? Што, вам лепш гэтыя схітраваныя сцэнкі з удзелам Аколава і Семакова? Прабачце, я пытаюся ўжо як глядач, як карыстальнік прадукцыі. У тым ліку і Вашай прадукцыі.

Крыўдна за Пушчу. За ўсіх нас, хто тут сабраўся. Гэта ганьба. Мне крыўдна і сорамна.

## «У Пушчу прыйшлі камэрсанты і авантурысты»

ІНТЭРВ'Ю КАРЭСПАНДЭНТУ РАДЫЁ «СВАБОДА» МІХАЛУ СТЭЛЬМАКУ*

5 чэрвеня 1998

В. ДРАНЧУК. Сёньня факт, што запаведная справа ня ў тых руках, у якіх хацелася б нашай грамадзкасці, і ня толькі навуковай ці экалягічнай. Замест багавейлівай прыродалюбнай запаведнасьці на нашых эталонных тэрыторыях запаноўвае гаспадарчая дзей-

* друкуецца на мове этэру

насьць, усталёўваецца жорсткі эксплюатацыйны рэжым.

Калі я прыяжджаю ў Белавескую пушчу, мяне заўсёды зьдзіўляе, што ў самым, лічы, сэрцы гэтай сусьветнай знакамітасьці, у музеі прыроды прадаюцца шкуры зьвяроў, а заадно й чырвонакніжнага зубра. Наагул, няхай сабе прадаюцца, можа, ня самая гэта вялікая загана чалавека перад прыродаю, але ж ня тут, ня ў гэтым мейсцы, ня ў двух мэтрах ад той самай Чырвонай кнігі за музейнай вітрынай. Ідэя беражлівага стаўленьня да жыцьця не запанавала на нашых ахоўных тэрыторыях. Запаведная справа не ў руках навукі, не ў руках прафэсіяналаў, скажам, біёлягаў, энтамолягаў, эколягаў, а ў руках авантурыстаў, камэрсантаў ад хворай палітыкі, камэрсантаў ад прэзідэнцкай улады.

М.СТЭЛЬМАК. *Як піша газета «Белавеская пушча», прамыслова-спажывецкае стаўленьне да ахоўных тэрыторыяў узьведзена ў ранг афіцыйнай палітыкі беларускіх уладаў. Лесанарыхтоўчыя ды лесапаляўнічыя тэндэнцыі паўнапраўна завалодалі станам рэчаў, сталіся характэрнай рысай нацыянальных паркаў. Напрыклад, валютнае паляваньне вельмі звыкла практыкуецца ў Белавескай пушчы, у нацыянальным парку «Прыпяцкі».*

В. Д. Што такое валютнае паляваньне? Калі гэта ў нацыянальным парку, дык мне здаецца, ня толькі валютнае, але наагул паляваньне, страляніна выключаюцца. Сапраўдны паляўнічы нейкай цывілізаванай гільдыі ў Белавескую пушчу страляць не паедзе, я сумняюся, што тут нешта годнае, што гэта, як нам даводзяць, нармальна арганізаваныя паляўнічыя туры з заходніх краінаў. Хутчэй, гэта нейкая дзікая пошасьць, лоўля кашалькоў, крымінальшчына. Прычым, куды ідуць гэтыя грошы? Гэтыя грошы ідуць у ценявы бюджэт. І гэта таксама не сакрэт — пра гэта

кажуць мне добра інфармаваныя людзі, зь якімі я сустракаюся ў Пушчы.

Нацыянальны парк — гэта і пэўныя абмежаваньні для мясцовых жыхароў. І калі пушчанцы, напрыклад, разумеюць гэтую высокую ідэю — ідэю кансервацыі прыроднага стану, гатовыя трымацца асаблівых правілаў, нават прапагандаваць гэтую ідэю і стаяць за яе — дык што разумее ў гэтым улада, якая нахабна карыстае прыродныя багацці, не зважаючы на абмежаваньні, закон, традыцыі? Людзі бачаць, куды, што ды як. Яны з пакаленьня ў пакаленьне глядзелі гэты лес, а цяпер яны тут ніхто — дык што можна думаць? Як самому паспець адарваць кавалак? Чаму б і мне не пайсці ды не пасекчы гэтыя дубы, гэтыя сосны?.. Я дапускаю такія думкі.

М. С. *Ці можаце Вы пасьведчыць адкат сёньняшняй дзяржаўнай палітыкі ў справе аховы навакольнага асяродзьдзя параўнальна з папярэднім пэрыядам айчыннай гісторыі?*

В. Д. Белавеская пушча ператварылася ў нацыянальны парк. Дзяржава падтрымала і паскорыла курс на яе далейшую эксплюатацыю, гаспадарчую дзейнасьць, на здабыцьцё валюты з ахоўнай тэрыторыі. Падтрымаў, у рэшце рэшт, і прэзыдэнт. Навука, пакуль пытаньне ўзгаднялася ў высокіх кабінетах, стаяла на тым, каб у Белавескую пушчу вярнуць ідэю поўнай запаведнасьці. Можа, ня ўся навука, але вядомыя акадэмічныя асобы, экалягічная грамадзкасьць, мас-мэдыі, абапіраючыся на думку прафэсіяналаў, на думку прыхільнікаў сапраўднай прыродалюбнай ідэі, былі ўсе за тое, каб там быў запаведнік, каб там запанаваў высокі дух. На жаль, тое, што сёньня бачым, гэта не запаведнік, гэта і не нацыянальны парк. Гэта фазэнда, дзе гаспадарыць вузкае кола высокапастаўленых чыноўнікаў. І чым далей, тым больш. Мы яшчэ ня раз запэўнімся ў гэтым...

# «Terra vita» або Дзе «той крык, што жыве Беларусь...»?

Газета «Белавежская пушча» 1998

Дагэтуль не магу зразумець: ёсць у краіне Беларусь цэлае прыродаахоўнае ведамства, якое цяпер называецца Міністэрствам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, — з мноствам службаў, штатам чыноўнага люду, з міністрам, у рэшце рэшт, світай ягоных намеснікаў, інстытутамі маніторынгу, якія ўсе разам на правядзенне «зялёнай» ідэі павінны нібыта жыццё класці, — а мы, журналісты, па сутнасці так і не дачакаліся хоць бы адной прэсавай канферэнцыі, дзе на поўны голас загучала б слова праўды і засцярогі з вуснаў гэтага ведамства. На ім, не пабаюся сказаць, ляжыць нерушны знак маўчання.

Па-першае, заўважу, гэта тады, калі ці не «кожная жаба», як жартам сказаў адзін мой калега, сёння руліцца склікаць прэс-канферэнцыю, выказацца. Па-другое, ледзь не штодзень чыняцца злачынствы ў дачыненні прыроды і наваколля, намячаюцца і здзяйсняюцца праекты яе далейшага і глыбейшага адцяснення, а то і спусташэння, у выніку чаго чарговы прыродазнішчальны віток не прымусіць сябе доўга чакаць.

Ніхто, здаецца, не адмяняў і асаблівы статус краіны — зоны экалагічнага нацыянальнага бедства (пасля Чарнобыля); на высокіх прадстаўнічых форумах сёння пачуеш не ў жарт: «экалагічны тупік», «палітыка выжывання», «экалагічная блакада», «стратэгія развіцця»... А што за ўсім гэтым стаіць? І што, урэшце, супрацьстаіць? Інерцыя, імператыў, замірэнне? Ці наступ экалагічнай свядомасці грамадства?

Лічыцца, што галоснаць, увогуле, — гэта права кожнага называць рэчы сваімі імёнамі. Варта, мусіць, дадаць, што не толькі права, калі гаворка датычыць дзяржаўнай установы, але абавязак, службовая фун-

кцыя. Дапускаю: крычаць і званіць у званы, мабыць, належыць журналістам. А займальнікам пасадавых крэслаў — добрасумленна, адкрыта і аб'ектыўна даводзіць да журналістаў інфармацыю пра сапраўдны стан навакольнага асяроддзя, магчымыя і дзейныя шляхі выйсця з крызісу, пры гэтым прапаноўваць грамадству адэкватную сістэму паводзінаў чалавека ў цяперашніх умовах.

Кажуць, наша інфармацыйная прастора пашыраецца. Гэта насамрэч можна бачыць па новых перыядычных выданнях, вектарах публічнасці на радыё і тэлебачанні. Тэматычны спектр таго, што чуем і чытаем, патроху ўзбагачаецца. Аднак відавочна, у ім бракуе «зялёнай» фарбы. Толькі асобныя газеты шануюць экалагічную тэму, большасць звяртаецца да яе, як кажуць, пад настрой. Вельмі горка, што дагэтуль Беларусь не мае паўнавартаснага, добра ілюстраванага папулярнага выдання, якое б на годным узроўні прадстаўляла прыроду Беларусі, акумулявала экалагічную свядомасць і духоўную энергію грамадства. Часопіс «Родная прырода», мала што выданне вузкаведамаснае і, на жаль, гэтай традыцыі моцна трымаецца, — яшчэ і згортвае сваю дзейнасць: з 1993 года перайшоў на шасціразовы гадавы цыкл замест ранейшага штомесячнага. Перастаў рэгулярна выходзіць і экалагічна-сацыяльны тыднёвік «Набат», гады ў рады знаходзіць чытача «Экалогія Мінска», адпаведныя выпускі знялі з праграм радыё і тэлебачанне. Мялеюць, адным словам, ручайкі экалагічнай інфармацыі на Беларусі, тым часам як у свеце адбываецца працэс «пазелянення» інфармацыйнага патоку, паглыблення плыняў экалагічнай галоснасці.

Летась мне давялося наведаць некалькі семінараў розных ініцыятыўных цэнтраў, якія вядуць незалежнае ад дзяржавы даследванне экалагічных праблем. Збіраецца на іх падрыхтаваная, цікавая публіка — бліскучыя аратары, разумныя палітыкі. Але не раз падумаеш: як цесна гэтым размовам у сценах кабіне-

таў! Дый чаго вартыя шляхетныя ў сваёй большасці намаганні, калі яны не маюць шырокага выйсця на грамадства, на людскую думку.

Няхай сабе выпрабаванае чынавенства не любіць «засвечвацца» перад журналістамі; століначальнікі з большай ахвотаю ідуць «на дыван» да вышэйшага (але свайго!) начальства, чым на брыфінгі і канферэнцыі. Затое ад новаўтвораных, недзяржаўных структураў дэмакратычнага выбару, якія абвясцілі сябе ў той ці іншай меры прыродазаступнікамі, грамадства мае ўсе падставы чакаць больш цесных стасункаў з мас-медыямі. Але чаму ў такім выпадку колькасць экалагічных грамадскіх арганізацый (партый, фондаў, саюзаў, асацыяцый) павялічваецца — і дзякуй богу! — а дзіркі экалагічнай галоснасці па-ранейшаму зеўраюць?

Мы ўсе добра памятаем, як тры гады запар штолета гарэлі беларускія лясы, узнімаючы дзе-нідзе хмары радыяцыйнага бруду...

Ведаем, якая няпростая і ў эканамічных, і ў экалагічных адносінах сітуацыя складваецца штогод вясной на Палессі...

Разумеем, які спектр актуальных пытанняў, у тым ліку звязаных з навакольным асяроддзем, выклікае стан энергетыкі і разам з ім ідэя будаўніцтва на Беларусі атамных электрастанцый...

Збольшага чулі, што падпісана альбо ратыфікавана тая ці іншая міжнародная прыродаашчаджальная канвенцыя, тым самым Беларусь усклала на сябе дадатковыя абавязанні і вялікую адказнасць...

Былі буйныя аварыі ў басейнах рэк, у Наваполацку, не аднойчы згушчаліся чуткі вакол прыгранічнай Ігналінскай АЭС...

Прыходзіў і адыходзіў «месячнік цішыні» — май, чэрвень — надзвычай важны перыяд у жыцці жывой прыроды...

На працягу года здараліся кліматычныя анамаліі, якія датычылі экалагічнай бяспекі людзей...

Час ад часу інфармацыйныя пласты іскрылі фактамі ўвозу на тэрыторыю Беларусі чужых радыеактыўных адходаў...

Хваля браканьерства захліствае наш лясны ды азёрны край. Гінуць каштоўныя віды дзікіх жывёл і птушак...

Штогод размяркоўваецца пазабюджэтны экалагічны фонд — фонд экалагічнай бяспекі і прыродаахоўнай дзейнасці...

Пералік актуаліяў можна доўжыць і доўжыць. Усе яны — своеасаблівыя тэсты на галоснасць, на адкрыты дыялог перш-наперш афіцыйных службаў з грамадскай думкай, на тое самае права называць рэчы сваімі імёнамі. Усе гэтыя актуаліі чакалі мноства пытанняў і адказаў, неабходных каментароў, засцярог, журналісцкіх даследванняў. І, аднак, усе яны, ціха, калі не сказаць абыякава, праігнараваны інстытутам дзяржаўнай прапаганды. «Дыпламаты» ад выпешчанай айчыннай бюракратыі рабілі дакладны разлік: лепш перасядзець у сваіх утульных міністэрскіх гнёздах — і ўсё абыдзецца ціха.

Тым часам, па маіх назіраннях, адзін раз на тыдзень можна сабраць прыстойную журналісцкую аўдыторыю, каб даводзіць да насельніцтва надзённую інфармацыю. Да гэтага ёсць не толькі свежыя, аператыўныя падставы. Ёсць і людзі, чыя грамадзянская пазіцыя, дасведчанасць вартыя ўвагі журналістаў і шырокай грамадскасці.

Вядома ж, выдатным тэстам і на ўспрымальнасць самой зялёнай ідэі, і на «пад'ём», і на галоснасць канцэптульных акцэнтаў сталася абвяшчэнне Саветам Еўропы 1995 года Еўрапейскім годам аховы прыроды (прычым, папярэдні 1994 год быў падрыхтоўчым і не менш адказным). Чарговы тэст засведчыў поўную няздольнасць урадавай структуры з годнасцю паварочвацца да адказнай еўрапейскай акцыі. Перш-наперш, не ставала, ды і цяпер не стае інфармацыі.

Брыфінгі і прэс-канферэнцыі, як няцяжка здагадацца, ладзілі іншыя зацікаўленыя і, зразумела, з іншай нагоды. У Мінпрыродзе, праўда, склалі «план першачарговых мер», — аднак, па-першае, ён не быў прадстаўлены журналістам, а значыць, грамадству. Пра яго ўвогуле мала хто ведаў і ведае сёння. Па-другое, мне асабіста ён дужа нагадаў план піянерскай дружыны «лепшых часоў». Самы вялікі недахоп гэтай, з дазволу сказаць, праграмы, у тым, што ён зусім не вяжацца з трапяткою і надзвычай канкрэтнай мэтай — аховай прыроды па-за межамі ахоўных тэрыторый, гэта значыць там, дзе прырода ў непасрэдным суседстве з чалавекам, унутры заселеных тэрыторый. Гэтая ідэя — гармоніі чалавека з жывой прыродай — згубілася за тоўшчай бяздумна нагрувашчаных агульных «мерапрыемстваў».

Вярнуся да прэсавых канферэнцый зялёнага кшталту, іх вострай неабходнасці ў сённяшнім жыцці грамадства. У сваёй кнізе «Зямля ў небяспецы» віцэ-прэзідэнт ЗША Альберт Гор з крыўдаю ўспамінае, як ягоныя шчырыя экалагічныя прапаведзі, што нагадвалі крык Касандры, нярэдка танулі ў ватным раўнадушшы мас-медыяў і журналістаў. Мяркую, што ў нейкай меры гэта ўжо ўласціва і нам. Аднак і падставаў разлічваць на разуменне з боку нашых нацыянальных крыніц масавай інфармацыі — больш чым дастаткова. Толькі не трэба так бязмерна эксплуатаваць іхні энтузіязм, адгароджваючыся бюракратычнай сцяной свайго раўнадушша. Запачаткаваць цывілізаваныя зносіны з прэсай, напоўніць іх сацыяльна-экалагічным зместам — гэты пункт я і прапаную Мінпрыродзе ды іншым зацікаўленым у план Еўрапейскага года аховы прыроды на Беларусі.

Памятаеце, вядомае Купалава: «...гэта крык, што жыве Беларусь», якое воляй песняра сімвалізуе найперш жывую прыроду Бацькаўшчыны, яе голас, яе «terra vita»? Так, жыве Беларусь, пакуль жывуць

кулікі на яе балотах, пакуль жаўранак чуцён над полем, пакуль абуджаецца ўвесну сон-трава, пакуль ходзіць па нашай зямлі белавежскі зубр...

### P.S. МІНІСТРУ ПРЫРОДНЫХ РЭСУРСАЎ І АХОВЫ НАВАКОЛЬНАГА АСЯРОДДЗЯ РУСАМУ М. І.

Маю гонар звярнуць Вашу ўвагу на тое, што гэтаму артыкулу роўна тры гады. Я вельмі хачу, каб Вы яго ўважліва прачыталі. Спадзяюся, бываючы на сусветных экалагічных самітах, Вы цудоўна ўразумелі, наколькі востра сёння стаіць у свеце пытанне аб давядзенні экалагічнай інфармацыі да шырокіх слаёў насельніцтва. Аднак падпісваць Канвенцыі — гэта адно, зусім іншае — выконваць іх «літару» ў сябе дома. Я не буду збівацца на пафас артыкула, толькі зазначу: ведамства, якое Вы ўзначальваеце, мае ўстойлівую традыцыю замоўчвання вострых экалагічных праблем. Скажу шчыра: пакуль управай інфармацыі будуць кіраваць «праверанfestа кадры», да таго часу Ваша міністэрства будзе мёртвым. Мне — каб гэта сказаць — дастаткова шматгадовых назіранняў і журналісцкага досведу. Вам — каб не палічыць надта дзёрзкай маю выснову — дастаткова прачытаць гэты артыкул. Быў ён, дарэчы, напісаны на пачатку Еўрапейскага года аховы прыроды (люты, 1995), а надрукавала яго газета творчай інтэлігенцыі «Літаратура і мастацтва» пасля таго як «Звязда» і «Народная газета» друкаваць адмовіліся. А згадаў я гэты артыкул з нагоды, як мне падаецца, надзвычай важнай: Арганізацыя Аб'яднаных Нацый рыхтуецца прыняць Канвенцыю на пашырэнне экалагічнай інфармацыі і ўдзел грамадскасці ў прыняцці рашэнняў, якія датычаць аховы навакольнага асяроддзя. Так што гаворка па тэме. Каб што-небудзь змянілася, застаецца падпісаць яшчэ адну Канвенцыю?

# Рахункі ўладнага прагматызму: не даць, а ўзяць!

ГУТАРКА З ГАЛОЎНЫМ СПЕЦЫЯЛІСТАМ МІНІСТЭРСТВА ПРЫРОДНЫХ РЭСУРСАЎ І АХОВЫ НАВАКОЛЬНАГА АСЯРОДДЗЯ З. Ф. МУРАЎЁВЫМ

Газета «Белавежская пушча» 1998

В. ДРАНЧУК. *Здзіслаў Феліксавіч, шчыра кажучы, у мяне апошні час усё больш абвастраецца супярэчлівае пачуццё, з якім успрымаю сённяшнія гаворкі пра экалагічны, рэкрэацыйны ды прыродапазнавальны турызм. Як быццам абмяркоўваем сапраўды экалагічныя аспекты, а на справе бачым, што ў вузкай групы людзей інтарэс зусім іншы — як мага скарыстацца нашымі прыроднымі багаццямі дзеля так званага «акумулявання валютных паступленняў»...*

*Чый тут інтарэс, нам не трэба здагадвацца. Не хочацца паўтараць адно і тое ж імя, якое зрабілася ледзь не сінонімам грубага ўладнага прагматызму: узяць! Пад «навукова-абгрунтаваную» тэорыю сумяшчэння рэкрэацыі з аховай прыроды чыніцца сумнавядомае гаспадарчае асваенне (а часам і прыўлашчванне) ціхіх куткоў Беларусі. Ведаю, што Вы заўсёды выкрывалі такі падыход, лічылі яго заганным і небяспечным для справы захавання нацыянальнай спадчыны.*

*Якія ў Вас аргументы на сённяшні дзень?*

ЗДЗІСЛАЎ МУРАЎЁЎ. Найперш, я падзяляю Вашу трывогу і клопат. Рэкрэацыйна-турыстычнае асваенне найбольш заўзята і спешна ідзе на прыродных тэрыторыях, якія маюць асабліва ахоўны статус, — у нацыянальных парках і ў Бярэзінскім біясферным запаведніку. Такая тэндэнцыя і такі курс. Становішча надзвычай насцярожвае.

Каштоўных эталонных тэрыторый у нас ані не багата — усяго 6,9 працэнта. Прычым, пераважную долю складаюць заказнікі — 5,4 працэнта, дзе рэжым аховы вельмі адносны. Што ж застаецца на нацыя-

нальныя паркі і адзіны запаведнік? Кволая доля: адпаведна 1,1 ды 0,4 працэнта. Таму ацэньваць прыродаахоўную значнасць гэтых тэрыторый, іхні, так бы мовіць, уклад у захаванне біялагічнай разнастайнасці трэба вельмі асцярожна і стрымана. Не кідацца ў ілюзіі і не махляваць. Бо адказнасць надзвычай вялікая. Мы не такія багатыя, каб ураз, без аглядкі разменьваць нашы каштоўнасці, выціраць аб іх ногі. А рухлівыя дбаўцы на ніве «акумулявання валюты» якраз на каштоўнасці стаўку і робяць.

В. Д. *Шукаюць найкарацейшыя ды найлягчэйшыя шляхі?*

З. М. Ідуць на ўсё гатовае. Дзе ў нас ёсць большменш напрацаваны сэрвіс, традыцыі, кадры? Вядома ж, гэта нацыянальныя паркі. Такі курс, па-першае, вельмі шкодны для найбольш каштоўных прыродных тэрыторый. Па-другое, ён ніяк не апраўданы з гледзішча перспектывы: замаруджваецца рацыянальнае выкарыстанне звычайных прыродных тэрыторый, якія маюць вялікі рэкрэацыйны патэнцыял. У выніку не развіваюцца цэлыя рэгіёны, скажу нават больш, яны занепадаюць. Стрымліваецца развіццё самой рэкрэацыі і турызму.

В. Д. *Менавіта ў гэтым напрамку не зацікаўленая ўлада. А ўлада — гэта досыць вузкае кола людзей, якія, да ўсяго, не абцяжараныя гуманістычным светабачаннем. Вось факт. Дарога, якую нядаўна праклала адміністрацыя на гару Маяк, што ў Браслаўскім нацыянальным парку, і якую тут жа празвалі «тунэлем Ціцянкова», — бадай, самы буйны адлік на рахунках самаўладнага і супрацьзаконнага панавання на эталонных землях Беларусі. Пра гэта газета пісала ў мінулым нумары. На гару Маяк цяпер можна прымчацца з ветрыкам... Хіба не абраза, не выклік пешым турыстам, якія мелі асалоду менавіта з той, адвечнай дарогі? Дый усім нам, бо цынічна папіхаецца Закон аб ахоўных прыродных тэрыторыях, воля*

*той часткі насельніцтва, якая дарогу на Маяк мела за вартасць.*

*Яшчэ прыклад. На тэрыторыі Міжазёрнага заказніка, дзе вёска Будзілы, на беразе возера Снуды стаіць сярод лесу хаціна на па́лях. Лічы, самае сэрца нацыянальнага парку, а тут — раптам — паляўнічая вышка. Як доказ — свежанакіданая прынада... Пад чыю кулю ідзе прынаджаны звер, гадаць не трэба. Так цяпер здабываецца валюта.*

з. м. Прыклады тыповыя. Яны яскрава пацвярджаюць выснову, што жаданне сумясціць ахову прыроды і рэкрэацыю амаль заўсёды выходзіць на карысць рэкрэацыі, на карысць гаспадарчага выкарыстання каштоўных рэсурсаў...

в. д. *Горш, Здзіслаў Феліксавіч! У тым жа Браслаўскім парку ахова прыроды па вялікім рахунку яшчэ й не пачалася, а гаспадарчае асваенне ідзе поўным ходам.*

з. м. Бо вынікі такога гаспадарання адчувальныя, адно-два паляванні даюць салідны валютны прыбытак. Адразу відаць, чым трэба займацца.

Вы заўважалі такую рэч? Лічбы, якія характарызуюць прыбытковасць рэкрэацыйнага выкарыстання, сустракаеш надзіва часта. Напрыклад, я не раз чуў і чытаў, што ў ЗША прыбытак на 1 долар, пакладзены на ўтрыманне нацыянальных паркаў, складае 10-15, а часам сягае 40 і больш «зялёных». А вось разлікі, якія паказваюць іншы бок, — на колькі пры гэтым збяднелі ці ўвогуле заняпалі прыродныя экасістэмы, чаму прырода страціла сваю прывабнасць, — свядома прыхоўваюцца. Зрэдку што-небудзь праскочыць. Хоць спецыялісты-эколагі апошні час не застаюцца ўбаку, выказваюць занепакоенасць і трывогу. І ўжо ёсць зрухі. Шматлікія краіны робяць захады, каб паменшыць колькасць наведнікаў у нацыянальныя паркі: у Англіі — праз стварэнне мясцовых паркаў, у Польшчы — шляхам развіцця пазнавальнага і краязнаўчага турызму. Або, як у іншых

краінах, праз высокую плату за наведванне ціхіх куткоў.

Што да Беларусі, на вялікі жаль, на нашу глебу пераносіцца толькі першая частка багатага замежнага досведу, — тая, якая сведчыць пра высокія прыбыткі нацыянальных паркаў. Таму не выпадкова, што сёння, як Вы кажаце, такая гамана вакол нашых нацыянальных паркаў «Белавежская пушча», «Браслаўскія азёры», «Прыпяцкі» і адзінага Бярэзінскага запаведніка.

Можна сказаць, мы робім прыкладна тое, што іншыя краіны, не маючы ні свайго, ні чужога досведу, рабілі 50 ці 100 гадоў таму. Магу смела сцвярджаць: пры сённяшніх падыходах мы ў хуткім часе не пазнаем нацыянальных паркаў, як не пазнаём сёння, скажам, Нямігу ў гістарычным цэнтры Мінска. Яны зыначацца ў добра асвоеныя, вытаптаныя, з'езджаныя заняпалыя экасістэмы, там немінуча паўстануць экалагічныя праблемы, што і здарылася ў іншых краінах нашмат раней.

В. Д. *Тое, пра што Вы кажаце, амерыканец Олда Леапольд паўстагоддзя таму назваў працэсам зніжэння вартасці нечапаных тэрыторый.*

З. М. Зрэшты, вазьміце і такі трывожны факт. Ніводны нацыянальны парк Беларусі дагэтуль не мае праекта арганізацыі і функцыянавання. Некаму ж гэта на руку...

В. Д. *Гэтая рука ловіць рыбку... Пераймае валюту ў замежніка, які едзе да нас па трафеі са стрэльбай. Хоць вынішчальныя дзеянні ў нацыянальных парках, згодна з планам дзеянняў, прапанаваным адпаведнай камісіяй Рады Еўропы, не дапускаюцца...*

З. М. ...але толькі не ў нас! Вазьміце памеры і рэжым запаведных зон, дзе павінна захоўвацца абсалютная нерушнасць і панаваць хоць бы адносная цішыня. Зноў жа, ўсё ставіцца на карысць гаспадарання, гэтыя зоны не з«яўляюцца дамінантай на тэрыторыі

паркаў і маюць за сабой толькі частку ці нават часцінку той або іншай ахоўнай плошчы. Напрыклад, запаведная зона нацыянальнага парка «Белавежская пушча» налічвае 18,5 працэнта агульнай тэрыторыі, у «Браслаўскіх азёрах» — 3,7, у «Прыпяцкім» — 47,1. Вось паказальны прыклад таго, як мы збіраемся ахоўваць прыроду там, дзе сам Бог наказаў гэта рабіць.

І ўжо зусім трэба страціць пачуццё меры, каб запаведную зону пераносіць з аднаго месца на другое. Спачатку спустошыць, уволю пакарыстаўшыся, а затым запаведаць.

В. Д. *Гісторыя Белавежскай пушчы, дарэчы, выглядае ў гэтым сэнсе найбольш паказальна: былыя абсалютна запаведныя зоны перайшлі ў разрад звычайных, лесапрамысловых, а маладаступныя балоцістыя дзялянкі, куды не здолеў прадзерціся трактар, дзе пераважна малатаварны лес ды чорнаальшанік, — запаведаныя. Як кажуць, на табе, Божа, што мне нягожа.*

З. М. Спашлюся на досвед Нямеччыны. У Нацыянальным парку «Баварскі лес» з 13,3 тысячаў гектараў усёй плошчы 10 тысячаў з'яўляюцца абсалютна запаведнымі, дзе забаронена паляваць, браць драўніну, нават збіраць грыбы і ягады. Дзікая прырода абыходзіцца тут без якога-кольвек гаспадарчага догляду з боку чалавека. На такія ўзоры і трэба раўняцца.

Вядома ж, я не заклікаю адным разамператварыць нацыянальныя паркі ў запаведнікі, але памеры «ядра» павінны быць не сімвалічнымі, як цяпер, а панаваць па-над усім — працаваць на захаванне найбольш каштоўных экасістэмаў у запаведаным стане.

Трэба, каб адвечная частка нацыянальнага парка «Белавежская пушча» была адноўлена ў статусе запаведніка, як гэта было да 1957 года. Не разменная, а сталая запаведная зона — ядро — паказнік вызначальны, з яго відаць, якія інтарэсы будуць дамінаваць у нацыянальных парках і з якой нагоды іх будзем адстойваць.

Хачу яшчэ раз выказаць сваё, асаблівае меркаванне пра недапушчальнасць развіцця турызму ў запаведных мясцінах. Прычым, усякага турызму — і краязнаўчага, і так званага экалагічнага, якім зазвычай спрабуюць апраўдаць асваенне запаведных тэрыторый.

На Беларусі шмат іншых прывабных і не дабітых гаспадаркаю прыродных куткоў. Шмат якім, дарэчы, нададзены статус заказнікаў. У большасці з іх дазволены турызм і рэкрэацыя. Вось там і трэба спрабаваць спалучаць ахову прыроды з адпачынкам людзей сярод цішыні і прыроднага хараства. Іншая справа, што да гэтага трэба прыкласці галаву, энтузіязм, здольнасці, прыахвоціць грамадскія сілы і зрабіць так, каб рэкрэацыйная дзейнасць на той ці іншай тэрыторыі стала выгаднай мясцовым жыхарам і была на карысць прыродзе. Магчыма, тут трэба вынайсці нешта сваё, адметнае.

В. Д. *Ведаю, Здзіслаў Феліксавіч, што Вы ў свой час штурмавалі Эльбрус, калі там не было яшчэ канатнай дарогі, адольвалі Каўказскі хрыбет. Гэта быў экатурызм ці спартыўны імпэт?*

З. М. Такога паняцця як экалагічны турызм тады яшчэ не было ў нашым лексіконе. А на справе мы выпрабоўвалі моц, адпачывалі і набіраліся ўражанняў ад прыроды.

В. Д. *А якую кропку на карце Беларусі Вы маеце за найдаражэйшую? Апроч родных мясцін, вядома... І што пажадалі б сённяшнім і заўтрашнім аматарам прыродапазнавальнага турызму?*

З. М. З найдаражэйшых — Белавежская пушча... А пажадаць хацеў бы незабыўных і светлых уражанняў ад сустрэч з беларускай прыродай. Дзеля гэтага не абавязкова ісці ў запаведную глуш; лепш абмінуць унікальныя прыродныя комплексы, ведаючы і ўсведамляючы іх асаблівую значнасць. Ці варта таптацца?.. Пра іх можна і прачытаць, паглядзець кінастужку, дыяпазітывы.

Беларусь вялікая! Ёсць багата іншых мясцін. Велічна цудоўная пойма ракі Віліі, чароўныя пейзажы Паазер'я, найадметныя разлегласці Прыпяці... Адкрыць менавіта там сваю экзотыку, сваю цішыню, сваю сцежку часам гэтак жа хвалююча і радасна, як пабываць у запаведным асяродку нацыянальнага парку. Гэтага і жадаю.

## Беларусь-адыёзус, ці Беларусь — краіна зялёных каштоўнасцяў?

СЛОВА РЭДАКТАРА

Газета «Белавежская пушча» 1998

Пра Беларусь у свеце ведалі мала. Прыязджалі і здзіўляліся: «Дык вы ж ёсць! А мы не ведалі». Маўляў, тут у вас і гарады, і народ, і дзікая прырода... Сціплыя вы, беларусы.

Цяпер ведаюць куды больш. Але не пра нашыя гарады, не пра нашую нацыянальную спадчыну, не пра нашыя біясферныя каштоўнасці. Краіна за апошнія гады прыдбала славу, якая нікому й не снілася. Адным словам, Беларусь — адыёзус.

Крыўдна? Вельмі. І вельмі балюча.

Я пра гэта кажу з той нагоды, што цяперашняя ўлада спрабуе завабіць на наша айчыннае ўлонне замежных турыстаў. З'ява цікавая, ці не праўда? Цікавая тым, *хто* паедзе і *што гэта* будзе за турызм? Напраўду, з'ява. З'явішча.

Мой нядаўні суразмоўца, прафесар, якому я распавёў пра валютныя паляванні на запаведных тэрыторыях, з'едліва заўважыў па-руску: «Дичь идет на дичь». Сумны экспромт, адказаў я. «Трагедыя», — прызнаўся ён.

Няма сакрэту ў тым, што сёння шматлікія турысты староняцца наведваць нашу краіну. Раней, дарэ-

чы, заўсёды знаходзілася прычына, чаму не едуць. Маўляў, няма адпаведнага сэрвісу.

А ці ёсць адпаведны, кажучы моваю дыпламатаў, *ідэнтытэт*? Тое, па чым пазнаецца краіна, яе візітная картка, нейкая асаблівая памятка?

На жаль. Хіба маглі што добрае дадаць да ўяўленняў пра Беларусь як новую дзяржаву — гучныя непаразуменні ў Драздах, іншыя скандальныя гісторыі, выказванні, сведчанні?

Гэта значыць, чалавек, які чытае прэсу, слухае навіны або сядзіць у інтэрнэце, можа згадаць пра Беларусь як пра адыёзную, нявартую кропку на карце.

Неяк, спрабуючы пахіліць грамадства да рарытэтаў — прыродных каштоўнасцяў, наша газета пісала: «*...варта ўсім нам падумаць ды так абзадачыць, каб шырокі свет ідэнтыфікаваў Беларусь не з рогам раз'яранай злыгі, а з прыгожай рагатаю галавою белавежскага зубра ў квяцістым вянку першароднае флоры*».

Мы не былі наіўныя, калі гэта пісалі. Пакуль ёсць грамадства, народ, Белавежская пушча — жыве Беларусь.

## Спраўнікі па «бревну»

Газета «Белавежская пушча» 1998

У сакавіку гэтага года газета «Белавежская пушча» зрабіла запыт (паводле шэрагу канвенцый, якія падпісала наша краіна, такі ж запыт мае права падаць любы грамадзянін Беларусі) на імя Аляксандра Лучкова, начальніка ўправы ахоўных прыродных тэрыторый і лесапаляўнічых гаспадарак Кіраўніцтва спраў прэзідэнта з тым, каб атрымаць праўдзівую інфармацыю адносна размяшчэння на тэрыторыі нацыянальнага парка «Прыпяцкі» аб'ектаў вытворчасці.

Рэч у тым, што апошнім часам грамадскасць насцярожана сочыць за разгортваннем «лесапаляўні-

чай» гаспадарчай дзейнасці там, дзе прырода павінна перш-наперш ахоўвацца, дзе больш дарэчы багавейліва-пашанотнае стаўленне да яе, чым прамыслова-спажывецкае. Рэдакцыя запыталася ў А. Лучкова, якія вытворчыя аб'екты размешчаны на тэрыторыі НП «Прыпяцкі» або ў яго прылеглых частках, а таксама прасіла пазначыць іхнія сыравінныя крыніцы (прыкладам, для вырабу паркету).

Адказу ад кіраўніка ўправы рэдакцыя не атрымала. А. Лучкоў даручыў гэта зрабіць генеральнаму дырэктару нацыянальнага парка «Прыпяцкі» Мікалаю Бамбізе. Той і падпісаў ліст, адрасуючы яго А. Лучкову. З ліста даведваемся, што рыхтаваў адказ намеснік дырэктара па навуцы Анатоль Углянец. Такім чынам, начальнік-біёлаг А. Лучкоў не адказаў рэдакцыі на запыт і не паставіў свой подпіс пад інфармацыяй падначаленых — знаёмая бюракратычная хітрыка, з дапамогай якой высокапастаўленыя службоўцы пазбягаюць публічнасці і здымаюць з сябе ношу адказнасці.

Чытаем ліст: «... *паведамляем, што на тэрыторыі парка дрэваапрацоўчых цэхаў няма. Сучасны дрэваапрацоўчы цэх уведзены ў эксплуатацыю ў IV квартале 1997 года ў эксперыментальнай лесапаляўнічай гаспадарцы «Ляскавічы», якая размешчана больш на поўнач Нацыянальнага парка, аб чым шырока паведамлялася ў прэсе.*

*Сыравіннымі крыніцамі гэтай вытворчасці з'яўляюцца: 1) лясны фонд эксперыментальнай лесапаляўнічай гаспадаркі «Ляскавічы» — спецыяльнага структурнага падраздзялення выключна вытворчага накірунку; яно створана на плошчах, якія ніколі не ўваходзілі ў склад асабліва ахоўных тэрыторый, дзеля таго, каб зняць вытворчы прэс з запаведных экасістэмаў; 2) лясны фонд прылеглых лясгасаў*».

Гэты ліст рэдакцыя пакуль што пакідае без уласнага каментарыя. Хоць варта заўважыць, што адказам М. Бамбізы — А. Углянца кіраўнік управы, як вынікае з ліста, не проста «задавальняе» запыт

рэдакцыі, а «спрыяе» больш поўнай і дакладнай інфармаванасці газеты адносна вострай прыродаахоўнай праблемы, аб чым прасіла рэдакцыя.

Праблеме «пралівання святла» на сітуацыю ў «Прыпяцкім» у пэўнай меры дапамагла публікацыя ў газеце «Запавеснік» (Расійская Федэрацыя) пад красамоўнай назвай «Кашмар над Прыпяццю» (№2, 1998). Дазволім колькі цытатаў, якія істотна дапаўняюць інфармацыю, атрыманую са стала прэзідэнцкага спраўніка.

«*З утварэннем эксперыментальнай лесапаляўнічай гаспадаркі з'явілася зручная шырма для прыкрыцця непарадкаў, што чыняцца на запаведнай тэрыторыі. Дарэчы, гаспадарчая дзейнасць не абмяжоўваецца толькі нарыхтоўкай і перапрацоўкай лесу. Так званыя падсобныя гаспадаркі па сваіх маштабах даўно перараслі сам запаведнік. «Прыпяцкі» сёння — гэта не толькі карыстаныя лясныя надзелы, гэта магазіны і бары, гэта дрэваапрацоўчыя цэхі, вялізныя гаражы і шматсільны парк аўтамабільнай тэхнікі, гэта мясаперапрацоўчы і хлебны мінізаводы, гэта птушкаферма, гэта цэлы калгас і шмат чаго яшчэ. Пытанне толькі ў тым, чаму заробкі супрацоўнікаў запаведніка неадпаведна нізкія? Чаму не закончана будаўніцтва экспазіцыі Музея прыроды? Чаму не арганізавана прыродаахоўная асветніцкая работа сярод насельніцтва?*»

«*У 1997 годзе распачалі будаўніцтва буйнога дрэваапрацоўчага цэха, дзе паставілі абсталяванне італьянскай фірмы «А.Коста». Плануецца, што імпартная лесапілка зможа перапрацаваць да 50 тыс. кубаметраў драўніны ў год. На чарзе і паркетная лінія (за мяжой ведаюць кошт беларускага поймавага дуба). Праектная магутнасць абсталявання разлічана на штомесячны (!) выпуск 1400 кубаметраў паркетнага рэзіва, 500 — падлогавай дошкі, 200 — вагонкі і 600 кубаметраў альховай дошкі*».

*«Паводле паведамленняў у афіцыйным друку, ачольнік Кіраўніцтва спраў прэзідэнта І.І.Ціцянкоў і ягоны калега — дырэктар НП «Прыпяцкі» плануюць цалкам высекчы і зноў засадзіць лясны абшар Прыпяцкага запаведніка. Чым не мічурыншчына? Новыя «мічурынцы», праўда, (...) маўчаць пра тое, што галоўнае адрозненне запаведніка ад лясгаса ў тым, што там забаронена гаспадарчая дзейнасць, што запаведны лес тым і каштоўны, што ў ім няма ані высечак, ані ўзнаўляльных пасадак, інакш — гэта ўжо не запаведнік і нават не нацыянальны парк, а банальны лясгас».*

Чытач цяпер можа параўнаць і зрабіць выбар на карысць ісціны. «Незалежны эколаг М. Козел» (аўтарскі подпіс пад артыкулам «Кашмар над Прыпяццю») жыве ў «Прыпяцкім» і выбар, як бачым, зрабіў. Ён ударыў у набат, каб пра сённяшнія тэндэнцыі экаапаведнай палітыкі ў Беларусі ведалі як мага больш людзей. Калі гэты набат не пачуе шырокая грамадскасць, экспансія «лесапаляўнічага гаспадарання» можа ўходаць тую дарагую спадчыну, якую цанілі і шанавалі з веку ў век, а сённяшнія спраўнікі элементарна і цынічна прададуць яе разам з усёй дзяржавай. Гаворка тымчасам ідзе пра зберажэнне апошняга — таму і запаведнага, так званага «асабліва ахоўнага». І, зразумела, не толькі ў былым Прыпяцкім ландшафтна-гідралагічным запаведніку, але і ў Белавежскай пушчы, і ў Бярэзінскім біясферным запаведніку — усюды, дзе ёсць «бревно», кажучы жаргонам мацёрых гаспадарнікаў.

Свой подпіс пад адказам у рэдакцыю колішні акадэмічны вучоны Аляксандр Іванавіч Лучкоў не паставіў. Папросту схаваўся за прозвішча «галавы навукі» Прыпяцкага запаведніка. Зразумець апошняга неяк можна...

Цяжка зразумець дзяржаўных мужоў ад экалогіі ў высокіх, адказных крэслах, у тым ліку Міністэрства прыродных рэсурсаў ці тую ж навуку ў сталічных

кабінетах. Лесапаляўнічыя прагнасці ўладнай вярхушкі наўзвоч, у твар ляціць выклік за выклікам, а яны робяць выгляд, што гэта іх не датычыць. Датычыць. Напрыклад, добра вядома, што там, дзе спраўнікі прэзідэнта збіраюцца браць «бревно», планавалася размяшчаць заказнікі, каб гэтым пастрымаць празмерны ціск на запаведнік, стварыць вакол яго сапраўды прыродапашанотны рэжым, а не выкалочваць адсюль прыбыткі, ствараючы прамзону.

Але мужы маўчаць, даказваючы грамадству, што яны, у адрозненне ад «незалежнага эколага», не здольныя абараняць Бацькаўшчыну. Больш за тое — яны свядома, часам нават зацята-раз'юшана аддаляюць перспектыву цывілізаванага стаўлення дзяржавы да запаведнай спадчыны ў краіне.

## Еўрапейская прэмія Генры Форда «За захаванне культурнай спадчыны і навакольнага асяроддзя»

ЛІСТ НІЛУ КЭМПБЕЛУ І ДЗМІТРУ МОКШЫНУ («ФОРД ЮНІЁН», ПАСЁЛАК АБЧАК МІНСКАГА РАЁНА)

9 красавіка 1999

Паважаныя Ніл Кэмпбел і Дзмітры Мокшын!

Я вельмі ўзрушаны, бо маю ад Вас добрую вестку пра перамогу ў конкурсе «Еўрапейскія прэміі Генры Форда за захаванне культурнай спадчыны і навакольнага асяроддзя». Прымаючы Вашыя віншаванні, хачу выказаць шчырую ўдзячнасць за магчымасць адкрытага ўдзелу ў конкурсе і высокую адзнаку маёй працы. Расцэньваю гэты поспех як сведчанне нашых агульных памкненняў і яднання волі ў справе абароны біясферных каштоўнасцяў і культурна-біялагічнай спадчыны чалавецтва.

Рады заабавязацца як мага шырэй распаўсюджваць

ідэі конкурсу, прапагандаваць яго лепшыя праекты на старонках «Белавежскай пушчы».

Дазвольце таксама павіншаваць Вас з Велікоднымі Святамі, якія набліжаюцца паводле календара праваслаўнай канфесіі.

## СЛОВА НА ЦЫРЫМОНІІ ЎРУЧЭННЯ ПРЭМІІ ГЕНРЫ ФОРДА «ЗА ЗАХАВАННЕ КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ І НАВАКОЛЬНАГА АСЯРОДДЗЯ» (БЯРЭЗІНСКІ БІЯСФЕРНЫ ЗАПАВЕДНІК, ВЁСКА ДОМЖАРЫЦЫ)

14 красавіка 1999

Паважаны спадар Ніл Кэмпбел! Дарагія прысутныя! Сябры і калегі!

Мае пачуцці, мая радасць і мая ўзрушанасць зараз вельмі ўсім зразумелыя. Успамінаючы Багдановіча, «я не самотны...». Напэўна, штосьці блізкае зведаў я і тады, калі ў жніўні 1995 года выпусціў першы нумар газеты. Дапамог амерыканскі фонд, якому я ўдзячны. Затым знайшліся людзі, якія працавалі ў Беларускім фондзе Сораса і таксама з разуменнем паставіліся да маёй ініцыятывы. Я выйграў чарговы конкурс і атрымаў неабходную тэхніку, каб працягваць справу.

Сёння я вельмі ўдзячны найперш заснавальнікам гэтай прэміі і гэтай намінацыі. Я ўдзячны Вам, спадар Кэмпбел, што працэдура конкурсу разгорнутая ў Беларусі і конкурс мае ўжо трох лаўрэатаў. Я ўдзячны журы і асабіста каардынатару спадару Мокшыну, якія вылучылі мой праект.

Час, які я прысвяціў газеце, быў надзвычай цяжкі. Мушу ў гэтым шчыра прызнацца.

Але сёння я назваў бы гэты час і спрыяльным, у пэўным сэнсе нават шчаслівым, бо з цяжкага становішча я неяк выбраўся і ў рэшце рэшт мая праца адзначана ўвагай.

Мне ўдвая прыемна, што мае калегі прысутнічаюць менавіта на гэтай імпрэзе, што іхняя ўвага скіра-

вана не толькі на экалагічны праект, але і на праект *выдавецкі*. Я хацеў бы пажадаць удачы кожнаму з маіх калег-журналістаў.

Асаблівасць майго праекта, мабыць, у тым, што ён мае танны бюджэт, у ім адсутнічае штат, фонд зарплаты, а выдаткі зменшаны да магчымага мінімуму.

Мне прыемна, што мая спроба мае пэўны, хай сабе сціплы вынік — 16 нумароў, 256 старонак. Зразумейце правільна, я не супраць патроіць перыядычнасць, або падвоіць наклад, але гэта ўжо іншы размах і, адпаведна, іншы бюджэт.

Газета мусіць заставацца незалежнай, што асабліва важна для яе накірунку. Аднак і ў гэтых варунках я працягваю шукаць магчымасць, каб зрабіць газету штомесячнай і павялічыць аб'ём выпускаў да 24 старонак.

Я хацеў бы сёння асабліва падкрэсліць выключную ролю спаборнасці сярод праграм і праектаў, якія датычаць навакольнага асяроддзя. У Беларусі, на жаль, пакуль цалкам адсутнічае механізм адсочвання й стымулявання ўсяго лепшага і наватарскага, што магло б спрыяць развіццю зялёнай ідэі, хоць на гэта ў нашай дзяржавы ёсць і адпаведныя сродкі, і ўсе магчымасці. Ніводная просьба рэдакцыі аб фінансавай дапамозе, з якой я звяртаўся ў дзяржаўныя ведамствы, не была задаволена. На выдавецкі праект «Белавежская пушча» дзяржава не адпусціла пакуль аніводнай капейкі. Асобныя структуры (прыкладам, Гомельскі і Магілёўскі абласныя камітэты прыродаахововы, а сёлета і Мінскі гарадскі) палічылі за лепшае цалкам дыстанцыявацца ад выдання толькі па той прычыне, што яно заснавана з прыватнай ініцыятывы.

Аднак мне тым больш прыемна гаварыць пра шматлікія добрыя прыклады грамадзянскага стаўлення да газеты, разумення і зацікаўлення з боку міжнародных арганізацый, іх прадстаўніцтваў у Мінску, а таксама шчырых прыхільнікаў у рэгіёнах: з боку раённых аддзелаў адукацыі, раённых інспекцый прыро-

даахowы, Гродзенскага і Брэсцкага абласных камітэтаў прыродных рэсурсаў, школьнага настаўніцтва, бібліятэчных работнікаў.

Газета шукае і ўжо знаходзіць кантакты з прыватным бізнэсам, развіваючы гэтым самым ідэю экафундатарства ў Беларусі. Сюжэты сацыяльна-экалагічнай рэкламы, хай сабе яшчэ вельмі нячаста, падтрымліваюць фірмы і прадпрыемствы. А «Беларускі народны банк» размяшчае такую рэкламу штонумар і з добрым густам. Усім шчыра дзякую.

Сёння, карыстаючы момант, я хацеў бы звярнуць увагу калег-журналістаў на тры вельмі важныя і актуальныя праблемы. Гэта абніжаны стан і актыўнае камерцыйна-гаспадарчае скарыстанне нашых запаведных тэрыторый, асабліва лясных. Гэта выдаткаванне ці, лепш сказаць, «раздача» экалагічнай часткі бюджэта, поўная непразрыстасць гэтай працэдуры. Нарэшце, адсутнасць галоснасці ў пытаннях экалагічных пагрозаў: хто прыпомніць, калі апошні раз міністэрства прыродных рэсурсаў запрашала нас на прэсавую канферэнцыю, летась ці пазалетась?..

Я не буду падрабязна спыняцца на гэтых праблемах. Але спадзяюся, мы разам будзем да іх звяртацца. Абяцаю вам сваю дапамогу, падказкі, досвед, неабходныя кансультацыі, адрасы. Белавежская пушча, напрыклад, — гэта айсберг, у якім схаваная частка тоіць вялікую небяспеку для захавання яе самой як прыроднай спадчыны. Наогул, я вельмі жадаў бы, каб мой клопат стаў нашым агульным клопатам пра біясферныя каштоўнасці, да якіх мы ўсе прыналежымся — фізічна і этнічна. Дазвольце пажадаць вам творчага плёну.

Шаноўны спадар Кэмпбел! Маю гонар і выключную падставу яшчэ раз звярнуцца да Вашай персоны, каб у прысутнасці гэтай вельмі шаноўнай аудыторыі засведчыць сэнс Вашай працы ў Беларусі і сэнс Вашага дару, якім Вы ганаруеце маю працу, мой праект. Калі нас, фордаўскіх лаўрэатаў трохі паболее, я падумаю

аб тым, каб у Беларусі стварыць асацыяцыю, якая іх аб'яднае. Жадаю поспехаў у Вашай дзейнасці, якая і надалей будзе спрыяць захаванню культурных вартасцяў і навакольнага асяроддзя ў свеце.

## «Дрымучая справа» з хронікі Белавежскай пушчы застаецца актуальнай праз 138 гадоў

ДЗВЕ ЎВАГІ НА АКАЛІЧНАСЦІ ДАДЗЕНАЙ ПУБЛІКАЦЫІ

Газета «Белавежская пушча» 1999

ПЕРШАЯ ЎВАГА

Георгій Валкавыцкі — з беластоцкіх беларусаў Польшчы, паэт і публіцыст, карэнны белавежац — прэзентаваў рэдакцыі кнігу сваіх эсэ «Белая вязь» (Беласток, 1998). Герцэнаў звон — фрагмент кнігі — ёсць аўтарскім пераказам вядомых і дужа нашумелых белавежскіх артыкулаў у вольнай рускай палітычнай газеце «Колокол» (1861), што ў выглядзе ксеракопій трапілі да Г. Валкавыцкага. «І азваўся Герцэнаў звон», — піша наш беластоцкі аўтар. — «Дрымучая справа» ўскалыхнула нас. Колькі знаёмых герояў! Якія жывучыя! І непаражальныя!.. А можа, развіваемся назад?»

Гэта першая ўвага.

ДРУГАЯ ЎВАГА

Падаць гісторыю «Дрымучай справы» рэдакцыя збіралася даўно; з хронікі Пушчы яна тырчыць як узняты палец перасцярогі. Рэч не ў тым, што эпізодаў падобнага кшталту ўвогуле бракавала, проста гэтая «справа» мела вялікую агалоску, і яе хутчэй варта ўважаць за тыповую — нажыцца з лесу ахвотных заўсёды было... І шмат засталося дагэтуль, хоць добрага лесу ўжо катастрафічна бракуе. Нашая ўвага звязана з сённяшнім станам Пушчы і ўсіх лясных ваколіцаў Беларусі. Рацыя за Георгіем Валкавыцкім:

гэтая гісторыя як бы рассоўвае межы часу... Рацыя за ўсімі, хто сёння намагаецца ўратаваць Вялікія Parэшткі Вялікага Лесу, хто не маўчыць, шукае любога прыдатнага спосабу зварушыць грамадскі звон.

Гэта наша другая ўвага.

## Калі мы працягваем рукі — запаведнікі працягваюць ногі

ІНТЭРВ'Ю КАРЭСПАНДЭНТУ ГАЗЕТЫ «КОМСОМОЛЬСКАЯ ПРАВДА В БЕЛАРУСИ» ВЯЧАСЛАВУ ТКАЧУ

Газета «Белавежская пушча» 1999*

(...)

В. ДРАНЧУК. Сёння ў краіне застаўся толькі адзін запаведнік — Бярэзінскі біясферны. Іншыя асабліва ахоўныя тэрыторыі — Прыпяцкі ландшафтна-гідралагічны, Белавежская пушча, Браслаўскія азёры — набылі статус нацыянальных паркаў. Зроблена гэта не так сабе. Галоўная мэта — займець магчымасць уладам прыкласці руку да нацыянальных каштоўнасцяў, якія, паводле вызначэння і насуперак бізнес-планам, павінны заставацца недатыкальнымі. У распарадчым цыркуляры аб рэарганізацыі Прыпяцкага запаведніка сказана, аднак, досыць ясна: «... з мэтаю захавання унікальных прыродных комплексаў Палесся, развіцця вытворча-гаспадарчай базы, стварэння ўмоў для вырашэння сацыяльна-эканамічных задач насельніцтва».

Скажыце, якая можа быць вытворча-гаспадарчая дзейнасць у месцах, дзе мусіць панаваць зусім іншы, абсалютны культ — культ захавання біялагічных каштоўнасцяў, культ багавейлівасці перад жыццём, перад кожным дрэвам і нават кустом? А развівацца павінна навукова-пазнавальная база, а не вытворча-

* Перадрук з перакладам на беларускую мову

гаспадарчая. Аднак менавіта вытворча-гаспадарчую — не зважаючы ні на што —рухава развіваюць. У тым жа Прыпяцкім парку запушчана італьянская лінія па вытворчасці паркета. Думаеце, з чаго яго робяць. Вядома, з добрага жывога дуба — інакш, я мяркую, не атрымаеш якасны паркет… Або яшчэ прыклад так званай гаспадарчай дзейнасці ў тым жа «Прыпяцкім». Мне вядома, што ёсць кантракт, я бачыў паперу, на пастаўку адсюль у Галандыю 30 тысяч кубаметраў піламатэрыялаў па 100 даляраў за куб. Сумняюся, што хоць капейка з гэтых трох мільёнаў даляраў пойдзе на дабрабыт людзей, мясцовых жыхароў. Вы спытаеце: на што ідуць тыя грошы? Наколькі мне ўдалося высветліць, выручка ад кантрактаў паступае на банкаўскі рахунак парка, а потым яе размяркоўваюць —заўважце, не на навуковыя праекты, а на ўзнаўленне таго ж самага вытворча-гаспадарчага механізма… І падобных кантрактаў шмат: дакладна — з Польшчай, Германіяй, Чэхіяй.

ВЯЧАСЛАЎ ТКАЧ. *А што ж закон — ён ёсць або яго няма?*

В. Д. У Законе «Аб асабліва ахоўных прыродных тэрыторыях і аб'ектах» запісана: «Захаванне эталонных і ўнікальных комплексаў і аб'ектаў прыроды ёсць найпершай задачай нацыянальных паркаў». На справе гэта не так.

В. Т. *Але ж нешта робіцца?*

В. Д. Так. Саноўныя таварышы сёння любяць замовіць слоўка-другое пра любоў да прыроды, аднак чамусьці не кажуць, напрыклад, пра заняпад Белавежскай пушчы. Той, хто даўно тут жыве і працуе, пасведчыць, што сёння ад Пушчы як такой засталося мала —хіба што жаданы вобраз, «запаведны матыў»… З вынікаў сацыялагічнага даследвання, праведзенага сярод мясцовага насельніцтва, тым часам маем: 47% апытаных лічаць, што на іх вачах стан Пушчы значна пагоршыўся. Прычына —меліярацыя,

высечкі ў вялікіх аб'ёмах, работа ў лесе вялікагрузнай тэхнікі і г.д. Дайце яшчэ сюды тысячы кіламетраў цвёрдапакрытых дарог, трубаправодныя шляхі, дзесяткі піларамаў. Хіба ж можна пры гэтым казаць пра нейкі запаведны гістарычны лес як цяпершчыну? Хіба маральна заяўляць, што нашы зялёныя каштоўнасці ў надзейных руках? І калі ўжо напраўду за мэту мець рэкрэацыю і турызм, дык найперш трэба ратаваць гэтыя выспачкі, рэшткі адноснай ацалеласці, ствараючы вакол іх рэальна эфектыўную буферную зону.

Тое ж па Прыпяцкім нацыянальным парку. Гэты найадметны рэзерват яшчэ ў часы, калі быў запаведнікам, моцна пацярпеў — у перыяд з 1969 па 1987 год быў моцна зняможаны. На той час доля старых элітных лясоў паменшылася з 9,1 да 2,9 працэнта. І сёння становішча пагаршаецца.

Былы запаведны унікум, як і шмат іншых, перайшоў альбо паціху пераходзіць у разрад звычайных лесапрамысловых аб'ектаў. Быў запаведнік — зрабіўся лясгас. Сход гарацешны.

Праўдзіва запаведныя сёння хіба што забалочаныя дзялянкі з малатаварным лесам, як гэта мы бачым на прыкладзе Белавежскай пушчы. Дый тое, заўважце, толькі таму, што тэхніка туды папросту не даходзіць... А там, дзе магчыма, будуюць гасцініцы, рэстараны, тэнісныя корты, гаражы, стаянкі і г.д. Дарэчы, Бярэзінскі біясферны запаведнік не выключэнне. На чыстае «запаведанне» яму адпусцілі менш як палавіну тэрыторыі. Затое пабудавана гасцініца пад еўрастандарт. Калі справа пойдзе ў адным кірунку, апошні беларускі запаведнік хутка стане прадметам масавага карыстання. «Браслаўскім азёрам» наогул пакінулі на запаведную цішу мізэрныя 3,7 працэнта тэрыторыі.

Усё гэта робіцца пад выглядам развіцця турызму і ўсенароднага доступу да экалагічных каштоўнасцяў. Але хто сюды зможа прыехаць? Белавежскі закутак каштуе грошай. Зірніце ў меню мясцовай рэстарацыі

— там вы не ўбачыце гарбаты з верасовым мёдам, затое... прапануецца ўсялякая дзічына, дарагія напоі. Яшчэ зусім нядаўна ў музеі прыроды Белавежскага парка можна было купіць шкуру чырвонакніжнага зубра... Не дзіўна, бо дагэтуль зуброў тут страляюць — знаёмая «акумуляцыя валютных сродкаў». А «выбракоўваюць» жывёлін выключна немцы, якія плацяць «нам» 8 тысяч дойчмарак за трафей. Карацей кажучы, ідзе валютаздабыча ў які хочаш спосаб.

В. Т. *Паляванне — гэта кепска?*

В. Д. Замежных паляўнічых вабіць сюды не заседжаны іхнім братам-паляўнічым куток. Ціхі, нялюдны. Яшчэ ўсёдазволенасць, лаяльнасць. Да іх добра ставяцца. Абяцаюць паляванне з гарантыяй. І трафеі падрыхтуюць да перавозкі. У сярэднім такое паляванне каштуе 3–4 тысячы марак. Навошта ж нешта ахоўваць, калі так проста можна настраляць марак... У «Прыпяцкім» мне расказалі пра выпадак, як італьянцы настралялі качак, а яны, тыя качкі, як пасля стала ясна, належалі да «чырвонакніжнага» віду. Не ведаю, чым усё скончылася, але гэтыя качкі мне запомніліся як заканамерныя выдаткі працэсу.

В. Т. *І што, пра ўсё гэта нікому не вядома? Чаму маўчаць?*

В. Д. Шмат хто лічыць, што гаварыць няма сэнсу. У пэўнай ступені гэта так. Цяперашні заклік вучоных — вярнуць запаведнікі, ператварыць іх у навуковыя лабараторыі — пусты гук: улады не чуюць. А нярэдка блазнавата пытаюцца: «Вы што, супраць доступу народа да нашых прыродных каштоўнасцяў?» Я, напрыклад, адказваю: не, я за даступнасць. Але даступнасць — гэта калі мы цвёрда ведаем, што дзікія мясціны ёсць, што яны захаваліся для нас і нашчадкаў, і што ім нічога не пагражае... Так, няхай сабе людзі едуць да гэтых мясцін як найбліжай, глядзяць з багавейлівасцю на багацце і разнастайнасць прыроды. Але не ўсё можна чапаць рукамі.

Нацыянальны парк — гэта ж зусім не тое, што мы, гараджане, бачым за вокнамі. Гэта іншая цывілізацыя. І ўсімі даступнымі сродкамі яе трэба пазнаваць. А дзеячы, якія сёння гаспадараць у былых рэзерватах, часцей за ўсё папросту ігнаруюць правільны сэнс. Яны хочуць паставіць прыроду на нейкую самаакупнасць, лічы, на панель... Мо каму і падасца мой тон вельмі рэзкім, але я скажу: у нашай маленькай «асабліва ахоўнай» прыроднай зоне, якая займае ўсяго 3–5% агульнай тэрыторыі краіны, пануе хапужнасць і гвалт.

## Страляніна на запаведных тэрыторыях — гэта нонсэнс

Газета «Белавежская пушча» 1999

Пад рубрыкай «Афіцыйна» газета «Комсомольская правда в Беларуси» змясціла кароткі каментар начальніка аддзела запаведнай справы Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Андрэя Галдзянкова. Цікава пачытаць! Спасылаючыся на заканадаўства, сп.Галдзянкоў заўважае, што яно «*нават вітае развіццё тут турызма* (у нацыянальных парках — *В.Д.*) *і дапускае некаторую гаспадарчую дзейнасць*». Далей спадар Галдзянкоў дазваляе і пэўную асабістую разважнасць: «*...хоць мы хацелі б, каб у нацыянальных парках было менш вытворчых цэхаў, а больш аховы прыроды*».

Жаданне вартае ўхвалы, але хацець надта мала — міністэрства не палезе на ражон, колькі б гэтага не хацела.

Далей, што датычыць палявання. «*На жаль*, — кажа начальнік аддзела міністэрства, — *нацыянальным паркам даводзіцца гэтым займацца з эканамічных меркаванняў*» (падумалася нават, што прыродаахоўныя інтарэсы сёння, мабыць, адстойвае міністэрства эканомікі).

Напэўна, у лепшыя часы Андрэй Галдзянкоў сказаў бы інакш, а сёння трэба казаць заплюшчыўшы вочы на шматлікія нязручныя акалічнасці. Напрыклад, ён пацвердзіў, што ў Белавежскай пушчы можна ўпаляваць і самога зубра, аднак прызнанне гэтага факта тут жа спрабуе нейтралізаваць, маўляў, «*гэта складаны бюракратычны працэс, «дабро» на адстрэл безнадзейна хворай жывёліны неабходна атрымаць у нашым міністэрстве*». У тым, наколькі жывёліна «безнадзейна хворая», напэўна, не аднойчы ўсумніўся і сам Андрэй Анатольевіч, і той, хто шматразова падпісваў гэты дазвол. Хіба ж не зразумела: з «эканамічных меркаванняў» сачэнне за «здароўем» зуброў мае для іх цяпер вельмі шкодныя наступствы. Дый ці быў такі выпадак, каб адстрэл не дазволілі...

Аднак спадар Галдзянкоў і тут дапускае мяккую вольнасць, якая хоць трохі асланяе гонар міністэрскага мундзіра: «*Адстрэл жывёлін у нацыянальных парках, вядома ж, не самы файны спосаб рэгулявання папуляцый. Лепш іх рассяляць у іншыя лесагаспадаркі. Магчыма, калі-небудзь мы і прыйдзем да таго, каб забараніць паляванні ў нацпарках. Бо што тут казаць, страляніна на запаведных тэрыторыях — гэта нонсэнс*».

У рэшце рэшт, пазіцыя выказана. Калі зважаць на палітычныя абставіны і парадкі ў краіне, пазіцыя не з горшых — у традыцыях дыпламатычнага замірэння на карысць больш-менш разумнага сэнсу.

## Краіна Іванаў

СЛОВА РЭДАКТАРА

Газета «Белавежская пушча» 1999

Больш за год таму наша газета не перабольшвала, калі заўважыла: «Сонейка заходзіць, і над Пушчай згушчаюцца прыцемкі». Тая заўвага мела дачыненне да іншых, куды больш «прыцемненых» акалічнасцяў,

чым проста хвіліна сутак. У Пушчы тымчасам дагэтуль не развіднілася — дзейнасць беларускіх падахоўных тэрыторый пастаўлена з ног на галаву. Тут насамрэч пануюць густыя прыцемкі: грэбліва адсунуты ў бок закон, праігнараваны шматлікія нормы міжнароднага экалагічнага права, абражаюцца ўяўленні пра нацыянальныя каштоўнасці...

Апошні раз, калі я наведаўся ў Пушчу, мне людзі на гэта адказвалі, называючы адно прозвішча «наверсе», — і разводзілі рукамі. Іншыя глядзелі шырэй: пакуль не зменіцца ўлада і гэты палітычны курс — лепшага нічога не ўбачым. Па вяртанні ў Мінск названае «прозвішча», якое з Пушчы не хутка выдзьмуць нават самыя халодна-сцюжныя вятры, неспадзявана апынулася ў палітычных некралогах дэмакратычнай прэсы — уладнае месца з выглядам на запаведныя тэрыторыі Беларусі знянацку запусцела.

Цяпер нават не верыцца, што нехта іншы, а не сам Іван Іванавіч Ціцянкоў будзе пераразаць стужачку на адкрыцці супер-цэха лесаперапрацоўкі ў нацыянальным парку.

Вось думаю. Няхай бы ўсё ж гэта быў ён! Асабіста мне, калі б глядзеў на дзею яшчэ адной нацыянальнай ганьбы, прыгадаўся б незадаўнены эпізод палітхронікі нашай скрыўджанай краіны: праўдзівая нацыянальная сымболіка гвалтоўна замяняецца на штучную, часовую. Асабліва вылучыўся тады першы прэзідэнцкі спраўнік таварыш Ціцянкоў (ёсць кінакадры)... І вось паралель, дзень сённяшні — грандыёзны «лесапільны» праект сымбалізуе сабою 60 гадоў ад снежня 1939, калі беларускі ўрад прадэкляраваў (але так і не спраўдзіў) запаведнасць Белавежскай пушчы. Уяўляеце, наперадзе — постаць Івана... І, магчыма, не я адзін падумаў бы: «Ведаем, ведаем гэту птушку! Да ахоўных прыродных тэрыторый мае стаўленне прыкладна такое ж, як і да бел-чырвона-белага сцягу, які ён парваў на часткі чатыры гады таму».

Шкада. Гэта ўжо будзе не ён.

Зрэшты, хто б ні пераразаў стужачку, Івана Іванавіча ўсёроўна ўспомняць. Словам ці думкай, а ўспомняць. Магчыма, і лесапілку ў Пушчы назавуць імем былога, але яшчэ вельмі рэальнага Івана Ціцянкова. У такой краіне жывём. Хтосьці так і сказаў: «краіна Іванаў». Перапрашаю, каго пакрыўдзіў.

## Будзем памятаць і сведчыць

ЛІСТ У РЭДАКЦЫЮ ГАЗЕТЫ
«БЕЛАРУСКАЯ МАЛАДЗЁЖНАЯ»

1999

Паважаная спадарыня Таццяна Мельнічук!

Споўніць просьбу аднаго са сваіх нядаўніх суразмоўцаў і, як высветлілася, вельмі ўдзячнага чытача Вашага выдання я мог бы праз тэлефонную размову. Аднак, не адвінаючыся, адразу пішу, бо для мяне больш важна зрабіць гэта менавіта публічна — засведчыць поспех незалежнага выдання перад ягонай аўдыторыяй і тым самым развеяць міф пра нібыта марную патужнасць свабоднай прэсы, яе нібыта абмежаваныя магчымасці.

Шчыра кажучы, даўно не даводзілася чуць водгуку на востра крытычную выкрывальную публікацыю ад службовай асобы, чалавека пры пасадзе, раённага чыноўніка. І раптам — такая шчырая ўдзячнасць калегам па галоснасці, прызнанне іх журналісцкай пазіцыі, самыя лепшыя пажаданні аўтару...

Цяпер амаль даслоўна перадаю водгук: *«Перашліце, калі можна, нашу вялікую падзяку газеце за артыкул «Нацыянальныя паркі — мёртвая зямля» і асабіста аўтару Сяргею Пульшы,* — прасіў мой суразмоўца. — *Мы радуемся, што ёсць смелыя мужныя журналісты, якія ўмеюць пісаць праўду. Для нас гэта вялікая маральная падтрымка. Рэч у тым, што тэрыторыя Пастаўскага раёна стала часткай нацыянальнага парка*

*«Браслаўскія азёры», і мы ўжо бачым, куды што павярнулася. Лесанарыхтоўкі, паляванні, валютаздабыццё і ўсё такое. Ідзе нахабны падман грамадства, людзі ўжо разумеюць і толькі дзіву даюцца. У артыкуле гэта выразна паказана на прыкладзе «Прыпяцкага». Трапна і востра. А галоўнае, мы цяпер ведаем, што нас чакае. Мы гэтага не хочам і будзем супраціўляцца... Праўда, у рукі трапіў пакуль што адзін з трох артыкулаў. Але ён імгненна пайшоў па кабінетах, распаўсюджваецца ў ксеракопіях. Маем да вас вялікую просьбу — калі не цяжка, перашліце яшчэ два артыкулы, якіх мы не змаглі знайсці. І самае шчырае, самае ўдзячнае прывітанне аўтару».*

Я не называю службовую асобу па зразумелых прычынах. Дый гаворка была ў пэўнай меры прыватнай, таму я мушу захаваць этыку, пакідаючы за сабой права і абавязак заакцэнтаваць увагу на чытацкай удзячнасці, актуальнасці тэмы захавання прыроднай спадчыны ў нашай незалежнай прэсе і маім асабістым жаданні парадаваць Вас гэтым сведчаннем пэўнай удачы.

Заадно хачу дапоўніць публікацыю Сяргея Пульшы адной, на мой погляд, надзвычай істотнаю ўвагаю: з мноства названых злачынных фактаў перадусім і ў рэшце рэшт вынікае нягоднае, грэбліва «наплявацельскае» стаўленне беларускай адміністрацыі да Канстытуцыі і шэрагу экалагічных законаў, перш-наперш закона «Аб асабліва ахоўных прыродных тэрыторыях і аб’ектах». Здзірства і гвалт у нацыянальных парках маюць канкрэтных заказчыкаў і выканаўцаў, якія разумеюць: гэты рэжым не можа быць вечны. І збіраюцца ўсё спісаць, схаваць, уцячы ад адказанасці. Будзем памятаць і сведчыць!

Зычу поспехаў Вашаму выданню ў адстойванні зялёных каштоўнасцяў Беларусі.

# Лицензия на отстрел символа

ИНТЕРВЬЮ КОРРЕСПОНДЕНТУ ГАЗЕТЫ «БЕЛОРУССКАЯ ДЕЛОВАЯ ГАЗЕТА» ВЕРОНИКЕ ЧЕРКАСОВОЙ

Май 1999

ВЕРОНИКА ЧЕРКАСОВА. *Какая из экологических проблем, которые испытывают заповедники и национальные парки, представляется Вам сегодня наиболее серьезной?*

В.ДРАНЧУК. К сожалению, приходится констатировать, что государство полным ходом ведет хозяйственное освоение природоохранных территорий. В настоящее время в Беларуси остался всего один заповедник — Березинский биосферный. Припятский ландшафтно-гидрологический заповедник и Беловежская пуща преобразованы в национальные парки. Отдельные ученые были против. Изменение статуса, заявляли они, может повлечь за собой возможность большего доступа к природным богатствам и ослабление контроля со стороны научной общественности. Так и случилось. Но вскоре и они убедились в бессмысленности своих протестов.

Если бы изменение статуса и более открытый доступ были вызваны желанием научить людей более бережному отношению к природе, благоговению перед жизнью, экологической этике — это еще можно было бы как-то понять. Однако мотивы у властей совершенно иные. Постоянно приходится слышать, что эти территории должны быть самоокупаемыми. Но о какой самоокупаемости национальных парков или заповедных территорий можно вообще говорить? «Самоокупаемость» становится просто ширмой, прикрываясь которой можно безнаказанно хозяйничать, добывая валюту. Причем, заметьте, ни одному западному охотнику никогда не придет в

голову охотиться в национальном парке собственной страны.

в. ч. *Правда ли, что сегодня не защищен даже своеобразный символ Беларуси — беловежский зубр?*

в. д. Любой, у кого есть деньги, может купить лицензию и убить это животное. Преподносится это под видом выбраковки, но такой отстрел практически не контролируется. Попробуй, проверь, какого зубра и на каких основаниях отбраковали? Общественность к этому доступа не имеет — как правило, всё решают специалисты национального парка. Иногда между получением «министерского» разрешения на отстрел и самим отстрелом проходит много времени, потому что не могут найти охотника, который способен заплатить нужную сумму...

В Припятском национальном парке валютная охота поставлена на прочную коммерческую основу. Там ведется целенаправленный поиск платежеспособных охотников, которые приезжают, платят деньги за постой и за возможность вольготно поохотиться на животных, случалось, иногда даже занесенных в Красную книгу.

в. ч. *Затрагивает ли эта «самоокупаемость» другие белорусские леса?*

в. д. При бывших заповедниках созданы так называемые приписные и буферные зоны, где официально разрешена вырубка леса. И в Беловежской пуще, и в Припятском заповеднике имеются деревообрабатывающие производства. В частности, в Припятском заповеднике размещена итальянская линия по изготовлению паркетной доски. Паркет делается из дуба, который добывается тут же. В Беловежской пуще имеются десятки деревообрабатывающих производств. На вопрос о том, откуда для них берется сырье, официальные лица отвечают, что вырубаются лишь высыхающие деревья — здоровые якобы ник-

то не трогает пальцем. Но тогда встает вопрос: если Беловежская пуща высыхает в таких масштабах, то почему по этому ужасному поводу никто не бьет тревогу? А ведь Пуща — зеленые легкие Европы, мировое наследие — какие там могут быть производства? Но приезжающие туда чиновники оглядывают леса хозяйским взглядом и заявляют: «Так вы же здесь по золоту ходите!» А потом это золото добывают...

Что в такой ситуации меня тревожит? Отсутствие гласности, отсутствие множества поводов задуматься: «А что происходит?» Приведу пример. Однажды мне сообщили, что ожидается очередной отсрел зубра. Наконец нашли «валютного» охотника. Кроме того, выпал долгожданный снег, на котором лучше видны следы. Я попытался выяснить, могу ли я присутствовать на этой охоте. Мне ответили, что нужно специальное разрешение, без которого туда попасть нельзя. Тогда я решил обратиться к нашим радиостанциям с просьбой, чтобы в день, когда прозвучат выстрелы, они сообщили в эфире: «Сегодня в Беловежской пуще будут убиты два зубра». Ни одна станция не согласилась предоставить свой эфир для такого сообщения.

в. ч. *А сколько всего сегодня зубров в Пуще?*

в. д. Около 300. Не могу согласиться и примириться с тем, что вместо того, чтобы лечить животных, их предпочитают отстреливать. Не поверите, до недавнего времени прямо в музее природы национального парка можно было купить шкуру зубра, дикого кабана, оленя... Когда я впервые это увидел, я вышел на крыльцо вдохнуть свежего воздуха... Продажу на заповедной территории шкур животных, в том числе занесенных в Красную книгу, иначе, как уроком живодерства, не назовешь. Причем продавали шкуры совсем недорого, как-то раз предложили купить и мне. Вот честно, не мог представить, как это можно — вытирать ноги о зубра!

в. ч. *Трудно ли получить конкретную информацию об экологической ситуации в Беларуси?*

в. д. В общем-то, нет. При условии, если наладить сотрудничество с рядовыми учеными, а не идти в высокие номенклатурные кабинеты. Нередко среди исследователей, людей суховатых и дотошных, встречаешь и живой отклик, и свежий взгляд, и объективную аналитику, и внимательное отношение к этим проблемам.

Мало кто знает, что Беларусь подписала так называемую Орхусскую конвенцию — о доступе к экологической информации, принятию решений и правосудию в случае, когда вопросы касаются окружающей среды. Но у нас нет механизмов ее реализации. Государство подписало конвенцию — и забыло о ней. Вот и вся позиция.

в. ч. *Бывают ли в Беларуси судебные процессы, связанные с нарушениями в области экологии?*

в. д. Никогда. Такого понятия, как «экологическое право» или «мое экологическое право», у нас не существует. Это не значит, что нет поводов. Но «зеленые», простые граждане не судятся с государством или другими субъектами. Орхусская конвенция замечательно ставит эту проблему, ориентирует на это. Но вот уже год как подписан документ, он вступил в силу, а увидеть его, прочитать мы пока что не можем. До сих пор он не опубликован. Однако и это, пожалуй, не главное, если не ужесточать, не совершенствовать наши законы в духе этой конвенции. Что остается? Когда речь идет о правах, человеку часто говорят о том, чего он не должен делать — нарушать, наносить вред и так далее. То есть, не имеет права, *не может*. Но посмотрим на закон чуть иначе: ведь нам так много *можно*! Когда мы *можем* так много делать по праву! И прежде всего — любить, беречь, защищать, охранять… На тех же законных основаниях.

# Дзейнасць беларускіх запаведных тэрыторый сёння пастаўлена з ног на галаву

Газета «Белавежская пушча» 1999

Практыка гаспадарання, разлічанага выключна на цвёрдавалютны і валютаёмісты вынік, звяла на мізер, калі не на поўны нуль, прыродаахоўную, навукова-даследчую, культурна-пазнавальную ды іншую дзейнасць прыродаахоўных устаноў, стварыла тым самым небяспечную дыспрапорцыю, якая і ёсць грубым адступленнем ад Закона «Аб асабліва ахоўных прыродных тэрыторыях і аб'ектах» (гл. артыкулы 14, 20). На працягу апошніх гадоў ставяцца сумнеўныя, антынавуковыя эксперыменты, якія адцягваюць сілы калектываў і кіраўніцтва гэтых тэрыторый ад першачарговых задач, а ў шэрагу выпадкаў супярэчаць іх статусу і рэжыму.

У нацыянальным парку «Белавежская пушча», напрыклад, колькасць працоўных месцаў даўно перасягнула тысячу адзінак, хоць яшчэ нядаўна трымалася лічбы 700-800, прычым гэты рост ледзь паспявае менавіта за тымі відамі дзейнасці, якія, мякка кажучы, не адпавядаюць прыродаахоўнаму накірунку. Былі ўжо конегадоўля, развядзенне гусей, вырошчванне навагодніх ёлачак, ды шмат чаго іншага, аднак усе пачыны ў рэшце рэшт бясслаўна скончаліся, апроч валютных паляванняў (тут поўная стабільнасць!), прыносячы справе ахова прыроды адну толькі шкоду.

На першы погляд можа падацца, што людзі займаюцца не той справай, якая б хоць неяк упісвалася ў месца; рэч у тым, аднак, што справы ўжо ідуць тут не зважаючы на месца. Па-ранейшаму на апошніх ролях навука. Сёння ў аддзеле працуе 16 чалавек (два кандыдаты навук) — гэта значыць, што калі не адбыўся разгон пушчанскай навукі, дык засталося да

гэтага менш як трохі. Пра эфектыўнасць даследванняў або каштоўнасць навуковых распрацовак гаварыць не мае сэнсу, бо сённяшняя навуковая дзейнасць ёсць прыкрыццём зусім іншых мэтаў. Даплата да навуковага заробку з гаспадарча-камерцыйнай дзейнасці — рэч даволі красамоўная: навуку такім чынам «прыкормліваюць», ставяць у залежнасць ад сумнеўна-адыёзнага выніку.

Ці можна такое ўявіць, калі міжволі даць сабе веры, што Белавежская пушча — месца сусветнай прыроднай спадчыны і мае найадмысловы Еўрапейскі Дыплом Рады Еўропы? Цяжка. Але гэта так. Цяжка дапусціць і тое, што Дыплом праз тры гады не будзе адклікаены, бо з'явілася яшчэ адна вельмі сур'ёзная падстава прагназаваць несуцяшальную перспектыву: у нацыянальным парку будуецца чарговы цэх лесаперапрацоўкі.

Які па ліку — казаць не бяруся, можа, пяты, можа, дваццаць пяты — важна не гэта. Вытворчая лінія, прадукцыйнасць якой надзвычай высокая, ураз праглыне адносна невялікія запасы сухастойнай драўніны, якую цяпер у недапушчальна вялікіх памерах забіраюць у Пушчы. І тады востра паўстане пытанне сыравіны. Зрэшты, яно стаіць ужо й сёння, хоць мантаж магутнай лініі яшчэ не закончаны, — пытанне якаснай, канкурэнтаздольнай сыравіны. Кантракты падпісаны. За «лесапілку» (дарэчы, ужо карыстаную, купленую ў нямецкага прадпрымальніка), трэба будзе разлічвацца, што абяцае жорсткія рэаліі на заўтрашні дзень... Не засталася тайніцай і сума крэдыту, выдадзеная на «лесапільны» праект. Беларускі банк развіцця адпусціў парку 200 мільярдаў рублёў, а ўрад краіны даў дазвол Кіраўніцтву спраў зрабіць заклад маёмасці адпаведна з сумай крэдыту...

Не сакрэт, што пашырэнне вытворчай базы з колам гаспадарчых клопатаў «леспрамгасаўскага» кшталту значна павялічыць нагрузку як на прыродны, так і чалавечы фактар аб'екта сусветнай спадчы-

ны. Заснавальнікі Еўрапейскага дыплома, у прыватнасці, маюць ужо ўсе падставы разглядаць будаўніцтва дрэваапрацоўчага прадпрыемства як замацаваную і відавочную тэндэнцыю, якая супярэчыць умовам і рэкамендацыям Рады Еўропы. Дый не варта забываць, што Дыплом не так прызнаваў заслугі, як абавязваў — ставіў краіну-абранніцу на больш высокую ступень прыродаахоўнай дысцыпліны. Аднак атрымальнікі не засяроджвалі на гэтым увагу. Адразу было бачна, што Дыплом успрымаецца аднабакова, без разумення выдадзенага авансу, неабходнасці крытычнага стаўлення да сваёй дзейнасці.

Што гэтага не зразумелі (хутчэй — свядома ігнаруюць умовы разумнага пастрымання з боку еўрапейскай структуры), яскрава сведчаць рэальныя «дрымучыя» справы і дзеянні ўладароў нацыянальнага парка, дарэчы, не абмежаваныя хоць бы такім «дамашнім» атрыбутам законапаслушнасці як Палажэнне аб нацыянальным парку «Белавежская пушча» (артыкул 24), якога дагэтуль няма, але які, калі б ён быў, шмат чым замінаў бы поўнай уседазволенасці.

І ўжо зусім не туды заехалі таварышы з адміністрацыі, калі запуск пілapaмы спрабуюць прышчапіць да так званага «запаведнага» юбілею Пушчы. Ці, можа, прыехалі якраз туды. Бо 60 гадоў (пасля вядомага ўз’яднання), пераважна савецкіх на тэрыторыі Пушчы, большым чынам сымбалізуюць *страту* запаведнасці, чымся яе трыумф. Статус запаведніка (яшчэ зусім кволы, непаўнагодкавы) быў забраны ў 1957 годзе і больш ніколі сюды не вяртаўся. Які напрамак тут сёння ўсталёўваецца, паказваюць не толькі факты жорсткага гаспадарчага ўціску на Пушчу, але і жаданне, спроба ўлады цынічна ўвязаць даўні факт яе запаведання з валютаёмкай «прыродаахоўнай дзейнасцю» ў выглядзе... эксплуатацыйных вартасцяў еўра-пілapaмы на тэрыторыі аб’екта нацыянальнай і сусветнай прыроднай спадчыны.

# 2

**А**проч караеда, на запаведнай тэрыторыі прыжыўся зусім іншы, чалавечы фактар знішчэння лясной нерушы, куды больш небяспечны і разбуральны, — караед лесанарыхтоўчы, прадажны, балотаасушальны, а цяпер і валютаздабывальны. Дзейнасць гэтага караеда забяспечана пэўнай інфраструктурай, сістэмай здзелак і барышоў, подкупам і застрашэннем. Механізм стары і абсалютна некантраляваны грамадскасцю. Паспрабуй што праверыць!..

**П**адупалы і моцна хворы арганізм Пушчы сёння патрабуе рашучага перагляду чалавечай дзейнасці на яе абшарах, змены стэрэатыпаў, якія тут прыжыліся за шмат гадоў, сацыяльных зрухаў на карысць чалавека — жыхара і абаронцы Пушчы.

**Экологические и нравственные проблемы особо охраняемых природных территорий.**
*Резолюция-2: констатируем, заявляем, требуем.* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 91

**Чулі? Асабліва ахоўныя тэрыторыі «расквітнелі».** *Кіраўнік прыродаахоўнага ведамства ўхваляе гаспадарчую дзейнасць на запаведных тэрыторыях.* . . . . 93

**Што ў сейфе аўтара?** *Адказ Яраславу Раманчуку.* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 95

**Пра адзін кадравы зрух (з пралогам і маналогамі).**
*На думку дасведчанага белавежца, пачынаючы з 1957 года ў Белавежскай пушчы прыродаахоўных мерапрыемстваў не назіралася* . . . 100

**Ёсць такі нацыянальны парк!** *Ягонае кіраўніцтва прымае «ўсе магчымыя меры па нарошчванні аб'ёмаў вытворчасці піламатэрыялаў».* . . . 105

**«Дремучее дело» временщиков.**
*В Беловежскай пуще началась «реконструкция леса».* . . . . . . . . . . . . . . . 110

**Хопіць лускаць гранты ў дупле.** *Ці магчымы погляд на амаральныя рацыі дзяржавы з пазіцыі грамадзянскага выбару?* . . . . . . . 112

**У Адміністрацыі Прэзідэнта згубіўся ліст беларускіх «зялёных».**
*Ці стане рабунак біялагічных багаццяў тэмай беларускіх мас-медыяў.* . . . . . 116

**Ачаг нацыянальнага ўсыхання.**
*Інтэрв'ю газеце «Свободные новости плюс».* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 119

**«Тут ведаюць, як пілаваць Пушчу, а не ахоўваць».**
*Інтэрв'ю Польскаму тэлебачанню.* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 128

**ЭкаАрт. Прырода ў выяўленчым мастацтве.**
*Аргументы эстэтыкі і культуры на карысць біялагічнай спадчыны.* . . . . . . . . 129

**Прыроду могуць бараніць мастакі.** *Слова на адкрыцці выставы «ЭкаАрт».* 131

**У нацыянальным парку «Белавежская пушча» не выконваюцца ўмовы і рэкамендацыі Еўрапейскага Дыплома.**
*Зварот беларускай грамадскасці ў Раду Еўропы.* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 132

**Стимулы престижной европейской награды должны работать на спасение Великого леса.** *Интервью газете «Рабочы».* . . . . . . . . . . 135

**Адказ белавежскаму апаненту.** *Ферамонныя пасткі для караеда-тыпографа найлепш прыдадуцца для спраўнікаў дзяржапарата.* . . 141

**Белавежскі АДНАасобнік.** *Чаму 26-ы выпуск газеты «Белавежская пушча» быў зладжаны ў адным экземпляры.* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 147

**«Нашы папярэднікі не ішлі на экстрэмальныя тэхналогіі…»**
*На пытанні адказвае экс-гендырэктар нацыянальнага парка «Белавежская пушча» Яўген Смактуновіч.* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 150

**Пад пагрозай біялагічная цэласнасць і гістарычнасць Белавежскага лесу.** *Зварот беларускай грамадскасці ў ЮНЭСКА.* . . . . . . 154

**«Состояние Беловежского леса – это вопрос организации науки».**
*Диалог с профессором, который пытается отмежеваться от политики.* . . . 158

**Варварскія праекты ў найстарэйшым лесе Еўропы.**
*Інтэрв'ю газеце «Наша Свабода».* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 162

**Сёння Пушчу трэба ратаваць ад дзяржавы.** *У польскай Пушчы моцнае «ядро», а ў Беларусі гэткім «ядром» магла б стаць уся Пушча.* . . . . 165

# 2000–2002

## Экологические и нравственные проблемы особо охраняемых природных территорий

РЕЗОЛЮЦИЯ-2 (АЛЬТЕРНАТИВНАЯ)

Декабрь 2000

15 декабря 2000 года состоялась научно-практическая конференция «Экологические и нравственные проблемы особо охраняемых природных территорий». Организацию этого несомненно важного мероприятия взял на себя Белорусский социально-экологический союз «Чернобыль» при участии белорусских ученых, Представительства ООН в Беларуси, других общественных и государственных структур.

Возлагались большие надежды на то, что экологическая общественность на этот раз обобщит обвал заповедности в Беларуси и сделает поистине нравственный выбор между стяжательскими устремлениями административно-ведомственных органов и морально-этническими интересами многих поколений белорусов, между законами силы и силой законов.

К сожалению, надежды не оправдались. Острота и актуальность вопросов были размыты потоком вто-

ростепенных словочтений, тема конференции ушла на задний план и затрагивалась лишь в мягкой, властобоязненной форме. «Ошибкой» организаторов было то, что ключевая процедура — процедура участия — обеспечила присутствие представителей Управления делами президента и полностью исключила участие представителей научных отделов национальных парков, прежде всего таких как « Беловежская пуща», «Припятский», а также Березинского биосферного заповедника. Обсуждение вопросов было преднамеренно загнано в русло бесконфликтного прослушивания научных докладов, а в ряде случаев — открытого лоббирования точки зрения Управления делами президента.

Мы, Здислав Муравьёв и Валерий Дранчук, оставляем за собой право считать этот компромисс угодным власти и несовместимым с действиями демократической общественности. Фальсификация озабоченности положением дел на эталонных природных территориях поставила под сомнение возможность определиться в нравственном выборе и принять общую резолюцию. Принятие последней было отложено, однако и ее отсроченный вариант стал едва ли не полным отражением сорванного мероприятия. В связи с этим и встал вопрос об альтернативной и более явственной резолюции, которую мы, подписавшие ее, предлагаем в качестве морального выбора.

1. Мы констатируем:
в отношении эталонного природного наследия власть насаждает безнравственные научно необоснованные принципы управления. Национальные парки и так называемый Березинский биосферный заповедник не обеспечивают сохранность природных экосистем, находящихся на их территории. Абсолютная заповедная зона за последние годы резко сократилась и составляет лишь 0,7% от всей территории республи-

ки. До сих пор Беларусь не имеет концепции сохранения природных экосистем.

2. Мы заявляем:
практика природопользования вместо сохранения и развития биоразнообразия на заповедных территориях ведет к деградации и необратимой потере остатков естественных природных ценностей.

3. Мы требуем:
разработки в 2001 году концепции сохранения природных экосистем Беларуси, способной спасти уцелевшие заповедные уголки от хозяйственного захвата и уничтожения, совершенствования в соответствии с ней законодательства, проведения в сентябре 2001 года двухчасового Круглого стола на Белорусском телевидении с включением «независимых телекамер» и участием представительного круга экспертов по проблеме состояния и использования заповедных территорий Беларуси.

## Чулі? Асабліва ахоўныя тэрыторыі «расквітнелі»

ПЫТАННЕ МІНІСТРУ ПРЫРОДНЫХ РЭСУРСАЎ
І АХОВЫ НАВАКОЛЬНАГА АСЯРОДДЗЯ Л. ХАРУЖЫКУ
НА ПРЭСАВАЙ КАНФЕРЭНЦЫІ І ЯГОНЫ АДКАЗ

З дыктафона. Чэрвень 2000

В. ДРАНЧУК. *Не адзін год экалагічная грамадскасць настойвае на падпарадкаванні асабліва ахоўных прыродных тэрыторый Вашаму ведамству. Найперш гэта датычыць нацыянальных паркаў і Бярэзінскага біясфернага запаведніка, падведамных цяпер Кіраўніцтву спраў прэзідэнта.*

*У якасці аргумента называецца камерцыялізацыя гаспадарчай дзейнасці, яе шырокамаштабны характар і як вынік — пагроза біялагічнай разна-*

*стайнасці. Апошні прыклад — будаўніцтва новай буйной лесапілкі ў Белавежскай пушчы. Ці падзяляеце Вы гэтую заклапочанасць, спадар міністр?*

Л. ХАРУЖЫК. Я хачу нагадаць, што наша міністэрства не гаспадарчае. У нас кантрольныя функцыі. Вы гэта ведаеце.

Зараз нацыянальныя паркі падначаленыя Кіраўніцтву спраў прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Гэта акурат і ёсць тое гаспадарчае падраздзяленне, якое мае магчымасць актыўна кіраваць гэтым працэсам. Я не думаю, каб у Вас не было інфармацыі пра тое, што за гэты перыяд — шэсць з лішнім гадоў — адбыліся пазітыўная змены.

В. Д. *У мяне іншая інфармацыя і процілеглыя звесткі.*

Л. Х. Мой погляд некалькі іншы.

В. Д. *Вы сказалі...*

Б. СВЯТЛОЎ, вядучы (*да В.Дранчука, перабіваючы*). Я зараз папрашу Вас выйсці, бо ў нас тут прэсканферэнцыя.

Л. Х. Нацыянальныя паркі — гэта перш-наперш тыя зоны, якія мусяць быць даступныя для людзей, тыя зоны, якія павінны развіваць экалагічны турызм. Развіваць, падкрэсліваю, дачыненні чалавека з прыродай, разуменне прыроды. Запаведнікі на тое і перайменаваныя ў нацыянальныя паркі, каб павялічыць доступ. Ва ўсіх цывілізаваных краінах гэтыя запаведныя куткі — цікавыя, бадай, для ўсіх жыхароў — з’яўляюцца і даступнымі для іх. Я не маю на ўвазе тыя абсалютна запаведныя зоны, якія закрытыя для якога-небудзь нават нязначнага доступу, дзе і вучоныя з’яўляюцца вельмі рэдка. Тым не менш я канстатую гэты факт, што за час знаходжання нацыянальных паркаў ў карыстанні Кіраўніцтва спраў адбыўся значны прагрэс у развіцці экатурызму, і не толькі экалагічнага турызму, але ўсёй прыродаахоўнай дзейнасці. Вы цудоўна ведаеце, што Бярэзінскі запаведнік і Белавеж-

ская пушча былі ўзнагароджаны Дыпломамі Рады Еўропы. Гэта знак міжнароднага прызнання і Вы не можаце выключаць яго або не ўлічваць гэта.

Таму скіраванасць Вашага пытання ў іншы бок не падаецца лагічнай. Зараз, я лічу, немэтазгодная перадача нацыянальных паркаў з ведання Кіраўніцтва спраў у веданне Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя. Прычына ў тым, што, па-першае, мы не з'яўляемся суб'ектам гаспадарчай дзейнасці, — у нас, паўтаруся, кантрольныя функцыі. Па-другое, прычына ў тым, што нацыянальныя паркі дасягнулі значнага росквіту. Тое, што Вы маеце на ўвазе — перапрацоўку драўніны ў буфернай зоне, дзе размешчана піларама, дык гэта было і ў той час, калі Пушча з'яўлялася запаведна-паляўнічай гаспадаркай.

Драўніна, я лічу, не павінна гінуць. Адбываецца, як вядома, натуральны адпад — 200 тысяч кубаметраў за год. Што, яе трэба там пакідаць? Нацыянальны парк разбіты на пэўныя зоны, і гаспадарчая дзейнасць рэгулюецца заканадаўствам. Ёсць зоны, дзе выбіраць гэтую сыравіну магчыма. Мяркую, і перапрацоўка яе абавязковая, таму што не па-гаспадарску было б яе пакідаць нескарыстанай.

## Што ў сейфе аўтара?

АДКАЗ ЯРАСЛАВУ РАМАНЧУКУ

Газета «Белавежская пушча» 2000

«На зямлі становіцца ўсё гарачэй. Глабальнае пацяпленне грозіцца ўзрушыць прыродную раўнавагу. Антарктыда і Арктыка растануць, узровень вады адразу падымецца, паўсвету пойдзе пад ваду, а на рэштках запануе пустэча. Многія палітыкі даўно знайшлі вінаватага ў гэтым няшчасці. Капіталізм, свабодны рынак, вялікі бізнес, прага прыбыткаў — вось яны, магільшчыкі нашай планеты», — такі запеў падае

штотыднёвік «Белорусская газета» ў артыкуле аглядальніка Ярослава Раманчука *«Сусветны патоп: «зялёная» дыверсія»*. Тут жа й даволі красамоўны падзагаловак: «Яны прыйшлі па нашыя грошы».

«Яны» — гэта значыць, «зялёныя», экалагісты. Але хто ж тады «мы»? «Белорусская газета», аўтар-аглядальнік, ці, мо, шараговы падаткаплацельшчык, каго сярод белага дня рабуюць прагавітыя «дыверсанты»?

Яшчэ колькі цытатаў з Ярослава Раманчука.

«Ці нагэтулькі ўжо апраўданыя страхі «зялёных»; чаму палітыкам і грамадскім арганізацыям па абароне навакольнага асяроддзя выгадна раздзімаць істэрыю пра заўчасны канец свету ад пацяплення, смецця, кіслотных дажджоў ды іншых справакаваных чалавекам катаклізмаў?»

На гэтыя пытанні і спрабуе адказаць аглядальнік «Белорусскай газеты»:

«Многія вучоныя-кліматолагі... дапускаюць спрашчэнні і ўмоўнасці, выбудоўваючы кліматычныя мадэлі. Потым зацятыя «зялёныя» вырываюць асобныя часткі даследванняў, ігнаруючы факталагічны кантэкст, і б'юць у званы пра чарговую спробу знішчыць Зямлю.

У большасці выпадкаў стрэлачнікі адны і тыя ж: бізнес і рынкавая сістэма ў цэлым. Пры адсутнасці адназначна даказаных прычынна-выніковых сувязяў у кліматалогіі палітыкі спяшаюцца рабіць высновы пра глабальнае пацяпленне, хуткі канец свету і ўходванне прыродных рэсурсаў. Тут жа прымаюцца палітычныя рашэнні на нацыянальным і міжнародным узроўні, якія абмяжоўваюць эканамічную свабоду і выцясняюць з рынку малы і сярэдні бізнес».

«Аналіз статыстычных дадзеных за апошнія 50 гадоў сведчыць, што цеплавы эфект вуглякіслага газа быў перабольшаны. Гэта значыць, увесь шум, падняты «зялёнымі» і іх палітычнымі хаўруснікамі, мае іншыя мэты — выбіць грошы з падаткаплацель-

шчыкаў пад надзвычай спрэчныя праекты, умяшацца ў працэс вытворчасці тавараў і паслуг, сказіць інфармацыйнае поле...»

Далей аўтар «Белорусскай газеты» падводзіць чытача да самага, бадай, галоўнага.

«Пад эгідай ААН, — піша ён, — з удзелам развітных краінаў і краінаў, якія развіваюцца, прымаецца Кіёцкі пратакол. Нягледзячы на навуковыя факты, удзельнікі сустрэчы зыходзяць з кампутарнай мадэлі, згодна з якой тэмпература паветра да 2100 года падвысіцца на 20 градусаў. Каб гэтага ўнікнуць, палітыкі прапануюць значна скараціць выкіды прамысловых газаў. ЗША выкідваюць у атмасферу газаў больш за ўсіх, але яны і вырабляюць больш за іншых сусветнага ВВП. Значыць, трэба замарудзіць дынаміку развіцця эканомікі ЗША?»

Аднак — не падумайце чаго! — аўтара артыкула хвалюе лёс бедных краінаў, дзе экалагічныя стандарты тэхналагічнага абсталявання значна паніжаныя.

«Уявіце на хвіліну, — даводзіць Я.Раманчук, — што будзе з вытворчым сектарам Беларусі, калі яго заабавязуюць працаваць паводле гэтых стандартаў (маюцца на ўвазе патрабаванні Пратакола — *В.Д.*)? Колькасць беспрацоўных павялічыцца да 60%, заводы спыняцца, а ўсіх рэсурсаў краіны хопіць, каб купіць колькі дзесяткаў тэхналагічных ліній, якія адпавядаюць тым самым стандартам. А што будзе, калі жорсткія экалагічныя нормы ўвесці ў міжнароднае права, калі выкананне зрабіць абавязковым пры ўступленні ў ЕС, іншыя эканамічныя саюзы?..»

Дый, зрэшты, усе захады па ўтаймаванні кліматычных парухаў мала што значаць, падводзіць да высновы аўтар «БГ». Чалавецтва, маўляў, як бы ні старалася, «практычна нічога не выйграе. Затое... Будзе арганізавана шмат канферэнцый, прынята на працу мноства спецыялістаў-эколагаў, выдадзена мноства дзяржаўных грантаў».

Цытуем, аднак, далей:

«... пашырацца паўнамоцтвы існуючых кантрольных органаў альбо будзе створана новая «зялёная» міліцыя. І ўсё гэта за кошт беднага падаткаплацельшчыка. Ёсць у гэтай гульні і свае пераможцы: бюджэт 12 самых вялікіх арганізацый, якія спецыялізуюцца на абароне навакольнага асяроддзя ў ЗША, перавысіў $700 млн. А на рынку працуюць яшчэ больш за 500 структураў, якія таксама за плугам не ходзяць».

«Калі развітныя краіны пачнуць ставіць выдачу сродкаў у залежнасць ад выканання кліматалагічных патрабаванняў паводле Кіёцкага пратакола, іншых стандартаў па абароне навакольнага асяроддзя, то эканамічны рост у пераходных краінах відавочна задоўжыцца. З дапамогай «зялёнай» дубінкі можна лёгка распраўляцца з патэнцыйнымі канкурэнтамі. Бедным краінам, улучаючы Беларусь, не варта занадта эмацыянальна рэагаваць на псеўданавуковыя высновы не зусім абазнаных абаронцаў навакольнага асяроддзя».

«Захаванне статус-кво — лепшы адказ дзяржавы на патрабаванне «зялёных» умяшацца ў дзейнасць эканамічнай сістэмы... — заканчвае аўтар «Белорусской газеты». — Не варта ствараць яшчэ адну, гэты раз «зялёную» касту недатыкальных, таму што яны, як і «чырвоныя», прыйшлі па нашыя грошы».

З'яўленне такога артыкула ўвогуле застаецца рытарычнай загадкай, тым больш у быццам бы незалежнай прэсе. Абарона навакольнага асяроддзя ў публікацыі «БГ» выглядае прышэсцем рабаўнікоў з сейфавымі адмычкамі. Але пакінем за аўтарам права «памыляцца» альбо рабіць выгляд, што гэта свой погляд. У нас ёсць відавочныя падставы сумнявацца ў «чысціні» напісаных радкоў (дарэчы, газета не пашкадавала месца, каб стрэл прагучаў як гарматны).

Дзіўна, што ні аўтар, ні выданне не пасаромеліся,

не пастрымаліся гэта змясціць, дакладней, змясціць у *такой* падачы, з *такім* «разуменнем» складанай і вострай праблемы наогул, і ў Беларусі — пагатоў. Гаворка — паслухайце! — сыходзіць на тое, што нашай дзяржаве не варта эмацыянальна рэагаваць на шум «зялёных», а захаваць статус-кво, гэта значыць, усё як ёсць.

Хочацца ўскрыкнуць: «Дзе ты жывеш, Яраслаў? Ці думаеш, што гаворыш? Рэагаваць — на што?.. Ты чуеш голас беларускіх «зялёных»? Іх пратэсты, патрабаванні? Або, можа, падпісанне краінай чарговых міжнародных канвенцый — на доступ да экалагічнай інфармацыі ці, прыкладам, на захаванне водна-балотных аб'ектаў — здольнае аслабіць беларускую эканоміку, бо развяжа рукі мясцовым «зялёным дыверсантам»? Дый выраз — «не варта эмацыянальна рэагаваць...» — вельмі ўжо нагадвае трагічны чарнобыльскі красавік–1986 і сумнапамятную рэакцыю на падзеі камунапартыйных босаў...

У публікацыі Я.Раманчука цікавыя не аргументы (іх папросту няма), а перш-наперш — прырода яе ўзнікнення. Не скінеш з шаляў разваг той факт, што Я.Раманчук — адзін з лідэраў Аб'яднанай грамадзянскай партыі. Няўжо і партыя, якая ідзе да ўлады, услед за сваім эканамічным стратэгам збіраецца блакаваць рэкамендацыі вучоных-эколагаў, напрыклад, па экалагізацыі эканомікі, якая на працягу дзесяцігоддзяў пакідае, вобразна кажучы, бульдозерны след на абліччы прыроды, даўно ўходваючы багацці, якія належаць нашым нашчадкам? Гэтым самым Я.Раманчук быццам падпісвае сабе прысуд як палітыку. Што асабліва характэрна, згадваючы амерыканскага вучонага, ён не згадвае ніводнага прыклада айчыннай практыкі. Чаму? Ці не таму, каб, не абцяжарваючы масавую свядомасць «лішнімі» дробязямі, запусціць ідэю «захавання статус-кво»? Інакш ягоны прадукт не будзе адпавядаць належным у гэтым выпадку таварным паказчыкам (...).

# Пра адзін кадравы зрух (з пралогам і маналогамі)

Газета «Белавежская пушча» 2000

ПРАЛОГ

Улада схлусіла зноў. На пасаду генеральнага дырэктара нацыянальнага парка «Белавежская пушча» прызначаны Яўген Смактуновіч. Патомны пушчанец. Тут нарадзіўся і вырас, тут працавалі ягоныя бацька і дзед. Гэта праўда. Няпраўда там, дзе ўлада спрабуе звязаць гэты кадравы зрух з нібыта зычлівымі намерамі і дбайным сваім слугаваннем на карысць Белавежскай пушчы.

Праўдай гэта было б гадоў колькі назад, калі «асабліва ахоўны» лес чакаў гаспадара-беражліўца, гаспадара-заступніка, і Яўген Смактуновіч тэарэтычна мог тады стаць кіраўніком парку. Аднак не стаў, бо планаваўся лесазнішчальны праект, пад які Пушча і прыдбала статус нацыянальнага парка замест запаведніка (на запаведніку настойвала акадэмічная навука).

Дырэктарам паставілі калгаснага старшыню, ён пераехаў у Камянюкі з Магілёўскай вобласці. Васіль Патапавіч Жукаў — свяціла фарбай новае імя на візітоўцы Кіраўніцтва спраў прэзідэнта — трымаўся пэўна. За ім стаяла ўлада, якая сказала яму, што рабіць і як сябе паводзіць. Пабудавала файны асабняк (затым дазволіла прыватызаваць), навучыла крывадушна маўчаць, а мінулай вясной аддзячыла не абыякой пасадай у Мінску. За гады службы «кадр» падпісаў плойму неабходных кантрактаў (чаго варта закупка і размяшчэнне высокапрадукцыйнай піларамы!), бліскуча забяспечыў уладны рэжым здольнасцю рабіць тое, што «там» загадаюць, і ў рэшце рэшт, калі час надышоў, знік з «пажыўнага месца».

Я.Смактуновіч апошнія тры гады быў галоўным ляснічым нацыянальнага парка. Добра ведае след Івана Ціцянкова ў Пушчы, прайшоў і адпаведную «школу» стасункаў з разнамасным чыноўным началь-

ствам. Да яго прыгледзеліся і хутка скемілі: добрае, пакуль незаплямленае імя і патэнцыял Смактуновіча сёння патрэбныя больш уладзе, чым Пушчы. Пушчай нахабна пакарысталіся, цяпер улада будзе рабіць выгляд, што «біясферным запаведнікам» (паралельная назва нацыянальнага парка) кіруюць сумленныя людзі. З мясцовых, пушчанцы. Выпраўляюць дапушчаныя памылкі, берагуць гонар і славу адвечнай карміцелькі і заступніцы дзядоў-прадзедаў. Новы дырэктар пачне паціху закрываць рабаўніцкія кантракты, вяртаць Пушчы незваротнае, а ўладным чыноўцам з адміністрацыі — добры выгляд твару, па якім яны, мусіць, вельмі занудзіліся.

Гэта я не пра Яўгена Смактуновіча. Ягоныя сапраўдныя выпрабаванні толькі пачынаюцца. Я — пра сённяшнюю ўладу, якая хоча, каб усё пайшло па яе сцэнары, поўным крывадушнага зместу.

Як пойдзе і ці спраўдзіцца сцэнар замятання слядоў, хутка пабачым.

Тым часам я ўспамінаю першую сустрэчу з ветэранам і знаўцам Пушчы, паслядоўным і ўпартым заступнікам яе каштоўнасцяў і багацця Уладзімірам Дацкевічам. Тады, у 1996 годзе, ён вельмі цёпла адазваўся пра Яўгена Смактуновіча. Праўда, не цешыў сябе надзеяй, што без палітычных зменаў можна нешта змяніць у Пушчы.

Гэтыя колькі слоў ад сябе я і прапаную ў якасці пралога — актуальнай падставы да нашых гутарак з Уладзімірам Апанасавічам у яго хаце, на адной з ціхіх вулічак Камянюкаў.

### МАНАЛОГІ УЛАДЗІМІРА ДАЦКЕВІЧА. 1998-2000

#### Пнёвыя краявіды

— Прычакаем вясны, пойдзем, я пакажу вам гэтае месца. Вы ўбачыце на свае вочы, як падае скальны дуб. Яшчэ трохі часу, і гэты найкаштоўны асяродак лесу адыдзе ў нябыт. Надзіва рэдкая супольнасць Пушчы, яе мы хутка не ўбачым. Страта незваротная.

Бо сыходзіць вада. Уяўляеце, крыніца Жыцця пакідае Пушчу. Прычым, на пагоркавым месцы. Крыні, бывала, выходзілі прама наверх. Ручайкі беглі, цэлыя рэчкі. Дагэтуль відаць зарослыя рэчышчы. Вадзіліся качкі. Было балота. Дзе-нідзе засталіся рэшткі, нейкая крыха вады сям-там пакуль точыцца. Тут, каля гэтых крыніцаў, дрэвы яшчэ стаяць. Але гэта ўжо стан выжывання. Лічы, канец. Далей ад крыніц — спрэс адміраюць. Пнёвыя краявіды. Праз дзесяць гадоў не застанецца і гэтага следу.

Хоць вазьміце па-людску!

— Я ўжо амаль зміры́ўся. Але злуе двурушнасць функцыянераў, якія ў Пушчы за гаспадароў. Дураць народ. Я разумею, Пушча пачала падаць. Чалавек зрабіў чорную справу — і гэта мусіла стацца. Ні волі, ні спосабу ўратаваць становішча ў цяперашніх уладаў няма. Падзенне будзе працягвацца. Але афіцыйная палітыка не прызнае гэты факт публічна — адміністрацыя спяшаецца пагрэць рукі. Толькі ж і тут усё на хворую галаву, пачварна, у нейкай шалёнай бязглуздай спешцы. Здарылася бяда — дык хоць вазьміце, што магчыма, па-людску. Я ўжо не кажу, што трэба дзень і ноч думаць, як прыпыніць дэградацыю, заняпад. Пра гэта забыліся думаць, забыліся ратаваць. Але ўжо калі браць, дык бярыце з толкам.

Што робяць яны? Купілі ў прыватніка-немца бэвэшную лінію, кінулі на яе аграмадныя грошы, богведама, што ў рэшце рэшт атрымаецца і як той крэдыт акупіцца — гэта не жарт. Даваць жа трэба якасць, варты прадукт. А каму тут ёсць рабіць? У гэтай сістэме прадпрыемства такога кшталту працаваць не будзе. Кваліфікацыя рабочых — раз. Дый народ пайшоў апівошны, жадання працаваць няма. Абы дзень да вечара. Калі хто талковы — яму не будзе ходу, ён не прыжывецца, не захоча рабіць бясплатна, пойдзе шукаць лепшае. Адкуль быць якас-

ці? А хто купіць дзярмо? Словам, тэхналогіі і працоўная сіла не гатовыя даць канкурэнтаздольны, варты прадукт. З адпаду, калі на тое, можна азалаціцца. Але ўявіце, якія змены патрэбны, каб у нашых умовах адбыўся гэтакі цуд.

Як «іх» назваць?

— Напачатку я думаў, што многія ў Пушчы не разумеюць, што твораць. Прыгледзеўся, некаторых паслухаў. Хто больш прагрэсіўны і з жалем на гэта глядзіць, той разводзіць рукамі. Маўляў, што зробіш супраць дурняў.

Але гэта не так. Тыя «дурні» цудоўна разумеюць, што яны робяць. Канешне! Кажуць, маўляў, дырэктар — былы старшыня калгаса. Яно так. Але ж ані не дурань, не прафан. Абсалютна. Яшчэ які не прафан! Будзь здароў! Я запэўніўся ў гэтым не раз. Ён цудоўна ўсё разумее.

І законы вывучыў на зубок. Каб ведаць, што парушае. І парушае! Бо ў яго развязаны рукі. Ведаеце, тут даўно прыжыўся інструмент застрашэння людзей — паспрабуй пікні, скажы што супраць... Яму і далі гэткую ўладу, каб ён падаўляў і застрашаў.

Як яго назваць — жулікам ці неяк яшчэ? Не ведаю. Але гэта далёка не дурань і не прастак. Усе гэтыя тытулы і дыпломы, якімі ўганараваная Пушча, для яго ўсёадно што гульня ў карты. Ён даўно зарыентаваўся, як сябе паводзіць і якія словы казаць высокай грамадскасці, у тым ліку экспертам Рады Еўропы. Ён зробіць правільны выгляд і скажа тое, што ад яго хочуць пачуць. Паходзіць той самай «картай» і нават вокам не міргне.

Аванс для разумных

— Вы думаеце, што замежныя эксперты ў гэтым не разабраліся? Ва ўсім разабраліся. Але ж ім трэба неяк стымуляваць, спанукаць цывілізаваную дзейнасць, беражлівыя адносіны да таго, што хоць неяк ацалела,

таму ідуць на гэта. З аднаго боку, прызнаюць каштоўнасць, з другога — ствараюць пэўныя рамкі дзейнасці. Што ані не значыць, быццам яны ў захапленні ад убачанага альбо гэтак высока ацэньваюць зробленае. Гэта разумны аванс на ўразуменне людзей.

А як было ўсё пададзена і разрэкламавана: дыплом! за заслугі! вось мы захавалі! вось як мы ўмеем! вось мы якія! і гэтак далей. Дыплом Еўропы быў чарговы раз скарыстаны для далейшага фальшавання і прыкрыцця гаспадарчага ўціску на Пушчу.

На ўмовы і рэкамендацыі заплюшчылі вочы. Каму трэба захоўваць умовы ці прыслухоўвацца да рэкамендацый? І хто будзе гэтым цікавіцца? Урад, парламент?..

Праўдзівая карціна

— Бяруся даказаць на фактах, што пачынаючы з 1957 года* ніводнае мерапрыемства ў Пушчы, якое санкцыявалася адміністрацыяй, не было прыродаахоўным. Скажыце, што сёння ёсць прыродаахоўнага ў Белавежскай пушчы? Стаяць шлагбаумы, якія абмяжоўваюць доступ... каго? Непатрэбных адміністрацыі асобаў. Астатнія — колькі заўгодна і дзе заўгодна. Доступ абсалютны! Раз'язджаюць як па ўласнай фазэндзе. Адно што — з дазволу адміністрацыі. Хіба гэта не ўплывае на стан Пушчы? Яшчэ як! І загазаванасць, і тлум, і паруха лясной цішыні, і align рознае іншае. Якая прыродаахова? Апроч рубак, у лесе іншых работ няма. Нарыхтоўкі набылі перманентны характар і пануюць тут непадзельна. Вы можаце ўявіць сабе карціну: запаведны лес, дзе бензапілы глушаць рокат матораў?..

* У гэтым годзе запаведнік «Белавежская пушча» спыніў сваю дзейнасць. Наўзамен была створана зусім невядомая тады структура — дзяржаўная запаведна-паляўнічая гаспадарка (праіснавала да 1991 года) .

Ці ўратуем хоць рэшткі?

— Па вайне, як не стала вузкакалеек, Пушча зрабілася недасягальнай. Старыя дарогі, яшчэ ад царскіх паляванняў, ператварыліся ў кісельную масу, сталі непраезнымі. Хіба на кані як-небудзь, на ровары.

Цяпер жа — асфальт. Тысячы кіламетраў дадатковых дарог. Поўная дасягальнасць. Толькі газуй. Так званыя санітарныя рубкі — гэта падман, тралююць жа лес выключна трактарамі. Адно — што бязбожна сякуць, другое — нішчаць, коўзаючыся, страты ад гэтага куды большыя.

Каб хоць тое, што ацалела, неяк ўратаваць! Не рассеем мы гэты міф, не данясём горкую праўду пра Пушчу, яе гаротлівы сённяшні стан, — мы не ўратуем і рэшткі.

## Ёсць такі нацыянальны парк! Па нарошчванні аб'ёмаў вытворчасці піламатэрыялаў

Газета «Белавежская пушча» 2000

ПАРУШЭННІ, ЯКІХ НЯМА

«Сам я з Жыткавіч і гэтую праблему добра ведаю, — заявіў падчас наўпроставай лініі па Радыё-1 міністр прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Міхаіл Русы, адказваючы на запыт слухача з выпадку высечак поймавых дуброў у нацыянальным парку «Прыпяцкі». Міністр катэгарычна не пагадзіўся з тэлефонным суразмоўцам. Працытуем адказ міністра, зняты на дыктафонную стужку падчас этэру:

«Дубровы спілаваныя не да стварэння нацыянальнага парка, а 25 гадоў таму. Я хацеў бы запабегчы ўсе далейшыя тэлефанаванні на гэты конт, бо досыць часта даводзіцца чуць такое: раз там прадпрыемства Кіраўніцтва спраў прэзідэнта, значыць, абавязкова парушэнні. Няма там парушэнняў. Па даручэнні на-

шага Прэзідэнта і па просьбе кіраўніка спраў мы ўзялі пад самы жорсткі кантроль усе нацыянальныя паркі. Дуб завозіцца туды з іншых тэрыторый, іншых дзяржаў, і калі вядзецца высечка, дык толькі на тых дзялянках, якія не ўваходзяць у зону нацыянальнага парка. Таму хачу запэўніць: што датычыць дуба ці іншых асабліва каштоўных гатункаў, у нас тут будзе парадак».

Аргументы Міхаіла Іванавіча выглядаюць, мякка кажучы, як вельмі дзіўныя. У іх, нібыта ў люстэрку, адбітак тыповага мыслення наменклатурнага бюракрата.

*Аргумент першы, падхалімажны:* па даручэнні нашага Прэзідэнта...

Ды ёсць жа Канстытуцыя і закон Аб асабліва ахоўных прыродных тэрыторыях і аб'ектах, Канвенцыя аб біялагічнай разнастайнасці, у рэшце рэшт, сумленне і абавязкі міністра, а Вы, Міхаіл Іванавіч, кіруецеся нейкімі ўскоснымі даручэннямі даволі прыватнага кшталту (адмысловага ж «указа» не было).

*Аргумент другі, бюракратычны:* узялі пад самы жорсткі кантроль...

Чыста паперкавая дэкларацыя і амбіцыйная чыноўніцкая самаўпэўненасць. Бо ўзяць пад жорсткі кантроль досыць аддалены аб'ект сёння надзвычай цяжка, каб так адназначна рапартаваць пра адсутнасць там парушэнняў.

*Аргумент трэці, бязглузды:* дуб (для паркетнай вытворчасці — *в.д.*) завозіцца з іншых тэрыторый, іншых дзяржаў...

Скажыце, людзі добрыя, навошта тады ў нацыянальным парку, на асабліва ахоўнай прыроднай тэрыторыі ствараць паркетны цэх ды іншыя «леспрамгасаўскія» вытворчасці? Каб затым трымаць яго на прывознай сыравіне? Можа ў гэткім разе лепш падумаць пра больш адпаведную назву і самой запаведнай тэрыторыі — напрыклад, нацыянальны парк па дрэваапрацоўцы і вытворчасці паркета...

Выглядае, што міністр, парыруючы заўвагу радыёслухача, праігнараваў літару Закона аб асабліва ахоўных прыродных тэрыторыях і аб'ектах, які арыентуе нацыянальныя паркі на прыродалюбную і прыродаахоўную дзейнасць, а не гаспадарчую з відавочнымі фактамі вынішчэння біялагічнай спадчыны.

*«Кіраўніцтвам прадпрыемства прымаюцца ўсе магчымыя меры па нарошчванні аб'ёмаў вытворчасці піламатэрыялаў, у першую чаргу па экспартных пастаўках...»* — чытаем ліст генеральнага дырэктара нацыянальнага парка С.Бамбізы кіраўніку спраў прэзідэнта.

Гэтаму дакументу-сведчанню не, не дваццаць пяць гадоў, на якія спасылаўся міністр. Яшчэ і года няма...

ПАЕЗДКА Ў ТУРАЎ

Магчыма, міністр М.Русы ўжо пашкадаваў, што сказаў не тыя словы. Аднак я далёкі, каб лёгка-паблажліва дараваць гэта высокаму дзяржаўнаму чыноўніку. Перад мільённай аўдыторыяй ён сказаў людзям няпраўду, больш за тое: свядома і настойліва падкрэсліў нявіннасць сучаснай сістэмы і таго рэжыму, які прагнівае да апошняга сучка. Гэтая няпраўда — ці не апошняя кропля, якая перапаўняе цярпенне. Міністр М.Русы добра ведае парушэнні не толькі ў «Прыпяцкім», але і ў іншых мясцінах беларускай нацыянальнай запаведнасці.

Праз колькі дзён пасля перадачы я выехаў у Тураў, дзе месціцца сядзіба нацыянальнага парка, каб на свае вочы пабачыць тыя парушэнні, якіх *няма*, — перш-наперш так званыя санітарныя рубкі. У ваколіцах вёскі Хваенск мясцовыя жыхары паказалі мне жывыя раны Вашай радзімы, Міхаіл Іванавіч. Тут, у «прамзоне» нацыянальнага парка, мяне акружалі свежыя пні векавых дубоў, а на зямлі дзе-нідзе яшчэ ззяла пілавінне. Адно з наймагутных дрэў засталося нявывезенае, і я моўчкі пастаяў каля яго, намагаючыся засвоіць сэнс паняцця «санітарныя рубкі». Гэта было

прыгожае роўнае жывое дрэва, якое так рана пайшло пад нож у запаведаным (!) куточку Палесся. Вы не адчуваеце сваёй здрады, Міхаіл Іванавіч, калі мімаходзь згадваеце свой родны куток, якому прэзідэнцкія службы даўно і планавана ладзяць Майданэк, а Вы паслужліва яго апраўдваеце? Я разумею, сёння цяжка выбіраць паміж праўдай і пасадай міністра, паміж самастойнасцю і абніжанай годнасцю. Аднак, нагадаю і сваім чытачам, і Вам, Міхаіл Іванавіч, што недзяржаўная прэса дзеля таго й існуе, каб, у прыватнасці, засведчыць той факт, што выбар гэты міністр Міхаіл Іванавіч Русы зрабіў.

УВАГА! ДАКУМЕНТ ПРЫВОДЗІЦЦА Ў «ЖЫВЫМ» ВЫГЛЯДЗЕ

Інфармацыя па знешнеэканамічнай дзейнасці нацыянальнага парка «Прыпяцкі».Па стану на 1 студзеня 1999 г.

1. Піламатэрыял абрэзны (хвойных парод) — «Констдрэў» (Польшча), м куб. — 7.000, кошт — 168 ДМ, сума кантракта 1.176.000, факт. адгружана 2.320,2.

2. Піламатэрыял абрэзны (хвойных парод) — «Timcon» (Нідэрланды), м куб. — 5.000, кошт — 450 ДМ, сума кантракта 2.250.000, факт. адгружана 35,4.

3. Піламатэрыял абрэзны (хвойных парод) — «Град б.в.» (Нідэрланды), м куб. — 30.000,— $100, сума кантракта 3.000.000, факт. адгружана 144,05.

4. Піламатэрыял неабрэзны (хвойных парод) — «Ганна Маеўска» (Польшча), м куб. — 400, кошт — $85, сума кантракта 34.000, факт. адгружана 74,87.

5. Піламатэрыял неабрэзны (хвойных парод) — «I.POPP» (Германія), м куб. — 1200, кошт — 179 ДМ сума кантракта 214.800, факт. адгружана 56,67.

6. Піламатэрыял абрэзны (вольха) — «TINEZ plus» (Чэшская рэспубліка), м куб. — 31.150, кошт — 200 ДМ, сума кантракта 6.230.000, факт.

адгружана 11,82.

7. Піламатэрыял абрэзны (хвойных парод) — «Ван Веллерс — Хоутангенурон» (Нідэрланды), м куб. — 3.000, кошт — 170 ДМ, сума кантракта 510.000, факт. адгружана 64,24.

8. Піламатэрыял абрэзны (хвойных парод) — «Канікула» (Малдова), м куб. — 2.300, кошт — 160 ДМ, сума кантракта 368.000, факт. адгружана 37,7.

9. Вугаль драўнінны — «SIGOTRONICS Gmbh» (Германія), тон — 30, кошт — 300 ДМ, сума кантракта — 9.000. факт. адгружана 13,26.

Фрагменты ліста
кіраўніку спраў прэзідэнта
Ціцянкову І. І.* Тураў, 1999

«У цяперашні час у Нацыянальным парку «Прыпяцкі» па раду аб'ектыўных прычын не выконваецца графік пагашэння валютнага крэдыту ў доларах ЗША, атрыманага ў Гомельскім абласным упраўленні АСБ «Беларусбанк» у 1996 годзе з тэрмінам пагашэння ў жніўні 2001 года».

І далей:

«Кіраўніцтвам прадпрыемства прымаюцца ўсе магчымыя захады па нарошчванні аб'ёмаў вытворчасці піламатэрыялаў, у першую чаргу па экспартных пастаўках...»

Генеральны дырэктар *С. М. Бамбіза*

ТОЛЬКІ ЛЯНІВЫ МОЖА НЕ ВЕДАЦЬ... ЯК УЛАДА ГУБІЦЬ ЗЯЛЁНУЮ СПАДЧЫНУ БЕЛАРУСІ

Гадоў колькі таму міністр Русы ў тэлеперадачы «Сёння з вамі», гэтак жа парыруючы пытанне аўдыторыі ў дачыненні экалагічнай абазнанасці насельніцтва і доступу людзей да адпаведнай інфармацыі, падсумаваў:

* Друкуецца з максімальным захаваннем арыгінала.

«Сёння толькі лянівы можа не ведаць...». Гэта азначала з кантэксту, што міністр тут не бачыць праблемы, інфармаванасць беларускіх людзей у пытаннях, скажам, экалагічнай бяспекі ўжо вырашаная. Нечуваная безадказнасць і неразуменне вялікай праблемы!

І гэта не адзіны выпадак, калі праблема — надзвычайная, а М.Русы яе не бачыць. Прыгадваю пасаж Міхаіла Іванавіча — ужо на хлебе міністра — падчас канферэнцыі ў Стоўбцах (тут ён крыху раней быў першым сакратаром райкаму). Параўноўваючы Беларусь з «розным Захадам», міністр экалогіі запэўніў, што вада ў Нёмане такая чыстая, што яе можна піць без наступстваў.

Што тут сказаць? Такія міністры — анёльскія стварэнні для сённяшняга рэжыму, кішэннага парламента і талерантнага народа. Няма парушэнняў — іх прыдумляюць «зялёныя», няма праблемаў — іх стварае апазіцыя. Адчуваеце, з якіх нябёсаў гэтыя «анёлы»? Аднак жа: калі ва ўлады кружыцца галава ад райскай вады і райскага паветра, у нас яна закружыцца ад нечага іншага.

## «Дремучее дело» временщиков

«Белорусская деловая газета», июль 2001

В семи кварталах национального парка «Беловежская пуща» начались сплошные санитарные рубки общей площадью 50 гектаров. Таков итог многолетнего «рачительного» хозяйствования Управления делами Президента на заповедных территориях Беларуси.

Решение о сплошных санитарных рубках принято келейно, на основании так называемого «Акта о результатах обследования еловых насаждений», в обход Научно-технического совета парка и Национальной Академии наук Беларуси. Среди подписавших данный акт есть, однако, и ученые: Я.Марченко (гос-

учреждение «Беллесозащита» Министерства лесного хозяйства), А.Блинцов (Белорусский государственный технологический университет), А.Лучков и А.Максимович (Управление делами президента).

Производственно-хозяйственный прессинг на так называемую «особо охраняемую» территорию связан скорее всего с долговой ямой, в которую попал национальный парк. В 1999 году, когда делами Президента заправлял незабвенный куратор заповедных просторов Беларуси Иван Титенков, у немецкого предпринимателя была куплена «бэушная» высокопроизводительная пилорама, рассчитанная на так называемую сырорастущую древесину, что еще более стимулировало и без того имеющие место тенденции вандализма в Пуще. Однако больше всего сегодня жмут долги за авантюрную покупку, огромные проценты в виде ежемесячных выплат. Большие деньги были взяты в кредит якобы «под гарантию президента».

Три месяца назад в национальном парке произошла смена руководства: Евгения Смоктуновича, потомственного лесовода из рода пущанцев заменил Николай Бамбиза, закалённый на производственно-хозяйственном освоении другой особо охраняемой территории — национального парка «Припятский», где он много лет пребывал в должности гендиректора, пока не возглавил белорусский рыбнадзор, откуда его и «выудила» три месяца назад управляющая делами Галина Журавкова.

Дремучее дело о сплошных рубках раскручивается с каждым днем и угрожает не только колоссальными потерями биоразнообразия наиболее сохранившегося уголка зеленой Атлантиды, но и большими моральными издержками. Нельзя забывать, что 80 процентов лесов Беловежской пущи — это первичные леса, которые образовались естественным путем и формировались под воздействием природных процессов без вмешательства человека. Нынешние держатели Пущи пытаются бесстыдно забыться, что

распоряжаются эталонным богатством страны, занесенным в Список объектов наследия человечества и получившим статус биосферного заповедника. Временщики. Им надо успеть взять, пока в стране беспредел, пока не настали грозящие перемены. Преступное, чумное забытьё.

Инициативная группа «Асацыяцыя беларускіх зялёных» призывает общественность встать на защиту природного национального достояния. Два месяца назад газета «Белавежская пушча» и её Общественный совет, руководствуясь принципами Орхусской конвенции о доступе граждан страны к экологической информации, правосудию и процедуре принятия решений, обратились в Администрацию Президента с инициативой совершения пресс-туров на территории, подвластные Управлению делами Президента. Были намечены поездки журналистов и представителей «третьего сектора» в Беловежскую пущу, национальный парк «Припятский» и Березинский биосферный заповедник для ознакомления и открытого диалога на местах. За их проведение проголосовало 75 участников слета «зеленых» Беларуси. Реакции со стороны президентских структур до сих пор не последовало.

Группе, на днях побывавшей в Пуще, стало известно, что на посещение объекта мирового наследия начали налагаться запреты. Пока выборочно. Администрация парка ссылается на проведение работ, связанных с «реконструкцией леса».

## Хопіць лускаць гранты ў дупле

ДА І ЗЛЁТУ «ЗЯЛЁНЫХ»

Спецвыпуск альманаха «Зялёны край» 2001

Зялёны рух, які мы сёння маем, я параўнаў бы з цяперашнім кішэнным парламентам — прыродная спадчына галее, нішчыцца, мізарнее, а дзесьці ў фе-

шэнебельным царстве ідуць бясконцыя гаворкі з перапынкамі на каву-брэйк. Далей канстатацыі фактычнага становішча (у лепшым выпадку) справа ж не рушыць.Такі «экалагічны менеджмент» толькі на руку антыэкалагічнай дзяржаве.

Не дзіва, што «зялёнае» дрэва апошнія гады дало плодны ўраджай бесканфліктных арганізацыяў, якія нічога ніколі не баранілі і не адстойвалі, апроч хіба нейкіх асабістых інтарэсаў. Яны «прыйшлі па грошы», замежныя стажыроўкі ці які іншы кайф. Толькі — не абараняць, не лезці ў бойку з уладай. На канфлікт або нейкі скандал у іх устойлівая алергія, з іхняга разумення даўно знікла такое паняцце як ратаўнічая экалогія ці процідзеянне, а «пікет» для іх гучыць як лаянка з дзяржаўнай адміністрацыяй.

Прыгадаю адзін характэрны прыклад. Прыканцы мінулага года я быў сведкам (і ўдзельнікам) канферэнцыі «Экалагічныя і маральныя праблемы асабліва ахоўных тэрыторый». Ладзілі яе чатыры арганізацыі, адна з якіх — Беларускі сацыяльна-экалагічны саюз «Чарнобыль». Гэтая арганізацыя і была закапёршчыкам. Падтрымала акцыю Прадстаўніцтва ААН у Мінску. Гэта, пэўна ж, абнадзейвала. Праўда, сярод тых, хто «падтрымаў», стаяла і Кіраўніцтва спраў прэзідэнта. І што атрымалася? Актуальнасць пытанняў была ад пачатку размытая аморфным сочывам слоў, за якім ледзьве праглядалася тэма, не кажучы пра «маральны» выбар. Вастрыня праблемы, уся канфліктнасць сышлі на задні план, а калі дзе і праглядаліся, дык у гэткай «уладабаязнай» форме, што рабілася брыдка і прыкра за наш нібыта «зялёны рух». Але найбольш абурала нават не гэта. «Памылкай» арганізатараў было тое, што ключавая працэдура — працэдура ўдзелу — забяспечыла прысутнасць прэзідэнцкіх спраўнікаў і цалкам выключыла ўдзел прадстаўнікоў навуковых аддзелаў нацыянальных паркаў і Бярэзінскага біясфернага запаведніка. І вось вам: на канферэнцыі адкрыта лабіраваліся амараль-

ныя рацыі Кіраўніцтва спраў, а не пазіцыі незалежнага маральнага выбару. Дык на каго спрацавала грамадская арганізацыя? На што патрачаны грошы? І ці ёсць на Беларусі «зялёны» рух?

Момант ісціны, аднак, палягае на тым, што рэзерв публічнасці і адкрытасці актуальны ў абодвух выпадках: і калі рух наступальны, выразны, і калі зусім кволы. Замоўчванне нават самых нязначных эпізадычных патужнасцяў грамадства на захаванне біялагічнай спадчыны і адстойванне бяспекі свайго пражывання ў навакольным асяроддзі ёсць добрай паслугай тым, хто кіруе дзяржавай, хто бязбожна рабуе яе багацці, хто ігнаруе права чалавека на жыццё. З большага такі малюнак мы і бачым: зялёны рух кволы, ён неадэкватны рэальнасцям асяроддзя.

Прыйшоў час заўважыць адну з самых пагражальных тэндэнцый апошніх 5-8 гадоў: няўрадавых экалагічных арганізацый становіцца больш, іх дзейнасць робіцца праектаскіраванай і заахвочанай грантадаўцамі, а прырода, нашы біясферныя каштоўнасці, навакольныя асяродкі застаюцца неахаванымі, мізарнеюць з-за традыцыйных і новых форм эксплуатацыі, негатыўнага ўздзеяння — іх практычна ніхто не бароніць.

Трэба тэрміновым чынам мяняць тэндэнцыю. Інакш нават тыя невялікія сродкі, якіх пакуль для нас не шкадуюць фундацыі Захаду, пойдуць намарна, будуць перахопліваецца спрытнымі функцыянерамі трэцяга сектару, якія прыйшлі абслугоўваць грамадскі экалагічны рух і... практычна выціснулі яго, зрабілі гэты рух нежывым, няздольным да абаронных акцый, да супраціву. Як у вядомым сюжэце, толькі наадварот: «зялёны фронт» зачынены, усе пайшлі на ... фуршэт. Застольна-фуршэтны кірунак «дзейнасці» нагэтулькі спадабаўся, што пра пікеты ці іншыя формы пратэсту даводзіцца хіба ўспамінаць. Тых, хто лепш пачуваецца на фуршэтах, чым на высечках падахоўных дуброў з плакатам у руках, на жаль, больш чым трэба.

Ёсць грамадскія арганізацыі, якія існуюць не так даўно і паспелі «асвоіць» дзесяткі тысяч долараў заходніх падаткаплацельшчыкаў. Ёсць вельмі здатныя спецыялісты па напісанні заявак і справаздач. Куды менш — цікавых праектаў у натуры, публічных узораў прыродаахоўнай патужнасці.

Згадаем агульны стан нашых запаведных тэрыторый, дзе з рукі дзяржаўных авантурыстаў ці не ўсё рабілася ў абыход грамадскай і навуковай думкі, з парушэннем заканадаўства. Тым часам беларускія «зялёныя» не пажадалі нават высоўвацца — лузалі свае «гранты» ў дупле, пакуль у Белавежскай пушчы не збудавалі супер-піляраму.

Па-ранейшаму застаюцца без заступнікаў нашы водныя крыніцы, лес, на якія б першым чынам мусілі распаўсюджвацца праекты-SOS.

Гаворка нават не пра тое, што паездка за мяжу — гэта дрэнна; гаворка пра тое, што грошы, якія заходнія падаткаплацельшчыкі ахвяруюць на нашы цяжкасці, па-першае, вельмі часта адмываюцца «грантаэлітай», якая лоўка арыентуецца ў гэтых грашовых патоках, прыўлашчваюцца і дзеляцца на «сваіх», а па-другое, гэтых сродкаў надта мала, каб ігнараваць праблему прыярытэтнасці праектаў, іх конкурснасці і адкрытасці працэдураў адбору і маніторынгу выканання.

Сёння трэба казаць пра стварэнне дасканалых каардынацыйных механізмаў, якія б з’арыентавалі замежныя фундацыі на нашы самыя балючыя патрэбы, зрабілі конкурсы экалагічных праектаў больш адкрытымі і кантраляванымі грамадскасцю. (Дэкрэт №8 таму і ўзнік, каб перахапіць ініцыятыву ў трэцяга сектара, не дапусціць якіх-кольвек пазітываў, а грабануць мядзьведжай лапай. Тады ні мёду, ні пчольніку). Блізка гэтай праблемы і паўстала ідэя «Асацыяцыі беларускіх зялёных». Нехта ж за гэта павінен брацца, несці адказнасць і калі трэба — званіць у званы.

# У Адміністрацыі прэзідэнта згубіўся ліст беларускіх «зялёных»

Газета «Народная воля» 2001

Як адзін з аўтараў гэтага задаўненага ліста, зважаючы на бюракратычную неахайнасць прэзідэнтскай адміністрацыі, мушу праз «Народную волю» цалкам давесці да грамадскасці ягоны змест. Мяркую, гэта будзе цікава чытачам па дзвюх прычынах. Па-першае, каб запэўніцца, што, насуперак падпісанай нашай краінай у 1998 годзе Орхускай канвенцыі аб доступе насельніцтва да экалагічнай інфармацыі і прыняцця рашэнняў, прэса Беларусі пазбаўлена праўдзівых сталых крыніц, дзе можна чэрпаць своечасовую і аб'ектыўную інфармацыю. Па-другое, літаральна апошнім часам з неафіцыйных крыніц сталі вядомыя факты чарговага ўціску на беларускія прыродныя тэрыторыі, што з'яўляюцца асабліва ахоўнымі, — Белавежскую пушчу і нацыянальны парк «Прыпяцкі». У звязку з гэтым актуальнасць ініцыятывы «зялёных» не выклікае сумневу.

Але спачатку ліст:

Аб ініцыятыве правядзення прэс-тураў у Белавежскую пушчу, нацыянальны парк «Прыпяцкі» і Бярэзінскі біясферны запаведнік.

Газета «Белавежская пушча» і яе Грамадская рада, кіруючыся прынцыпамі Орхускай канвенцыі, а таксама шэрагам іншых норм, якія гарантуюць грамадзянам Беларусі доступ да экалагічнай інфармацыі і прыняцця рашэнняў, прапануе Вам разгледзець пытанне аб наведанні прыродных аб'ектаў групай журналістаў і прадстаўнікоў грамадскіх арганізацый (колькасць 15 і больш чалавек). Прапануюцца ў якасці такіх аб'ектаў нацыянальны парк «Прыпяцкі», Белавежская пушча і Бярэзінскі біясферны запаведнік.

Як вядома, дзве асабліва ахоўныя тэрыторыі — Белавежская пушча і Бярэзінскі біясферны запаведнік — маюць Еўрапейскі Дыплом. Захаванне ўмоў і рэкамендацый з нагоды атрымання Дыплома, а таксама патрабаванняў айчыннага экалагічнага заканадаўства і міжнародных дакументаў, падпісаных нашай краінай, несумненна, хвалюе журналістаў і шырокую грамадскасць Беларусі. Шматлікія крытычныя публікацыі ў прэсе не пакідаюць усіх нас абыякавымі да лёсу нацыянальных прыродных каштоўнасцяў, якімі перш-наперш з'яўляюцца запаведныя тэрыторыі і аб'екты.

Усе падрабязнасці і ўскладанне (размеркаванне) абавязкаў будзе дэталёва разгледжана сумесна, калі наша прапанова атрымае станоўчы водгук. Прэс-туры ў падтрымку Орхускай канвенцыі прапануем зрабіць у ліпені і жніўні гэтага года.

За правядзенне такога мерапрыемства прагаласавалі таксама 75 удзельнікаў Злёту зялёных Беларусі 19 траўня 2001.

Абмеркаваць план дзеянняў мы гатовыя ў самы бліжэйшы час.

*В. Дранчук,* галоўны рэдактар газеты

*А. Мікуліч,* старшыня Грамадскай рады

*М. Капран,* каардынатар Злёту зялёных.

Цяпер дазволю сабе кароткі каментарый.

Як рэдактару газеты «Белавежская пушча», мне даўно вядома, што дзейнасць самых тытулаваных беларускіх нерушаў пастаўлена ўладамі з ног на галаву. Найбольш яскравае пацвярджэнне гэтаму — «лесапільны» праект, спушчаны ў Белавежскую пушчу два гады таму (1999 год). Авантурны, рэдкі па сваім невуцтве «праект» сёння вельмі дорага абыходзіцца працоўнаму калектыву нацыянальнага парка, вымагае каласальных матэрыяльных і маральных выдаткаў, адцягвае сілы ад першачарговых задач. За непасільны крэдыт, узяты ў банку (лінія

дрэваапрацоўкі куплена ў Германіі), трэба тэрмінова расплочвацца валютай, тым разам і высакаякаснай драўнінай. Менавіта гэты матыў і спанукаў прызначэнне новага дырэктара нацыянальнага парка Мікалая Бамбізы, чалавека, загартаванага выключна на камерцыйна-гаспадарчым асваенні запаведных тэрыторый краіны. Раней у ягоным ачольстве знаходзіўся нацыянальны парк «Прыпяцкі». Добра вядомы шырокай экалагічнай грамадскасці вандальны почырк гэтага гаспадарніка не хавае намераў улады: узяць з Пушчы як мага хутчэй і самай поўнай жменяй. Узяць там, дзе ўжо не ляжыць, калі зважаць на Закон і нацыянальныя інтарэсы. Браць давядзецца не з аднае Пушчы, бо нават яна не задаволіць апетыт прагных авантурыстаў. Ёсць планы паласавацца і запаведнай прыпяцкай драўнінай.

Пра гэтыя ды іншыя факты газета «Белавежская пушча» пісала на працягу апошніх пяці гадоў. Па сутнасці, біла ў званы (да месца ўспомніць рубрыку «Голас Касандры»). Часам да публікацый спрабавалі прыслухацца, але зменам замінаў запанаваны палітычны ландшафт: рабунак прыродных багаццяў на запаведных тэрыторыях быў адобраны і часткова ўзаконены «бацькам», папаўняў і папаўняе далёка не празрысты бюджэт улады.Тым часам, невялікі наклад газеты «Белавежская пушча» (цяпер выданне часова не выходзіць) не даваў магчымасці разгарнуць інфармацыйную кампанію ў належным фармаце. Таму, трымаючы на ўвазе нарастанне пагражальных тэндэнцый у дачыненні асабліва ахоўных прыродных тэрыторый, газета ініцыявала прэс-туры ў слынныя нерушы Беларусі, каб і іншыя медыі, улучна з шырокім грамадскім прадстаўніцтвам, змаглі атрымаць інфармацыю з першых вуснаў ды паглядзець, як кажуць, усё на свае вочы.

Спадзяюся, пасля гэтай публікацыі аўтары ліста атрымаюць адказ з Адміністрацыі прэзідэнта. Што да пазіцыі Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы на-

вакольнага асяроддзя, тут прапанова газеты своечасова разгледжана. Прадстаўнікі Мінпрыроды абяцаюць удзел і неабходную інфармацыю.

## PS

Газета «Белавежская пушча», АДНАасобнік 2002

Нягледзячы на шматлікія напамінкі ды іншыя патрабаванні, аўтары ліста адказу не дачакаліся. Бюракратычная фізіяномія ўлады не паказала знешняй рэакцыі. Аднак ініцыятыва газеты «Белавежская пушча» была скарыстаная служкамі адміністрацыі па ўсіх правілах ліхадзейства, якое сёння культывуецца рэжымам. Менавіта — з мэтай ілжывай прапаганды і распаўсюджання «сваіх» антынавуковых і безальтэрнатыўных падыходаў. На прыканцы года групу журналістаў (паводле справаздачных публікацый, пераважна з дзяржаўных выданняў) завезлі ў Пушчу, каб паказаць ім на шашаля-караеда ды спанукаць адпаведны водгук у прэсе. Іншадумцаў, вядома ж, абышлі, аўтараў ліста не запрасілі.

## Ачаг нацыянальнага ўсыхання

АДКАЗЫ НА ПЫТАННІ ГАЗЕТЫ
«СВОБОДНЫЕ НОВОСТИ ПЛЮС»

Верасень 2001

СВОБОДНЫЕ НОВОСТИ. *Валеры, чым скончылася «дрымучая справа»? Што адбываецца ў Пушчы цяпер?*

В. ДРАНЧУК. Дрымучая справа ў Белавежскай пушчы не сканчаецца, бадай, з часоў Герцэна, мяняючы хіба што формы, і варварства будзе працягвацца, пакуль на нашай зямлі не скончыцца век чужой, дэспатычнай улады. Пытанне захаванасці нашых яшчэ не дабітых да ручкі запаведных тэрыторый, як, дарэчы,

і іншых нацыянальных каштоўнасцяў — цалкам, лічу, палітычнае. Асабліва што да Белавежскай пушчы. Тут улада скрозь кармілася і балявала, брала, колькі ўлазіла, і нішчыла, што хацела. Камуністычная крамлёўская эліта менш секла, а дзеля гарантаванага паляўнічага «шчасця», сабе на ўцеху пладзіла столькі звера, што ён з'ядаў Пушчу. Кебіч, калі за ім раскідалі запаведна-паляўнічую гаспадарку, не аддаў Пушчу вучоным-акадэмікам, а пагадзіўся на варыянт змовы — стварыць нацыянальны парк, тым самым абнізіць нават тую, лапікавую запаведнасць і яшчэ больш абдзіраць Пушчу. На гэта і выйшла. Не выйшла, адно што, Кебіча зрабіць прэзідэнтам. Але намеры яго ўладнага атачэння цалкам спраўдзіліся за Лукашэнкам і шмат у чым пераўзышлі сябе.

Дык вось, што цяпер? Ідзе ілжывая гульня пасля таго, як наша ініцыятыўная група падняла алярм вакол суцэльных санітарных высечак на белавежскіх лясных абшарах. Мінпрыроды парупілася стварыць так званую ўрадавую камісію. Можа, гэта і шчыры парыў галоўнага прыродаахоўнага ведамства, але пакуль што вынік ніякі. Што робіцца ў Пушчы зараз, мала каму вядома, апроч тых, хто там жыве і ўсё бачыць на свае вочы.

С. Н. *Вы знаёмы са складам камісіі? Хто яе ўзначаліў?*

В. Д. Там за два дзесяткі чалавек, большасць я ведаю, а ўзначаліў камісію экс-дырэктар інстытута эксперыментальнай батанікі нашай Нацыянальнай акадэміі навук акадэмік Віктар Парфёнаў. Наогул, такая камісія — спроба замяць і заблытаць яшчэ адну дрымучую справу. Па сутнасці, гэта гульня. З'яўленне камісіі «на месцы злачынстваў» — у Пушчы — для большасці было рытуальным. Вы разумееце? Ды разбудзі Віктара Іванавіча сярод ночы на лецішчы — і ён без запінкі скажа, навошта сякуць Пушчу. Бо ведае, не маладзён, што час такі, улада такая, навука на

панелі, што гэта, у рэшце рэшт, — менавіта палітычнае пытанне. Для яго, вучонага-акадэміка, як і для большасці, усё даўно ясна. Парфёнаў, дарэчы, быў прыхільнікам чыстага запаведніка ў Пушчы, а не нацыянальнага парка як зручнай шырмы для ўкаранення тут гаспадарча-вытворчай дзейнасці. Ён не адзін год ачольваў вучоны савет Пушчы, ведае і людзей, і праблемы, і ўсю гэтую запаведна-паляўнічую кухню. Аднойчы, падчас чарговай «гаварыльні» гады чатыры таму ён падсеў да мяне і гэтак шчыра, са стомай у голасе сказаў: «Падымі пратаколы дзесяцігадовай даўнасці — дальбог, тое самае. Гаворым, гаворым, а прасвету ніякага. Калі нічога не адбудзецца, Пушчы праз дзесяць гадоў не будзе. Будзе так сабе, захудалы лес... Надзея хіба што на прэсу, на тваю газету. Бачыш, — паказаў ён на чалавека, які сядзеў ад нас крыху воддаль. — Гэта Жэня Смактуновіч. Граматны спецыяліст, патомны лесавод. Пушча быццам дала нам яго, каб ён сёння быў генеральным дырэктарам».

Пра тую ж камісію. Не хачу пакрыўдзіць вучонага, але, па-першае, спадар Парфёнаў яшчэ не ўсё страціў у гэтым жыцці, каб з першага закліку чыноўнікаў кідацца на пашчу дзота. На што здольная гэта камісія ў цяперашніх палітычных умовах? Вярнуць Смактуновіча ў крэсла дырэктара парка, дзе яго з’елі, як кажуць, на трэція суткі? Ды гэта ж быў эксперымент улады. Пастка. Гульня ўладных шулераў. Сёння Смактуновіч апынуўся пад службовым арыштам. Новы дырэктар забараніў яму, галоўнаму ляснічаму, з’яўляцца ў Пушчы, гэта значыць, выконваць свае абавязкі...

Камісія паглядзела, пераначавала ў Пушчы і раз’ехалася па дамах. Дакумент не быў там прыняты. Затым яго доўга пісалі-круцілі, ён і дагэтуль не мае якой-небудзь сілы, бо паміж членамі пачалася нейкая штучная бойка, дыскусія. Дый нават калі б быў цвёрда акрэслены дакумент з пунктамі патрабаванняў і поўная згода падпісантаў, на іх высновы ўлада

не паглядзела б. Гэта не значыць, аднак, што сёння нам не патрэбны «гераічныя ўчынкі». Але ў навуцы, на жаль, я бачу іх менш і менш. Паглядзім, камісія пакуль не распушчана. Наколькі я ведаю, гомельскі эксперт, вядомы вучоны-лесавод Іван Багінскі не падпісаўся пад высновамі камісіі, бо палічыў іх залішне мяккімі і настойвае на адэкватных пазіцыях.

Роля міністэрства прыродных рэсурсаў на чале з былым намеснікам кіраўніка спраў прэзідэнта Ляонціем Харужыкам уяўляецца тут надзвычай бутафорнай; гэта відаць хоць бы з таго, што менавіта само гэта міністэрства санкцыянавала незаконную суцэльную высечку. Цяпер адганяюць стрэлку назад, праз нібыта «урадавую камісію».

С. Н. *Вы сказалі, што сярод чальцоў камісіі ўсчалася дыскусія. На чым палягае спрэчка?*

В. Д. Камісію напічкалі кім заўгодна і затым справакавалі дыскусію. Спрачаюцца, секчы ці не. Маўляў, каб збавіцца ад жука-караеда, трэба высекчы пяцьдзесят гектараў лесу, што ўжо заселены гэтым «шкоднікам». У чым штучнасць дыскусіі? У тым, што яна наскрозь фальшывая. Не таму, што ў пушчанскіх кварталах няма караеда, ён быў і ёсць. Але апроч караеда, на запаведнай тэрыторыі прыжыўся абсалютна іншы, чалавечы фактар знішчэння лясной нерушы, куды больш небяспечны і разбуральны, — караед лесанарыхтоўчы, прадажны, балотаасушальны, а цяпер і валютаздабывальны. Дзейнасць гэтага караеда забяспечана пэўнай інфраструктурай, эканамічнымі выкладкамі, сістэмай здзелак і барышоў, подкупам і застрашэннем. Механізм стары і абсалютна некантраляваны грамадскасцю. Паспрабуй што праверыць!.. Таму асобныя дыскутанты ад камісіі і спрачаюцца пра... час вылету шашаля, а не прычыны заняпаду Пушчы. Гэта проста спектакль! Дарослыя людзі, яны ўсё разумеюць. Побач з іхняй гасцініцай год як запушча-

на супер-пiларама, за якую трэба разбiцца ў кроў, расплацiцца з замежным камерсантам ды банкам-крэдыторам. Расплацiцца чым заўгодна. Але адмiнiстрацыя вымушана плацiць лесам, вядома, самым лепшым, бо пiларама разлiчана выключна на сыры лес, а той немец, што прадаў яе, патрабуе ўзамен супер-драўнiну.

Я быў у Пушчы два разы, як пачалiся суцэльныя высечкi. Апошнi раз мяне мала хто там наогул бачыў. Гутарыў з людзьмi, пушчанцамi. Сведчу: з пушчанскiх дзялянак лесапавал цяпер перакiнуўся на прыпяцкiя лясы. Уяўляеце, лесавозы вязуць драўнiну з аднаго Нацыянальнага парка (маю на ўвазе «Прыпяцкi») — у другi. Гэта што, захаванне прыроднай спадчыны? Разумная рэсурсазберагальная экалагiчная палiтыка?

С. Н. *Мясцовыя жыхары — пушчанцы — неяк спрабуюць абаранiць свой адвечны схоў?*

В. Д. Шматгадовыя традыцыi «наменклатурнай запаведнасцi» плюс прыгранiчная зона зрабiлi сваю справу. Адкрывацца людзi не спяшаюцца, баяцца пераследу. Знайсцi праўду цяжка, а страцiць заробак лёгка. У хамскай улады развязаны рукi па «вертыкалi», зверху данiзу. Дарэчы, за апошнiя сем гадоў змянiлася пяць дырэктараў! Сённяшнi Мiкалай Бамбiза доўгi час гаспадарыў у «Прыпяцкiм», пашыраў там вытворча-паляўнiчую базу, арыентаваную на камерцыйныя лесапастаўкi ды цвёрдавалютныя паляўнiчыя туры. Пры гэтым звёў на нуль навукова-даследчую, культурна-пазнавальную дзейнасць. Не паспеў сесцi ў новае крэсла гендырэктара нацыянальнага парка «Белавежская пушча», як распачаў антызаконныя бескантрольныя рубкi тутэйшага запаведнага рэсурсу — з гэтага добра вiдаць, хто яго сюды паслаў i навошта. Вось дзе сапраўдны ачаг караеда-дачаснiка, вось вам ачаг нашага нацыянальнага прыродна-ляснога ўсыхання! Пушча — так, вялiкi адвеч-

ны схоў, але яна не абаронца правоў яе жыхароў, бо сама іх даўно не мае.

С. Н. *Кола замыкаецца? А дзе ж пушчанская навука?*

В. Д. Яна таксама без правоў, калі можна ўважаць за навуку так званы навуковы аддзел з двух ці трох кандыдатаў на паўтара дзесятка супрацоўнікаў. Хутчэй — імітацыя навукі. Там, дзе насамрэч мусілі б у цесным звязе цараваць прырода і навука, гуманітарныя каштоўнасці сусветнага ўзроўню, пануе непісьменны, я б сказаў, вандальны лesпрамгасаўскі прагматызм. Навуковыя падыходы адлучаны ад актуаліяў прыродаахоўнай практыкі, не кажучы пра ўплыў на прыняцце рашэнняў ці ўратаванне Пушчы. Невыпадкова з парка сыходзяць маладыя навуковыя кадры. Тыя, хто збольшага ўкараніўся, вымушаны ўвесь час прыстасоўвацца. Што рабіць вучонаму, калі ўлада-монстр плодзіць монстраў-герастратаў ды саджае іх у кіраўніцкія крэслы? Да каго кідацца? Прыгадваю 80-я. Алярмічны напал савецкай навукі быў у той час куды большы. Ідэалогія гэта заахвочвала, так бы мовіць, развівала плюралізм. Цяпер зусім іншае. Беларуская ўлада хавае экалагічныя праблемы, думку грамадскасці выцясняе жорстка і планамерна. Афіцыйная прэса, асабліва БТ, занятыя палітычным трубадурствам і ачмурэннем беларусаў.

С. Н. *Але найперш — маўчыць навука!*

В. Д. Не толькі навука. Вазьміце грамадскія арганізацыі, наш так званы «зялёны рух». Ён загнаны ў віртуальныя лёхі, лускае гранты ў сваіх офісных дуплах, ладзіць бясконцыя «круглыя сталы», ходзіць на кашачых лапках перад уладаю. Хто дзе сур’ёзна азваўся на боль нашай зямлі, стаў у пікет, арганізаваў шэсце ў абарону Белавежскага лесу, прабіўся на газетную паласу з набатам ці выкрыццём? Ёсць,

скажам, такая, з дазволу сказаць, няўрадавая арганізацыя «Экаправа». Аднойчы тэлефаную і прапаную зрабіць сумесную экспертызу аднаго выказвання дзяржаўнага чыноўніка, які ацаніў размяшчэнне той жа піларамы ў Белавежскай пушчы як законнае і цалкам прымальнае, без негатыўных наступстваў. Тыдзень думалі. У рэшце рэшт не згаджаюцца, маўляў, экспертыза — вельмі гучная, правакацыйная форма, трэба мякчэй, у выглядзе юрыдычнай кансультацыі.

Тым часам, ведаю з уласнай навукі, што такая структура як нацыянальны парк «Белавежская пушча» даўно не мае юрыдычных падстаў для існавання, яе трэба ў пажарным парадку «апячатваць», бо дагэтуль не распрацавана і не прынята прадугледжанае законам Палажэнне — кодэкс паўнамоцтваў, у якім рэгламентавалася б яе дзейнасць, вызначаліся кірункі, улічваўся сусветны статус і гэтак далей. Не ведаю, Міністэрства юстыцыі ці «Экаправа» павінны гэтага дамагчыся, але пакуль што папускаюцца парушэнні і злоўжыванні супраць закона «Аб асабліва ахоўных прыродных тэрыторыях».

Гэта красамоўна вытыркнулася нядаўна, калі прадстаўнік дацкай праўрадавай арганізацыі сумесна з нашай праакадэмічнай грамадскай арганізацыяй «Ахова птушак Беларусі» прыехалі ў Пушчу, каб размясціць тут экатурыстычны праект. Нечакана выяўляецца, што тытулаваны рэзерват менш за ўсё арыентаваны на прыродапазнавальны турызм — тут акурат пачаліся тыя самыя вандальныя «санітарныя» высечкі. З пункту гледжання самой ідэі экатурызму, перспектыва несуцяшальная, што давялося прызнаць і супрацоўніку Прадстаўніцтва ПРААН у Беларусі, і дацкім партнёрам, і актывістам птушкааховы, і самім гаспадарам. Замяць гэтакі «адыёзус» давялося тым, што беларускі бок нібыта заабавязаўся неяк займець Палажэнне, якое будзе адпавядаць дзеюча-

му заканадаўству ды ўсім іншым нормам экалагічнага права. А грантадаўцы наўрад ці будуць чакаць, аддадуць грошы палякам. Там Пушча нашмат меншая, затое сітуацыя прадказальная. Дый суседзі ўжо карыстаюць нашую сітуацыю: маўляў, у іх там бедлам, рэжым Лукашэнкі, вандальныя рубкі... А ў нас, гэта значыць у польскай Пушчы — увесь дабор агульнапрынятых стандартаў, асвета, экалагічны турызм і г.д. Еўрапейцы ахвотна вераць.

Дарэчы, развіваць экатурызм на нашых мізэрных запаведных тэрыторыях, якія да ўсяго і запаведнасці рэальнай не маюць, — ідэя спрэчная. І вось чаму. Прычыненне ўрону і нанясенне чалавечай эрозіі непазбежныя. 3–5 адсоткаў вельмі ўмоўнай запаведнасці не даюць нам права гэта рабіць. Турыстычны прадукт трэба знаходзіць за межамі асабліва ахоўных тэрыторый. Тым не менш дзяржава прыняла такое рашэнне ў выглядзе Нацыянальнай праграмы развіцця турызму ў Беларусі на 2001–2005 гг., дзе ў якасці «апорных цэнтраў развіцця экатурызму» (там гэтак сказана) плануюць скарыстоўваць менавіта нацыянальныя паркі. Гэта не што іншае, як яшчэ адна форма няшчаднай эксплуатацыі першавобразаў нашага ўлоння. Тыповы чыноўніцкі валюнтарызм. «Мяккі дотык да прыроды» мы ўжо бачым на прыкладзе Белавежскай пушчы, «Прыпяцкага» і іншых прыродных аб’ектаў.

С. Н. *Хто адкажа за ганьбаванне прыроднай спадчыны Беларусі?*

В. Д. За апошнія сем гадоў адміністрацыя А.Лукашэнкі — адзіны гаспадар самых слынных, тытульных запаведных тэрыторый нашай краіны — пастаралася, каб грамадскай свядомасці напусціць ружовага туману і ўвесці ў зман міжнародных экспертаў. Пушча атрымала сусветны статус біясфернага запаведніка, займела Еўрапейскі дыплом, патрапіла ў Спіс аб’ектаў сусветнай спадчыны. Па вялікаму рахунку,

гэта ўсё авансы, правілы гульні для сумленных людзей, а не спажыўцоў-махінатараў, загартаваных на калгасна-саўгаснай вытворчасці. Якую мараль выспавядаў Іван Ціцянкоў, што рваў, як парцянку, нацыянальны сцяг суверэннай краіны? Ён прыйшоў у Пушчу з фразай: «Па золаце ходзіце». Гэта быў тыповы гандляр у храме, акружаны плоймай халуёў. Усе высокія тытулы Белавежскай пушчы адным махам былі складзеныя ў стосік на ўсякі выпадак — скажам, каб зручна адбіцца, калі нехта раптам спытае за рабаўніцтва і разбуральныя дзеянні, якія ў запаведных нерушах набылі асабліва цынічны характар. Руку на стосік — і... вось мы якія заслужаныя, нам Еўропа Дыплом дала!

Сёння пытанне яшчэ і ў тым, ці пакіне Рада Еўропы сваю прэстыжную ўзнагароду — Еўрапейскі дыплом, якім ганаравала Пушчу ў 1997 годзе. Пяць гадоў (менавіта на такі тэрмін выдаецца гэты знак прызнання з неабходнасцю наступнага пацвярджэння) паказалі, што гаспадары Пушчы рабілі ўсё, каб зняважыць годнасць Дыплома. Пілорама, якая вырасла ў гучную справу, — найкрасамоўнае сведчанне бязглуздых эксперыментаў і гаспадарчага ўціску на дыпламаваны аб'ект сусветнай Спадчыны. Якое рашэнне прыме дэпартамент Еўропы па праблемах навакольнага асяроддзя і ўзаемадзеяння з мясцовым кіраўніцтвам, хутка стане вядома. Наша ініцыятыўная група мае намер актыўна паўплываць на працэс прыняцця рашэння і ўжо распачала дзеянні.

Хто адкажа за здзек? Калі прыйдзе ўлада, спагадна-чулая да нацыянальных вартасцяў, і будзе абраны працаздольны парламент, тады і трэба ставіць гэтае пытанне адпаведным чынам. Сёння рана што-небудзь казаць. Парушаўся Закон і Канстытуцыя. Абіралася і нішчылася Спадчына, рэдкасны лясны генафонд, біялагічная разнастайнасць, якой няма цаны ў свеце. Да таго ж, Беларусь падпісала шэраг міжнародных Канвенцый і нясе адказнасць за іх выкананне.

С. Н. *Вы сказалі пра камісію…*

В. Д. Лічу, камісіі павінны быць дзве. Адна, парламенцкая, па расследванні злачынстваў супраць прыроднага фонду, у тым ліку Белавежскай пушчы, другая, міжнародная, якая асобна вызначыць далейшы лёс еўрапейскай славутасці. Я б асабліва падкрэсліў выключную ролю міжнароднай экспертызы, перш-наперш — наданне ёй правоў і паўнамоцтваў з усімі ўмовамі спрыяння. Мяркую, сярод чальцоў камісіі не павінна быць беларускіх прадстаўнікоў. Становішча ў Пушчы сёння такое, што трэба саступіць, як кажуць, «прынцыпам» і даць поўную магчымасць сусветным знаўцам зрабіць незалежны накід перспектывы. Не трэба лезці і перашкаджаць ім. Галоўнае, каб не было надта позна, бо ўжо сёння, нават учора, гэта позна. Гаворка пра тое, каб ўратаваць Вялікія Парэшткі Белавежскай пушчы. Патрэбна стратэгія дзеянняў і сродкі, якія б яе забяспечылі.

## «Тут ведаюць, як пілаваць Пушчу, а не ахоўваць»

ІНТЭРВ'Ю ПОЛЬСКАМУ ТЭЛЕБАЧАННЮ.
ПРАГРАМА «САМІ ПРА СЯБЕ»
(ПАВОДЛЕ ЗАПІСУ Ў ДЗЁННІКУ)

Сакавік, 2002

…Пушчы як «першабытнага лесу» даўно няма. Людзі, якія тут гаспадараць, папросту знішчаюць гэтыя рэшткі. Мо, каму падасца дзіўным, але сёння ў Пушчы няма аховы прыроды. Калі спрабуеш гаварыць, цябе не разумеюць. Робяць вялікія вочы, наіўна пытаюцца: «А што Вы маеце пад аховай Пушчы?» Наогул не ўяўляюць. Я думаю, гэта не наіўнасць. Тут добра ведаюць, маючы багаты досвед, як пілаваць Пушчу, што і як з яе браць, як эксплуатаваць… Такі падыход да гэтага лесу. Гэтакі стыль кіравання ёю.

Таму, калі гаворыш пра паняцці кшталту *прыродаахова*, *абавязкі паводле Канвенцыі* — цябе элементарна не разумеюць.

## ЭкаАрт. Прырода ў выяўленчым мастацтве

НА ЎДЗЕЛ У ВЫСТАВЕ, ДА СВАЁЙ ГРАФІЧНАЙ ПРАЦЫ «НА ПАКРОВЫ. ХУТАР ГАВЯЗНА»

Сакавік 2002

Гэтая выстава ёсць першай сур'ёзнай спробай злучыць, згуртаваць намаганні экалагістаў і мастакоў, кансалідаваць грамадскую, навуковую, экалагічную свядомасць з эстэтычнай. У рэшце рэшт, кансалідаваць наша грамадства на зялёных каштоўнасцях, на ўратаванні ацалелых рэшткаў прыроднай, а значыць духоўнай спадчыны.

Трэба па-справядлівасці ацаніць сітуацыю: эколагі, наша навука, так званыя спецыялісты не спраўляюцца з гэтай задачай.

На падмогу эколагам, біёлагам, усім ратавальнікам роднага ўлоння павінны прыйсці таленты з добра ўсвядомленым творчым клопатам. Аргументы эстэтыкі, прыгажосці, культуры павінны стацца ці не рашаючымі ў канфлікце цывілізацыі з жывой прыродай, асабліва — прыродай *дзікай* або адносна *свабоднай* ад чалавечага ўціску.

Сёння палітыкі амаль не рэагуюць на экалагічныя пагрозы і не жадаюць размаўляць на мове прыроды. Напрыклад, адкрытым тэкстам (гэта значыць, без аніякіх агаворак або сумненняў) ідзе розгалас пра будаўніцтва ў Беларусі АЭС, быццам нічога наогул не адбылося. Амаль цалкам забытая тэма Палесся, дзе прайшла спусташальная меліярацыя. Плямамі заўчаснага забыцця пазначаны тэрыторыі, дзе размяшчаліся савецкія ваенныя базы... Я ўжо не кажу

пра тое, што ў нас вельмі мала элементарна ахаванай прыроды, што доля абсалютнай запаведнасці складае «нуль цэлых...».

Страты ў прыродзе — страты Радзімы і Бацькаўшчыны — магчымыя і прадказальныя. Трэба зрабіць іх НЕмагчымымі.

Мастакі, якія спрабуюць згуртавацца вакол ідэі абароны прыродных асяродкаў, свяшчэнных мясцін Радзімы, яшчэ скажуць сваё слова. Канцэпцыя, платформа напрамку будуць асэнсоўвацца і «дамалёўвацца» — сёння мы маем пункт адліку, засведчаны гэтай выставай.

Аднак, на мой асабісты погляд, варта ўжо зараз паспрабаваць адкінуць лішняе, перш-наперш унікнуць саладжавасці і салоннасці, знайсці ў новай плыні свой кантрапункт як момант ісціны. Арт — не «грынпіс», і ўсё ж... Творца, стоячы перад мальбертам, скажам, у белавежскай глушы ці ў прыпяцкіх поймах, мусіць адчуваць і бязлітасны наступ антрапагену — звон бензапілаў, гусенічны лязгат меліярацыйнай тэхнікі, стрэлы камерцыйных паляванняў, у рэшце рэшт, увесь дабор гвалтоўнага ўціску чалавека на прыроду. Тым больш павінны гэта адчуваць арганізатары пленэру або выставы, трымальнікі галерэі, гледачы і крытыкі.

Выстава, мне падаецца, вельмі беларускамоўная. Людзі, якія стваралі свае творы, думалі менавіта па-беларуску. Калі твор выяўляецца па-беларуску, на роднай мове, значыць, гэты твор найбліжэй адпавядае мове самой прыроды.

«*Страчана незваротна*» — гэтыя словы мы чуем, калі гаворка ідзе пра страты ў прыродзе. А што, калі чалавечая ласка, любоў і свядомасць, у якой акумуляваны прыродалюбны код, будуць таксама страчаны і вяртання да іх не будзе?

# Прыроду могуць бараніць мастакі

СЛОВА НА АДКРЫЦЦІ ВЫСТАВЫ «ЭкаАрт» (ПРЫРОДА Ў ВЫЯЎЛЕНЧЫМ МАСТАЦТВЕ). МІНСК, ГАЛЕРЭЯ РЭСПУБЛІКАНСКАГА ЭКАЛАГІЧНАГА ЦЭНТРА НАВУЧЭНЦАЎ

Сакавік 2002

Шаноўныя сябры! Дзякуй усім, хто падзяліў з намі, арганізатарамі выставы, гэты вечар, хто прыхільны да пейзажнага жанру, да тэмы прыроднага асяроддзя.

Шчыра жадаецца, каб вы ў рамках гэтай выставы не толькі паглядзелі творы мастацтва, але сягнулі за яе межы — змаглі выказацца і напісаць пра свае ўражанні, каб хапіла нашай агульнай волі прыйсці сюды яшчэ раз і абмеркаваць пачатак. Бо гэта не проста чарговы паказ мастацкіх прац, а выстава-прэзентацыя вызначанага напрамку. Знак на працяг. Надзея на тое, што «ЭкаАрт» — гэта на гады і дзесяцігоддзі. Кірунак яшчэ толькі абвешчаны, і гэтая выстава, бадай, не больш, чым заяўка на заўтрашні плён, дэманстрацыя творчай волі і сілы, знак далучэння.

Дзікай прыроды ўсё менш таму, што грамадства на яе забываецца, або гатова мірыцца з тым, што адбываецца. Мы пераконваемся, што гэтак званыя спецыялісты ўжо не ратуюць нашы лясы, нашы рэчкі, нашы цудоўныя краявіды.

Белавежскую пушчу, напрыклад, не бароніць навука, не бароняць прафесіяналы. Але яе могуць абараніць мастакі, калі там пачаць ладзіць пленэры, а на выставы збіраць шырокую публіку і казаць пра пагрозы ў гэтым вялікім рарытэтным лесе.

Сёння, на гэтай выставе мне хочацца сказаць таксама пра пагрозу імітацыі прыроднай красы, пра падмену жывога — штучным, непасрэднага — віртуальным. Пры сённяшніх тэхналогіях — вазьміце відэа ці інтэрнет або «шпалерную» паліграфію — чалавек пакрысе прывыкае да іншай, глянцава-бліскучай

«прыроды» і ўжо не заўважае тое, што ёсць сапраўднае ў рэальным асяроддзі. Ён часта насычаецца тым, што ёсць поўнай падменаю.

«Эка-арт», пленэрыстыка здольныя карэктаваць гэты працэс, несці канкрэтнае, адкрываць беларускія краявіды, запамінальныя вобразы нашай прыроды, абараняць яго сымбалі і малюнкі.

Тут вялікія перспектывы. Але пра гэта трэба весці дыскусію, трэба спрачацца — перш-наперш самім мастакам, мастацтвазнаўцам, эколагам, псіхолагам творчасці, педагогам. Я спадзяюся, так і будзе. І ў хуткім часе мы зноў сустрэнемся на выставе «Эка-Арт» у новым, больш акрэсленым вымярэнні.

## У нацыянальным парку «Белавежская пушча» не выконваюцца ўмовы і рэкамендацыі Еўрапейскага Дыплома

ЗВАРОТ БЕЛАРУСКАЙ ГРАМАДСКАСЦІ Ў РАДУ ЕЎРОПЫ

Студзень 2002

Дэмакратычная і навуковая грамадскасць Беларусі з глыбокай заклапочанасцю абмяркоўвае мэтазгоднасць падаўжэння Еўрапейскага дыплома Рады Еўропы нацыянальнаму парку «Белавежская пушча». Выпадак па-свойму неардынарны, бо ніхто не бярэ пад сумнеў прыродна-культурную вартасць сусветна вядомай мясціны. Але Дыплом дзейнічаў на працягу пяці гадоў і выкананне яго спецыяльных умоў і рэкамендацый было адказнай праверкай ганараванага аб’екта на шчырасць і паслядоўнасць у слугаванні правілам прыродазахавання. Сёння пытанне ў тым, на што паверне гэтая высокая мера заахвочання, калі яна будзе пацверджана на новы тэрмін? Мы, хто

падпісаўся, кіруемся прынцыпам «не пашкодзіць» і хочам запабегчы магчымасць залішне аптымістычнага рашэння Рады Еўропы, нібыта ўжо гатовай падоўжыць чын прэстыжнае ўзнагароды. Мы не ўпэўнены, што гэта будзе своечасовае і ўзважанае рашэнне, грунтаванае на рэаліях і здольнае паспрыяць карысцям эталоннай прыроднай спадчыны, якой з'яўляецца Белавежская пушча. Хутчэй за ўсё — і мы хочам пра гэта сказаць адкрыта і ўголас — чарговае міжнароднае прызнанне стане заахвочаннем усталяванай заганнай практыкі прыродакарыстання замест прыродазахавання і запаведнасці Белавежскай пушчы, канчаткова развяжа рукі прамыслова-гаспадарчаму комплексу на тэрыторыі рарытэтнага лесу. Менавіта гэтыя тэндэнцыі сёння нясуць пагрозу галоўнаму запаведнаму аб'екту Беларусі.

Маем спадзеў, што Рада Еўропы прыме да ведама перш-наперш тое, што стан аб'екта прыкметна пагоршыўся, умовы і рэкамендацыі Дыплома не захоўваліся ў поўным аб'ёме, думка грамадскасці ўсяляк адцягвалася ад іх абмеркавання, трымалася ў няведанні, крытычныя заўвагі ігнараваліся. Вакол вострых, праблемных пытанняў запаведнасці Пушчы захоўвалася напружанасць. Замест адкрытага сумленнага дыялога ўлада хітравала, хаваючы праўду і дэманструючы няшчырасць і фанабэрыю. Грамадскае ўмяшанне, мякка кажучы, не віталася і не заахвочвалася. Адміністрацыя прэзідэнта, напрыклад, адмовіла арганізатарам зялёнай акцыі «Прэс-туры ў падтрымку Орхускай канвенцыі» наведаць Нацыянальны парк і атрымаць інфармацыю на месцы, з першых рук. Жаданага выніку не далі і спробы жыхароў Белавежскай пушчы звярнуцца асабіста да Прэзідэнта краіны. Сітуацыя асабліва пагоршылася ў 2001 годзе, калі на ахоўнай тэрыторыі актывізаваліся нарыхтоўкі жывога лесу, стала вядома пра намеры пачаць суцэльныя санітарныя рубкі. Паказальна, што адбылося гэта як толькі эксперт Рады Еўропы пакінуў Белавежскую пушчу (чэрвень, 2001). У парку абвастрыўся эканамічны і сацыяльны крызіс.

Пачаліся звальненні, у тым ліку навуковых супрацоўнікаў парка, якія выказаліся супраць парушэнняў галоўных правіл аховы прыроды. Прамыслова-гаспадарчы, лесанарыхтоўчы сектар выцясніў апошнія, часам сімвалічныя намаганні па ахове і ўратаванні біяразнастайнасці Вялікага лесу, а ў сферы інфармавання асветы і гэтыя намаганні цяжка назваць нават мінімальнымі.

На шматлікія актуаліі, звязаныя з сённяшнім днём прыроднай вартасці Еўропы, апошнім часам адгукнуліся самыя ўплывовыя незалежныя сродкі масавай інфармацыі Беларусі і СНД. Дзесяткі ўсхваляваных публікацый сталі сведчаннямі таго, што ўлада насаджае амаральныя, навукова неабгрунтаваныя прынцыпы кіравання ў Белавежскай пушчы. Выказваецца таксама перасцярога, што міжнароднае прызнанне ў выглядзе Дыплома будзе чарговы раз скарыстанае беларускімі ўладамі ў спекулятыўных, далёкасяжных мэтах, а менавіта: для прыкрыцця дзейнасці, якая цалкам супярэчыць духу Еўрапейскага Дыплома і захаванню Белавежскай пушчы. На наш погляд, гэтыя публікацыі, як і думку многіх вучоных, грамадскіх дзеячоў, простых людзей і патрыётаў, шматлікіх жыхароў Белавежскай пушчы, нельга не ўлічваць, прымаючы рашэнне аб пацвярджэнні Дыплома на новы тэрмін.

Пераканаўча просім Вас не спяшацца. Мы прапануем перанесці прыняцце рашэння па Белавежскай пушчы на больш позні тэрмін, зрабіць кантрольную праверку з абавязковым выхадам на беларускую грамадскаць, а затым, з улікам дыялога і больш глыбокіх экспертных ацэнак, прыняць узважанае рашэнне.

Падпісаліся таксама: *Радзім Гарэцкі,*
*Ніл Гілевіч, Святлана Алексіевіч,*
*Уладзімір Дацкевіч, Аляксей Мікуліч,*
*Юры Хадыка, Мікалай Карташ, Іна Зеніна,*
*Здзіслаў Мураўёў, Андрэй Саннікаў,*
*Таццяна Процька, Алесь Бяляцкі.*

# Стимулы престижной европейской награды должны работать на спасение Великого леса

ИНТЕРВЬЮ КОРРЕСПОНДЕНТУ ГАЗЕТЫ «РАБОЧЫ» СЕРГЕЮ МОНАСТЫРСКОМУ

Январь 2002

СЕРГЕЙ МОНАСТЫРСКИЙ. *Валерий, под Обращением стоят подписи очень авторитетных людей — академика Радима Горецкого, писателей Нила Гилевича, Светланы Алексиевич, видных экологов, политиков... А были те, кто отказался подписываться?*

В. ДРАНЧУК. Были. Это люди, работающие в государственных организациях. Говорили примерно так: все в письме верно, но ты же понимаешь, пока я человек подначальный... Пару раз приходилось слышать — ай, зачем шум поднимать, и так у страны репутация не лучшая...

С. М. *Хорошо, давайте посмотрим на проблему изнутри, по-домашнему. Как было дело?..*

В. Д. В 1996 году в Пущу приехала группа серьезных международных экспертов. Знатоки заповедного дела, они увидели здесь умных, знающих ученых, налицо был и очень лестный для Беларуси факт: Беловежская пуща — наиболее сохраненный из биосферных комплексов Европы. На тот момент — может быть, и правда, хотя я бы оценил положение дел куда критичнее: гости просто были рады увидеть более-менее настоящий лес, там у них таких, увы, почти не осталось. Возможно, внушало доверие то, что Пущу, как и другие знаменитые заповедные территории, взяло под свое крыло Управление делами президента — одна из самых влиятельных государственных структур. И Диплом дали отчасти по заслугам, отчасти авансом, в знак поощрения добрых намере-

ний. Но это был лишь факт признания, точка отсчета. Ведь Диплом еще и степень ответственности, испытание на прочность, своеобразный обет порядочности. Представить, что вскоре после получения Диплома то же самое Управление делами в той же самой Пуще развернет лесопильный комплекс — такое европейскому энтузиасту заповедного дела не могло присниться и в страшном сне! И дело отнюдь не в наивных экспертах: настолько горячими были заверения белорусских чиновников. Да и сам по себе Диплом был кредитом доверия, заставлял держать экологическую дисциплину. И все могло пойти по-другому, если бы власть распорядилась иначе, поставила дело на разумную и перспективную основу.

С. М. *Вы имеете в виду...*

В. Д. Ведь тенденции падения, усиливающийся курс на эксплуатацию, подмена заповедности видами деятельности, которые противоречат статусу Пущи и чего, кстати, не могли, да и не хотели видеть эксперты, — все это было уже налицо... Потому сейчас мы просто обязаны бить в колокол. Лучше переборщить, пойти на скандал, но привлечь к этому факту внимание мировой общественности.

С. М. *Каковы размеры порубок? Вы можете привести цифры?*

В. Д. Я могу привести факты. Вот фото. Это штабеля лесоматериала возле пилорамы в Каменюках — деревне, где расположен административный центр заповедника. Вот и оценивайте масштабы. День-два — и этих запасов не будет. Линия мощная, высокопроизводительная. Могу добавить, что по дорогам Пущи лесовозы снуют беспрерывно. Впечатление удручающее: не парк, а лесоповал какой-то. Вообще, всякой техники на лесных дорогах, мягко говоря, чересчур много. И вроде шлагбаумы всюду стоят...

А теперь давайте, глядя на этот снимок, рассуждать с точки зрения обычного здравого смысла. Ле-

сопилка была куплена в 1999 году (Управление делами президента тогда возглавлял Иван Титенков). Под нее был взят валютный кредит. Находится пилорама на балансе национального парка. Надо долги отдавать? Надо! Что остается? Валить лес. Считается, что пока под нож пускается сухостой или то, что добыто во время санитарных рубок. Допустим... Ну а завтра? С санитарными рубками вроде как закончили, все, что мало-мальски подлежит вырубке, вырубили... Что, остановится этот молох? Это уже налаженное производство, рабочие места, зарплата. Вы поверите, что его свернут, разберут, куда-нибудь вывезут? Или имеется в виду, что лесопилка останется в Пуще, только работать будет на привозном сырье? Чтобы понять весь абсурд, вспомним, что речь-то идет о заповедной территории, называемой особо охраняемой.

С. М. *Санитарные вырубки объясняют борьбой с лесным вредителем, короедом-типографом: нужно отсечь просеками пораженные участки. Кроме того, там, где короед поработал, лес уже, считайте, погублен — деревья все равно засохнут, их только на доски и пускать... Чтобы добро не пропадало, покупаются лесопилки...*

В. Д. Это очень странные рассуждения. Во-первых, биологи почти единодушны, что короед — биологическая единица, необходимая для Пущи. И не надо с ним бороться, вступать в такую уж смертельную схватку. Ему есть от кого отбиваться — более сотни естественных врагов прямо в Пуще! На *заповедной территории* надо бороться с человеческим вмешательством — вот действительно острая проблема, эпидемия. Короед появляется, уходит. И появляется, кстати, когда в лесу массовые, «экологически несовместимые» рубки. Лишь экономический интерес заставляет бороться с этим «злосчастным» жучком. И никакой другой — ни экологический, ни биологи-

ческий, ни эстетический. И нет здесь дискуссии, если говорить языком природы, языком Пущи, языком заповеданного леса.

Не будем забывать, что речь идет об остатках, клочках относительно свободной природы. Проблему легко заболтать — властям только на руку эта дискуссия о короеде, она создает иллюзию научной проблемы там, где наукой давно не пахнет, — я имею ввиду Беловежскую пущу. И уверяю вас — еще нигде в мире никому не приходило в голову бороться с жуком-вредителем в заповеднике с помощью лесопилок.

Кстати, Беловежская пуща не единственный заповедник, где за последние годы появились лесоцехи. Возьмите Припятский национальный парк. Дубравы, уникальный лесной массив — и здесь уже вовсю развернулся купленный за большие доллары сверхсовременный паркетный цех. Припятский паркет — «лучшая (то бишь, экологически чистая? — *ред.*) продукция 2001 года». И здесь, как послушаешь, все объясняется борьбой с вредителями, необходимостью санитарных рубок. Так что у нас идет сначала, а что потом — появление короеда (и, как следствие, контракт на закупку лесопилок) или сперва лесопилки закупаются, а следом как-то вдруг, очень кстати, жучок обнаруживается?

С. М. *Иначе говоря, заповедный лес валится потому, что это живая валюта?*

В. Д. К сожалению, так было и так есть. И это преступление с точки зрения сохранения природного наследия. Потому что заповедники не принадлежат ни Управлению делами, ни президенту, ни правительству, ни кому-то другому (говорю сейчас о моральной, а не юридической принадлежности). Это Божий дар Беларуси, дар нашим детям, нашим потомкам. Они являются достоянием всего человечества.

С. М. *Скажите, а на месте порубок лесовосстановительные работы ведутся?*

в. д. То есть?

с. м. *В старые времена было правило: срубил дерево — посади два...*

в. д. Вот вы о чем... Я бы сказал, это пример неправильной постановки вопроса. Нам и пущанские порубщики могут сказать: никакого хищничества, все восстанавливается. Происходит подмена понятий. Потому что к такому явлению, как Беловежский лес нельзя подходить с позиций лесопромышленного объекта. Здесь в принципе не должно быть хозяйственной деятельности, способной хоть как-то повлиять на биоразнообразие этого уникального раритета! Пуща — давайте не забывать! — это первичный естественный лес, многосложный, веками устоявшийся организм, а не лесная плантация. Провели вырубку — образовалось «окно», проплешина в живой ткани. Нарушено то, что называется «биотой», — природные взаимосвязи на данном участке. Посадили саженцы — но сколько они еще будут расти? Двадцать лет? Тридцать? Первичный лес восстановить невозможно.

с. м. *«Никакой хозяйственной деятельности» — это, конечно, красивая мечта. Но на практике Беловежская пуща всегда была заложницей и экономики, и политики. Что при царе, что «за польскім часам», что в советские времена здесь ладились сановные охоты, веселились вожди. Хотя, помню, один ученый-зоолог, много лет проработавший в Пуще, с ностальгией вспоминал годы Хрущева и Брежнева: ну подстрелит большой начальник зубра-другого раз в год — так зато Пуща тогда считалась объектом особой важности, на нее не жалели денег, была возможность для научной работы...*

в.д. Преувеличение огромное! И охоты, и деньги под них — лишь подтверждение того, как просто было нарушить сложившиеся веками взаимосвязи,

биологический климат Пущи. Что касается дотаций, да, богатая империя могла себе это позволить. А Беларусь пока — страна бедная, к тому же беднеющая... И мы видим, как спешат на ее остатках разбогатеть, а не сделать благородный взнос.

Понимаете, что обидно. Честные деньги на заповедниках зарабатывать можно, в том числе и валюту. Но при другом мышлении. Такие уникальные природные объекты, как Пуща, вполне могут быть, например, международными центрами экологического туризма. Года три-четыре тому немецкий Центр имени Гете предлагал белорусским властям провести здесь первый Европейский безвизовый фестиваль. Но... Предложение повисло в воздухе. Зато появились лесопилки.

С. М. *Вы считаете, что наши власти ведут себя, как временщики — потому и рубят Пущу. Власти заявляют, что порубки — вынужденная и неопасная для заповедника мера. Кто в этом споре может быть судьей?*

В. Д. Вопрос действительно щепетильный. Вот и давайте для начала обратимся к международной общественности. Чтобы привлечь ее внимание, мы и выступили со своим открытым письмом. Запад в этой проблеме не сторонний наблюдатель. Есть международная программа — «легкие Европы», она отслеживает ситуацию с лесами на континенте. Так что в интересах всей Европы убедиться, что со стороны Беларуси этим «легким» не причиняется вред, не ведется противопоказанная деятельность. И нельзя забывать, что часть Беловежского леса является всемирным наследием ЮНЕСКО.

С. М. *Последний вопрос. Письмо написано, опубликовано — что дальше?*

В. Д. Продолжается сбор подписей, причем, очень активно. Принципиальная особенность: наше обращение подписали уже не только природозащитники, но

и правозащитники. Если кто-то здесь видит политику, так он скорее всего прав: Беловежская пуща всегда была проблемой политической. И легче всего эту проблему можно решить политическим путем, то есть, при условии, если к власти придут нормальные люди, цивилизованные министры, директора и так далее.

Думаю, и политические партии здесь не окажутся в стороне. Наше обращение может перерасти в новую общественную инициативу. Пожалуй, это и есть тот случай, когда не так важно — «правые», «левые», «либералы»... А пока я надеюсь на глубокие экспертные оценки, на взвешенное слово Совета Европы — не навредить! Стимулы престижной европейской награды должны работать на спасение Великого леса.

## Адказ белавежскаму апаненту

Газета «Белавежская пушча». АДНАасобнік 2002

На Зварот, які быў надрукаваны ў шматлікіх сродках масавай інфармацыі, у газету «Народная воля» даслаў свой водгук і былы намеснік дырэктара па навукова-даследніцкай працы нацыянальнага парка «Белавежская пушча» Вячаслаў Семакоў. Не адмаўляючы факта, што ў Пушчы і сапраўды шмат праблемаў, ён не разумее аўтараў Звароту: хіба можна пагражаць пазбаўленнем таго, што ўжо заваявана іншымі. «Невялікая група людзей узяла на сябе адказнасць размаўляць з Саветам Еўропы...», — здзіўляецца В.Семакоў і прапануе надаць праблеме большай публічнасці. А за «кропку адліку» раіць узяць сам Зварот ды ягоны ліст-водгук.

Якімі ж аргументамі аўтар спрабуе пабіць дакумент, адпраўлены ў Швейцарыю. «Так, праблем у Пушчы хапае», — прызнае В.Семакоў, але пра іх не кажа нічога. Нават цяжка здагадацца, якія «прабле-

мы» ён мае на ўвазе. Спосаб не новы — адцягнуць увагу ад прычын і, не называючы рэчы сваімі імёнамі, гаварыць пра наступствы.

Лесарубы з уладных вертыкаляў могуць спаць спакойна, пакуль мы будзем перажоўваць, напрыклад, байкі пра атаку шашаля-караеда, які сваім раптоўным нашэсцем напусціў жаху на ўсю Пушчу. (Менавіта гэтая біялагічная асобіна, дзякуючы змастачаным адміністрацыяй «актам праверкі», і стала падставай для суцэльных санітарных рубак мінулым летам).

Што да караеда, дык гэта насамрэч «вутка», выпушчаная з уладных структураў, пад апекай якіх знаходзяцца сёння запаведныя скарбы краіны. Службам адміністрацыі, схопленым на здзелках, што блізка стаяць ад злачынстваў перад будучымі пакаленнямі, сёння хацелася б наўзамен чарговага міжнароднага скандала атрымаць як падарунак «абмеркаванне праблемы». Ці не навязвае нам Вячаслаў Васільевіч загаварыць тэму, адысці ад галоўнага, змякчыць стылістыку гаворкі? Ягоныя аргументы, прынамсі, схіляюць так думаць.

Напрыклад, ён называе падпісаных «свадзебнымі генераламі» (ягоны ліст па-руску), якія, на думку Семакова, не маюць аніякага дачынення да атрымання Еўрапейскага дыплома пушчанскай установай. Калі на тое, хочацца запярэчыць Вячаславу Васільевічу, дык зварот мог напісаць і падпісацца пад ім наогул адзін чалавек. І няважна — філолаг ці біёлаг, галоўнае — сын зямлі, наследак гэтай спадчыны.

Бо гаворка ідзе пра парушэнні закона, міжнародных норм, узятых краінай абавязанняў, грубае ўмяшанне чалавека ў прыродны арганізм ляснога рарытэта, дзе ўмяшанне мае незваротны характар.

«Нашэсце» караеда ў Белавежскай пушчы (і, як вынік, нарыхтоўкі жывога лесу) — падстава не экалагічная, а цалкам эканамічная. Пушчу точыць караед нарыхтоўчы, камерцыйны, валютаздабывальны. Як не дзіўна, але нават вучоныя ўцягваюцца ў спрэчку. На

жаль, адстойваюць не закон і запаведнасць, не літару міжнародных канвенцый у абарону біяразнастайнасці прыроднай спадчыны, а падтрымліваюць ілюзію навуковай праблемы, якраз і патрэбную ўладам для апраўдання вандальных тэндэнцый у запаведнай нерушы. Дапусцім, В.Семакоў мае рацыю: маўчыць біялагічная навука. Але зноў не кажа, чаму яна маўчыць. Таму што — на кароткім павадку, таму што — няма навукі экаабароны, навукі — супраць ілжэнавукі. Таму так лёгка заводзіцца «шкоднік» у выглядзе караеда-тыпографа ці іншы «небяспечны» від.

Улада правакуе хаос у галовах людзей, каламуціць, як кажуць, ваду. Чым больш грамадскасць будзе спрачацца пра караедны чыннік падзення Пушчы — тым больш верагодныя і больш маштабныя тут нарыхтоўкі драўніны. Такая стратэгія і тактыка сённяшніх трымальнікаў айчыннай запаведнасці. І калі ўжо развешваць так званыя ферамонныя пасткі для шкоднікаў-пушчаедаў, дык лепшага месца, чым Кіраўніцтва спраў прэзідэнта, нам не знайсці. Ці, можа, у Вячаслава Васільевіча Семакова, спецыяліста па лясных шкодніках, іншая думка?

Мне падаецца, што Рада Еўропы, яе Дырэктарат па культуры і прыродна-культурнай спадчыне мае сёння ў асобе нацыянальнага парка «Белавежская пушча» несумленнага, хоць і дыпламаванага партнёра. Мяркую, і эксперты, якія час ад часу прыязджаюць да нас, усё бачаць і разумеюць, але не спяшаюцца рабіць рэзкіх рухаў — такая спецыфіка гэтага мудрага Дыплома: заахвочвай і давярай, але — правярай, патрабуй, абмяжоўвай.

Дзіўна, што В.Семакоў, які нямала зрабіў для таго, каб Еўрадыплом з'явіўся ў Пушчы пяць гадоў таму, раптам выяўляе поўнае неразуменне яго механізмаў. «Мне, — піша Вячаслаў Васільевіч, — ніколі не прыходзіла ў галаву забіраць заваяванае раней.» Гэта штосьці зусім новае ў практыцы аховы прыроды, дадае белавежскі апанент. Чаго тут больш — «працяч-

ковага» няведання або жадання напусціць туману і заблытаць чытача? Тое, што «не прыходзіла ў галаву» дасведчанаму чалавеку, за якога, трэба думаць, трымае сябе сам В.Семакоў, — мае тым часам трыццацігадовую практыку, «блукае па Еўропе» роўна столькі, колькі існуе сам Дыплом, — адкліканне ўзнагароды ў выпадку, калі ганараваны аб'ект не выконвае адмысловыя ўмовы і рэкамендацыі Дыплома. Такія прыклады ёсць. Але ёсць і выпадкі, калі пагроза страціць Дыплом вельмі хутка ўразумляла яго намінантаў, засцерагала ад памылак.

Дый мы, хто падпісаўся пад Зваротам, добра ўсведамлялі, што выпускаць з рук адзін з рэальных рычагоў уздзеяння на дзяржаву было б неразумна. Папраўдзе кажучы, таму-сяму і ў Мінску, і ў Белавежскай пушчы Еўрадыплом не надта й патрэбны. Або зусім непатрэбны. Нехта хацеў бы з ім развітацца — ды як мага хутчэй. Развязаныя рукі. Больш зручна ўвіхацца з бензапілой. Магутная дрэваапрацоўчая лінія, набытая яшчэ за Ціцянковым, не можа прастойваць. Даўгі і крэдыт падціскаюць. Правілы экалагічнага этыкету, «навязаныя» Дыпломам, — выпадак нязручны, асцё ў горле: лесазнішчальны праект, які планаваўся ў Пушчы з мінулага лета, давялося адкласці з вымушанай аглядкай на Еўрадыплом, на пазіцыю «зялёных».

І грамадскасць, ведаючы гэта, не заклікала Савет Еўропы забраць ганаровы знак, на чым беспадстаўна акцэнтавалі ўвагу асобныя СМІ, — інакш бы мы аддалі ўплывовы сродак абароны белавежскага лесу. Мы прасілі Савет Еўропы не спяшацца і прыняць рашэнне пасля яшчэ адной кантрольнай праверкі, з абавязковым выхадам на беларускую грамадскасць, перш-наперш, «зялёную».

Мяркую, што з боку шаноўнай еўрапейскай інстанцыі мы не зачакаемся адэкватнага разумення. Што ўмовы і рэкамендацыі Дыплома ў новай рэдакцыі будуць скарэктаваныя з улікам нашай пазіцыі.

Спадзяюся, недалёка той час, калі Беларусь прыме ўнікальны ў міжнароднай практыцы закон, які датычыць адной канкрэтнай тэрыторыі і які будзе называцца «*Закон аб Белавежскай пушчы*». Калі дзве краіны — Беларусь і Польшча, валодаючы адным рэліктавым лесам — аб'ектам прыроднай спадчыны ЮНЭСКА, — падпішуць *Пакт на абарону Белавежскай пушчы*. Гэта я і хацеў, са свайго боку, прапанаваць у якасці «кропкі адліку» для чытацкага абмеркавання. Думаю, і Вячаслаў Васільевіч не застанецца ў баку, паспрыяе чым зможа ці возьме непасрэдны ўдзел.

ДАРЭЧЫ

Аўтар ліста прадставіўся як «асоба, непасрэдна зацікаўленая ў захаванні Пушчы» і больш ні слова не сказаў пра сябе. Я асабіста знаёмы з В.Семаковым і таму дазволю сцісла прадставіць яго чытачам «Белавежскай пушчы» — такім, якім ведаю з 1995 года. Вячаслаў Васільевіч — вучоны, кандыдат біялагічных навук, больш за дзесяць гадоў аддаў Белавежскаму лесу. Калі азіяцкі кантынент змяніў на еўрапейскі (пераехаў працаваць у Пушчу), нацыянальны парк называўся тады запаведна-паляўнічай гаспадаркай. Працаваў у навуковым аддзеле, быў намеснікам дырэктара па навуковай працы, бліжэй да пенсіі ачольваў музейную справу, вёў экскурсійнае абслугоўванне турыстаў і дэлегацый. Падчас нашых размоў любіў казаць, што Белавежская пушча ёсць Мекай усіх жыхароў Беларусі, што гэта — сапраўдная еўрапейская тайга. Пасля, з прыходам да ўлады А.Лукашэнкі, В.В.С. было ледзь пазнаць — не адразу, але паступова ён пахіляўся да апанентаў беларускага суверэнітэту, крытыкаваў гістарычную «Пагоню» і відочна камплексаваў з нагоды вынікаў «віскулёўскае змовы». Усё больш настальгічна гучалі ў голасе В.Семакова геапалітычныя матывы, сярод якіх

выразна чуліся ноткі, знаёмыя з мікрафонаў расейска-думскай фракцыі Зюганава. «Ці не даплочваюць маскоўскія таварышы да сціплай «палучкі» пушчанскага гіда», — падумалася аднойчы. Кажуць, сам Аляксандр Лукашэнка быў удзячным слухачом В.Семакова, а гэта пра нешта ды сведчыць.

Як здольны папулярызатар і «асоба зацікаўленая», В.В.С. шмат пісаў і піша пра Пушчу з яе нязменнымі таямніцамі, гаючай глухаманню ды рознымі іншымі прыкметамі рэкламнай «нечапанасці» ляснога кутка — трэба ж неяк папіхаць вазок мясцовага турбізнесу! Зрэдчас Вячаслаў Васільевіч сярдуе на зламыснікаў, якія капáюць пад Пушчу, спрабуючы развянчаць белавежскі міт і гэтым самым зарабляюць сабе палітычны капітал, вядома ж, прапануючы ўзамен сусветную славу прыроднай каштоўнасці. Было на арэхі ў свой час і газеце «Белавежская пушча» разам з яе выдаўцом — за друкаванне «інсінуацый» на адрас сусветнай спадчыны, за выкарыстанне назвы слыннага лесу дзеля асабістай (г.зн. маёй — *В.Д.)* папулярнасці і карысці, за патаемную сувязь з «бэнээфаўцамі» і г.д.

Вось і зараз Семакоў высакародна адгукнуўся, паставіў пад сваім прозвішчам «пенсіянер», а побач, як закід на высвятленне магчымай рэакцыі (відаць, маёй?), удакладніў: «аўтар назвы газеты «Белавежская пушча». Мушу, аднак, запярэчыць В.Семакову: ідэя і назва газеты «Белавежская пушча» цалкам належыць заснавальніку і выдаўцу газеты. Я магу пацвердзіць хіба што іншае: Вячаслаў Васільевіч быў гарачым і ці не першым прыхільнікам ідэі такога выдання, хоць праз пэўны час нам не ўдалося паразумецца. Тым не менш, я з удзячнасцю стаўлю яго ў лік першых арганізатараў газеты «Белавежская пушча» і спадзяюся на лепшае.

# Белавежскі АДНАасобнік, або Чаму 26-ы выпуск газеты «Белавежская пушча» зладжаны ў адным экземпляры

СЛОВА РЭДАКТАРА

Газета «Белавежская пушча», АДНАасобнік 2002

Пасля непрацяглага перапынку газета «Белавежская пушча» аднаўляе выданне досыць нетрадыцыйна — яна не выходзіць «у свет», як бывала дагэтуль, у размножаным выглядзе, а вяртаецца ў інфармацыйную прастору безнакладным выпускам, гэта значыць, у АДНАасобным варыянце.

Гэтак, мяркую, можна зрушыць свядомасць да ўразумення стратаў, пагрозаў і небяспекі, без якіх немагчыма ўжо думаць пра Белавежскую пушчу і ўяўляць яе пракаветнае ўлонне.

Выпуск зладжаны ў адным экземпляры. Я хацеў бы гэтым засведчыць, што Белавежская пушча ёсць велічным АДНАасобнікам прыроднай спадчыны чалавецтва, будучыня якой становіцца знакам нашай агульнай трывогі і вымагае нестандартных дзеянняў. Не маючы аналагаў у свеце, гэты лясны рарытэт, еўрапейскі пралес, альбо «Ноеў каўчэг» еўрапейскага жывёльнага свету, як яго называюць, ператварыўся ў лясную гаспадарку, дзе пануюць валавыя паказчыкі, а не гуманітарныя каштоўнасці светнага ўзроўню.

Гэты выпуск і ёсць знакам перасцярогі. Тут сабраны матэрыялы-SOS, пачынаючы з артыкула «Падзенне Белавежскай пушчы», датаванага 1997 годам, і канчаючы апошнімі публікацыямі на абарону найстарэйшай лясной спадчыны планеты.

Эпоха міфалагізацыі Пушчы як выспы дзікай ды нечапанай прыроды мусіла ў рэшце рэшт скончыцца. На гэта спатрэбілася колькі гадоў пільнае ўвагі з боку грамадства, перш-наперш незалежных сродкаў

масавай інфармацыі. Падупалы і моцна хворы арганізм Пушчы сёння патрабуе рашучага перагляду чалавечай дзейнасці на яе абшарах, змены стэрэатыпаў, якія тут прыжыліся за шмат гадоў, сацыяльных зрухаў на карысць чалавека — жыхара і абаронцы Пушчы.

Прыкры парадокс: Белавежская пушча — рэдкі куточак сусветнай спадчыны — рабуецца і прадаецца. На паверхні толькі частка айсберга, якім ёсць гандаль, карпаратыўныя інтарэсы, лесапрамысловае лобі, глабалізацыя. Мы бачым новую супер-пілараму, сетку дарог ды рухавых забеспячэнцаў, што кіруюць чарговай вандальнай аперацыяй, арудуючы ў лясных кварталах. Але не бачым астатняе, што добра схавана і часам удалечыні ад самое Пушчы. Нам даспадобы казаць жаданыя словы, што беларускі лес — гэта і духоўнасць, і стратэгія. Але праўды тут мала, як і духоўнасці. Наўзамен прыйшла «стратэгія»: лясы ператвараюцца ў сметнікі і стратэгічны тавар. У рэшце рэшт застаюцца сметнікі.

Гэты АДНАасобнік — яшчэ адна спроба адрадзіць духоўнасць нашых лясоў, запярэчыць ценявым стратэгам і фінансавым кілерам, ад якіх церпіць прырода і лес, а заадно і мы з вамі.

Белавежскую пушчу — трэба нарэшце ўцяміць — немагчыма адрадзіць, узнавіць або кампенсаваць. Усё, што ў ёй ёсць, — альбо ёсць, альбо няспоўнена зноў, гэта значыць, ужо няма. Страчаны арыгінал — няспоўнены арыгінал, бо ён адзін і апошні. Няспоўненыя багацці — няспоўненая супольнасць. Арыгінальнасцю Пушчы ёсць тое, што тут найбагацейшая з захаваных у свеце супольнасць супольніцтваў. На жаль, ацалелая ў рэштках. Таму і няспоўненасць палохае маштабамі стратаў. Як біялагічных, так і геаграфічных.

Газета-АДНАасобнік, як і папярэднія 25 яе выпускаў, выходзіць без колернай гамы. Гэта ўжо сталы і пэўны прынцып: колерная гама імітуе прыроду,

яе непаўторную вясёлкавую чароўнасць, гаму арыгіналу. Я свядома ўнікаю спакусы замілаваць каго-небудзь малюнкамі Пушчы, або іншай навакольнай прыроды. Замена жывой прыроды ў безлічы reprаductio ўціхамірвае, суцяшае і заспакойвае наша чалавечае сумленне перад варварствам штодзённага абыходжання і дачыненняў з прыродай у рэчаіснасці. Ці не голас Касандры спрабуе давесці гэта: замена прыроды ёсць яе ціхім зыходам? Чорна-белая гама гэтага выпуску вельмі жорсткая па задуме; Пушча вартая замілавання, калі ты ў ёй, перад ейнай аднаасобнай зялёна-велічнай красой, а не ў гэтым выпуску, абраным выключна формай пратэсту і ратаўнічага сымбалю.

Гэты выпуск абмяжоўвае чалавечае насычэнне, каб перавесці нашыя думкі ў кірунку бяды, што напаткала Вялікі лес.

Гэты адзіны асобнік чарговага нумару газеты працягвае традыцыю самадастатковасці выдання. Усе папярэднія тыражаваныя выпускі, якія трымалі наклад у некалькі тысячаў, былі надзвычай самадастатковыя, мелі сціслы бюджэт, гэта значыць, выдаваліся за мінімальныя грошы з чыстых рук.

Кошт гэтага нумару яшчэ больш сціслы. Ён пагатоў не можа быць вызначаны паводле калькуляцыі. Ён бяскоштавы паводле азначэння. Хутчэй, гэта выраз байкоту, сымбаль маёй незалежнасці ад ведамстваў і структур, якія ніколі не спяшаліся на дапамогу «зялёнаму» выданню на працягу сямі гадоў.

Але гэты АДНАасобнік ёсць газетай НАСАМРЭЧ больш за ўсе папярэднія выпускі, бо пагартаць яе можна толькі ў арыгінале і ў адным месцы, там, дзе газета захоўваецца. Гэтак жа і саму Белавежскую пушчу можна пабачыць на свае вочы, калі прыехаць да яе альбо ўсведамляць, што яна ёсць і што яна — здабытак не адно толькі сённяшняга дня, твайго веку і тваёй краіны, але належыць заўтрашнім пакаленням і ўсяму свету. Мы пакуль што не можам сябе

заспакоіць гэтымі думкамі, бо маем выключна небяспечную сітуацыю ў Белавежскай пушчы.

Я кладу гэты асобнік, апрануты ў цвёрды абклад з сымбалічнаю зашчапкай, у ганаровае месца на зялёны алтар вольнай новай Радзімы. Я, аднак, не магу пакуль споўніць сваё трапяткое жаданне — пакласці выпуск газеты ў музейную схowaнь самой Белавежскай пушчы. Цяпер гэта цалкам небяспечна. Але я маю цвёрды спадзеў зрабіць гэта ў блізкай будучыні.

## «Нашы папярэднікі не ішлі на экстрэмальныя тэхналогіі...»

НА ПЫТАННІ АДКАЗВАЕ ЭКС-ГЕНДЫРЭКТАР НАЦЫЯНАЛЬНАГА ПАРКА «БЕЛАВЕЖСКАЯ ПУШЧА» ЯЎГЕН СМАКТУНОВІЧ. ЛІПЕНЬ 2001

Газета «Белавежская пушча», АДНАасобнік 2002

У гэтым чалавеку многія бачылі заўтрашні дзень Пушчы.

Мы сустрэліся неўзабаве пасля таго, як улада санкцыянавала суцэльныя санітарныя высечкі ў сямі кварталах запаведнага лесу. На твары Яўгена Анатольевіча, звычайна ветліва зычлівым і спакойным, гэты раз я ўбачыў суровую засяроджанасць.

В. ДРАНЧУК. *Што, неспакойныя думкі?*

ЯЎГЕН СМАКТУНОВІЧ. У гэтай сітуацыі яны не могуць быць спакойныя. Змены ў вядзенні санітарных рубак, параўнальна з тымі, якія склаліся тут на працягу многіх дзясяткаў гадоў, мяне вельмі насцярожваюць.

В. Д. *Змены ў бок інтэнсіўнасці?*

Я. С.Так. Вы бачыце, што прапануюць гэтыя «тэарэтыкі». Яны прапануюць варыянты суцэльных ле-

сасечных рубак, што заснаваныя практыкай вядзення гаспадаркі ў шараговых лінейных лясгасах, дзе насаджэнні створаны штучна, дзе «вырошчваюцца» аднаўзроставыя, аднастайныя сваім складам лясныя пасадкі дзеля аднае мэты: павялічыць прадукцыйнасць лесу, колькасць драўніны.

В. Д. *Так званыя лясныя плантацыі?*

Я. С. Што да Белавежскай пушчы, дык гэта ж, прабачце, не плантацыя. Гэта адметны лясны масіў, які фарміраваўся, дзякаваць богу, цягам тысячагоддзяў, без якіх-кольвек планавых мерапрыемстваў, без аднаго ўзятага курсу. Гэта масіў, які заснаваўся натуральным чынам і ўяўляе сабой, так бы мовіць, адвечны тып лесу. Пачатак пачаткаў. Першавобраз. Рэліктавы дрэвастой. Таму яго цяжка раўнаваць з якім іншым лесам, у прыватнасці, з тымі дзялянкамі, для якіх былі распрацаваныя гэтыя метады вядзення санітарных рубак, аніяк не прыдатныя для Белавежскай пушчы, калі Пушчу ўважаць за рэліктавы лес. Характар тутэйшых рубак адпрацоўваўся цэлыя стагоддзі, канчаткова склаўся ў пасляваенны перыяд і дзякуючы шматгадоваму досведу гаспадарання такіх выбітных адміністратараў-кіраўнікоў, якімі былі Качаноўскі, Раманаў, Раманоўскі, спрыяў, на мой погляд, захаванасці ляснай славутасці. Трымаўся гэтай ашчаднай методыкі і Балюк. Была, адным словам, напрацавана ўстойлівая практыка.

І ў кожным выпадку, калі ўзнікае, скажам, сітуацыя, якая нагадвае санітарны катаклізм — караед ці іншыя ўспышкі шкоднікаў, падыход мусіць быць вельмі індывідуальны, вельмі дбалы і скрупулёзны. Тут прыдатныя ашчаджальныя метады, іх і трэба карыстаць, трымаючы на ўвазе, што насаджэнні вельмі рэдкія і каштоўныя.

Што мы бачым цяпер? Ідзе інтэнсіўнае развіццё караеда. Калі ягонае засяленне ёсць фактам, і дрэва незваротна ахвярнае, яго трэба аператыўна выра-

заць і прыбіраць з лесу — рабіць так, каб маладое пакаленне караеда не перазасялілася. Але гэта чыста санітарны пункт гледжання на стан справы, я не сказаў пра галоўнае: Пушча — перадусім аб'ект, дзе галоўнаю мэтай ёсць захаванне біяразнастайнасці ў шырокім спектры гэтага слова. Таму, кіруючыся разумнымі правіламі санітарных рубак, не трэба баяцца невялічкіх прагалаў або палян, што паўстануць на нейкі час. Яны, наадварот, ствараюць пэўную мазаічнасць, спрыяюць развіццю травяністай расліннасці, з'яўленню многіх рэдкіх відаў ляснога жыхарства, у рэшце рэшт, садзейнічаюць біяразнастайнасці.

Другі момант, досыць важны для практыкі, — як быць з гэтымі адкрытыміляснымі ўчасткамі? Калі рубкі памяркоўна ашчаджальныя, калі працэс ідзе павольна і ўмяшанне чалавека не такое інтэнсіўнае, а як бы ў згодзе з лясным асяроддзем, калі ёсць дыстанцыя даверу — прырода гэта ўдзячна прымае і сама залечвае раны шляхам натуральнага лесаўзнаўлення. Таму высечкі трэба рабіць выключна паступовыя. Менавіта гэты прынцып і гэты метад, лічу, трэба адстойваць. Калі ёсць засяленне караедам, трэба выбіраць менавіта той участак, які пашкоджаны, і не рабіць апераджальныя высечкі.

В. Д. *У такім разе — што маем зараз?*

Я. С. Небяспеку таго, што гэтыя буйныя ўчасткі ў выніку суцэльных высечак не ўзновяцца натуральным чынам. Часцей за ўсё яны зарастаюць травой, дзірванеюць, і насенне лясных дрэў практычна не дае рады тут прарасці. Застаецца так званае «акно».

В. Д. *Ваша ацэнка таго, што цяпер адбываецца? Наколькі пагражальныя дзеянні, рэгламентаваныя гэтым актам?*

Я. С. Я катэгарычна не згодны з такім паспешным рашэннем — распачынаць суцэльныя рубкі. Ісці на гэтакі крок без абгрунтавання тэхналогіі на навуко-

вым савеце, без прыцягнення шырокага кола спецыялістаў-эколагаў не проста рызыкоўна, а безадказна. Тут вырашаецца не толькі лесагадоўчае пытанне, тут закранаюцца ўсе праблемы асабліва ахоўнай прыроднай тэрыторыі.

В. Д. *А больш канкрэтна?*

Я. С. Руйнуецца, ламаецца традыцыйнае стаўленне да вядзення лясной гаспадаркі ў Белавежскай пушчы. Нібыта маецца на ўвазе мэта аздараўлення насаджэнняў, аднак і гэта не матывуецца якімі-кольвек аргументамі. А на справе зусім іншае — не згубіць каштоўную драўніну, скарыстаць з моманту, пашырыць лесанарыхтоўкі.

В. Д. *З размяшчэннем імпартнай піларамы гэта звязана?*

Я. С. Гэта мае прамую сувязь, бо драўніна, якая ў нас нарыхтоўваецца ў ходзе лесадагляду, — не патрабуе папеннай платы. А купля за межамі — гэта дадатковыя выдаткі.

В. Д. *Ці звязаны з планам інтэнсіўных высечак прыход у Пушчу новага дырэктара? Якое Ваша стаўленне да гэтага прызначэння?*

Я. С. Тут самы лепшы дарадца — час. Чалавек ацэньваецца па дзеяннях і ўчынках. Час пакажа і расставіць кропкі над «і».

В. Д. *А тое, што робіцца, хіба не паказчык?*

Я. С. Тое, што сёння робіцца, для нас, пушчанцаў, ненатуральна і супярэчыць шматгадовай практыцы. Выпадкі масавага развіцця караеда былі. Часам нават перасягалі сённяшнія маштабы. Але папярэднікі не ішлі на экстрэмальныя тэхналогіі. І, як бачым, няма сур'ёзных наступстваў гэтай стыхіі. Лес самаўзнавіўся. З дапамогай чалавека, пры ягоным спрыянні і даверы, але без грубага ўмяшання.

В. Д. *Сёння — гэта 50 гектараў?*

Я. С. Па папярэдніх звестках, наколькі я ведаю, так.

в. д. *А колькі вызначыла камісія? Ці не столькі, колькі запрошвалася?*

я. с. Вельмі магчыма.

в. д. *Па-вашаму, 50 гектараў — гэта вялікая плошча?*

я. с. У прынцыпе, гэта значная тэрыторыя. І не толькі з пункту гледжання намаганняў па лесаўзнаўленні або садзеянні лесаўзнаўленню. Адкрываюцца прагалы, пра што я казаў, — паляны як кінуць вокам. А гэта прыводзіць да неўзнаўлення; вялізныя ўчасткі застаюцца адкрытымі і, безумоўна, запатрабуюць карэннага ўмяшання чалавека, бо прырода не зможа сама залячыць такія глыбокія раны. Спатрэбіцца надзвычайнае садзеянне, папросту кажучы, пасадка лесу або, як вы слушна заўважылі, лясных плантацый...

## Пад пагрозай біялагічная цэласнасць і гістарычнасць Белавежскага лесу

ЗВАРОТ БЕЛАРУСКАЙ ГРАМАДСКАСЦІ ДА МІЖНАРОДНАЙ СУПОЛЬНАСЦІ З НАГОДЫ ПРЫЕЗДУ Ў БЕЛАРУСЬ ГЕНЕРАЛЬНАГА ДЫРЭКТАРА ЮНЭСКА

25 чэрвеня 2002

Мы, хто падпісаўся, успрымаем запланаваны прыезд Генеральнага дырэктара ЮНЭСКА спадара Мацуура ў Беларусь як надзвычай важную і радасную падзею. Візіт сусветна вядомай асобы выклікае ў нас пачуцці аптымізму і нацыянальнай годнасці, мацуе надзеі на хуткае вяртанне нашай краіны ў цывілізаванае рэчышча, на шлях культурнай перспектывы.

Мірскі замак — другі беларускі аб’ект, адзначаны высокім тытулам спадчыны сусветнага значэння. Ад-

нак гэты выключна годны факт чарговага прызнання беларускай вартасці, які будзе засведчаны місіяй высокага госця, дае нам падставы з пачуццём занепакоенасці і трывогі гаварыць сёння пра іншы, прыродны і прыродаахоўны аб'ект — Белавежскі лес, які ў 1992 годзе быў занесены ў Спіс чалавечай спадчыны і знаходзіцца пад аховай ЮНЭСКА.

Лёс гэтага рэзервату, нягледзячы на ягоны высокі сусветны тытул (да таго ж, не адзіны!), вымушае нас біць у званы, голасам Касандры даводзіць да міжнароднай супольнасці, што «Ноеў каўчэг» еўрапейскага жывёльнага свету, так званы еўрапейскі пралес зведвае небяспеку і знаходзіцца пад пагрозай.

У выніку нарошчвання тут шматгадовага прамыслова-гаспадарчага патэнцыялу і ўкаранення вытворчых эксплуатацыйных механізмаў — наўзамен (аж да поўнай адсутнасці) рэальнага навукова-даследчага і прыродаахоўнага забеспячэння — Белавежская пушча як запаведны і сусветна прызнаны аб'ект прыроднай спадчыны ператварылася ў лесапрамысловы аб'ект, дзе прыхавана пануюць камерцыйныя нарыхтоўкі драўніны, так званыя валютныя паляванні, іншая сумнеўная дзейнасць. Рабунак Пушчы не спыняецца. Структуры дзяржаўнага апарату, якім падпарадкаваны нацыянальны парк «Белавежская пушча», гандлююць лясным дабром сусветнага рарытэту, каб папоўніць свой ценявы бюджэт, а міжнароднымі адзнакамі і тытуламі маскіруюць прагу штодзённай нажывы.

Адным з апошніх яскравых прыкладаў разбойнага прыўлашчвання Белавежскага лесу і адцягвання сіл калектыву і кіраўніцтва ад першачарговых задач можа служыць факт размяшчэння ў 1999 годзе на цэнтральнай сядзібе нацыянальнага парку высокапрадукцыйнай лесапілкі. Гэты варварскі праект быў падмацаваны леташняй ініцыятывай адміністрацыі парку ажыццявіць суцэльныя санітарныя высечкі ў

сямі кварталах запаведнага лесу, што супярэчыць усякім нормам паводзінаў у такім месцы як Белавежская пушча.

Унікальныя прыродныя сістэмы занепадаюць. Спусташаецца біялагічная разнастайнасць, бяднее відавы склад Пушчы. Менш і менш застаецца дзікай прыроды, страчваюцца біялагічная цэласнаць і гістарычнасць першабытнага асяродку. Назіраюцца цяжкія наступствы меліярацыі, высыхае ялова-хвойная расліннасць, знікаюць балоты. У небяспечнай блізкасці з Пушчай пабудаваны гіганцкі газавы рэзервуар, які стварае пагрозу і абніжае рэпутацыю Пушчы як сусветнага скарбу. Мы не маем аптымізму суцяшаць сябе і тым, што ёсць так званае ядро Пушчы, якое нібыта з'яўляецца абсалютнай нерушай. Яно ніколі не заменіць Белавежскі лес, бо не ёсць яго раўназначным вобразам, не ўвасабляе сабой ягонай велічы і пракаветнасці і не дае поўнага ўяўлення пра ўсю біялагічную і маляўнічую каштоўнасць сусветнага багацця. Запаведнасць Пушчы пад вялікім сумненнем. Справядліва сказаць, што Пушча рэальна не запаведана і ўжо, на жаль, больш фармальна, чым насамрэч, з'яўляецца асабліва ахоўнай прыроднай тэрыторыяй.

Гэта не галаслоўныя нашы сцвярджэнні і не агульнае ўражанне дылетантаў. Эканомія месца вымушае нас абмяжоўвацца дыягназам, апісанне хваробы патрабуе зусім іншых абставін, месца і часу, якія, хацелася б спадзявацца, яшчэ знойдуцца ў нас.

Як і ўчарашні камуністычны, сённяшні беларускі рэжым не прызнае падзення Белавежскага лесу, імкнецца міфалагізаваць ягоны стан, працягвае замоўчваць вялікія праблемы або фальсіфікаваць становішча справаў. Фінансавая дзейнасць нацыянальнага парка закрытая ад грамадства і пры сённяшняй палітычнай сітуацыі ў Беларусі цалкам некантраляваная, што дае магчымасць уладам і надалей махляваць і красці ў прыроды. Патрабаванні асобных ву-

чоных, дэмакратычнай грамадскасці адпрэчыць хіжыя стэрэатыпы гаспадарчай дзейнасці, змяніць заганныя метады дзеля зберажэння нацыянальнай святыні і каштоўнасці чалавецтва шматгадова адхіляюцца. Грамадская думка ігнаруецца або двурушна заспакойваецца праз дзяржаўныя тэлебачанне і друк.

Канстатуючы гэткі стан рэчаў, мы вельмі добра ўсведамляем, што праблема Белавежскай пушчы, яе беларускай часткі ёсць найперш праблемай беларускага грамадства. Аднак, разам з тым, ёсць іншая сувязь, іншы грунт. Мы не агучвалі б свае трывогі і не ўскладалі б на каго-небудзь надзей, калі б не ўмовы міжнароднай *Канвенцыі на ахову сусветнай культурнай і прыроднай спадчыны*, да якой далучылася Беларусь і якая павінна няўхільна выконвацца Бакамі, а яе выкананне — строга кантралявацца. У звязку з гэтым, што датычыць Белавежскай пушчы, адказна сведчым: умовы Канвенцыі парушаюцца прама і ўскосна, практыка і якасць нацыянальнага захавання сусветнага рарытэту не адпавядаюць яе высокім патрабаванням. У прыватнасці, найбольш яўна не выконваюцца і парушаюцца артыкулы 4, 5, 27, якія датычаць канкрэтных задачаў нацыянальнай аховы спадчыны і інфармавання грамадскасці пра небяспекі, якія ёй пагражаюць.

Мы бачым цяперашні стан Белавежскай пушчы вынікам сур'ёзных пашкоджанняў і хацелі б, каб увага сусветнай супольнасці, а таксама кампетэнтная зычлівая ўвага спадара Генеральнага дырэктара да унікальнай лясной выспачкі свету былі звернуты на гэтыя нашы сумненні, трывогі і расчараванні дзеля аднаго — ўратаваць Белавежскі лес ад далейшага заняпаду і дэградацыі. Мы не выключаем мэтазгоднасці залучэння Белавежскай пушчы ў *Спіс сусветнай спадчыны, якая знаходзіцца пад пагрозай,* калі адпаведны міжнародны камітэт паводле вызначаных крытэрыяў і на падставе даследаванняў зной-

дзе ў тым неабходнасць. Мы заклікаем супольнасць ініцыяваць гэтыя даследаванні і на падставе аб'ектыўных ацэнак дамагчыся поўнай карціны, якая склалася ў Белавежскай пушчы на пачатак трэцяга тысячагоддзя.

Тэкст гэтага Звароту пакладзены ў аснову нашага Ліста асабіста Генеральнаму дырэктару ЮНЭСКА спадару Каічыра Мацууры.

Падпісаліся таксама: *Святлана Алексіевіч, Уладзімір Дацкевіч, Радзім Гарэцкі, Ніл Гілевіч, Леанід Лыч, Пятро Садоўскі, Станіслаў Шушкевіч*

## «Состояние Беловежского леса — это вопрос организации науки»

ДИАЛОГ С ПРОФЕССОРОМ ЭРИКОМ СЛЕПЯНОМ (САНКТ-ПЕТЕРБУРГ, РОССИЯ).
ЗАПІС ПАДЧАС МІЖНАРОДНАГА «КРУГЛАГА СТАЛА» ПАД ЭГІДАЙ ЮНЕСКА, ПРЫСВЕЧАНАГА ПРАБЛЕМЕ «ВЫТОКІ ФІЗІЧНАГА І МАРАЛЬНАГА ТЭРАРЫЗМУ Ў ЭПОХУ ГЛАБАЛІЗАЦЫІ», МІНСК

9–10 ліпеня 2002

В. ДРАНЧУК. *Господин Слепян, что Вы можете сказать о сохранении природных резерватов, таких как Беловежская пуща, в нынешних, подчас весьма затруднительных условиях? Пример, который на слуху, — Пуща теряет свое лицо, мельчает, обессиливается, являясь при этом местом всемирного наследия, — не только всех нас волнует, но вызывает определенные разочарования и заставляет задуматься.*

Э. СЛЕПЯН. Проблема национальных природных резерватов, конечно же, имеет международное значение. И пока мы не установим закономерность, способность резерватов самообеспечивать свою надеж-

ность и устойчивость, пока не будут установлены закономерности нарушения этих резерватов, как зависимых, так и не зависимых от деятельности человека, пока не будут установлены управляемые человеком законы восстановления нарушенных экологических систем, — ни один резерват в мире не может быть сохранен.

В. Д. *Какое место в этом Вы отводите ЮНЕСКО?*

Э. С. Я бы полагал, что ЮНЕСКО должно взять на себя одну обязанность — быть главным организатором разработки в области а) науки, которая называется экоплагономия, — науки о нарушении закономерности экологических систем и б) науки — экореставрономии, то есть, науки о закономерностях восстановления нарушенных экосистем.

Вот эта проблема — нарушение и восстановление экологических систем — имеет, безусловно, международный смысл, так как ни одно государство не способно её решить самостоятельно; хотя бы по той простой причине, что истина познается в сравнении: и законы нарушения, и законы восстановления экологических систем — это законы сравнительные, поскольку имеем различные ландшафты, различные ландшафтные зоны, различные экологические системы — и у каждого своя специфика как в реакции на повреждающие воздействия, так и в механизмах восстановления. Так что законы эти должны быть разработаны на сравнительной основе, а сделать это может только ЮНЕСКО и ООН.

В. Д. *Существует Конвенция, международный экологический документ, который также мог бы «вмешиваться» в процесс, когда объект всемирного наследия испытывает своеобразный террор. Как Вы думаете, этот правовой документ мог бы воздействовать на ситуацию?*

Э. С. Ответ двояк. Первое. Прежде всего с учетом

требований к смыслу термина «террор» и с учетом смысла термина «экологический терроризм» и «экологические террористические акты», нужно четко определить, что имеет место и каков диагноз: какие повреждающие агенты действуют, кем и как они генерированы и к чему они приводят? Второе. Безусловно, любой международный документ, имеющий основу международного права, основу договоренности между разными государствами, не просто должен, он обязан быть исполнен. Иначе государство не имеет права называться членом мирового сообщества. Вы не забывайте, что когда создавалась Асуанская плотина, там объединились многие государства для того, чтобы спасти памятники целых культур и цивилизаций. Третье. Поскольку Беловежская пуща — это объект государства Беларусь, то именно Беларусь — как самостоятельное суверенное государство несет ответственность за судьбу объекта, который принадлежит не только ему, но и всему миру.

В. Д. *Так записано в Конвенции. А в случае, если Беларусь не выполняет предписанных ей обязанностей?*

Э. С. Надо выяснять причину. Может не быть денег — раз. Могут отсутствовать специалисты –два, не разработаны национальные технологии сохранения и так далее. В этом случае руководство государства или отдельные институты этого руководства, я бы считал, должны обратиться к мировому сообществу с просьбой о содействии — так же, как это происходит сегодня с Венецианской лагуной, Пизанской башней и др.

В. Д. *Но как быть, когда государство вместо этого продолжает мифологизировать Беловежскую пущу? Никому ни в чем не уступать?..*

Э. С. *(перебивая)* Это уже вопросы политики.

В. Д. *Это политика? Вы так считаете?*

Э. С. Это не имеет отношения к делу.

В. Д. *То, что плачевная ситуация в Беловежской пуще не признается, дабы продолжать плановые рубки, заниматься поставками, торговать добром и так далее — разве это...*

Э. С. Вы знаете, тут я ничего сказать не могу. Скажу лишь одно: должны быть профессионалы, специалисты: это и лесоводы, и почвоведы, и ландшафтоведы, как белорусские, так и зарубежные, но прежде всего белорусские — экологи, специалисты в области биологической химии, экологических аспектов физики и т.д. Они должны объединиться и поставить точный диагноз. Понимаете, ни у кого нет времени на разговоры ни о чем. Надо поставить диагноз, четко его обосновать и уже с поставленным диагнозом разговаривать с теми государственными учреждениями — экономическими, политическими, внутриполитическими, конечно, и научными, которые имеют возможность что-то решить.

В. Д. *И последний вопрос. Если вот эти специалисты не объединяются, не идут... Их, точнее, не подпускают, слушать не хотят, диагноз не признается. Если...*

Э. С. *(перебивая)* Это уже вопрос...

В. Д. *Секундочку!.. Если не происходит то, о чем Вы только что сказали, — разве это не вопрос политики, ситуации в стране?*

Э. С. Нет, это не вопрос политики. Это вопрос организации науки.

В. Д. *Кто же должен инициировать это начало, этот разговор профессионалов с учреждениями власти?*

Э. С. У Вас есть Министерство по охране окружающей среды.

В. Д. *А если оно не ставит эти вопросы, не инициирует их? Из Беловежской пущи ушла наука, ее незаметно убрали. Тогда что?*

Э. С. Вы знаете, это вопросы уже не ко мне. Это вопросы...

В. Д. *А Ваше отношение?*

Э. С. Отношение таково: я не верю, что в Беларуси нет таких специалистов.

В. Д. *В Беларуси они есть, но они не востребованы властями, не объединяются. Им угрожают, их увольняют.*

Э. С. Что значит, *«не востребованы»*? Я не буду вмешиваться в эти вещи. Вы должны меня понять. Если вы представляете Беловежскую пущу как резерват международного значения, возьмите на себя дополнительные функции, попытайтесь привлечь к делу, кого считаете нужным. Что значит, *«не объединяются»*? Если не объединяются, значит, нет объединяющего начала.

В. Д. *Спасибо за откровенность, господин Слепян. То, что Вы сейчас сказали, по-моему, очень важно. Это вне политики или выше политики, я не знаю. Хотя очень спорно. Но в Ваших словах, мне кажется, больше искренности, чем желания отмежеваться от наших белорусских условий. И это как раз воодушевляет. Спасибо!*

Э. С. Спасибо и Вам за понимание. Желаю успеха!

## Варварскія праекты ў найстарэйшым лесе Еўропы

ІНТЭРВ'Ю КАРЭСПАНДЭНТУ ГАЗЕТЫ «НАША СВАБОДА» ВЯЧАСЛАВУ КУЛІКОЎСКАМУ З НАГОДЫ ПАСЛАННЯ ГЕНЕРАЛЬНАМУ ДЫРЭКТАРУ ЮНЭСКА КАІЧЫРА МАЦУУРЫ

Ліпень 2002

ВЯЧАСЛАЎ КУЛІКОЎСКІ. *Спадар Валеры, якім чынам утварылася кола падпісантаў і як была ўзгодненая пазіцыя па крайне катэгарычных выс-*

*новах — што цяперашнія ўлады не маюць ні волі, ні жадання ўратаваць становішча ў Пушчы?*

в. дранчук. Палітыкі Пётр Садоўскі і Станіслаў Шушкевіч яшчэ ў перыяд працы ў Вярхоўным Савеце дванаццатага склікання час ад часу апекаваліся праблемамі Белавежжа. Садоўскі, у прыватнасці, асабіста сутыкаўся з фактамі крыміналу ў запаведніку. Прафесар Леанід Лыч шмат працуе на абарону беларускасці, ён лічыць, што прырода, як і мова, патрабуе больш плённай руплівасці ад патрыётаў. Святлана Алексіевіч падпісвалася пад папярэднім зваротам у Раду Еўропы, і яе цвёрдая пазіцыя — што ў Пушчы павінна быць дыдактыка, а не прамысловае лобі. Арнітолаг Уладзімір Дацкевіч — карэнны белавежац, гэта розум і звон Пушчы, чалавек з вялікім досведам. Ён адкрыта заяўляе пра незваротныя страты рэліктавых краявідаў, балотаў, канстатуе, што колькасць пушчанскай арнітафауны памяншаецца з году ў год. Пазіцыі Ніла Гілевіча і Радзіма Гарэцкага добра вядомыя: крыніцы Жыцця пакідаюць Пушчу, бо ўладныя функцыянеры спяшаюцца як мага пагрэць рукі, а не ўратаваць жывыя парэшткі. Увогуле, усе мы стаім на платформе грамадскага кантролю за выкананнем у нашай краіне Міжнароднай канвенцыі на захаванне сусветнай культурнай і прыроднай спадчыны. Гэта цудоўны і мудры дакумент, прыняты еўрапейскай супольнасцю 30 гадоў таму, але ў Беларусі ён ніколі дагэтуль не друкаваўся, практычна ўтойваўся ад грамадскасці.

в. к. *Якім можа быць механізм перадачы Звароту ў структуры міжнароднай супольнасці?*

в. д. Апроч таго тэксту, што пайшоў на ўнутраны інфармацыйны рынак, ёсць яшчэ асобны ліст — персанальна да Каічыра Мацууры. Ён на ангельскай мове, больш структураваны і ўтрымлівае дзве просьбы. Мы спадзяёмся, што пры сустрэчах з дзяржаўнымі асобамі Генеральны дырэктар ЮНЭСКА закране

праблемы Белавежскай пушчы на падставах, выкладзеных у Звароце. З-за таго, што ўзровень нацыянальнага захавання Белавежскай пушчы вельмі нізкі, патрабуецца дасканалая і поўная праверка становішча спраў экспертамі ЮНЭСКА «на прадмет» нашай прапановы — адмяніць статус помніка Сусветнай прыроднай спадчыны і занесці Белавежскую пушчу ў Сусветны спіс помнікаў, якія знаходзяцца пад пагрозаю вынішчэння. Мы можам даказаць якой хочаш камісіі, кожнаму эксперту, што гэта тая сусветная спадчына, той пракаветны гістарычны Белавежскі лес, якому сёння пагражае небяспека.

В. К. *А ці ёсць шанец атрымаць якую-небудзь «фортку» ў раскладзе візіту пана Каічыра Мацууры і асабіста пазнаёміць яго з набалелай праблемай у экалогіі Беларусі?*

В. Д. На асабістае знаёмства спадзеву няма. Ёсць асобы, якія будуць спрыяць азнаямленню Генеральнага сакратара з белавежскай праблемай, перададуць яму наш пакет. За тыдзень мы разаслалі тэксты па электроннай пошце, і я мяркую, што спадар Мацуура збольшага паінфармаваны. Цяпер падрыхтаваная папка з трыма аркушамі. Першы тэкст — беларускамоўны, які распаўсюджаны ў нашай краіне, другі — ліст на беларускай мове непасрэдна Мацууры, трэці — англійскі варыянт гэтага ж паслання.

В. К. *Зварот прадстаўнікоў дэмакратычнай грамадскасці Беларусі да ЮНЭСКА — гэта чарговы крок заступніцтва за найстарэйшы лес Еўропы. Што з'явіцца наступным?*

В. Д. Мы зараз слабейшыя за фінансава-прамысловае лобі, якое практычна на нішто звяло навуку ў Пушчы і канчаткова пераарыентавала працу ў запаведніку на нарыхтоўку і перапрацоўку драўніны. Але Беларусь з'яўляецца ўдзельніцай Міжнароднай канвенцыі на захаванне сусветнай культурнай і прыроднай спадчыны і павінна няўхільна выконваць яе

стандарты. Насамрэч у Белавежскай пушчы як месцы сусветнай спадчыны адбыўся поўны правал па трох канкрэтных пунктах. І калі мы бачым, што дзяржава не прытрымліваецца гэтых прынцыпаў, то лічым патрэбным інфармаваць высокія міжнародныя інстанцыі. Зараз у стадыі фармавання грамадская ініцыятыва TERRA-Канвенцыя, якая будзе апекавацца менавіта тым, як прыродаахоўныя канвенцыі і міжнародныя юрыдычныя дакументы знаходзяць сваю рэалізацыю ў Беларусі, асабліва што да іх стыковак з нацыянальнай прававой базай.

## «Сёння Пушчу трэба ратаваць ад дзяржавы»

ІНТЭРВ'Ю НЕЗАЛЕЖНАЙ ЖУРНАЛІСТЦЫ ГАННЕ АРЦЮШКЕВІЧ, ДЛЯ ГАЗЕТЫ «НАРОДНАЯ ВОЛЯ»*

Снежань 2002

ГАННА АРЦЮШКЕВІЧ. *Валер, у лістападзе 1972 года на Генеральнай канферэнцыі ААН у Парыжы была прынятая Канвенцыя на захаванне сусветнай культурнай і прыроднай спадчыны, а дзесяць гадоў таму часткай сусветнай спадчыны прызналі Белавежскую пушчу і за яе захаванне пачало адказваць усё чалавецтва. Калі я нічога не блытаю, гэта была першая прыродная вартасць на абшары новых незалежных дзяржаў, якая трапіла ў Спіс усясветнай спадчыны?*

В. ДРАНЧУК. Усё абсалютна слушна. Дадам хіба тое, што гонар далучыцца да вялікай спадчыны свету выпаў пры гэтым двум дзяржавам — Польшчы і Беларусі.

Г. А. *Словам, гадавіна. І па даўняй добрай традыцыі варта было б гаварыць пра росквіт Пушчы*

* Друкавалася са скарачэннямі. Падаецца арыгінал.

*пад крылом усясветнага клопату. Аднак клопат айчынны паспеў да яе раней за ўсясветны, у выніку чаго ты, Валер, ініцыяваў два набатныя Звароты прадстаўнікоў беларускай дэмакратычнай грамадскасці ў адрас Савета Еўропы і міжнароднай супольнасці: у адным, на першы погляд не вельмі патрыятычным, вы просіце не спяшацца падаўжаць тэрмін дзеяння пачэснага Еўрадыплома, прысуджанага Пушчы пяць гадоў таму, у другім, на адрас ЮНЭСКА, — настойваеце ўлучыць прыродную каштоўнасць у асобны Спіс усясветнай спадчыны, якой пагражае небяспека. Ці займела твая экалагічная ініцыятыва той рэзананс, на які вы маглі разлічваць?*

В. Д. Што да Рады Еўропы, мы сведчылі перад гэтай высокай інстанцыяй наша стаўленне ў сувязі з невыкананнем адмысловых умоў і рэкамендацый Дыплома і падаўжэннем яго тэрміну для Белавежскай пушчы. Нашы пазіцыі і падыходы былі дыпламатычна засведчаны і ўспрынятыя, пра большае мы не ведаем. На жаль, на той час, як я даведаўся пазней, рашэнне аб падаўжэнні Дыплома было ўжо прынята... Але час бяжыць хутка. І калі быць паслядоўным і ведаць, за што змагаешся, можна не чакаць 2007 года, а ўжо сёння патрабаваць ад беларускіх уладаў выканання новых умоў і рэкамендацый падоўжанага Дыплома. Праз тыдзень я еду ў Пушчу, буду цікавіцца.

Г. А. *Сёння цябе называюць журналістам з «пушчанскай прапіскай». А з чаго ўсё пачалося?*

В. Д. Канец 70-х. Я працаваў карэспандэнтам «Звязды». Неяк заселі за навагодні нумар. Хацелі зрабіць яго звонкім, казачным, прыгожым, каб былі ў ім і людзі, і снег, і прырода. Я падышоў да карты і выбраў кропку — Белавежская пушча. Дагэтуль яна была ў маіх асацыяцыях нейкай мрояй, летуценнем. І я паехаў. Мяне правезлі на матацыкле па глухіх лясных сцежках. Выпаў сняжок, я пабачыў зубра, мне ад-

крыўся цудоўны лясны ландшафт. І Пушча ўвайшла ў маё жыццё — раптам і назаўсёды. Газета як бы ўвянчала мае памкненні, гэта быў першы выпадак, калі друкаванае выданне займела назоў лесу, Вялікага лесу.

Г. А. *І хто падтрымаў?*

В. Д. У 1994 годзе тады яшчэ жывы Фонд Сораса абвесціў конкурс, я замовіў удзел, падаў свой прыродалюбны праект: выдаваць газету, якая б расказвала людзям пра белавежскі цуд. Журы мяне падтрымала: на сродкі фонда я набыў настольную выдавецкую тэхніку і стаў «чалавекам-рэдакцыяй» — выпускаў шаснаццаціпалосную газету з дапамогай сямейнікаў ды блізкіх сяброў. Наймаць штат каштавала вялікіх грошай. Падвярнулася яшчэ пара невялікіх грантаў, а з чацвёртага нумара газета пачала выбівацца на самаакупнасць.

Г. А. *Матывацыяй былі толькі эмоцыі ад паездкі ў Пушчу?*

В. Д. Перадусім, але не толькі. У Беларусі адбыліся велічныя змены. Мы ўжо сталі дзяржавай. Мая газета пачалася менавіта з усведамлення сваёй дзяржавы. Паспрыяла гэтаму зноў-такі Пушча. Пасля падзей 1991 года ідэя газеты яшчэ больш захапіла, я ўжо сніў яе першы нумар. Увесь пакой быў засланы эскізамі, газету я скрозь пісаў і маляваў. І вось, калі выйшаў першы нумар, мяне паклікалі «на кавёр». Чыноўнікам Кіраўніцтва спраў прэзідэнта не спадабалася назва. Маўляў, так называецца ўжо нацыянальны парк. Крымінал, артыкул кодэкса! Але я не спалохаўся, паставіўся досыць спакойна. Трымаўся свайго. Бо ў назве было ўсё, без гэтай назвы газеты няма... Пушча здавалася мне эталонным лесам, я арыентаваўся на тытульныя каштоўнасці, на Пушчу як ідэнтытэт краіны. Здарылася так, што ў рэшце рэшт газета выканала іншую мэту — развянчала міф пра Белавежскую пушчу як «першабытны лес», як абсалютна нечапаную тэрыторыю.

Г. А. *І калі пачалося развянчанне? Якім чынам дарога, што пачыналася ў зімовай казцы, прывяла да Звароту?*

В. Д. Развянчаннем была праўда пра Белавежскую пушчу. Горкая і пякучая. Гаворыш — і баліць. Гэтую праўду на самым пачатку сказаў мне адзін чалавек. Яго завуць Уладзімір Апанасавіч Дацкевіч. Патомны пушчанец, вучоны-арнітолаг, смелы і мужны чалавек. Я не ішоў у нашу Акадэмію да тытулаваных вучоных, а ехаў да яго, бо цвёрда верыў у ягоны досвед і розум. Ён гаварыў мне голасам Касандры. Вучоныя-акадэмікі так не гаварылі. Я слухаў і запісваў. Наша гутарка з'явілася ў сёмым нумары і называлася «Падзенне Белавежскай пушчы». Пяць гадоў прайшло, а гэты маналог Уладзіміра Апанасавіча, здаецца, зрабіўся яшчэ больш востры, яшчэ больш балючы сваёй непадробнай праўдай. Дзікунствы эксплуатацыі Пушчы канчаткова ўзаконіліся. І справа нават не ў тым, што Пушчу рэжуць планава-дырэктыўна — 100–120 тысяч кубаметраў драўніны ў год, і гэтая лічба паўзе ў гару, а рэч у тым, што апроч гэтай жорсткай эксплуатацыі тут нічога больш не застаецца.

Г. А. *Навошта секчы дрэвы ў Пушчы, калі ёсць лясгасы?*

В. Д. Не адпускае інэрцыя. Пушча вялікая, лес кругом, а гэта спакуса. Плюс камерцыялізацыя, новыя стаўкі на хуткі прыбытак, абагачэнне, прага нажывы.

Г. А. *На беларускім тэлебачанні я нейкі час рабіла перадачы пра лес. На адным з семінараў міністр лясной гаспадаркі Зорын паказвае мне на магутны дуб і кажа: «Такое дрэва за мяжой добрага мерседэса каштуе!» Напэўна, у Пушчы вялікія грошы круцяцца?*

В. Д. Я ўжо трохі казаў. Але дадам. Месяцаў колькі таму над Пушчай пранеслася бура. Тэлефануе знаёмая журналістка і пытаецца пра магчымыя наступ-

ствы. Кажу, прыродзе трэба давяраць, мяне куды больш палохаюць фінансавыя буры над Белавежскай пушчай. Менавіта яны забіраюць наш скарб. Людзі, якія працавалі ў пушчанскай канцылярыі, цвердзяць пра двайную бухгалтэрыю. У справаздачах, маўляў, адно, а на справе, як кажуць, адзін Бог ведае. Пушча не кантралёр. А штатныя кантралёры сюды рэдка едуць.

Г. А. *Прэм'ер-міністр можа ведаць прыкладныя лічбы?*

В. Д. Не думаю. Дый галава ў яго за Пушчу не баліць. Я лічу, што ёсць канкрэтнае фінансава-прамысловае лобі, абмежаванае колам людзей, якія запраўляюць справамі ў Пушчы. Я гатовы сцвярджаць, што сітуацыяй там непадзельна валодае Кіраўніцтва спраў. Куды ідуць грошы, можна здагадвацца.

Г. А. *Але гаспадарчая дзейнасць у Пушчы павінна быць строга абмежаванай?*

В. Д. Гэта, як кажуць, ключавы панятак. Паводле закона, гаспадарчая дзейнасць павінна весціся на аснове «перадавых дасягненняў прыродакарыстання». Пушча — гэта наш першавобразны лес, эталонны прыродны комплекс, складаны жывы арганізм, еўрапейскі рарытэт. І чалавек павінен быць з кожным кусцікам на «вы» — гэта значыць, шанаваць і захоўваць біялагічную разнастайнасць, а не чыніць разбурэнні. Наогул, якая «гаспадарчая дзейнасць»? Той жа закон «Аб асабліва ахоўных тэрыторыях», артыкул 20, ставіць гаспадарку апошнім, сёмым звяном. Перадусім — прыродазахаванне, асвета, навука, культурная спадчына, рэкрэацыйная дзейнасць... Вось так! Закон, між іншым, наш, беларускі. Яго ніхто не адмяняў.

Г. А. *Каб трымацца «чэсных правіл», Пушча не павінна быць даступнай і шырокаму колу наведнікаў?*

В. Д. Калі паляўніча-запаведная гаспадарка, якой была Белавежская пушча, мяняла свой статус, вучоныя, найперш, Сушчэня, Парфёнаў, Жукаў і іншыя, — я гэта добра ведаю, быў у той час галоўным рэдактарам «Роднай прыроды», — прапаноўвалі зрабіць яе запаведнікам. Тады Пушча магла паспрабаваць выйсці на нейкі светлы шлях. Можна было б павучыцца ў шэрагу краінаў, дзе ёсць запаведнікі і рэзерваты. Скажам, у Вялікабрытаніі некалькі рэзерватаў належаць не якому-небудзь Кіраўніцтву спраў прэзідэнта, а грамадскім экалагічным арганізацыям. І людзі не едуць таптаць рэзерваты, а купляюць альбомы з яго відамі. Яны шчаслівыя ад таго, што гэтая тэрыторыя належыць птушкам і рэдкім жывёлам. А ў нас, калі Пушчу рабілі нацыянальным паркам, улада кінула кліч: нацыянальныя каштоўнасці павінны быць даступнымі «для шырокіх мас»!

Г. А. *Спекуляцыя?*

В. Д. Яшчэ якая! Ніякай «даступнасці» не было, няма і не будзе. Экскурсійны маршрут, вальеры, дапатопны музей. Гэта шырма. Рэстарацыя, бар, гасцініца, лазня — ці пра такую даступнасць трэба казаць? Дый якая даступнасць на фоне дэградацыі? Які турызм на пнёвых краявідах? Пушча закрытая і належыць уладзе, сённяшнім саноўнікам. Гэтым летам, напрыклад, там адпачываў Ельцын. Для яго быў зроблены адмысловы прычал, дзе ён вудзіў рыбу, а пад «дзедаў кручок», як казалі мясцовыя, была кінута тона рыбы, каб добра клявала. Так што ў гэтым сэнсе нічога не змянілася.

Г. А. *Пушча магла б зарабляць грошы без шкоды сабе?*

В. Д. У тым і рэч! Магла б, калі б, напрыклад, на месцы лесапілкі за той жа крэдыт стварылі Выдавецкі дом «Белавежская пушча». На кнігах і альбомах можна было б зарабляць прыстойную валюту, таму што пра Пушчу зараз амаль нічога няма, а попыт заўжды

вялікі. Магчымасцяў мноства. Можна пашыраць і экалагічны маркетынг, праўда, не так, як гэта пачаў рабіць Іван Ціцянкоў.

Г. А. *Менш турызму, больш экалогіі?*

В. Д. Мяркую, Белавежская пушча застаецца месцам, дзе трэба ўзнаўляць навуковы турызм. Тут былі заваяваныя пазіцыі, але, на жаль, яны панішчаны.

Г. А. *Дарэчы, пра навуку. Якія перспектывы, на думку вучоных, чакаюць Пушчу?*

В. Д. У Пушчы сёння навукі, запаведнай навукі, амаль няма. Сур'ёзныя даследаванні скінуты на абочыну. Навуковыя праграмы пахаваныя ў пілавінні лесаперапрацоўчага комплексу. Зроблена гэта для таго, каб рукі ў лесарубаў былі развязаныя, каб ніхто ім не замінаў. Чаму навука не ўмешваецца ў праблемы і лёс Пушчы? Можа, таму што яна сёння на каленях. Акадэмік Парфёнаў — спецыяліст па Пушчы з вялікім стажам — сказаў у яе абарону нямала разумных слоў, я гэта чуў, але ў рэшце рэшт зразумеў, што гаварыць — няма сэнсу. А выходзіць на плошчу ці станавіцца ў пікет ён не ўмее або не хоча.

Калі прыязджаў у Мінск Генеральны дырэктар ЮНЭСКА К. Мацуура, у Доме літаратара быў наладжаны «круглы стол», дзе абмяркоўваліся праблемы глабалізацыі і тэрарызму. З падачы Адама Мальдзіса я ўвёў у кантэкст дыскусіі тэму тэрарызму ў адносінах да Белавежскай пушчы. Прафесар з Санкт-Пецярбургу Эрык Сляпян — дарэчы, выхадзец з Беларусі, вучоны шырока абазнаны, спрактыкаваны і дасціпны — мяне падтрымаў, але сказаў, што да грамадскіх зваротаў ставіцца з доляй прахалоды, таму што, маўляў, навука сёння здольная да той ступені самаарганізацыі, калі можа абараніць любую ідэю ад дзяржаўнага ўціску. Скажам, навука лічыць, што Пушча павінна стаць запаведнікам, значыць, яна здольная і мусіць гэта зрабіць.

Г. А. *На маю думку, вучоны з Санкт-Пецярбургу проста класічны ідэаліст у сэнсе «самаарганізацыі» беларускай навукі... Чула, што не на карысць Пушчы змянілася і кіраўніцтва ў ёй?*

В. Д. Да прыходу бальшавікоў у Пушчы дырэктарам быў вучоны, лесавод-энтамолаг Ян Ежы Карпінскі. Асоба! Пісаў музыку, вершы, пакінуў цудоўную фатаграфічную спадчыну — гэта лепшыя здымкі, якія ўвогуле ёсць пра Белавежскі лес. Але найперш Карпінскі быў буйны вучоны. І бліскучы, нястомны арганізатар. Ён жыў Пушчай, ён любіў Пушчу, ён яе аберагаў, — душой, імпэтам, статусам дырэктара. За ім у Пушчы панавалі навука і культура. І ў нас былі светлыя галовы, ратавалі Пушчу ад гвалту. А сёння прыходзяць людзі, «загартаваныя» на гаспадарцы, на лесанарыхтоўках — такія як Жукаў (не той, вучоны, а былы старшыня калгаса), пасля Бамбіза.

Г. А. *А што ў польскай частцы Пушчы?*

В. Д. Там цяпер сітуацыя, на мой погляд, куды больш скіраваная ў бок гуманізацыі адносін да Пушчы. У іх моцнае «ядро», дзе поўная неруш. Яны могуць паказаць праўдзівую Пушчу. Парк Нарадовы — іх гонар, адукацыйная Мека. Шмат выдаецца літаратуры. І я б адзначыў высокі ўзровень арганізацыі па ўсіх накірунках прыродаахова. Палякі даўно ўсё зразумелі і лёгка перахапілі ініцыятыву сабе на карысць. Еўропа ўжо выдае ім гранты, каб яны ехалі да нас і вучылі, як трэба, напрыклад, развіваць экалагічны турызм.

Г. А. *Яны вучаць нас не секчы Пушчу?*

В. Д. Так. І калі бываю на такіх семінарах, то адчуваю сябе, прабач, ці не поўным ідыётам. Мне даводзяць слушныя рэчы, а ў гэты самы час чыноўнік з Мінску падпісвае дазвол на суцэльную санітарную рубку. Я не крыўдую на палякаў, мне крыўдна за сваю дзяржаву. Мы ўпарта не хочам быць разумным гра-

мадствам, абніжаем сваю годнасць. Не прызнаём памылак і не жадаем на іх вучыцца.

Г. А. *Калі Пушча прызнаная ўсясветнай спадчынай, то яна павінна быць адкрытай для сусветнай навукі?*

В. Д. Па вялікім рахунку, на гэта скіраваны і абодва нашы Звароты. Больш за тое, я лічу, што наш шлях у Еўропу можа адбыцца: ў тым ліку праз гуманізацыю нашага стаўлення да прыроды. Мы здольныя і маглі б ісці паперадзе Еўропы. На гэта ў нас ёсць адпаведны прыродны, навуковы, інтэлектуальны патэнцыял. Хіба нельга зрабіць так, каб у Пушчы, скажам, ажыццяўлялі свае зялёныя праекты вучоныя і грамадскія арганізацыі Еўропы і свету?

Г. А. *Вярнуся трохі назад. Ёсць два звароты дэмакратычнай грамадскасці ў аўтарытэтныя міжнародныя інстанцыі. Там, дзе прапануецца ўлучыць Пушчу ў Спіс усясветнай спадчыны, якая знаходзіцца пад пагрозай, усё зразумела. Не ўсе разумеюць, навошта адбіраць Еўрадыплом?*

В. Д. Еўрапейскі дыплом даецца на пяць гадоў. Калі ўсё добра, тэрмін працягваецца. Гэта сродак захавання Белавежскай пушчы, інструмент выхавання і пастрымання. Дыплом не столькі прызнаваў заслугі, колькі абумоўліваў змены. А нашы ўлады ім спекулююць. Зрабілі з яго шырму, за якой працягваюць эксплуатаваць унікальны лес, кампраметуючы, між іншым, саму ўзнагароду. Дыплом абавязвае выконваць шэраг умоў — яны не выконваюцца, нават, сказаў бы, ігнаруюцца ў здзеклівай форме. Пад Еўрадыплом можна і грошы прасіць за мяжой, толькі вось — ці будуць яны траціцца на карысць Пушчы, пакуль на двары гэтая ўлада? Мы прасілі Раду Еўропы не спяшацца, а націснуць на беларускую адміністрацыю.

Г. А. *Хто, на тваю думку, можа абараніць сёння Белавежскую пушчу?*

в. д. Толькі мы самі. Згодна з нашай Канстытуцыяй, гэта прамы абавязак кожнага грамадзяніна Беларусі. Безумоўна, з дапамогай міжнароднай супольнасці. А калі зусім рэальна, — напэўна, мясцовыя жыхары, друк, нацыянальная навука, закон… Я нагул лічу, што Пушча павінна належаць чатыром інстытутам: навуцы, адукацыі, культуры і абавязкова — мясцовым жыхарам. Гэта магчыма ў дэмакратычным грамадстве. А сёння абараняць Пушчу трэба ад дзяржавы.

г. а. *Ці не здаецца табе, што наступныя пакаленні будуць меркаваць пра нашу духоўнасць і па тым, ці захавалі мы Пушчу, бо яна — не толькі рэліктавы лес, а сімвал Беларусі, частка нашай душы?*

в. д. Свежы прыклад. Тэлефануе жанчына, спрабуе выведаць сякія-такія звесткі: як даехаць у Пушчу, што паглядзець, з кім сустрэцца і гэтак далей. Я падказаў і таксама давай распытваць: як і чаму ўзнікла ідэя паездкі? Яна гаворыць: «Павінна ж нешта цёплае грэць душу. Мы лічым, што гэта Пушча». Большасць суайчыннікаў лічаць так… На жаль, мала хто задумваецца, што грэе… сваімі рэштками. Я вось думаю: ці сагрэе Пушча маіх унукаў? Баюся, што не. З палону вялікага міфу трэба выбаўляцца і як мага ратаваць Пушчу ўсёй грамадой. Якая там магутная энергетыка! Яна ж збіралася ў Пушчы вякамі! Там ёсць яшчэ, ёсць нешта такое, чаго мы сёння нават патлумачыць не можам, пра што нават не здагадваемся, можа, толькі навука будучыні разгадае гэтую прошчу. Калі я не пабываю ў Пушчы месяц-другі, я пачынаю трызніць Пушчай! Гэта — унікальная мясціна і, павер, нам ёсць што абараняць!

# 3

Ініцыятыва «TERRA-Канвенцыя патрабуе: павялічыць плошчу абсалютнай запаведнай зоны да 50 працэнтаў нацыянальнага парка і вышэй, дамагацца пашырэння ўсясветнай Спадчыны на ўсю тэрыторыю гэтай зоны.

Фасад канчаткова абрынецца. І мы ўбачым маштабы страт, дэградаваныя плошчы. На ўзроўні вачэй нам адкрыецца тое, што сёння старанна хаваюць ад нас.

Праўда не ў тым, секчы або не секчы Белавежскую пушчу, а ў тым, што людзі, якія прыйшлі яе секчы, нічога іншага рабіць не ўмеюць. Паводле тэорыі запаведнай справы

**Ведаць праўду, каб пісаць праўду.**
*Ліст 12 журналістаў да прадстаўніка ААН у Беларусі.* . . . . . . . . . . . . . . . . . 177

**Ніл Бунэ пацікавіўся, чаму рэжуць Пушчу.**
*Інтэрв'ю часопісу «Чалавек».* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 179

**«Фасад откроется, и мы увидим масштабы потерь...»**
*Интервью телеком-пании RenTV.* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 184

**Золото Беловежской пущи.**
*Восемь лет Они охотились на тугие кошельки,*
*торгуя элитным богатством нации и человеческого наследия.* . . . . . . . . . . 185

**Выказвацца «парламентарна».**
*Слова на прэзентацыі дэмакратычнага блока «Свабодная Беларусь».* . . . . . 192

**«Праўда не ў тым, секчы або не секчы Белавежскую пушчу...»**
*Публікацыя на сайце www.charter97.org.* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 193

**Сказка вместо правды. Будем читать?**
*Что бы сказал белорусским коллегам Василий Песков,*
*узнав полную правду о Беловежской Пуще?* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 194

**Каб убачыць перспектыву, трэба азірнуцца назад.**
*Адказы на пытанні газеты «Ніва» (Беласток).* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 197

**Пра сітуацыю ў Белавежскай пушчы. In memorium.**
*Прэс-рэліз грамадскай экалагічнай ініцыятывы «Terra-Канвенцыя».* . . . . . . . 203

**Не кідайцеся ў абдымкі хімераў!**
*Беларускі Дзед Мароз вернецца ў Белавежскую Пушчу,*
*калі яна стане аб'ектам годнасці, а не нацыянальнай ганьбы.* . . . . . . . . . . . 204

**Хутаранец.** *Інтэрвью Н. Калядзе і М. Халезіну*
*да рубрыкі «Персона» на сайце www.charter97.org.* . . . . . . . . . . . . . . . . . . 205

# 2003–200?

## Ведаць праўду, каб пісаць праўду

ЛІСТ 12 ЖУРНАЛІСТАЎ ДА ПРАДСТАЎНІКА ААН У БЕЛАРУСІ НІЛА БУНЭ

2 студзеня 2003

Высокашаноўны спадар Ніл Бунэ!

Гэты ліст да Вас мы накіроўваем, усведамляючы свой грамадзянскі і прафесійны абавязак — ведаць праўду, каб пісаць праўду. Гаворка ідзе пра лёс аб'екта сусветнай прыроднай спадчыны, біясфернага запаведніка «Белавежская пушча». Маючы бясспрэчнае прызнанне як вялікая каштоўнасць, Белавежскі лес знаходзіцца пад пагрозай планава-дырэктыўнай і жорсткай эксплуатацыі. Высечкі з кожным годам павялічваюцца, набываючы прамысловы размах, і ўжо красамоўна сведчаць пра запанаваныя тут вандальныя тэндэнцыі замест прыродаахоўных, вызначаных юрыдычнымі нормамі і статусам нацыянальнага парка.

За апошнія два гады беларуская прэса, пераважна недзяржаўная, з вялікім неспакоем і шмат пісала на гэтую балючую тэму, намагаючыся спыніць прамысловы ўціск на выдатны лясны рэзерват. Колькасць антывандальных публікацый перасягнула за сотню. Аднак кіраўніцтва нацыянальнага парка «Белавеж-

ская пушча» і дзяржструктуры, якія нясуць адказнасць за экалагічную бяспеку краіны і выкананне шэрагу Канвенцый ААН, ігнаруюць голас грамадскасці, адказваючы на крытыку яшчэ больш жорсткай эксплуатацыяй запаведных запасаў.

Тое, што сёння адбываецца ў Пушчы, можа быць расцэнена як выклік не толькі нацыянальным інтарэсам, але ўсёй супольнасці, нашым агульным імкненням і жаданням зберагчы каштоўнасці прыроды.

Мы, журналісты, хто тут падпісаўся, прапануем у бліжэйшы час наладзіць трохдзённую прэс-экспедыцыю ў нацыянальны парк «Белавежская пушча» з удзелам вучоных, якія на працягу многіх гадоў апякуюцца праблемамі гэтага самага старога лесу Еўропы, а таксама прадстаўнікоў грамадскасці, з голасам якой беларуская ўлада не хоча лічыцца. Цэнтральнай часткай экспедыцыі павінна стаць прэс-канферэнцыя або Круглы стол на тэму прамысловага знішчэння біялагічнай разнастайнасці белавежскага лесу.

Просім Вас, вельмі шаноўны спадар Прадстаўнік, прычыніцца да нашай сумеснай акцыі, а найперш стаць яе паўнапраўным арганізатарам і зацікаўленым кампетэнтным удзельнікам.

З дапамогай Вашай аўтарытэтнай і ўплывовай арганізацыі мы хацелі б не толькі запэўніцца дакладным становішчам спраў у Пушчы, але прыцягнуць увагу міжнароднай супольнасці да нашай думкі і нашых публікацый.

Падпісаліся таксама: *Мікалай Аляксандраў,*
*Таццяна Антонава-Мельянец,*
*Ганна Арцюшкевіч, Марат Гаравы,*
*Уладзімір Даўжэнка, Марына Загорская,*
*Анатоль Казловіч, Алег Карповіч,*
*Ганна Соусь, Аляксандр Хілімон,*
*Вераніка Чаркасава.*

# Ніл Бунэ пацікавіўся, чаму рэжуць Пушчу

АДКАЗЫ НА ПЫТАННІ КАРЭСПАНДЭНТКІ ПРАВААБАРОНЧАГА ЧАСОПІСА «ЧАЛАВЕК» ЮЛІІ СЬНЕГ*

Люты 2003

ЮЛІЯ СЬНЕГ. *Колькі слоў пра Вашу грамадзкую ініцыятыву «TERRA-Канвенцыя»?*

В. ДРАНЧУК. Сваю зацікаўленасьць «TERRA-Канвенцыя» найперш засьведчыла ў адстойваньні Белавескае пушчы. Наогул, гэта тая работа, якая за вынік хацела б мець экалягічную сьведамасьць грамадзянаў на падставе існуючых міжнародных канвэнцыяў. Што адкрылі для сябе ў гэтых канвэнцыях сябры ініцыятывы — яны хочуць тое самае адкрыць і для іншых, для ўсяго нашага грамадзтва. Чаму «TERRA»? Таму што зямля — ўсеабдымны панятак. Гэта — усё. Рэкі і багны, лясы і пушчы, багацьце краявідаў і разнастайнасьць біялягічнага сьвету, гэта шмат і шмат яшчэ ўсяго, што мы пакуль маем і абавязаны захаваць. Чаму грамадзкая ініцыятыва? Таму што наш урад, па-першае, не займаецца гэтымі канвэнцыямі, па-другое, ён іх не прапагандуе, не паказвае, ён іх трымае ў бюракратычных сталах. Яны не працуюць, бо ня маюць вельмі важных стыковак з нашым заканадаўствам. Іхні ўзровень амаль не спрыяе падвышэньню нашага заканадаўства, нашай сьведамасьці — найперш сьведамасьці дзяржаўных чыноўнікаў.

Слова «ляндшафт», напрыклад, мы ня знойдзем нідзе сярод нашых заканадаўчых актаў, так бы мовіць, экалягічных. Ёсьць «прыроднае асяродзьдзе», ёсьць нешта яшчэ, але няма там шмат якіх міжнародных паняткаў. Да многіх канвэнцыяў мы яшчэ не дайшлі. Пакуль што працуем з чатырма — Парыс-

---

*друкуецца на мове арыгінала

кай «Аб захаваньні культурнай і прыроднай спадчыны», Орхускай «Аб доступе экалягічнай інфармацыі да шырокіх слаёў насельніцтва», з канвэнцыямі «Аб біялягічнай разнастайнасьці» — вельмі ўнівэрсальнай і вельмі такой... высакароднай, «Аб воднабалотных угодзьдзях». Гэта толькі чатыры. А разам іх — дзясяткі, што Беларусь падпісала, і, адпаведна, абавязаная выконваць.

Ю. С. *Якая рэакцыя Ніла Бунэ была на тое, што Пушча ў бядзе? Ці была яна наогул?*

В. Д. У часе сустрэчы з Нілам Бунэ першае, пра што ён спытаў, «Чаму, на Вашу думку, высякаецца Белавеская пушча?» Гэта быццам рытарычнае пытаньне, але ў той самы час, мне падаецца, — ён пакуль што ня ўцяміў, што над Белавескай пушчай вісіць пагроза зьнішчэньня. Ён гэтага або ня ведае, або сумняецца ў тым, што мы хочам яму давесьці. Гэта самы драматычны момант, які я вынес з нашай сустрэчы са спадаром Бунэ... Ён быў у Белавескай пушчы, відаць, гэта была паездка на вельмі даверлівым афіцыйным узроўні, дзе яму забясьпечылі ролю госьця, а не эксперта. Гэта тыповая зьява, якая негатыўна адбіваецца на лёсе нашых рэзерватаў. Экспэртаў, што прыязджаюць у Беларусь, надзвычай апякаюць і ўлагоджваюць. У рэшце рэшт яны не знаёмяцца дэталёва са станам справаў і нейкіх прынцыповых ацэнак адносна таго, што адбываецца насамрэч, не выносяць.

Ніл Бунэ, у прыватнасьці, задаволены сёньня тым, што Белавеская пушча далучаная да праграмы, зь якой нацыянальны парк атрымлівае дапамогу. Праўда, нават зацікаўленая грамадзкасьць ня ведае, што гэта за праекты, хто іх выконвае. Гэта, я лічу, не празрыстыя праекты. У Пушчы я, напрыклад, сутыкаюся з інтэрнацыяналізацыяй паляваньняў. А што да навуковых дасьледваньняў, дзе інтэрнацыяналізацыя была б куды больш дарэчы, — тут пануюць «дасьледчыкі» Кіраўніцтва спраў прэзыдэнта. Чаму не было ніякіх адкрытых конкурсаў, каб вызначыць

выбітных выканаўцаў — адмыслоўцаў, навукоўцаў, у тым ліку замежных. Гэта, мяркую, было досыць аўтарытарным рашэньнем. Магчыма, мандат не дазваляе прадстаўніцтву ААН дзейнічаць інакш — так, як, на іх погляд, было б лепей. Яны запрошаныя нашым урадам і мусяць прыслухоўвацца да ягоных парадаў.

У сп. Бунэ была гэткая фраза: «Калі так здарыцца і мы далучымся да вас, пойдзем у Белавескую пушчу сварыцца з урадам, які там дазваляе непрыгожыя рэчы, то ўрэшце Беларусь, Белавеская пушча пазбавіцца і таго кволага фінансаваньня, якое сёньня выдаткоўвае ПРААН».

Ю. С. *У рэшце рэшт, пра што Вы дамовіліся?*

В. Д. Паводле Бунэ, пасля таго, як нашы высновы — у звароце 12 журналістаў — будуць правераныя, мы атрымаем вусны адказ. Спрэчныя, на думку Бунэ, пытаньні будуць высьвятляцца з урадам.

Прадстаўнік не выключае магчымасьці ініцыяваньня міжнароднай экспэртызы Белавескай пушчы. Але зноў жа ў тым выпадку, калі ня супраць будзе беларускі ўрад. Калі ж урад будзе катэгарычна супраць, аніякіх экспэртызаў Прадстаўніцтва ААН ініцыяваць ня будзе.

Наперад вядома: якімі б не былі вынікі нашага звароту ў ААН, змагацца прыйдзецца доўга. Улада ня хоча бачыць міжнародных экспэртаў.

Ю. С. *Ёсьць верагоднасьць таго, што міжнародная супольнасьць застанецца ўбаку?*

В. Д. Не, яна ніяк не застанецца ўбаку. Гэта розныя рэчы. Нават калі мы не атрымаем наўпрост падтрымкі, мне здаецца, што Прадстаўніцтва ААН у кожным разе, незалежна ад меркаваньня афіцыйнага боку, будзе спрыяць дыялёгу. І не калі-небудзь, а менавіта цяпер. Я веру ў тое, што ААН — гэта вельмі дэмакратычная, вельмі ўплывовая і вельмі тэхналягічная арганізацыя, якая стала апякуецца прырод-

най спадчынай, праблемамі навакольнага асяродзьдзя. Дарэчы, кожны грамадзянін Беларусі (менавіта кожны) зьяўляецца сябрам ААН з 1945 года. І ня трэба забывацца на тое, што мы — частка Эўропы. Якая мусіць ведаць, што адбываецца ў нас.

Ю. С. *Што далі вашы папярэднія падобныя акцыі на абарону Белавескай пушчы?*

В. Д. Год таму беларуская грамадзкасць зьвярталася ў Раду Эўропы, а ўлетку, напярэдадні прыезду ў Менск дырэктара ЮНЭСКА, мы грунтоўна і прынцыпова паставілі перад гэтай арганізацыяй пытаньне пра неадпаведны ўзровень нацыянальнага захаваньня Белавескай пушчы — мейсца сусьветнай спадчыны — патрабаваньням Парыскай канвэнцыі. Эфектыўнасьць зваротаў не выклікае сумневаў. Беларускія папкі ў гэтых арганізацыях папоўніліся інфармацыяй, якая не супадае з афіцыйнай. Нам паведамілі, што агульны стан Белавескай пушчы, улучна з пытаньнем высечкі дрэваў не сыходзіць з парадку дня Камітэта па сусветнай спадчыне і яго бюро. Як бачым, нашую інфармацыю ўспрынялі. Яна стала важкай падставай пытацца і патрабаваць каментароў у беларускага боку, а ён — мусіць адказваць. І гэтыя каментары я бачыў. Яны абавязкова будуць прадстаўлены шырокай грамадзкасці... Ідзе, адным словам, сумесная праца, якая, спадзяюся, дасьць плён — мы прыцягнем увагу міжнароднай супольнасьці да экалягічнага тэрору ў Беларусі і ў рэшце рэшт прамысловы гнёт на Вялікі Лес будзе спынены.

Ю. С. *Што найперш цікавіць журналістаў у Белавескай пушчы?*

В. Д. Самы дзейны сродак журналіста — гэта праўда. Мы хочам, каб журналісты, разам з прадстаўнікамі грамадзкасці, пабылі ў Пушчы, праехалі, прайшлі па тых мясьцінах, сустрэліся з кім пажадаюць, убачылі і пачулі ўсё на месцы, задалі каму захацелі свае пытаньні — і напісалі праўду.

Ю. С. *Але ж такая спроба аднойчы была.*

В. Д. Толькі спроба. У траўні 2001 года мы зьвярнуліся ў Адміністрацыю прэзыдэнта і прапанавалі сустрэцца ў Пушчы. Нам адказалі маўчаньнем. А ідэя прэс-тураў была вельмі груба перахоплена ўладамі, бо праз колькі месяцаў Кіраўніцтва спраў «само» ініцыявала такі прэс-тур, прывезла ў Пушчу журналістаў, пераважна дзяржаўных СМІ, і загрузіла іх звычайным фальсыфікатам. Натуральна, рабілася гэта цішком. Усе няўгодныя засталіся ў Менску, бо нічога ня ведалі.

Цяпер мы робім інакш. Дэлягуем сваё права, якое ўлада нахабна праігнаравала, Прадстаўніцтву ААН і просім яго далучыцца да нашага грамадзянскага і прафэсійнага клопату. Падцягваем да гэтай акцыі і замежных журналістаў-эколягаў, у прыватнасьці, ёсьць папярэдняя дамоўленасьць з калегамі Швэцыі.

Ю. С. *Калі коратка, што адбываецца цяпер у Пушчы?*

В. Д. Дзікунствы эксплюатацыі Пушчы тут не спыняюцца. Яны мімікруюцца. Поўным ходам ідзе планава-дырэктыўная — 100-120 тысяч кубаметраў драўніны ў год — прамысловая высечка элітнага стараўзроставага лесу. Гэта самае балючае месца, іншымі словамі, рабуецца святое. Людзі, а гэта пушчанцы, якія страцілі пасады як незгаворлівыя, пачалі фармаваць апазыцыю. Сярод іх ёсьць добрыя спэцыялісты, дасьледчыкі, патрыёты Пушчы. Гэта яшчэ ня рух і ня трэці сэктар. Але ўжо сіла, якой дагэтуль, бадай, тут не было.

Ю. С. *15 студзеня 2003 года ў дзяржаўных СМІ зьявілася паведамленьне пра новую ініцыятыву А.Лукашэнкі. Ён абвесьціў, што «плянуе стварыць інспэкцыйную структуру, якая будзе кантраляваць працэсы, зьвязаныя з аховай прыродных рэсурсаў і запаведнікаў краіны. Кіраўнік дзяржавы падкрэсьліў, што асабіста меў магчымасьць пераканацца ў тым «бязьмежжы», якое мае мей-*

*сца ў гаспадарках і запаведніках, і заявіў, што ня мае намеру мірыцца з гэткім становішчам», паведамляе інфармацыйнае агенцтва БЕЛТА. Як Вы мяркуеце, ці дапаможа гэткая інспэкцыя Белавескай пушчы?*

В. Д. Мне падаецца гэта надта няшчырым. Што датычыць Белавескай пушчы, больш як год таму група белавежцаў накіроўвала асабіста Прэзыдэнту свае сігналы SOS. Шмат чаго пісала прэса. Што ж гэтак позна рэагаваць? Гэткая заява — папулізм і дэмагогія. Пабачыце, усе застануцца на пасадах, а вандалізм будзе працягвацца. Пакуль не запануе цывілізаваны лад і дэмакратычныя нормы, Беларусь будзе пустошыцца і галець.

## «Фасад откроется, и мы увидим масштабы потерь»

ИНТЕРВЬЮ ТЕЛЕКОМПАНИИ RenTV

Февраль 2003

КОРРЕСПОНДЕНТ. *Что происходит в Беловежской пуще?*

В.ДРАНЧУК. Меня пытались не пустить сегодня в Пущу, оказать на меня давление, отсечь всяческие альтернативы. Но я, как видите, тут, хотя и не был на пресс-конференции. Меня об этом сразу уведомила так называемая служба охраны Пущи, передо мной закрывали двери.

На Пущу, таким образом, вешают замок. Разыгрывается спектакль с участием слабо осведомленных или лояльных.

Но фасад обязательно откроется. Как бы тщательно ни закрывали в нем щели. Он уже приоткрылся. Журналисты кое-что увидели. Пуща — очень большой лес, чтобы все увидеть на уровне глаз и сразу. Да еще в таком сопровождении.

Когда фасад упадет окончательно, мы увидим и ужаснемся, каковы масштабы потерь. Искать виновных будет поздно. Власть это предчувствует и всячески маскируется.

## Золото Беловежской пущи

Газета «Свободные новости плюс» 2003

Пошел третий месяц как в Беловежской пуще побывали журналисты белорусских и зарубежных СМИ, став свидетелями небывалого развертывания хозяйственно-коммерческой деятельности на особо охраняемой природной территории, имеющей статус объекта мирового наследия.

Предыстория такова. Двенадцать «перьев», пишущих в защиту окружающей среды (в их числе и я, автор этих строк), в начале года обратились в Представительство ООН в Минске с предложением провести совместную акцию — пресс-экспедицию в Беловежскую пущу. Как известно, здесь имеют место устойчивые нарушения ряда Конвенций ООН, прежде всего Конвенции об охране всемирного культурного и природного наследия.

Что же предлагали авторы письма? Простое дело: чем долго спорить, лучше поехать и посмотреть на «место происшествия»? Еще лучше — без «экскурсоводов» Управления делами президента. Пусть покажут Пущу те, кто там живет, работает или работал, кому небезразлична ее судьба. Примерный сценарий выглядел так: день смотрим, что показывают, второй — выбираем тему и третий — садимся за круглый стол.

### ВСТРЕЧА С НИЛОМ БУНЕ. ОГЛЯДКА НА МАНДАТ

Глава Представительства Нил Бунэ, встретившись с журналистами накануне, сказал, что его организа-

ция готова участвовать в диалоге между правительством и общественностью по беловежской проблеме и со своей стороны пообещал всяческое содействие. Правда, оглядка на мандат и проскальзывающий намек на отягчающие обстоятельства авторитарного правления в Беларуси давали повод усомниться в больших возможностях и горячем желании международной организации помочь тем, кто сегодня выступает за спасение Пущи и в защиту её населения. Всё, о чем говорил дипломат, конечно, могло вселять надежду, но, как тут же заметил мой коллега, с поправкой на белорусский режим.

Беловежская пуща, сказал Нил Бунэ, как объект всемирного биоразнообразия, должна сохранить свое лицо и этому может содействовать ее природоохранный режим, высокий статус и должный уровень управления.

По словам собеседника, то, о чем он узнал из последних источников и публикаций, вызывает повышенную озабоченность, но актуальность или беспочвенность заявлений будет взвешиваться и скрупулезно оцениваться специалистами «в тесном сотрудничестве с белорусским руководством». Что же касается пресс-экспедиции в Пущу, то глава Представительства приветствует ее проведение в рамках диалога, способствующего разрешению разногласий, но обсудит это сначала с правительством. Разумеется, участие его организации возможно лишь в той мере и настолько, насколько это не будет противоречить мандату Представительства ООН. Организация международной научно-технической экспертизы, увидеть которую в Беловежской пуще хотела бы общественная инициатива TERRA-Конвенция, также, по словам Нила Буне, не исключается, если об этом попросит официальная сторона, то есть, белорусское правительство.

Я понимаю: это разговор дипломата с журналистами. Но ведь речь идет о конвенционных обязатель-

ствах, которые игнорируются присоединившейся стороной, о мерах защиты мирового наследия перед угрозой деградации и волюнтаризма!

### ФАСАД ПРИОТКРЫЛСЯ, ЖУРНАЛИСТЫ УВИДЕЛИ ПРОМЗОНУ

Воспользовавшись ситуацией, власть не постеснялась навязать свои правила игры. Решение пойти на «диалог» было принято с необычайной готовностью. За организацию пресс-экспедиции взялись те, кто меньше всех был в ней заинтересован.

Советник главы Представительства Владимир Щербов находит меня вдали от Минска, чтобы сообщить «молнию»: через два дня Управление делами предоставляет автобус, если потребуется — два, доступ всех желающих будет обеспечен, можно собирать «альтернативную сторону» из журналистов и представителей научной общественности.

А в понедельник обрушился «холодный душ»: и я, и многие другие не могут быть аккредитованы, списки участников утверждает сама Журавкова (управляющая делами президента — *ред.*). Чего боялись перехватчики общественной инициативы, нетрудно догадаться. Бывший академический ученый, нынешний чиновник Управления делами президента А.Лучков бросил мне в трубку: «Вы уже наездились в пущу, всё увидели, всё описали — хватит, дайте другим...»

Как можно было расценить такой поворот? Однозначно: как вероломство властей, не желающих открываться перед общественностью. В результате и была устроена эта однодневная (точнее, несколькочасовая) ловушка. Расчет прост: спровоцировать поверхностный отклик в средствах массовой информации, посеять замешательство и сбить с толку общественное мнение, создать очередной дискуссионный момент якобы научного характера на фоне произвола, который сегодня творится в Пуще, а также не до-

пустить участия в пресс-экспедиции Нила Буне (поездка странно совпала с началом его запланированной кратковременной зарубежной командировки). Таковы главные мотивы «организаторов» экспедиции.

К счастью, не все они воплотились в действительность.

Мне жаль, конечно, что я не смог сам присутствовать, проследить воплощение позорного сценария в деталях и подробностях этого дня. В автобус меня не впустили, вход перекрыли тот же А.Лучков и некто с ним А.Максимович. В Брест пришлось ехать поездом. В Пущу подвезли товарищи по перу — сердечное им спасибо! Служба охраны национального парка очень старалась: окружив «вниманием», сотрудники несколько раз предупреждали о том, что я не имею права присутствовать на пресс-конференции. Дороги, как и входы в центральные служебные помещения, тщательно охранялись от «диверсионных атак». Ни бывший генеральный директор, ни его заместитель по науке, пришедшие по просьбе журналистов, не смогли занять свои места в «диалоге», так как не были допущены на пресс-конференцию.

И хотя наша инициатива в полном смысле была изуродована, подменить ее было уже невозможно. Фасад Пущи приоткрылся. Журналисты увидели промзону — как следствие того, что упорно пытаются спрятать президентские управленцы: наплевательство на международное право и конвенционные обязательства, хозяйственный волюнтаризм, произвол и хаос. Особая благодарность корреспонденту БелаПАН Марату Горевому, журналистам «БДГ», «Белорусской газеты», «Народнай волі», других средств массовой информации за неравнодушный отклик на страницах своих изданий, в оперативных сводках новостей. Я уверен, продолжение последует. Ведь Пуща — это курс ликбеза. За фасад еще предстоит пройти.

КОНВЕНЦИОННАЯ ОТВЕТСТВЕННОСТЬ

Десять лет как Беловежская пуща «дотянулась» до статуса объекта мировой значимости, теперь вопрос в том, дотянемся ли мы — поймем ли, в чьих руках был и остается природный объект. Управление национальным парком требует решительной реформы в сторону мирового статуса Беловежской пущи. Параграфы и критерии конвенционной ответственности пока лишь усиливают общий безрадостный фон якобы заповедной действительности.

Например, есть Парижская конвенция — ей, слава богу, исполнилось тридцать лет! — об охране мирового культурного и природного наследия. Блестящий документ экологического права, к которому присоединилась и Беларусь. Беловежская пуща вошла в Список человеческого наследия, следовательно, подчинение конвенционным обязательствам стало особенно предметным. Но чем больше вчитываешься в содержание статей и параграфов, изучаешь этот документ, тем очевиднее становятся традиционный лесозаготовительный «статус» Пущи, порабощение местного населения, система административного запугивания и насилия, разгул коммерческой деятельности. Мы всё дальше уходим от Конвенции, подписанной, повторяю, белорусской стороной, вместо того, чтобы приближаться к ней. Уходим директивно, сознательно, попирая ее букву и гуманистический смысл. Больше всего это видно по статьям, которые касаются *национальной охраны, международного сотрудничества в интересах наследия*. Нет добрых устремлений в пользу красоты и национальной гордости, научной инициативы и экологического воспитания. Есть обратное.

В статье 27 упомянутой конвенции говорится, к примеру, что страна-участница обязуется *широко информировать общественность об опасностях, которые угрожают наследию*. Сколько помню, управленцы только и твердили о расцвете Пущи в их

«нежных» объятиях. Становятся очевидными и некомпетентность управления особо охраняемой территорией, и последствия хозяйствования Управления делами президента. Долгие шесть-восемь лет специалисты этой структуры скрывали истинное лицо Пущи, спекулируя на проблеме усыхания леса (чего стоит новая высокопроизводительная пилорама!), упиваясь доходами от коммерческих охот, продаж и бартеров, а сегодня пытаются уйти от ответственности — свалить все на последствия мелиорации, нашествие жука-короеда, ветровалы и тому подобное.

Господа-товарищи! Шесть-восемь лет нужно было только и звать на помощь мировой опыт, бить в колокола, спасаясь от надвигающихся последствий и угроз мировому наследию. Вы были расчетливы и чинили расправу над остатками Великого леса. Вы охотились на тугие кошельки, торгуя элитным богатством нации и человеческого наследия. Вы действительно «ходили по золоту», бросая вокруг жадные взгляды, но это был обман зрения — вы не увидели истинного золота Пущи. Вы сегодня вынуждены обратить взгляды общественности на «лунные пейзажи» уникального леса, но при этом вы никогда не скажете людям правду. Я обличаю вас в директивном поощрении и насаждении некомпетентного руководства.

ТРЕБОВАНИЯ

Общественная экологическая инициатива TERRA-Конвенция, апеллируя к авторитетным документам международного экологического права, одной из сторон которых является Беларусь, предлагает и настаивает:

подчинить Национальный парк «Беловежская пуща» природоохранному ведомству — Министерству природных ресурсов и охраны окружающей среды;

разработать Положение о Национальном парке «Беловежская пуща» в соответствии с республиканским и международным природоохранным законодательством;

остановить в Беловежской пуще хозяйственно-экономическую деятельность, которая противоречит Закону об особо охраняемых природных территориях, ряду международных конвенций, условиям и рекомендациям Европейского Диплома;

запретить на территории национального парка все коммерческие охоты;

вывести из ведения национального парка высокопроизводительную линию по переработке древесины в деревне Каменюки, а также другие производственные объекты, деятельность которых не соответствует основным целям и задачам национального парка;

увеличить размер бюджетных средств для Пущи до 85% с тем, чтобы остальные 15% (а не 35%, как теперь) можно было обеспечить за счет деятельности, которая не будет противоречить нормам природоэтики на заповедных территориях;

довести площадь абсолютной заповедной зоны до 50% территории Пущи и выше (справочно: сегодня 18%) и предпринять меры по расширению объекта мирового наследия «Беловежская пуща» на всю территорию абсолютной заповедной зоны;

укрепить и расширить научный отдел, в том числе за счет новых направлений (научный туризм, издательская деятельность и др.);

разработать и передать на обсуждение общественности План устойчивого управления Беловежской пущей до 2020 года;

ходатайствовать перед международным сообществом:

произвести комплексную научно-техническую экспертизу состояния Беловежской пущи как объекта всемирного природного наследия;

по итогам экспертизы рассмотреть вопрос о целесообразности переноса Беловежской пущи в Список всемирного наследия, которому угрожает опасность (справочно: существуют соответственно два Списка).

# Выказвацца «парламентарна»

СЛОВА НА ПРЭЗЕНТАЦЫІ
ДЭМАКРАТЫЧНАГА БЛОКА «СВАБОДНАЯ БЕЛАРУСЬ»

Чэрвень 2003

На працягу васьмі гадоў я быў у баку ад палітыкі, займаўся выдавецкай ды экалагічнай дзейнасцю, зялёнай журналістыкай, але цяпер бачу, што выказвацца трэба «парламентарна». Нашай прыродзе — лясам, балотам, водным багаццям — прыйшоў час прамаўляцца, выказвацца менавіта «парламентарна».

Досвед паказвае, што абарона прыроды ўжо патрабуе зусім іншага, я б сказаў, самага высокага ўзроўню. Гэта ўзровень рашэнняў, якія прымаюцца, а найперш законаў, паправак і той праўнай базы, на якой яны прымаюцца. Сёння прырода, ландшафты фактычна па-за абаронай, прыродакарыстанне патрабуе ўжо іншага кантролю, а гэта значыць, іншай увагі заканадаўцаў.

Людзі, якія спрабуюць абараніць краявід, сваю зялёную спадчыну, таксама безабаронныя.

Прыклад — Белавежская пушча. Гэта наша святое, самы вялікі еўрапейскі лес. Яму як ніколі патрэбная дапамога, узровень абароны.

Але абараніць у тых умовах, у якіх мы сёння знаходзімся, — вельмі цяжка. Таму я прагаласаваў за тое, каб стварыць такі блок. Мы павінны разам думаць, як, якім чынам абараніць Беларусь. А для мяне найперш — зялёную Беларусь.

Думаю, што ў наступны парламент павінны прыйсці людзі, якія будуць абараняць нашы зялёныя біясферныя каштоўнасці. І справа не ў тым, ці буду я балатавацца, — гэта пакажа час. Але я ўжо цяпер бачу задачу нашага дэмакратычнага блока — падтрымку тых «зялёных» кандыдатаў, якія пажадаюць ісці на выбары. І такіх кандыдытаў набярэцца паўсотні і больш. Гэта рэальная лічба, я гатовы хоць зараз назваць не адзін дзесятак сваіх калег...

## «Праўда не ў тым, секчы або не секчы Белавежскую пушчу, а ў тым, што людзі, якія прыйшлі яе секчы, нічога іншага рабіць не ўмеюць. Паводле тэорыі запаведнай справы»

АДКРЫТЫ ЛІСТ

Сайт: WWW.charter97.internet.org
24 траўня 2003

23 траўня кіраўнік грамадскай экалагічнай ініцыятывы «TERRA-Канвенцыя» Валеры Дранчук пасля тэлефоннай размовы з рэдактаркай газеты «Комсомольская правда в Беларусі» Юліяй Слуцкай накіраваў ёй адкрыты ліст, у якім перасцярог ад павярхоўнай і аднабокай інтэрпрэтацыі сённяшніх праблем Пушчы ў запланаванай публікацыі шматнакладнага выдання (артыкул мае з'явіцца ў пятнічным выпуску).

Змяшчаем ліст са згоды аўтара.

Шаноўная спн. Слуцкая!

Яшчэ раз — настойваю на слове «перасцерагаю». Разумейце сэрцам. Бо я таксама кажу гэта — сэрцам, хоць з Вамі зусім незнаёмы. Сэрцам — таму што балюча за Пушчу, за Беларусь, за нашу прыроду. Сёння ў Пушчы вандалы, экалагічныя тэрарысты, грубая ўладная сіла. Вы збіраецеся абараняць іх, а не Пушчу? Яны і Пушча — тое самае, што ка́ты і ахвяра.

Памылку — пры вашым накладзе — вельмі цяжка паправіць. Сёння «ка́ты» робяць усё для таго, каб апраўдаць свае дзеянні. І зробяць яшчэ больш. Яны замятаюць свае сляды — сляды рабаўнічага карыстання. Ёсць шэраг абставін, якія ім паспрыялі. Не спрыяйце ж Вы ім схаваць праўду. Не зрабіце памылку.

Зразумейце. Праўда не ў тым, секчы або не секчы сёння Пушчу паводле тэорыі размнажэння караеда-тыпографа. Праўда ў тым, што людзі, якія прыйшлі яе секчы, нічога іншага рабіць не ўмеюць *паводле тэорыі запаведнай справы*. Вы ўважліва паслухалі іх. Гэта вялікая палавіна справы, але толькі палавіна... Перасцерагаю.

З павагай.

## «Сказка» вместо правды. Будем читать?

КОММЕНТАРИЙ ПО ПОВОДУ.
В КОМИССИЮ ПО ПРОФЕССИОНАЛЬНОЙ ЭТИКЕ
ОО «БЕЛАРУСКАЯ АСАЦЫЯЦЫЯ ЖУРНАЛІСТАЎ».

Декабрь 2003

«Комсомольская правда в Беларуси» присоединилась к потоку фальсификаций в государственных средствах массовой информации о Беловежской пуще, напечатав несколько месяцев назад разворот под впечатлительным названием «В Беловежский лес вселился бес?» (выпуск «КП в Беларуси» от 30 мая 2003). Что могло произойти? Ведь на протяжении нескольких лет газета занимала совершенно иную позицию. Тема заповедных территорий, в том числе беловежская тема, подавалась проблемно и остро. Газета открыто оппонировала властям.

И вдруг — неожиданный поворот с разворотом.

Произошло что-либо кардинальное в управлении Пущей? Отнюдь. Скорее всего другое. Газета, которую читают массы (тираж 37000), похоже, принудили пойти на сделку с профессиональной совестью, попросту говоря, соврать читателям по-крупному. С одной стороны, до странности обреченная однобокость и фрагментарность подачи материала не оставляют сомнения, что публикация сделана под давлением обстоятельств. Каких? Трудно сказать. Воз-

можно, газета испугалась грозящих ей судебных домогательств, нависающих темной тучей...

С другой стороны, что представляется более вероятным, изданию дали возможность реабилитироваться методом «творческого задания» — придумать для Пущи эдакий супер-проект. И не какой-нибудь, а коммерческий. Сегодня в национальном парке вращаются очень большие деньги — зачем же тратить их так же бездарно, как это делали до сих пор, не лучше ли с размахом, с привлечением немалой читательской аудитории!?

Как бы то ни было, журналисты «Комсомолки» в Беларуси выполнили этот заказ, сосредоточившись на том, чтобы сохранить лицо. Они сделали свое (на этот раз очень грязное) дело технологично и «профессионально», чтобы при этом можно было думать о себе хорошо, даже очень хорошо. То есть, что б там ни говорили, о чем бы ни спорили, — это нас меньше всего касается. Вот мы, авторы Юлия Слуцкая, Виктор Малишевский, Александр Конотоп (главный редактор, его зам и фотокор) сначала съездили в Пущу, действительно увидели там короеда-типографа — истинного пожирателя всемирного наследия — и... «сделали» тему.

Затем пошел и сам «проект» — новогодний карнавал в заповедной Пуще: «Беловежские зубры ждут Деда Мороза. Через пару недель он поселится рядом с ними под 150-летней елью» (выпуск от 22 ноября 2003).

Рядовой читатель, конечно, не заметит подделки. Я провел маленький опрос и легко убедился в этом.

Ну и славно. Чего еще можно хотеть от газеты служителям лжи!

Борьба за Пущу, однако, продолжается. Власть скрывает правду, искажает факты, заметает следы преступлений и недозволенных действий в отношении Объекта всемирного наследия. Эта власть упря-

мо не признавала экологических угроз в Пуще (кроме ветровалов, подкинувших дровишек на импортную высокопроизводительную лесопилку), игнорировала и продолжает игнорировать принципы и требования Конвенции об охране всемирного культурного и природного наследия и теперь предпринимает всё, чтобы не допустить на территорию национального парка международных экспертов.

Сегодня в Пуще по существу приостановлена научная деятельность. Все приоритеты в руках властей — держателей национального достояния. И дело не столько в том, что Пущу рубят, пожирают ее Великие остатки, паразитируют на больном и здоровом, сколько в том, что не спасают, не жалеют, не собираются кончать.

В таком контексте позиция (скорее демарш) известной газеты выглядит как вызов своим коллегам, всем тем, кто немалыми усилиями налаживал беловежский информационный прорыв. Бутафорные начинания, вроде «сказочных резных ворот» с домом Деда Мороза, «куда дети будут приезжать как в сказку», — лишь чудовищный фасад, за которым трагедия Пущи, лунные ландшафты гигантских вырубок, лицемерие и ложь власть придержащих. И вся планирующаяся новогодняя феерия на 15 гектарах леса затевается на фоне падения Пущи как уникального резервата в целом и серьезного заболевания одного из «участников» представления — беловежского зубра, в частности. Некоторых неугодных посетителей, в том числе журналистов, сегодня в Пущу не пускают, их преследуют и доследуют, устраивают против них засады, погони и, как бывало, избивают. Позвольте наивно спросить, господа-товарищи из «Комсомолки» в Беларуси: как же традиции Василия Пескова, старого «зеленого волка», умудренного опытом российского коллеги по страницам Вашей газеты? Или — каково нам всем перед образом незабвенного Дмитрия Завадского, трепетного правдо-

люба и коллеги по независимому белорусскому цеху?

Напоследок — маленький штрих.

Хозяйство, основывающееся на принципах эксплуатации заповедного леса, само себе зарабатывает (как зарабатывают на панели), чтобы восстанавливаться и воспроизводиться в том же порочном виде. Вотчиной по лесопромышленным сделкам, охотничьим турам и «конфискатным» операциям не могут управлять профессора экологических наук, здесь востребованы другие люди. Оказалось, востребована — иже с ними — и демократическая «независимая» пресса.

Грустная «сказка». Будем читать?

ПОСТСКРИПТУМ. Этот комментарий я адресую Комиссии по профессиональной этике *Беларускай асацыяцыі журналістаў,* в которой имею честь состоять, с просьбой рассмотреть его как факт, имеющий конфликтную подоплеку и непосредственное отношение к профессиональной этике ее коллективного члена. Этот комментарий я направляю также в издательский дом «Комсомольская правда», ее главному редактору и генеральному директору В. Сунгоркину (Москва).

## Каб убачыць перспектыву, трэба азірнуцца назад

АДКАЗЫ НА ПЫТАННІ КАРЭСПАНДЭНТА ГАЗЕТЫ «НІВА» (БЕЛАСТОК) УЛАДЗІМІРА ЛАПЦЭВІЧА

Жнівень 2003

УЛАДЗІМІР ЛАПЦЭВІЧ. *Што далі звароты грамадскасці ў Раду Еўропы і да Генеральнага дырэктара ЮНЭСКА?*

В. ДРАНЧУК. Найперш мы назвалі рэчы сваімі імёнамі, выказалі трывогу і заклапочанасць станам

слыннага аб’екта. У першым выпадку прасілі ўзмацніць кантрольныя назіранні за Пушчай, каб механізмы заахвочання, у прыватнасці Еўрадыплом, працавалі тут супраць механізмаў эксплуатацыі. Другі зварот ініцыяваў міжнародную экспертызу ЮНЭСКА з перспектывай разгляду пытання аб пераносе Пушчы ў Спіс аб’ектаў сусветнай спадчыны, якой пагражае небяспека.

Паводле інфармацыі, якую мы атрымалі, наша пытанне некалькі разоў абмяркоўвалася на паседжаннях Камітэта па сусветнай спадчыне і яго бюро. Запрошваліся афіцыйныя каментары: чым беларуская ўлада тлумачыць свае пазіцыі. Я бачыў гэтыя каментары — даволі звыклае камбінатарства ўладаў, якія хаваюць ад міжнароднай супольнасці рэальнае становішча спраў і характар пагрозаў.

Наколькі я ведаю, сёння ў структурах па Сусветнай спадчыне ЮНЭСКА абмяркоўваюць праблему больш аператыўнага назірання за станам аб’ектаў міжнароднай апекі і больш адэкватных дзеянняў у выпадку, калі спадчына пад пагрозай. Вядома, што краіна, якая падпісала Парыжскую канвенцыю, а Беларусь падпісала яе дзесяць гадоў таму, мусіць сама апекавацца аб’ектам, аднак, гледзячы на Белавежскую пушчу і гледзячы на адсутнасць дэмакратыі ў краіне, гэтая праблема стаіць на повенькі рост. І міжнародная супольнасць не можа гэта не ўсведамляць.

У нейкай меры мы прыспешылі прыезд адмысловай місіі ЮНЭСКА для маніторынгу стану Белавежскай пушчы. Калі ён адбудзецца, яшчэ невядома, але ў яго блізкай магчымасці можна не сумнявацца.

Абодва звароты мелі надзвычай вялікі рэзананс у прэсе. Праз СМІ ўдалося сцвердзіць важныя паняткі ды ісціны. Скажам, такія, што без развіцця дэмакратыі цяжка абараніць нацыянальныя прыродныя каштоўнасці, нават роўню Белавежскай пушчы.

У. Л. *Якая пазіцыя ўладаў? Ці можна казаць, што патрабаванні грамадскасці будуць пачутыя? З інтэрнэту даведаўся, што нядаўна ў міжнародныя арганізацыі, а таксама да беларускага Прэзідэнта звярнуліся старэйшыя жыхары Пушчы.*

В. Д. Тут некалькі пытанняў адразу. Улада ўжо не мае аргументаў, здольных каго-небудзь у чым-небудзь пераканаць. Таму не ідзе на дыялог, а ўпарта трымаецца за сваё — абдзірае і выбівае Пушчу. Сённяшнія ўладары наважаныя толькі браць ад яе і нічога не аддаваць. Дый што можна казаць? Лесазнішчальны канвеер працуе як працаваў, планавыя высечкі як вяліся, так і вядуцца. Па маіх звестках, гэта ўжо блізка 150 тысяч кубаметраў за год! Можаце ўявіць, які антрапаген ціснe на Пушчу. Але гэтак сказаць — не ўсё сказаць: пад гэтыя «аб'ёмы» мусіць прыстасоўвацца і чалавек, і ўвесь працоўны калектыў, і сама так званая прыродаахоўная ўстанова. Што з гэтага вынікае, мы бачым. Таму ўлада не дыскутуе тэму, карыстае аўтарытарнасць рэжыму і дзейнічае нахабна, не зважаючы. Правы, дадзеныя сённяшняму дырэктару парка, — гэта карт-бланш для чарговага герастрата.

Але сказаць, што ўлада нічога не гаворыць, будзе не зусім дакладна. Паводле акцэнтаў у афіцыйнай прэсе, можна прасачыць асцярожны, прымаруджаны рух уладнай дырыжорскай палачкі. Вось гэтыя акцэнты. Першы: жук-караед-тыпограф. Другі: ветравалы-ураганы. Трэці: Пушчу заўсёды секлі, не шанавалі, а сёння яна ўжо старая і «самазнішчаецца».

Гэта спроба зняць з сябе адказнасць, і маральную, і крымінальную.

І былі два калектыўныя лісты, пра якія Вы згадалі. Апошні — яго падпісалі за 200 пушчанцаў — кранае сацыяльныя праблемы гэтай запаведнай тэрыторыі. Справа не толькі ў тым, што ў вёсцы Камянюкі не гараць вулічныя ліхтары ды пустошацца людскія сенакосы. Пытанне глыбей. Стаўка на мясцовае, ці,

лепш сказаць, карэннае насельніцтва дала трэшчыну, пачала катастрафічна падаць. Гэта паказчык! Мясцовым людскім рэсурсам улада заўжды маніпулявала, задабраючы і застрашаючы, а тут здарылася так, што нічога не засталося, апроч нагайкі — звальненні, уціск, прыніжэнні.

Па просьбе пушчанцаў я асабіста займаўся распаўсюдам гэтых лістоў, развозіў іх па сталічных адрасах. Пасля вёў перамовы, лабіраваў. Што раблю і цяпер. Гэта эксперымент, але я наперад ведаю: улада не адгукнецца. Абсалютна замкнёнае кола, у чым я вінавачу найперш цяперашні аўтарытарны рэжым і персанальна прэзідэнта А.Лукашэнку.

У. Л. *Ці адгукнуліся на лісты жыхароў Пушчы міжнародныя арганізацыі?*

В. Д. Пакуль не. Большасць уважліва іх пачытала ды паклала ў асобную папку. Я гэта сведчу. Магло адгукнуцца АБСЕ: сітуацыя ў Пушчы цалкам супадае з мэтамі яе цяперашняй місіі. Аднак і АБСЕ, і Прадстаўніцтва ААН занадта асцярожныя, баяцца за свой мандат. Мяркую, пушчанская праблематыка можа адбіцца на іхніх больш выгадных прыярытэтах у Беларусі. Мабыць, гэта тыя цяжкасці, якіх мы папросту не бачым.

У. Л. *І ўсё ж скажыце, што найбольш не задавальняе сёння жыхароў Пушчы ў кіраванні нацыянальным паркам?*

В. Д. Гэта вельмі істотны момант. Найперш, відаць, грубае абыходжанне з імі. Пушчанцы заўсёды трымалі сябе за самастойны шляхетны народ, а тут ім — мат-перамат, пагрозы, караючая рука. Па-другое, нават у параўнанні з камуністычным мінулым, таксама далёка не ідэальным у дачыненнях да Пушчы як ахоўнай тэрыторыі, людзі бачаць вялікі адкат. Адкат у бездань, бо ўсе кірункі, па якіх ідзе Пушча, за нязначным выключэннем, — вядуць туды. Людзі гэта ўсе разам адчулі. Іх лес калечыцца і дэградуе. Старыя

плачуць: у што перайначылі Пушчу! Паўсюль крутня, падлог, афёра. На паперы сусветная спадчына, а на справе гандаль дабром. Для многіх стала відавочным, што палітыка дзяржавы працуе супраць іх, супраць іхняй асновы асноў — Пушчы. І ні ім, ні іхнім дзецям лепш не становіцца. Яны адчулі сябе заложнікамі на сваёй зямлі, ізгоямі сярод Вялікага лесу.

Каб убачыць перспектыву, трэба азірнуцца назад. Спакон мясцовае жыхарства жыло з Пушчы. Пушча ахоўвала жыхароў, а жыхары стараліся зберагчы Пушчу. Былі традыцыі, развіваліся рамёствы, якія не шкодзілі лесу, але дапамагалі жыць людзям. Напрыклад, бортніцтва — легенда Белавежы, сама гармонія пушчанскага быту. Што мы бачым цяпер? Традыцый не засталося. Работа ў лесе — гэта эксплуатацыя, піларама, вытворчасць. Яшчэ паляванні. Дзе які нацыянальны парк? Дзе якая навука? Закон? Я ўжо не кажу пра міжнародныя стандарты.

Еўропа навязвае экалагічны турызм — хутчэй прадукт глабалізацыі, чым экалагізацыі. Бо ўлада тут жа з'арыентавалася: нарошчваецца інфраструктура, растуць аб'ёмы будаўніцтва, шчэміцца капітал, на пастаўках матэрыялаў «зарабляюцца» грошы і гэтак бясконца.

Што ў рэшце рэшт мае насельніцтва? Нічога. Пра людзей ніхто не ўспамінае наогул. Лічы, няма прафсаюза, іншых элементарных аб'яднанняў, якія б дазвалялі насельніцтву хоць трохі ўнезалежвацца, трымаць альтэрнатыву перад уладай.

У. Л. *Напрыканцы ліпеня Белавежскую пушчу наведала адмысловая дзяржаўная камісія. Ці ёсць якія вынікі?*

В. Д. Камісію арганізавала дэпутат парламента Марыя Худая пад ціскам грамадскай ініцыятывы «TERRA-Канвенцыя» і тых лістоў, пра якія я ўжо казаў. Мушу, дарэчы, паправіць сябе: гэта адзіная спроба з афіцыйнага боку разарваць замкнёнае кола. Яшчэ не выклік рэжыму, але ўжо і не руціна, не махляванне.

Я назіраў за работай гэтай групы крыху збоку, бо ў склад яе мяне не пусцілі, і, хай сабе з вялікай нацяжкай, ацаніў бы асобныя моманты як станоўчыя. Члены камісіі ў большасці схіляюцца да разумення існуючай тут небяспекі. У шэрагу выпадкаў тое, што яны пабачылі і пачулі, супярэчыць шматгадовым заспакойваннем Кіраўніцтва спраў прэзідэнта. Аднак чакаць іншых, больш істотных вынікаў было б занадта наіўна. Марыя Худая абяцала абмеркаванне праблемы ў парламенце. Але я моцна сумняюся і ў гэтым. Зрэшты, калі да гэтага дойдзе, пытанне, як заўсёды, закране палітыку і таму нават разуменне асобнымі парламентарыямі стану спраў у Пушчы наўрад ці пераважыць стаўленне прэзідэнцкай адміністрацыі да «сваёй» гаспадаркі.

ПАСЛЯСЛОЎЕ. Інтэрв'ю друкавалася на старонках «Нівы» ў скарочаным пераказе, дзе Уладзімір Лапцэвіч прыканцы заўважае:

«Беларускія эколагі дабіваюцца правядзення ў Белавежскай пушчы незалежнай экспертызы і разгляду пытання аб пераносе Пушчы ў спіс Сусветнай спадчыны, якой пагражае небяспека. Калі Пушча апынецца ў гэтым спісе, то можна лічыць, што міжнародная грамадскасць прызнае за варварскае стаўленне цяперашніх беларускіх уладаў да ўнікальнай вартасці.

(...) Жыццё па-свойму вырашае праблему захавання Белавежжа. Можа, не ад добрага жыцця, аднак зараз лесагаспадарчая прамысловасць на Падляшшы значна меншая, чым за часамі ПНР. А заклікі і заахвочванні з боку ўладаў да аблясення прылегласцяў і патрабаванні Еўрасаюза да пераводу ўсёй «польскай» Пушчы ў абсалютна-запаведную верагодна зробяць тое, што захаваецца не толькі ўнікальнасць Белавежжа, але і пашырыцца яе тэрыторыя.

Будучым пакаленням грамадзянаў Польшчы застанецца Белавежская пушча. А што застанецца нашчадкам цяперашніх грамадзянаў Беларусі — дэградаваны лес?»

# Пра сітуацыю ў Белавежскай пушчы. In memorium

ПРЭС-РЭЛІЗ ГРАМАДСКАЙ ЭКАЛАГІЧНАЙ ІНІЦЫЯТЫВЫ «TERRA-КАНВЕНЦЫЯ» (ПАВОДЛЕ МАТЭРЫЯЛАЎ АПОШНЯЙ АФІЦЫЙНАЙ ПРАВЕРКІ, ЯКАЯ БЫЛА АРГАНІЗАВАНА З ІНІЦЫЯТЫВЫ І ПАТРАБАВАННЯ ГРАМАДСКАСЦІ)

1 кастрычніка 2003

Арганізатарам паездкі ў Пушчу выступіла Камісія па экалогіі і прыродакарыстанні Палаты прадстаўнікоў нацыянальнага сходу ў адказ на ліст і перададзеныя матэрыялы грамадскай экалагічнай ініцыятывы «TERRA-Канвенцыя», што датычылі крызіснай сітуацыі ў Белавежскай пушчы. Працоўную групу з ліку вучоных, спецыялістаў лесу і прадстаўнікоў дзяржапарата ачольвала дэпутат Марыя Худая.

На сустрэчы журналісты будуць падрабязна паінфармаваныя пра ход і вынікі праверкі, а таксама пра высновы, якія зроблены працоўнай групай і якія ў шэрагу выпадкаў супярэчаць шматгадовым заспакойваннем Кіраўніцтва спраў прэзідэнта (такія заявы рабіліся да 2001 года). За дзесяць гадоў непадзельнага «дбання» ў Пушчы Кіраўніцтва спраў адказваць не збіраецца. З гэтага боку матэрыялы праверкі падаюцца цікавымі.

Канферэнцыя прымеркавана таксама памяці Здзіслава Феліксавіча Мураўёва, каардынатара грамадскай экалагічнай ініцыятывы «TERRA-Канвенцыя», які адыйшоў ад нас 7 верасня 2003 г.

Здзіслаў Феліксавіч — ветэран запаведнай справы, шмат гадоў узначальваў адмысловы аддзел Мінпрыроды, адстойваў пазіцыі рэальнай, а не бутафорна-ілжывай прыродаахоўнасці на запаведных тэрыторыях. Апошнім часам вёў бескампрамісную перапіску з дзяржаўнымі ўстановамі, надзвычай

дзейна падтрымліваў ініцыятывы «трэцяга сектару», быў сябрам і каардынатарам незарэгістраванай суполкі «TERRA-Канвенцыя».

Маючы свой, альтэрнатыўны погляд на рэчы, ён настойліва дамагаўся праверкі нацыянальнага парка «Белавежская пушча» кампетэнтнымі спецыялістамі, ахвотна прапаноўваў свае паслугі ў якасці грамадскага дарадцы. У тым, што парламенцкая камісія выехала ў Белавежскую пушчу, праверыла факты і ў сваіх матэрыялах часткова адлюстравала сітуацыю, якая шмат у чым супадае з грамадскай, — несумненная заслуга незабыўнага і дарагога нам Здзіслава Феліксавіча Мураўёва. На жаль, ягоныя прапановы і шматлікія настойванні быць улучаным у склад працоўнай групы былі катэгарычна адхілены арганізатарамі паездкі. Марыя Худая задаволілася ягонай грунтоўнай аналітычнай даведкай і адмовіла З. Мураўёву прадстаўляць грамадскую ініцыятыву. Неўзабаве Здзіслава Феліксавіча не стала.

Здзіслаў Мураўёў верыў у праўдзівасць і прынцыповасць прэсы, ахвотна ішоў на кантакт з журналістамі. З вялікай адказнасцю рыхтаваўся да гэтай прэс-канферэнцыі, чакаў яе як сапраўднай падзеі. Спадзяваўся, што ягоная думка будзе пачута і запатрабавана...

## Не кідайцеся ў абдымкі хімераў

ДА КАЛЕГ-ЖУРНАЛІСТАЎ

15 снежня 2003

Паважаныя сябры!

На пачатку снежня я накіраваў у Выдавецкі дом «Комсомольская правда» і ў камісію па этыцы ГА «БАЖ» ліст, у якім выказваю стаўленне да «праекта» Кіраўніцтва спраў прэзідэнта як *цалкам спекуляцыйнага і крывадушнага*. Дасылаючы яго Вам,

заклікаю і прашу не далучацца да *містыфікацыі*, як гэта зрабіла і працягвае рабіць «*Комсомольская правда в Беларуси*» і некаторыя іншыя выданні.

Сёння, 15 снежня, згодна з планамі прэзідэнцкіх спраўнікаў, першы дзень заезду *«ў навагоднюю казку»*. Арганізатары шоў разлічваюць перш-наперш на журналістаў, на сродкі масавай інфармацыі, якія зробяць «карцінку» пад заказ, *«раскажуць усёй краіне»* (цытую газету *«Труд в Беларуси»*) пра самага добрага ў свеце Дзеда Мароза. Прасіў бы, калегі, перасцерагчыся і *не кідацца ў абдымкі хімераў*. Пад маскай Дзеда Мароза хаваецца ўсім добра знаёмае аблічча.

Дзед Мароз вернецца ў Белавежскую пушчу, калі яна стане аб'ектам годнасці, а не месцам нацыянальнай ганьбы.

Гатовы да цеснага дыялогу.

# Хутаранец

ІНТЭРВ'Ю НАТАЛЛІ КАЛЯДЗЕ
І МІКАЛАЮ ХАЛЕЗІНУ ДА ІХ АЎТАРСКАЙ РУБРЫКІ
«ПЕРСОНА»

Сайт WWW.charter97.internet.org.
2003

— *Вы нарадзіліся на хутары. Як гэта адбілася на Вашым характары?*

В. ДРАНЧУК. Хутар — гэта колішняя панская сядзіба, па-тадышняму фальварак, які на пачатку стагоддзя купіў мой дзед Іван Ігнатавіч Рымашэўскі. Куток гэты мае глыбокую гісторыю і звязаны з сярэднявечным Нясвіжам. Цяпер гэта проста хутар, наша радавое гняздо, якое знаходзіцца ў адкрытай мясцовасці, бачнае здалёк і яшчэ выглядае на каштоўную каралю ў панішчаным навакольным пейзажы. Дзед быў заможным чалавекам: сёння землі, што належаць двум калгасам, — гэта абшары, якія часткова належалі яму.

На хутары я рос самым меншым, апроч мяне ў сям'і былі брат і сястра. Выхаванне дзеда я сёння маю за найвялікшы дар лёсу. Не толькі таму, што мог сябе вольна пачуваць пад ягоным крылом, але і таму, што гэта сфарміравала мае стасункі і светапогляд.

— *Да якога ўзросту Вы там выхоўваліся?*

в. д. Мясцовая школа была васьмігодкай, таму я выхоўваўся на хутары да дзевятага класа.

— *Значыць, практычна да паўнагоддзя Вы былі сельскім жыхарам?*

в. д. Я не магу назваць сябе сельскім жыхарам у сённяшнім разуменні, таму што я — хутаранец. Гэта розныя рэчы: жыць у вёсцы і жыць на хутары. Прадметны свет хутара, як і жыццёвы ўклад, вельмі адрозніваўся ад сельска-вясковага.

— *Пазней Вам давялося пераехаць да бацькоў?*

в. д. Так, у мястэчка Гарадзею Нясвіжскага раёна. Там працаваў мой бацька: спачатку бухгалтарам, затым юрысконсультам на цукровым заводзе, маці навучала ў школе. Але родным гняздом для мяне заставаўся хутар. Нават калі ў 1969 годзе я паступіў на факультэт журналістыкі БДУ, усе канікулы праводзіў там, на ўлонні прыроды.

— *Вучыліся добра?*

в. д. Хутчэй сярэдне — на «4» і «5», але бывалі і «траякі», хоць вучыўся без праблем. Вася Драгавец, мой зямляк, быў за старасту і не адзначаў пропускі, калі я праседжваў тыя гадзіны ў бібліятэцы. А я мог суткі прападаць у любімым аддзеле, аддзеле мастацтва, альбо наогул з'ехаць на эцюды ў лес.

— *Вы ў сабе спалучаеце некалькі іпастасяў: экалогія, паэзія, жывапіс, журналістыка. У якой паслядоўнасці гэтыя сферы з'яўляліся ў Вашым жыцці?*

в. д. Напэўна, мастак з'явіўся найперш. Калі меці на ўвазе мастака паводле ўспрымання свету. Я пачаў

пісаць вершы і адначасна шмат маляваць — прыроду, жывёл. Адзін празорлівы настаўнік неяк сказаў: «Не пішы ты заметкі ў газету. Ты будзеш маляваць». Але я яго не паслухаў. Я паступіў на факультэт журналістыкі, і мастацкая адукацыя назаўжды засталася прыгожай марай.

На трэцім курсе, калі трэці раз трэба было ехаць «на бульбу», я пайшоў да дэкана з прапановай замяніць мне гэтую павіннасць клопатамі па арганізацыі маёй выставы. Ён паслухаў і згадзіўся. Я сабраў усе свае малюнкі, зрабіў шмат новых, і такім чынам мая першая выстава адбылася. Да мяне далучылася і Наташа Лось, якая вучылася курсам вышэй і закончыла выяўленчую студыю. Я быў самавукам, а яна «прафесіяналам», майстрам паэтычных манатыпій. Неяк Наташа мяне пахваліла, і тая пахвала была мне, памятаю, найважнейшаю сярод іншых.

— *Пазней сферы Вашых захапленняў папоўніліся экалогіяй?*

в. д. Экалогія з'явілася яшчэ на хутары. Але я мушу ўдакладніць, што не лічу сябе эколагам. Я — прыродаабаронца. Ёсць юрысты, а ёсць праваабаронцы. Так і тут: ёсць эколагі, а ёсць прыродаабаронцы. Эколагі — гэта ўсё ж такі навукоўцы, а прыродаабаронцы — тыя, хто змагаецца за зберажэнне прыродных асяродкаў.

— *І як праявілася гэтая схільнасць — абаронцы прыроды?*

в. д. Пачалося ўсё з маёй рачулкі, дзе я любіў бавіць час, вудзіў рыбу, купаўся. Рэчка знаходзілася ў двух сотнях метраў ад дому, я яе бачыў з ганку. Бачыў, як яна разлівалася ўвесну, як неслася з горкі і пераліўна блішчэла. Калі пачалі праводзіць першыя работы па меліярацыі, абмеры, я пацікавіўся, што будуць рабіць з маёй рэчкай. Высветлілася, што яе павінны спрацціць. Я напісаў свой першы ліст-зварот у абарону Гавязьнянкі, так звалі рэчку. Мне было тады тры-

наццаць гадоў. Ліст я так і не паслаў. Калгасны брыгадзір пачаў адгаворваць мяне, перасцерагаў, што будуць праблемы з кіраўніцтвам калгаса, — я паддаўся і не паслаў той зварот.

— *Гэта было пачаткам?*

в. д. Так. Пасля шмат такіх эпізодаў было ў мяне на вачах. Аднойчы наехала тэхнікі і мужыкі падпілавалі нашу ліпу, пад якой стаяў дом і на якой гнездаваліся буслы. Яна расла за садам, на мяжы хутара і калгаса… Хутчэй за ўсё гэтыя цыркуляры ішлі з Масквы і датычылі зачысткі ландшафтаў ад хутарскога «смецця». Тады кіраўніцтва краіны лічыла, што ўсё павінна быць «роўненька», і нішто не можа замінаць трактару з плугамі або сеялкай, а ворнай зямлі павінна быць больш. Гэта не пакідала мяне абыякавым, і я пачаў увязвацца ў розныя праваабарончыя акцыі.

— *Атрымалася, што Вы прыйшлі да прыродаабароны праз сваё, асабістае — праз «вашу рэчку», «вашу ліпу»?*

в. д. Абсалютна слушна. Я ўжо адчуваў прыроду як вартасць, як дар — не проста маю вартасць, але як вартасць сусвету. Я разумеў, што замах на жывую прыроду — гэта замах на прыгажосць, на каштоўнасць.

Ля нашага хутара і сёння часта спыняюцца людзі, каб адпачыць ці напіцца вады. Яны кажуць: «Як у вас прыгожа! Добра, што такое месца захавалася.» Гэта ўсё дзякуючы дзеду, які змог калісьці адстаяць хутар. Яго ўвесь час хацелі ссяліць, казалі, што гэтыя тэрыторыі трэба засяваць. А папросту, не супынялася ліквідацыя хутарской сістэмы, яе рэштак.

— *Якая роля дзяржавы і асобы ў абароне прыроды?*

в. д. Роля дзяржавы сёння з’яўляецца вызначальнай не ў абароне прыроды, а ў яе вынішчэнні. Прадстаўнікі раённых інспекцый прыродных рэсурсаў

так і гавораць мне: «Мы займаемся тым, што абараняем прыроду ад самое дзяржавы». Але яны ж і апраўдваюць дзяржаўныя злачынствы супраць прыроды. Гэта вядомая з практыкі сістэма падвойных стандартаў. Сёння міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя з'яўляецца галоўным апраўдальным ведамствам па шматлікіх злачынных дзеяннях з боку дзяржавы ў сферы прыродакарыстання.

На вялікі жаль, роля асобы ў абароне навакольных асяродкаў нізавая. Сёння трэба змагацца як за падвышэнне статусу экалагічнай праблемы, так і за падвышэнне ролі асобы ў рашэнні прыродаабаронных задач.

*— Вы можаце прывесці прыклад якога-небудзь дзеяння на падвышэнне ролі асобы ў абароне прыроды — як добры ўзор?*

в. д. Напрыклад, у нас ёсць старыя сядзібныя паркі. Як правіла, імі ніхто не цікавіцца. Дзяржава магла б даць пазыку чалавеку, які гатовы ўзяцца за аднаўленне такога парка, ці пэўныя льготы — грамадскай арганізацыі, якая наважыла яго адраджаць. Гэтыя магчымасці можна знайсці ў тым жа экалагічным бюджэце. Сёння мы, грамадскасць, не маем, бадай, ніякага ўяўлення пра тое, на якія патрэбы ён траціцца. А чыноўнікі ад экалогіі і фінансаў пільна ахоўваюць гэтую тайну.

*— Вы былі ў розных краінах і ведаеце сітуацыю там. Якая асаблівасць экалагічнай сітуацыі, што склалася ў Беларусі?*

в. д. Унікальнасць нашай сітуацыі ў тым, што шмат чаго мы яшчэ не паспелі згубіць, пусціць намарна. У нас не было развітай індустрыі прыродазнішчэння, папросту, не было казла ў агародзе. Лепш сказаць, быў, але не ўзброены прадукцыйнай тэхнікай, *Husqvarna*-й пілой, напрыклад. Цяпер, на жаль, гэты рынак наступае, і сітуацыя змяняецца ў горшы бок.

Хочаце ведаць, хто сёння займаецца высечкай Белавежскай пушчы? Тыя, каго дырэктар нацыянальнага парка наймае з Расіі і Украіны. Мясцовы чалавечы фактар раптам стаў незапатрабаваны. Сотні карэнных «лесарубаў» — умоўна кажучы, бо сярод іх ёсць і эканамісты, і праграмісты — адхілены ад работы таму, што яны не паслухмяныя выканаўцы, хоць ёсць і паслухмяныя, а людзі з прынцыпамі. Іх прынцып просты — Пушчу нельга бяздумна секчы, яе трэба захаваць. І яны не хочуць быць знішчальнікамі хараства і багацця свайго «хутара», бо сама Пушча для мясцовых лесарубаў такі ж хутар, як для мяне маё радавое гняздо з рэчкай і ліпамі.

*— Ці можна пазначыць экалагічныя праблемы Беларусі двума словамі?*

в. д. Наўрад ці гэта магчыма. Але асабіста для мяне гэтыя два словы — «вынішчэнне лесу». Наш галоўны прыродны скарб — гэта ўсё ж такі лес. І яго вынішчэнне сёння адбываецца на фоне, калі Акадэмія навук спрабуе рэалізаваць праект «Зялёнай кнігі». У нашым лесе яшчэ засталіся рэдкія дрэвастоі, пракаветныя раслінна-біялагічныя супольніцтвы – абараніць іх ёсць нашым святым абавязкам. Гэтая кніга магла б стаць першым механізмам абароны, але ўжо шэсць гадоў, як гэты праект тармозіцца.

*— Чым пагражае экалагічная праблема Беларусі самой Беларусі, Еўропе і свету?*

в. д. Беларусі пагражае страта натуральных элітных лясоў, багнаў, прыродных тэрыторый, якія маюць культурную значнасць. Камерцыя на лясных багаццях набыла неверагодныя маштабы, і працэс гэты ўжо абсалютна не кантралюецца. І хоць такія паняткі як ляснічы і егер засталіся, яны ўжо ў «сістэме» — іх купілі.

Безумоўна, вынішчэнне Белавежскай пушчы пагражае Еўропе. Еўропа павінна ўцяміць, што Беларусь з яе балотнымі абшарамі, зялёным поясам, які скла-

даюць лясныя ўгоддзі, — гэта аазіс. Мы лічым, што лес — гэта вытворца кіслароду, гэткі магутны біясферны фільтр, а высвятляецца, што балота ў гэтым сэнсе амаль на парадак больш эфектыўнае за лес, і гэты факт ужо даказаны. Нашы лясы і багны — гэта лёгкія не толькі Беларусі, але і Еўропы. Да асноўнай праблемы дадаюцца: пахаванні пестыцыдаў, старыя тэхналогіі вытворчасці, апустыньванне зямель і ландшафта, беднасць насельніцтва. Усе разам, гэтыя праблемы могуць прывесці да катастрафічных наступстваў і далёка за межамі. Працэс інтэграцыі нашых прыродных вартасцяў у еўрапейскія, светныя трэба вельмі добра сабе ўяўляць, каб ацаніць страты свету ад іх заняпаду ці вынішчэння, скажам, ад пагібелі Белавежскай пушчы. Пушча з'яўляецца знанай каштоўнасцю і таму, што гэта ці не самы апошні вялізны лясны масіў натуральнага паходжання — лессамасей, светны рэзерв, генатып.

*— Існуюць нейкія планетарныя вартасці светнага ўзроўню ў прыродзе. У які шэраг гэтых вартасцяў Вы маглі б паставіць Белавежскую пушчу?*

в. д. У шэраг тых светных каштоўнасцяў, якія залучаны ў Спіс усясветнай прыроднай спадчыны. Белавежская пушча была першым прыродным аб'ектам былога Савецкага саюза, які трапіў у гэты Спіс больш як дзесяць гадоў таму. Ужо пазней у гэтым Спісе з'явіліся прыродныя аб'екты з Расіі ды іншых краін былога СССР. Польшча першай гэта зрабіла, занесла сваю частку Белавежскай пушчы ў светны рэестр, а паколькі Пушча з'яўляецца трансгранічным аб'ектам, наша краіна таксама была вымушана гэта зрабіць. Нам папросту пашанцавала.

*— Сёння экалагічная праблема з'яўляецца ці не галоўнаю ў свеце. Як можна простага абывацэля ўцягнуць у працэс прыродаахова і давесці яму, што гэтая праблема найважнейшая?*

В. Д. Самы бяспройгрышны шлях — выхаванне дзяцей. У Гавязнянскай школе Стаўбцоўскага раёна я вяду майстар-клас экалагічнай журналістыкі і ландшафта. Нядаўна вывеў на экалагічную сцежку малодшых школьнікаў. Мы спыніліся на самай высокай кропцы, і я ім проста сказаў: «Паглядзіце навокал, як хораша!». Я прамаўляў нейкія простыя словы пра гэтыя мясціны і бачыў, як глыбока яны западаюць у чулыя дзіцячыя душы. Выхаванне праз любоў да прыроды — гэта і ёсць шлях да ўразумення сённяшніх праблем. Але гаварыць з дзецьмі трэба цёплымі, шчырымі словамі. Гэта накшталт рэлігіі.

*— Экалогія — гэта канстанта ці дынамічна зменлівы панятак?*

В. Д. Прырода — гэта канстанта, а экалогія — панятак, які дынамічна мяняецца. Мне так здаецца. Выклікі з'яўляюцца ўвесь час, да таго ж выклікі рознага кшталту. Дзякуй Богу, што сёння па радыё зрэдчас можна пачуць інфармацыю пра засмечанасць нетраў нашай зямлі цяжкімі металамі. А колькі тэм не гучыць? І ў гэтым, дарэчы, я бачу ці не самую вялікую правіну грамадскіх няўрадавых арганізацый, з лексікону якіх практычна зніклі ноты пратэсту. Сёння, калі нават сказаць грамадскім арганізацыям: «вось табе трыбуна, вось мікрафон», — баюся, не будзе каму і што прамаўляць. Я маю на ўвазе жыццёва важныя рэчы.

*— «Не будзе што»... А чаму так, з-за чаго? З-за непрафесіяналізму, боязі ці, можа, арганізацыйнага браку?*

В. Д. Вылучыў бы адно — з-за непрафесіяналізму. Дакладней, з-за непрадметнасці, няздольнасці «агучваць» рэчы сваімі імёнамі. Трэба валодаць прадметам, асабліва статыстыкай. А гэта цяжка даецца.

*— Ствараецца грамадская арганізацыя пад рашэнне экалагічных задач, атрымлівае фінансаванне і вядзе непрафесіянальную работу?*

в. д. Нярэдка іменна так: непрафесіянальную і непрадметную. Нейкая работа ёсць, але яна недакладная па выкліку. Напрыклад, колькі гадоў стаіць праблема запаведнасці. У нас з'явіліся нацыянальныя паркі, дзе ўкараняюцца антыэкалагічныя метады дзейнасці ў выглядзе высечак, продажаў, паляванняў, і ніхто на гэта не рэагуе такім чынам, каб улады адчулі. Нядаўна на Свіцязі прайшла сустрэча прыродаабаронцаў і эколагаў. Там ішла гаворка пра поўную бяздзейнасць грамадскага зялёнага сектара адносна гэтай праблемы. Выклік ёсць, а рэакцыі няма.

*— Чыя дзейнасць на ніве абароны прыроды ў свеце Вам імпануе?*

в. д. Ёсць запамінальныя прыклады. Як добры эпізод, няхай і задаўнены — урад Ізраіля правёў паседжанне міністраў на смеццезвалцы. Члены ўрада маглі назіраць адну з праблем краіны літаральна ў сябе пад нагамі.

У Швецыі вырашылі перанесці ветраныя электратурбіны ў мора, бо яны, на думку грамадскасці, псуюць традыцыйны ландшафт. На гэты конт пачаліся дэбаты і доўжацца ўжо тры гады. Далучана прэса, грамадскія арганізацыі і, вядома ж, прафесіяналы. Гэта значыць, інструмент прыняцця рашэння заведзены, і ён не спыніцца, пакуль праблема, як прадмет, не будзе вычарпана. Гэта ў рэшце рэшт і дасць жаданы вынік. Пытанне будзе вырашана з улікам усіх нюансаў.

*— А ў нас?*

в. д. А ў нас калегія Міністэрства прыродных рэсурсаў хутка чарговы раз будзе абмяркоўваць пытанне захавання біялагічнай разнастайнасці Белавежскай пушчы. Пашлюць у Пушчу двух-трох чалавек, там яны вып'юць каву-каньяк, трохі праветрацца, вернуцца і напішуць даведку, адкарэктаваную ў лепшых традыцыях Кіраўніцтвам спраў прэзідэнта. Затым пройдзе абмеркаванне пытання з наборам ап-

раўданняў, чаму ў Пушчы бедлам... Гэта руціна, мярцвячына. Я не кажу пра маральны бок праблемы. Мне асабіста імпануе жывая, прадметная, прафесіянальная работа. Ці гэта работа экспертаў Рады Еўропы, ці гэта работа ўрада або няўрадавай арганізацыі.

— *Значыць, некаму гэта выгодна?*

в. д. Гэта на руку лесапрамысловаму лобі, якім стала і Кіраўніцтва спраў. Іншага зацікаўленага суб'екта я не знаходжу. Гэтым службам выгодна браць ад прыроды, вяртаючы нейкі мізэр або наогул нічога не вяртаючы. Для прыроды гэта балючы след, нават калі ссечана адно дрэва. А для Белавежскай пушчы гэта ўжо трагедыя. А іх тут высякаюцца сотні тысячаў.

— *Ці не значыць, што гаворкі пра высечкі ў Пушчы наогул не можа быць?*

в. д. Высечкі дапускаюцца, але ў абмежаваных дозах і з хірургічнай асцярожнасцю; тут дарэчы ўзгадаць аперацыйнае аддзяленне. У практыцы ж гэта так званыя санітарныя высечкі, за якімі павінны стаяць выключны прафесіянальны падыход, экалагічная дакладнасць і ўзважанасць. Не толькі біялагічнага кшталту.

Я наогул кажу пра Пушчу таму, што гэты прадмет мяне цікавіць найперш. На жаль, сапраўдных дэбатаў па Белавежскай пушчы ў нас ніколі не было, нават блізка, іх тут жа «заразаюць». Гэта, калі можна так сказаць, стратны рэсурс нашага грамадства. А падобныя пытанні стаяць па Нарачы, па Беларускім Паазер'і, па Налібоцкай пушчы...

Больш як дзесяць гадоў таму вырашылі запаведаць Налібоцкую пушчу, але й па сёння гэтага не зрабілі. Зразумела, яна інтэнсіўна высякаецца. І хто гэта робіць? Дзяржава, лесапрамысловыя варацілы.

— *Рашэнні адносна высечак прымаюцца на ўзроўні ўрада?*

в. д. Неабавязкова. Прыняцце такіх рашэнняў магчыма і на ўзроўні аблвыканкамаў. Ды дзе заўгодна!

Каму трэба, даўно скемілі, што ўсё можа скончыцца ў адзін момант, і пакуль застаўся час, трэба скарыстацца, схапіць без праблем. Як правіла, гэта карпарацыйны інтарэс — іншага не бачу.

— *Апішыце найгоршы прагноз развіцця экалагічнай сітуацыі ў Беларусі.*

в. д. Магчыма, гэта пытанне вялікай дыскусіі, але тое, што лясы мы губляем, несумненны факт. Я бачу гэта наўзвоч, нават на сваім, хутарскім узроўні, чую гэта ад людзей, якія адпачываюць у сябе ў вёсках і з кожным годам бачаць змены да горшага. Летась яны яшчэ бачылі перад вокнамі лес, а сёлета ўжо — суседнюю вёску. Лясы радзеюць, мізарнеюць, драўніна вывозіцца як стратэгічны тавар у напрамку бліжэйшай чыгуначнай станцыі, а цэлыя біялагічныя супольнасці спусташаюцца — вось вам тыповая тэндэнцыя.

Мы можам страціць лес, як страцілі 80 адсоткаў рэчак. Бо толькі 20 адсоткаў іх засталіся адносна некранутымі — неканалізаванымі і неасушанымі. Калі не ўзяцца за галаву, не спыніць рабаўніцтва, мы згубім лясы і, па маіх разліках, гэтая праблема востра паўстане ўжо гадоў праз дзесяць-пятнаццаць.

— *Хто яшчэ адказны за вынішчэнне лясоў?*

в. д. Лесапілка ў Белавежскай пушчы магла і не з’явіцца, калі б банк праявіў належную карэктнасць у адносінах да Пушчы як да рэзервата. Але банкі крэдытуюць такую дзейнасць як «прагрэсіўны» кірунак. Наколькі прагрэсіўны, мяркуйце самі. Крыху задаўнены прыклад: дзякуючы высокапрадукцыйным пілам (атрыманым хутчэй за ўсё праз сістэму банкаўскага крэдытавання), за адну ноч у Бабруйскім раёне было спілавана 20 дубоў. Яны былі вомегам вывезены, а «справа», як мне казалі, хутка прыпынена.

— *Паспрабуйце апісаць найлепшы прагноз развіцця экалагічнай сітуацыі ў Беларусі.*

В. Д. Цудоўнае пытанне, адкажу з задавальненнем! Найлепшы прагноз – калі мы станемся часткай Эўропы і скажам пра свае вартасці. Разам з тым Беларусь павінна ініцыяваць цікавыя еўрапейскія прыродаахоўныя акцыі. Нам наканавана вярнуцца да сваіх прыродных каштоўнасцяў і прадэманстраваць свету, што ўмеем іх зберагаць. Напрыклад, Белавежская пушча павінна стаць аб'ектам навуковага турызма. Не экалагічнага, а менавіта навуковага. Досвед ЗША, іншых краін паказвае, што нават экалагічны турызм не такі бяскрыўдны для запаведных тэрыторый, стымулюе развіццё інфраструктуры, і ў выніку маем вытоптванне відаў замест «пяшчотнага дотыку». Навуковы турызм прадугледжвае іншыя мэты: правядзенне сумесных праектаў з міжнароднымі навуковымі арганізацыямі на захаванне і развіццё біялагічнага патэнцыялу нашых рэзерватаў.

*— Якія тры першыя законы Вы ўнеслі б для прыняцця іх парламентам, калі б сталі дэпутатам?*

В. Д. Першы закон, ці нейкі іншы прававы акт — *аб стымуляванні экалагічнай дзейнасці ў трэцім сектары*. 50 % усяго экалагічнага бюджэту, лічу, варта аддаваць грамадскім арганізацыям, у якіх працуюць энтузіясты-прафесіяналы. Але напачатку трэба запэўніцца ў працаздольнасці той або іншай экалагічнай арганізацыі шляхам маніторынгу і затым сярод лепшых праводзіць тэндэр, выключаючы права на памылку.

Другі — *на паляпшэнне якасці, арганізацыю і абарону ландшафта*. У нас вельмі неарганізаваны ландшафт. Як паводле забудовы, так і зместу ўтрымання. Гэтае пытанне павінна рэгулявацца законам. Паглядзіце на Еўропу: хіба там убачыш столькі занядбаных асотава-лапуховых закуткаў, як у нас! Мы прызвычаіліся, не бачым гэтага вэрхалу за сваім плотам. Па старой панскай сядзібе,

якая калісьці была ўзорам арганізаванага пейзажнапаркавага ландшафта, ходзяць трактары з прычэпамі, будуюцца склады пад ядахімікаты, збіраюцца плоймы бамжоў... І гэта доўжыцца гадамі, дзесяцігоддзямі.

Трэці закон — *на ўзмацненне абароны запаведных тэрыторый.* Тут я зрабіў бы акцэнт на тое, што запаведныя тэрыторыі існуюць не толькі для таго, каб іх абараняць і берагчы, але, на іх жа прыкладзе, абараняць і шанаваць тое, што за іх межамі.

А яшчэ я ўнёс бы на разгляд і прасіў бы прыняць *Міжнародны пакт на абарону Белавежскай пушчы* як самага вялікага натуральнага лесу Еўропы.

— *А якія тры першыя пастановы Вы падпісалі б, калі б сталі міністрам аховы прыродных рэсурсаў?*

В. Д. «Аб пераатэстацыі кадраў раённых і абласных службаў аховы прыроды», «аб прыродаахоўнай міліцыі» і «аб заахвочанні грамадскіх экалагічных ініцыятываў».

Што да большасці экалагічных законаў, то няхай застаюцца як ёсць. Але да іх патрэбны дзесяткі актуальных каментароў, якія не дазволяць трактаваць законы так, як гэта з рукі выканаўчай уладзе.

— *Сёння па двух беларускіх каналах можна бачыць сацыяльныя ролікі з заклікамі пра беражлівыя адносіны да прыроды. Якое Вашае стаўленне да іх?*

В. Д. Там добрыя кадры і добрыя словы, а сюжэты моцна фальшывяць. Гэта, безумоўна, двайны стандарт. З аднаго боку мы бачым, што робіцца з наваколлем, з другога — міністэрства, якое апраўдвае экалагічныя злачынствы, замаўляе тэлебачанню такую двурушную рэкламу. Выглядае вельмі цынічна, па-фарысейску.

*— Якая роля сям'і ў Вашай дзейнасці?*

в. д. Сям'я трывае і разумее мяне. Трываць, разумеючы, — ці не галоўная падтрымка і дапамога. Калі я выдаваў газету ў перыядычным рэжыме, гэта былі сапраўдныя выпрабаванні, мне дапамагалі жонка і сын. Паводле духу, яны такія ж хутаранцы, што і я.

*— Вы займаецеся праблемамі Белавежскай пушчы, а Ваш сын — адзін з лідэраў Беларускіх Зуброў. Гэта не выпадкова?*

в. д. Думаю, што не выпадкова. Памятаю яго дзіцячыя сачыненні на тэмы, блізкія Белавежскай пушчы, яны былі вельмі добрыя. У ім ёсць змагар, ваяўнік і ёсць прыродазаступнік з пачуццём справядлівасці. Аднойчы ў дзяцінстве Цімох вярнуўся з рыбалкі страшэнна засмучаны. Высветлілася, што ён сутыкнуўся з актам браканьерства. І гэта яго моцна ўзрушыла. У той момант я ўбачыў у ім сябе.

*— Што для Вас беларускі татэм: бусел, вавёрка, зубр?*

в. д. Я пакідаю зубра — як найбольш варты сімвал ідэнтытэту Беларусі. Хоць сёння добра вядома, што наш лясны асілак хварэе, у яго парушана імунная сістэма. Мяркую, хваробу зубра як татэма Беларусі карысна звязваць з хваробай нацыі. Бо гэта не штучная сувязь. Мы павінны змяніць сваё стаўленне да зубра і месцаў яго сялібішча, тады зменіцца і наша жыццё.

# З дзённікаў

**У**нікальнасць Пушчы як сродка пекнаты і чалавечага ўлюбавання дагэтуль незапатрабаваная. Яна папросту ігнаруецца на ідэйна-палітычным узроўні. На мове прыроды сёння гавораць адзінкі.

**Д**ыскусія, свабодны абмен думкамі не ў жарт пужалі трымальнікаў Спадчыны. Прэвентыўныя захады «па недапушчэнні», іх памеры і спланаваныя дзеянні (цяжка ўсё пералічыць) яскрава сведчылі, наколькі непажаданая тут альтэрнатыўная думка, незалежны погляд на сапраўдны стан сённяшняй Пушчы, непасрэдны кантакт з міжнароднымі экспертамі.

**П**аміж намі быў дрот. Нябачны як радыяцыя. На які натыкаешся розумам, а не целам. Птушыным розумам. Можа, едучы сюды, у Белавежскую пушчу, і трэба было б забыцца, што ты чалавек. І глядзець навокал іншымі вачыма, разумець і адчуваць іншую цывілізацыю, іншую культуру...

*** **Дацкі фонд**

*** **Подпіс Шушкевіча**

*** **Думка Сушчэні**

*** **Вялікая рыбалка**

*** **Здзіслаў Мураўёў**

*** **Худая ў Пушчы**

*** **БелаПАН**

*** **«TERRA-Канвенцыя»**

*** **Фас! Трымай джына!**

*** **Дом Смактуновічаў**

*** **Роспач Парфёнава**

*** **Місія ЮНЭСКА**

*** **Шчасны, Лучкоў і інш.**

*** **Рэзалюцыя SOS**

*** **Фактар пагрозаў**

*** **Цывілізацыя – чыя?**

*** **Ведаю, перакананы…**

# 2001–2004
## Запісы, ліставанне

## 2001

ЛІПЕНЬ

*** З групай акадэмічных вучоных, палітолага ды жанчыны з міністэрства прыроды кіруем у Пушчу. Я скарыстаўся шчаслівым выпадкам, запіхнуў у мікрааўтобус ровар-складанец — і цяпер бясконца ўдзячны гаспадарам рэйса, найперш дырэктару Інстытута М.Нікіфараву, за гэтую дарогу, што скарачаецца з кожнай хвілінай. Вечарам, яшчэ да заходу сонца, будзем у Пушчы, я перасяду на свае колы і праз дзесятак кіламетраў апынуся ў лясной вясковай глушы, дзе маю заначаваць. Раніцай вярнуся на цэнтральную сядзібу нацыянальнага парка, тут распачнецца беларуска-польскі семінар, прысвечаны пытанням развіцця экаадукацыі і экатурыстыкі ў Пушчы. Арганізатар — дацкі фонд, які збіраецца адпусціць на гэтыя мэты значныя сродкі.

*** Раніца ў сонцы і без спякоты. Дванаццаць кіламетраў скрозь лес, але ні грама стомы. Бадзёрасць і абуджанасць. Ніякія багатыя інтэр’еры не параўнальныя з тым, што схоплівала вока ў лясных прыдарожных шатах. Імпрэсія колераў. Найцудоўны пленэр.

Ледзь паспеў да пачатку.

На адкрыццё запрошаны і генеральны дырэктар. Яму першаму даюць сказаць. Гаворыць шэра і нецікa-

ва. Словы без думак. Тое не дзіўна. Ён гаспадарнік і лесанарыхтоўшчык. Выглядае, што яму ўсё роўна — ёсць экалагічны турызм ці няма. У яго іншыя ўстаноўкі, іншыя мэты і вартасці.

Калі большасць адгаварылася, прашу слова і я. Тое, што прапануе фонд, — гэта небяспечная гульня. Звяртаюся да Стэфана, ачольніка семінара, які прыехаў з Даніі: вы наўзвоч не бачыце нашых умоў — калі збіраецеся размяшчаць праект, дык азірніцеся навокал, хоць пацікаўцеся. Кругом высечкі, эксплуатацыя, адсутнасць навукі. Альтэрнатыва адпрэчваецца, дыялог ігнаруецца. Пры гэтакім становішчы гаварыць пра экалагічны турызм, не рэагаваць на дзікунства, на відавочны тэрор — амаральна.

Чакаў выступлення М.Нікіфарава. Нічога новага ён не сказаў. Знаёмы выбар пазіцыі: пры ўсялякім раскладзе такія праекты нам патрэбны. Маўляў, на эмоцыях нічога не зробіш, даводзіцца выбіраць. Слухаючы шаноўнага Міхала Яфімавіча, на жаль, так і не змог паверыць, што гэта гаворыць вучоны-эколаг, дырэктар акадэмічнага Інстытута. Хто заўгодна — менеджэр, каардынатар, лабіст... Можа, нават таленавіты, мудры, але... Дзе ж навука, навуковая думка, аналітычны погляд, дыягназ цяжкага стану? Паводле якіх, чыіх правілаў гэтая ўся гульня, гэты размен і гандаль?..

Дый што навука, калі ўжо трэба глядзець на артыкулы Крымінальнага кодэксу. Справа ўперлася ў цвёрды грунт — *пашкоджанне запаведных багаццяў краіны...*

Мае развагі перабіў былы генеральны дырэктар парка Яўген Смактуновіч. Ён нечакана ўзяў слова, калі ўсе, здавалася, выказаліся і кароткая паўза пагражала сканчэннем дыскусіі. Ён вельмі слушна ўспомніў пра мясцовы рэсурс, на які, маўляў, пераважна і трэба рабіць стаўку замежным спонсарам. Ёсць вельмі шмат энтузіястаў, сказаў Жэня, — і сярод ляснічых, і навуковых супрацоўнікаў Пушчы,

якія тут, на месцы, у сябе дома, здольныя разгарнуць шырокае поле дзейнасці на прыродазберагальным і культурна-адукацыйным кірунку. «З падтрымкай грантаў і пры належных умовах беларускі бок мог бы даволі хутка дабраць адпаведнага ўзроўню, які сёння маюць калегі на польскім баку. Мы маглі б вельмі цесна і плённа працаваць з суседзямі на карысць адной Пушчы і хацелі б на гэта разлічваць».

Яўген двойчы выразна падкрэсліў, што замежныя грантадаўцы не зробяць памылкі, калі будуць знаходзіць выканаўцаў з ліку работнікаў парка, «якія працуюць тут дзесяцігоддзі, прырасьлі да гэтых праблем і да гэтай зямлі і не здрадзяць ідэі захавання Белавежскай пушчы».

Я разумею Смактуновіча. Тое, што ён кажа, варта асобнага «круглага стала», нават больш. Аднак ягоны заклік не будзе пачуты ні калегам з Даніі, ні бліжэйшым калегам з Акадэміі навук. Гэта для іх, як кажуць, надта агульнае пажаданне. Ёсць пэўныя працэдуры і тэхналогіі, на якія толькі і можна разлічваць, каб таго дамагчыся, але... не ў нашай краіне. Прынамсі, паслугі пушчанцаў на карысць Пушчы не хутка будуць запатрабаваныя. Аўтарытарнае кіраванне ў асобе прэзідэнцкіх спраўнікаў бачыць тут для сябе і сваіх інтарэсаў вялікую пагрозу: стварэнне ў Пушчы незалежных працоўных месцаў, развіццё некантраляванага ўладамі прафесійнага сектару, што асабліва палохае ўладную бюракратыю, разгортванне альтэрнатыўных гуманітарных праектаў насуперак звыклым, прамыслова-нарыхтоўчым. Таму развіцца ў Пушчы грамадскаму сектару так проста не дадуць. Будуць глушыць, душыць, ставіць розныя пасткі ці прыкормліваць румяным рэжымным пернікам...

У заключным слове Стэфан не адгукнуўся на асобныя рэакцыі залі і павёўся надзвычай прагматычна. На жаль, Захад глядзіць на Пушчу так, як яму хочацца, а не так, як вымагае дыягназ.

# 2002

ЧЭРВЕНЬ

*** Зварот незалежнай грамадскасці да ЮНЭСКА падпісалі ці не ўсе, да каго я звяртаўся. Спачатку тэлефанаваў, затым хадзіў па кватэрах, офісах, кабінетах, даводзіў пра мэты. Бадай, кожны патэнцыйны аўтар крыху напружваўся: нешта раіў і адразу прапаноўваў або ўдакладняў. Станіслаў Шушкевіч, напрыклад, па некалькіх пазіцыях запярэчыў. Лепш сказаць, хацеў перасцерагчы «слушную ініцыятыву» ад крайніх поглядаў і «лішніх эмоцый». Асабліва, як я зразумеў, яму імпанавалі прозвішчы двух навукоўцаў, знаўцаў праблемы, якіх, ён гэта бачыў, сярод падпісантаў не было. Я прыкметна загарачыўся і пры поўным маўчанні Станіслава Станіслававіча сказаў маналог «пра навуку» і яе месца сёння пад... венікам улады. Сказаў, што на гэты раз, каб пачынаць кампанію, мне дастаткова аднаго знаўцы — Уладзіміра Апанасавіча Дацкевіча, арнітолага і жыхара Пушчы, меркаваннем якога даўно даражу і наўрад ці памяняю на дзесятак навуковых дактароў са сталічнай прапіскай. Нехта, даводзіў я, ноч ці дзве пераначуе ў Пушчы, пачокаецца з начальствам у мясцовым рэстаране — і ўжо з'яўляецца на свет гэткім свяцілам пушчанскай навукі. Такое, на жаль, здараецца. Іншая справа, жыць у самой Пушчы, бачыць праблемы на свае вочы, маючы вялікі прафесійны досвед, і пры гэтым не баяцца гаварыць праўду. Дык каму я павінен верыць найперш? — свой маналог я закончыў вялікім пытальнікам.

«Добра, падпісваюся», — рашуча сказаў Шушкевіч.

Але тут ужо я паспяшаўся запэўніць яго. Маўляў, да Сушчэні абавязкова пайду і ягоную думку паслухаю.

Мне, і праўда, цікава было пачуць, што скажа ветэран біялагічнай навукі, запэўніцца ў адэкватнасці сваёй пазіцыі праз ягоны акадэмічны досвед. Най-

перш я сам адчуваў адказнасць за кожнае слова ў калектыўным пасланні.

Сушчэня сустрэў сухавата, амаль бясслоўна. Паслухаў уважліва, не перабіваючы. Пасля ўсяго, што я сказаў і што ён прачытаў у звароце, настала працяглая паўза. Я выразна гэта адчуў, здавалася, акадэмік даваў мне магчымасць падгадаць, якой будзе яго рэакцыя, першая прамоўленая фраза. Я не мог здагадацца.

«Шлях у навуцы, які я прайшоў разам з Пушчай, даволі вялікі, — старанна падбіраючы словы, сказаў Леанід Міхайлавіч. — І ў часе, і ў спробах запаведання, і ў пошуках новых рашэнняў. Але на ўсіх этапах я пацярпеў паражэнне».

Апошняя фраза мне падалася асабліва значнай і вельмі да месца. Нотка спавядальнасці ў першых словах абнадзейвала. Водгук акадэміка выглядаў на спланаванае інтэрв'ю; гэта, аднак, магла быць і поўная імправізацыя: прадмет гаворкі цалкам займаў суразмоўца, быў яму вельмі блізкі.

«Была спроба, — прадоўжыў Сушчэня, — стварыць на базе Белавежскай пушчы інстытут лесу. Не ўдалося. 80–90-я гады: змаганне за новы годны статус Пушчы. Былая ўстанова, так званая запаведна-паляўнічая гаспадарка, рэзала свядомасць. Супярэчнасць рабілася відавочнай. Навука ўпарта стаяла на запаведніку. Улада баялася гэтага і на такі варыянт не пайшла. Атрымаўся нацыянальны парк. Ідэя парка — на месца запаведніка — лёгка прасочвалася па кіраўніцкіх структурах. За прыняццем гэтага рашэння стаяла не што іншае, як выкарыстанне рэсурсаў Пушчы з дапамогай новых магутнасцяў. Наступны наш крок добрай волі — стварэнне транснацыянальнага Белавежскага біясфернага запаведніка. Ізноў параза. Улады і гэтую спробу сустрэлі ў штыкі. Наўмысна, загадзя, планамерна распраўліся і з навукай. Надоўга ці не, сёння Пушча развіталася з сур'ёзнымі даследваннямі. Навуковы аддзел ёсць і яго няма, ён даведзены да апошняй мяжы».

Акадэмік перавёў позірк за акно, дзе лашчыўся сонечны поўдзень, прымоўк. Праз хвіліну паўтарыў сваю нялёгкую выснову: «Навука як вымерла ў Белавежскай пушчы».

Суразмоўца заставаўся суровым і засяроджаным.

«Быў вялікі снегапад — не памятаю, які год; пад выглядам расчыстак тады пачаліся беспрэцэдэнтныя высечкі Пушчы. Варварскае асваенне драўнінных запасаў пачало набіраць шалёныя тэмпы, яно і дагэтуль не скончылася, — усё працягваецца».

Пра сённяшнія высечкі Леанід Міхайлавіч ведае з прэсы і не сумняецца ў іхняй праўдзівасці. Прыгадвае такі эпізод з пушчанскай хронікі — як на продаж тонамі высмоктвалі бярозавы сок. У навукі ніхто не пытаўся. Якія дыскусіі тут маглі быць?

Яшчэ адна «зацемка» з біяграфіі вучонага, калі на даследзіны ў Пушчу былі арганізаваны гідралагічныя атрады. «Я, тады яшчэ малады навуковец, сарваўся на другой экспедыцыі, — успамінае Л.Сушчэня. — Знаходзім нейкі прыстанак або ставім намёт, пачынаем работу. Прыязджае дырэктар або ляснічы. «Убірайцесь! Каб духу тут вашага не было...»

«Развіваць навуку ў такіх умовах было складана», — зрабіў выснову былы прэзідэнт Акадэміі навук.

На заўвагу, што навукоўцы сёння часцей адмоўчваюцца, чым падаюць голас на абарону прыроды, Сушчэня адказаў за сябе: «Я ўжо стаў песімістам...»

Раней Белавежская пушча, нягледзячы на перашкоды чыноўнікаў, вабіла навукоўцаў з усяго Саюза, мяркуе вучоны. Гэта было надзіва прыцягальнае месца — крыніца доследнай дзейнасці на выбітных прыродных пляцоўках, якіх і ў свеце няшмат. «Сёння спецыялісты рэдка едуць туды. Абстаноўка трывожная, падыходы спрэс утылітарныя — цяпер там не вучонаму працаваць, — са шкадаваннем сведчыць Леанід Міхайлавіч і дадае: — На чале Мінпрыроды пастаўлены далёкі ад складаных пытанняў чалавек

— ён бачыць задачу не ў ахове, а ў максімальным выкарыстанні рэсурсаў прыроды».

Падсумоўваючы гаворку, акадэмік прыгадаў статыстычную звестку з замежнага часопіса 20-гадовае даўніны: калі б усе лясы Германіі пусцілі пад нож на скарыстанне і перапрацоўку, з гэтага атрымалі б 17 мільёнаў нямецкіх марак. Калі ж ацэньваць экалагічную каштоўнасць гэтага лесу як жывога дрэўнага покрыва — кошт выгоды сягаў бы сумы ўтрая большай — 50 мільёнаў марак.

«Слушна ўсё вы пішаце...» — закончыў Сушчэня і падаў мне старонкі нашага паслання.

Думка пра тое, каб акадэмік паставіў свой подпіс, не турбавала мяне. Было дастаткова пачутага.

Вечарам паспрабаваў звязацца з Шушкевічам. На жаль, безвынікова, тэлефоны маўчалі. Сеў у крэсла і з асалодай, старонка за старонкай пагартаў на першае знаёмства кніжку Станіслава Станіслававіча «Неакамунізм у Беларусі», якую ён падпісаў мне — «высокадасведчанаму абаронцу Белавежскай пушчы на ўспамін пра сустрэчу 25 чэрвеня 2002 года». Прымаю ацэнку як аванс, як нашы спадзяванні на лепшае ў сваёй Бацькаўшчыне.

ЖНІВЕНЬ

*** Улада нарэшце агучыла чарговы эксперымент, які яна збіраецца ажыццяўляць на ўлонках Белавежскай Пушчы. У найстарэйшым лесе Еўропы будзе распачата будаўніцтва трох вадасховішчаў з далейшым зарыбленнем іх дзеля прыцягнення сюды турыстаў (БТ, 11 жніўня 2002).

У свядомай часткі грамадства, якая не страціла пакуль пачуцця такту і кантролю над тым, што адбываецца ў краіне на яе ахоўных тэрыторыях, гэткае рашэнне выклікае абурэнне і пратэст. Мы ўжо даўно з'ўляемся сведкамі паляўнічых тураў у Белавежскім лесе пад выглядам экалагічнага турызму, цяпер вось мусім назіраць асвойванне Вялікага лесу з перспек-

тывай яго «рыбаёмкіх» вартасцяў, так мовіць, разгарненне тут «вялікай рыбалкі».

Дарэчы, гэтае разгарненне ўжо пачалося. Візіт Ельцына ў Белавежскую пушчу на пачатку лета адкрыў гэтую перспектыву. З вудай на беразе возера Ляцкія ён праседзеў да адзінаццаці раніцы. Пакуль маскоўскі дачнік чакаў лепшага клёву, каровы суседняй вёскі на ўвесь свет рыкалі, чакаючы, калі іх выпусцяць з хлявоў. І толькі тады, калі вялікая рыбалка скончылася і маскоўскі саноўнік пакінуў бераг возера, пушчанскіх рагуляў выпусцілі на пашу. Мне расказалі пра гэта жыхары Ляцкіх; яны ж, пасмейваючыся, давялі і той факт, што «пад дзедаў кручок» напярэдадні ўкінулі тону рыбы. Што гэта не байка, я больш чым перакананы: дагаджаць высокім чыноўным гасцям тут заўсёды ўмелі — што да «бацькі» і што за ім.

Вялікая рыбалка — чарговы эксперымент, яшчэ адна авантура, за якую Пушча заплаціць станам свайго здароўя. Шлях да яе пагібелі стане яшчэ карацейшы, хоць бы таму, што ўпускаецца час — ратаваць Вялікі лес належыць сёння і неадкладна. Толькі з дапамогай homo sapiens, ягонай шчыльнай апекі магчыма змяніць тэндэнцыі заняпаду.

Вучоныя чакаюць нейкага асобнага «дзяржзаказу» на даследванні ў Белавежскай пушчы, наіўна думаючы (або дзеля апраўданняў перад сумленнем), што ўлада раптам возьме ды раскашэліцца на... кампрамат супраць самой сябе. Ніколі. Простая рэч — любое навукова-даследчае ўмяшанне ў арганізм Пушчы прама ці ўскосна будзе выкрыццём вялікага ланцуга злачынстваў супраць прыроднай спадчыны. Улада гэтага не хоча, перастрахоўваецца як можа і ўсяляк адразае доступ сур'ёзнай навукі ў нацыянальны парк. Тым часам глумішча з Пушчы не перапыняецца, толькі калейдаскапічна мяняе выгляды і адценні.

*** Вечарам вырашыў праехацца на ровары ў бок возера Ляцкія. Зусім выпадкова з'ехаў на новенькую,

старанна адпрасаваную асфальтаўкладчыкамі дарогу сярод пушчанскага лесу. На карце яна не значылася як цвёрдая. Дый навошта яна тут? Ззяе «лампасамі» па баках, здаецца, яшчэ не высахла белая фарба. Прыкінуў — шырыня дарогі два з паловай — тры метры. Значыць, не для веласіпедных фаэтонаў у далікатнай павуцінкавай запрэжцы экалагічнага турызму, а для саноўных эскортаў.

Праехаў з вярсту і ўбачыў, што на дарогу выйшаў чалавек у зялёна-пярэстай форме. (Выйшаў дакладна насустрач). Павітаўшыся, спытаў, што я раблю ў Пушчы. Злева ў блізкіх кустах стаяў «уазік». «Ды вось, любуюся велічным лесам», — адказваю. «Далей забаронена ехаць», — сказаў сустрэчны. «А вы хто будзеце?» «Інспекцыя Белпушчы». Я пашкадаваў, што не захапіў з сабой пасведчанне журналіста і неабходныя дакументы, а вяртацца не хацелася. На маё шкадаванне сустрэчныя прамаўчалі.

Я ўжо завярнуўся ехаць назад, як з глыбіні лесу пачуўся шум легкавіка.

«Сыдзіце з дарогі!», — скамандаваў ахоўнік. Міма на шалёнай хуткасці праімчаліся дзве іншамаркі з цёмнымі шкламі.

«Чаму не спынілі?» — спытаў я, гледзячы туды, куды мне было забаронена ехаць.

«У іх ёсць дакументы», — пасміхаючыся, адказаў службовец і ўжо наважыў спыніць дыялог, вярнуцца ў машыну. Але я затрымаў яго чарговым пытаннем, перайшоў на больш памяркоўны тон, каб сёе-тое распытаць.

«Паслухайце, а ці не тая гэта дарога, што вядзе на прычал?»

«Які прычал?»

«Дзе вудзіў нядаўна Ельцын...»

«Тут няма ніякага прычалу. Хто вам казаў?»

«А дзе ж тады вудзіў Ельцын?»

«Не ведаем, мабыць, далёка адсюль»

«Добра, а гэты асфальт калі паклалі? Хіба не для госця?»

«А тут заўсёды быў асфальт, хіба што трохі паднавілі, — ужо амаль абыякава, не гледзячы ў мой бок, кінуў ахоўнік і падаўся ў машыну. Можа, каб схаваць вочы. Бо нахабна схлусіў — і наконт прычалу, і наконт дарогі. Я ў гэтым запэўніўся назаўтра раніцай, калі не чакаючы, як прачнецца ахова, мінуў месца ўчарашняй засады і на трэцяй хвіліне язды ўжо аглядаў месца «прычалу».

Аглядаў не адзін: са мной у дарогу пашукаць праўды падахвоціўся немаладога ўжо веку пушчанец: «Заадно і сам пагляджу!.. Гэта ж так падманулі Вас, так падманулі». Ён, мясцовы жыхар, здзівіўся не менш за мяне, калі ўбачыў, як тут усё адмянілася. Пляцоўка вакол лазні — самай большай будыніны пад чырвонай — з іголачкі! — металачарапіцай была цалкам заасфальтаваная. А гэта паўгектара плошчы. Усе астатнія будынкі блішчэлі светлай смалістай шалёўкай. Сажалка побач з лазняй, як і дарога да возера, былі абгароджаны свежым, толькі што ад сякеры, лазовым плятнём.

*** Прыехаць у Пушчу і пажыць у сціхоце самнасам з прыродай — вялікая ўцеха, салодкая мара мільёнаў жыхароў Беларусі. Маю на ўвазе тых, каму патрэбны стары гістарычны лес, адвечная ўтульнасць, а не рыбалка ці паляванне.

Унікальнасць Пушчы як сродка пекнаты і чалавечага ўлюбавання дагэтуль не запатрабаваная, яна папросту ігнаруецца на ідэйна-палітычным узроўні. Адна з прычын — непадрыхтаванасць і неадукаванасць людзей, прыстаўленых уладай да нацыянальнага парка, якія не ведаюць, дый не ўмеюць, як ствараць і падносіць новы турыстычны прадукт з Пушчы; з іншага боку глянуць — у дзяржаўным кіраўніцтве такая задача і не ставіцца, яна папросту адкідаецца, але пры збегу пэўных абставін — фармулюецца на зацікаўленне структур кшталту ЮНЭСКА, Рады Еўропы ды інш. Зразумела, далей фармулёвак

справа не рухаецца, а гнілыя леспрамгасаўскія падыходы або няўклюдна маскіруюцца або сістэмна прыхоўваюцца ад «прасунутага» грамадства. Сітуацыя пачне мяняцца, калі баланс гэтых двух бакоў парушыцца. Найперш — калі вышэйшы эшалон прыродаахоўнікаў, пачынаючы з міністра прыродных рэсурсаў, загаворыць на мове прыроды. Гэты час не прыйшоў, на мове прыроды сёння гавораць адзінкі.

## 2003

ЧЭРВЕНЬ

*** Тэлефанаванне ад Здзіслава Феліксавіча Мураўёва. Вынік яго ўпартых і працяглых перамоваў з М. Худой: парламенцкая паездка ў Пушчу мае адбыцца ў ліпені. З.Ф. прапануе падаць ліст ад нашай Ініцыятывы, у якім трэба канкрэтызаваць свае прапазіцыі. Гаворка пра тое, чаго можна чакаць ад гэтай паездкі і што залежыць ад нас. Трэба расставіць акцэнты ў лісце. Дамагацца ўдзелу і вартай рэзалюцыі. Інфармацыйная атака. Прэсавая канферэнцыя (альтэрнатыўная) па выніках паездкі. Але спачатку ліст.

Пастаянная камісія
па праблемах Чарнобыльскай катастрофы,
экалогіі і прыродакарыстання Палаты прадстаўнікоў
Нацыянальнага сходу

Паважаная Марыя Мікалаеўна!

Грамадская экалагічная ініцыятыва «TERRA-Канвенцыя» ўважліва сочыць за сітуацыяй у Белавежскай пушчы. Раней мы пазнаёмілі Вас асабіста з Адкрытым лістом старэйшых жыхароў Пушчы да шырокай грамадскасці. Колькі дзён таму ў Нацыянальны сход перададзены яшчэ адзін калектыўны ліст. Гэты раз яго падпісалі больш як 200 пушчанцаў.

Мяркуем, лёс Белавежскай пушчы і голас яе жыхароў, якія б’юць трывогу, не пакіне Вас абыякавай. Мы прапануем: *выехаць на месца, правесці парламенцкае даследаванне, сустрэц-*

*ца з людзьмі і з гэтых пазіцый глянуць на наша заканадаўства.*

Папярэдне даводзім да Вас меркаванне ветэрана-эколага, каардынатара нашай Ініцыятывы Здзіслава Феліксавіча Мураўёва. Да яго слушных высноў і грамадзянскай пазіцыі хацеў бы дадаць, што год таму я публічна выказаў прапанову распрацаваць *Міжнародны пакт на абарону Белавежскай пушчы.* Варта, на маю думку, неадкладна распачаць падрыхтоўку гэтага дакумента, тым самым засведчыць пераемнасць добрай волі сённяшніх дэпутатаў, якія апякуюцца прыродным асяроддзем, і сяброў дэмакратычнага блока «Свабодная Беларусь», якія збіраюцца прыйсці ў новы парламент, каб абараняць біясферныя каштоўнасці Беларусі ў супольнай Еўропе.

З павагай,
кіраўнік Ініцыятывы,
сябра Рады дэмакратычнага блока
«Свабодная Беларусь»
*Валеры Дранчук*

Да ліста ў Камісію прыкладаем аналітычную даведку З. Мураўёва на трох старонках.

«Пачынаючы з 1991 года, — гаворыцца ў ёй, — некалі запаведная Белавежская пушча, няхай сабе і з характэрнымі асаблівасцямі запаведна-паляўнічай гаспадаркі, імкліва ператвараецца ў супрацьлегласць, набываючы асаблівасці нават не лясгаса, а магутнага леспрамгаса. А на яе тэрыторыі, званай у свеце Спадчынай чалавецтва, быццам на здзек пакінулі нязначныя колькі кавалкаў былога запаведніка, абвясціўшы іх *запаведнай зонай*. Суцэльнай запаведнай тэрыторыі, якая магла б эфектыўна забяспечваць захаванне біяразнастайнасці, тут няма, а тыя 5 участкаў з запаведным рэжымам размешчаны далёка не ў самых прадстаўнічых (рэпрэзентатыўных) месцах Пушчы і маюць лакальнае значэнне. Затое пераваж-

ную частку Пушчы займае *зона рэгуляванага выкарыстання* — 57 тыс.га або 65,2% ўсёй тэрыторыі парка. Цікава, аднак, выглядае навуковая фармулёўка прызначэння гэтай зоны на фоне яе рэальнага выкарыстання: «... *Усе мерапрыемствы ў гэтай зоне павінны забяспечваць аптымальныя ўмовы для развіцця прыродных экасістэмаў з мэтай захавання эвалюцыйнага развіцця генафонду расліннага і жывёльнага свету*». Якія ж гэта мерапрыемствы? Жахліва, але факт: «аптымальныя ўмовы» ствараюцца санітарнымі высечкамі, гэта значыць, нарыхтоўкамі драўніны для ўласнага лесазавода і іншых, не менш прыбытковых мэтаў...»

ЛІПЕНЬ

*** Двойчы пераконваў Марыю Худую, што ў склад камісіі трэба *абавязкова* ўключыць прадстаўніка ад нашай грамадскай ініцыятывы.

«Гэта будзе Ваш моцны аргумент», — даводзіў я. Худая стаяла на сваім: «Ад гэтага будзе горш, а не лепш. Не атрымаецца шчырай гаворкі. Людзі будуць затойвацца, хавацца. Трэба даць ім шанец выказацца...»

«Камісія едзе правяраць факты, а не шушукацца пад ялінкай, — ціснуў я. — Ваша адмова паказвае, што Вы збіраецеся адстойваць інтарэсы канкрэтных наменклатурных колаў».

«Пачакайце, не гарачыцеся, — не здавалася Худая. — На гэтым этапе хай будзе ўсё так, як ёсць... Пакуль што ранавата...»

«Вельмі дзіўна, — казаў я, — па нашай ініцыятыве збіраюць камісію, а прадстаўніка не бяруць... Аб’явіце ўсім, Марыя Мікалаеўна, што з вамі едзе Мураўёў або Дранчук, што гэта — найперш — абавязак перад падпісанай у 2000 годзе Орхускай канвенцыяй аб доступе грамадскасці да прыняцця экалагічных рашэнняў. І няхай ведаюць, мяняюць замшэлыя звычкі. Пакажыце прыклад — з вамі прадстаўнік гра-

мадскасці, пачніце з сябе — і будзе лепш, а не горш…»

«Я амаль згодная з Вамі, — адказала М.Худая, — але не я адна прымаю рашэнне…»

*** Сёння звязаўся з Віктарам Іванавічам Парфёнавым — акадэмікам, былым дырэктарам Інстытута эксперыментальнай батанікі НАН, які днём раней даў згоду на ўдзел у парламенцкім рэйдзе.

Я папрасіў яго замовіць і наш удзел, гэта значыць, тых, хто даўно ініцыяваў гэтую паездку ў Пушчу, — найперш Мураўёва, які падрыхтаваў аналітычную даведку па просьбе Худой, або мяне. Парфёнаў адказаў няпэўна, хутчэй адмовіў, выглядаючы гэткім зрэбнікам, ад якога, маўляў, нічога ўжо не залежыць. (Нават калі так, чаму б не выказаць сваю пазіцыю? Але я ведаю, гэта быў бы амаль *вырашальны* голас на нашу карысць). Прычына, значыць, у іншым.

Я не ўпершыню бачыў расчараванасць вучонага, штосьці раздражняла Віктара Іванавіча. Апошні час ён мог дазволіць сабе моцныя выказванні пра бедлам у Пушчы, дзе ўсё, маўляў, «спаганена даастатку, пад корань, дзе нічога святога не засталося…» Аднак… Як вучоны і акадэмік, чалавек з біясферным досведам і мноствам рэгалій, ён не збіраў і «апалчэння» на абарону.

Ці не гаварыла ў ім хутчэй затоеная крыўда на ўладу? Прыўладныя клеркі — што яны разумеюць? А даўно не раяцца, не клічуць у вузкае кола «адміністратараў Пушчы». Магчымасць (а мо, і жаданне) прыдацца *гэтай* уладзе, і пры *гэтай* уладзе патайна, як і раней, вырашаць лёс Пушчы, відаць, не пакідалі акадэміка. Запрашэнне Худой — маласуцяшальная замена. Заход не з параднага боку. Дый роля Парфёнава была тут не першай. Хоць далёка і не апошняй…

У Пушчу мы паехалі ў адзін дзень, кожны сваёй дарогай. Я сеў на ровар, група Худой — 10 чалавек, сярод якіх і Парфёнаў, — у мікрааўтобус.

*** Выправіўся рана. У Берасце даехаў цягніком, там перасеў на аўтобус. На шчасце, у незапоўненым салоне знайшлося месца, я загрузіўся з роварам. У Камянцы, нарэшце, адчуў пад сабой жаданае сядло. Хутка выехаў на шашу, вецер быў у самыя плечы.

Мінуў Дзмітровічы. Нарэшце, і Камянюкі, мост праз раку Лясную.

На ўездзе ў нацыянальны парк мяне яшчэ з ганачка старажоўкі папярэдзілі, што далей «забаронена». Паказаў камандзіровачнае пасведчанне, пашпарт. Аднак дзяўчына не сунімалася. «Нельга з роварам!» Я папрасіў пісьмовае пацверджанне антыроварнай «санкцыі». «Мне так загадалі», — сардэчна прызналася вартаўнічка. «Куды ж, па-вашаму, ровар?» — спытаў я. «На платную стаянку».

З-за адсутнасці дастатковых падстаў працягваю шлях за шлагбаўмам.

Праз якую гадзіну мяне нагнаў матацыкл. Перагнаўшы, стаў. Кіроўца ў зялёна-пярэстай форме звярнуўся да мяне, ці не магу я спыніцца. Не згаджаюся. Педалюю далей. Але разагнацца не паспеў. Мяне перасціг «уазік». Не зачыняючы дзверцаў, на сцежку выбег мой леташні знаёмца, па-мясцоваму Бронак. Ён быў вельмі ўзлаваны, бо накінуўся з рыкам. Чаму не спыніўся? Твар выцягнуты і жорсткі. «Дзіўна, між іншым», — пасля падумаў я, бо ўжо ведаў, што нядаўна яго панізілі ў службе.

Спыняюся. Чарговая праверка дакументаў. «Шчас пасмотрым, что вы там возите», — Бронак паказаў на фотаапарат.

«Я ў творчай камандзіроўцы», — тлумачу і прашу не крычаць. Бронак сядае ў машыну і пакідае «месца здарэння». Зялёна-пярэсты памежнік паглядзеў у дакументы, вярнуў іх назад і развітаўся.

«Што з вас выраблююць...», — кідаю ўслед і па-чалавечы спачуваю, бо ў ягоным абліччы пазнаю інтэлігентнага чалавека.

Людзей, якія выконваюць тут загады, спрабую

неяк зразумець і не спяшаюся асуджаць, як кажуць, па поўнай праграме. Ледзь што, заўтра іх могуць звольніць або не падоўжыць кантракт.

Прайшоўшыся па калідорах адміністрацыйнага будынка ды павітаўшыся з даўнімі знаёмымі, я пачуў ад іх, што нават кароткія размовы з журналістамі тут фіксуюцца, дакладваюцца дырэктару. Мяне папярэдзілі і настойліва раілі быць асцярожным, дый заадно — не падстаўляць людзей.

Кожны мой крок насамрэч адсочваўся. Напрыклад, аднекуль тэлефанавалі ў кабінет і пыталіся, ці не заходзіў *такі і такі*. Часам гэта было ў маёй прысутнасці, я чуў асобныя фразы. Гэта быў інструктаж. Альбо цікавіліся, што я пытаў ці казаў... Людзі, якія ведалі мяне, прасілі зразумець іхняе становішча. І я ішоў далей. У пакаёўкі гасцініцы пакінуў асабістую запіску для Худой (яна мусіла вярнуцца праз паўгадзіны). Калі зноў завітаў, пакаёўку было не пазнаць. Зацятая. Спалоханы выгляд. Вінавата прызналася, што тую запіску забрала ў яе са стала нехта Валянціна Ўладзіміраўна. Я падняўся на другі паверх і пастукаўся ў нумар да Марыі Худой. Запэўніўся, што запіску ёй ніхто не перадаваў.

Нахабная паліцэйшчына і тэрор у дачыненнях з няўгоднымі журналістамі распачалася на тэрыторыі парка тады, калі ў друку з'явіліся вострыя крытычныя публікацыі (пераважна ініцыяваныя «TERRA-Канвенцыяй»), якія моцна патрывожылі ўладу. Гэта быў джын з бутэлькі. Трымай джына!

У зводцы БелаПАН — паведамленне пра пачатак парламенцкага рэйду:

«29 ліпеня ў Дзяржаўны нацыянальны парк «Белавежская пушча» прыбывае дэлегацыя на чале з намеснікам старшыні экалагічнай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Марыяй Худой.

У складзе дэлегацыі — прадстаўнікі Нацыянальнай акадэміі навук, Міністэрства прыродных рэсур-

саў і аховы навакольнага асяроддзя, Савета міністраў.

Як паведаміў БелаПАН вядомы беларускі эколаг, кіраўнік ініцыятывы «TERRA-Канвенцыя» Валеры Дранчук, гэты візіт — вынік звароту грамадскасці ў парламент, Адміністрацыю прэзідэнта, іншыя высокія інстанцыі». «Мы настойвалі і будзем настойваць на тым, каб улады разабраліся, што адбываецца ў Пушчы». На лісты, якія жыхары Камянюкаў пісалі прэзідэнту, у рэшце рэшт мусіць адказваць парламент», — сказаў Валеры Дранчук, які сёння таксама прыехаў у Белавежскую пушчу.

У час двухдзённай паездкі, паводле слоў Валерыя Дранчука, плануецца абмеркаваць шматлікія пытанні: прыродаахоўныя, сітуацыю ў вёсцы Камянюкі, праблему масавых звальненняў у парку, адсутнасць Палажэння пра нацыянальны парк, якое прадугледжана заканадаўствам, і іншыя. «Дэпутат Марыя Худая паабяцала, што будзе гутарыць не толькі з дырэктарам прыродаахоўнай установы Мікалаем Бамбізам, але і абавязкова сустрэнецца з людзьмі — ветэранам запаведнай справы Уладзімірам Дацкевічам, зволненымі з нацыянальнага парка Яўгенам Смактуновічам і Георгіем Казулькам, сельскім дэпутатам Аленай Мазговай і іншымі», — паведаміў Валеры Дранчук. Прыродаабаронца не верыць у тое, што гэты візіт неяк паўплывае на сітуацыю ў нацыянальным парку, аднак лічыць добрым знакам той факт, што паездка адбудзецца.»

Валянціна К а з л о в і ч . БелаПАН»

Візіт на кватэру экс-дырэктара нацыянальнага парка Я.Смактуновіча — першы пункт праграмы М. Худой. Разам з М. М. пажадаў наведаць былога кіраўніка парка і яе парламенцкі калега А.Свірыд. Калі падымаліся на ганачак, аселішча ўжо ахіналася ў змрок. Сустрэча доўжылася каля трох гадзін.

У доме Смактуновічаў здарыўся цікавы эпізод. Пасля агульнай гаворкі ўдзельнікі «слуханняў» ра-

зышліся па кулуарах. Георгій Казулька выказваў Марыі Худой сваё захапленне яе «ўвагай і глыбінёй зацікаўлення», настойліва раіў завітаць на свой «белавежскі» сайт. Мяне крыху здзівіла гэткая «эйфарыя», увогуле неўласцівая для стрыманага Георгія; нават калі гэта і «дыпламатыя», перабор быў яўны і рэзаў слых. Якая ўжо тут «увага», каб гэтак кампліментарна «падаць у ногі». Жорсткасць рэалій ані не схіляе да ўдзячных жэстаў такога кшталту.

Я спрабаваў укленіцца, парушыць гэты гасцінны лад, але нечакана пераканаўся, што ён усіх задавальняе, апроч мяне. Дэпутат Свірыд, «па-чалавечы прасякнуты» лёсам Яўгена Смактуновіча, радзіўся з апошнім наконт вяртання яго ў родны калектыў, маўляў, чаму б не вярнуцца — спецыяліст лесу, пушчанец, такія патрэбны Радзіме. І хоць Яўген сказаў сваё катэгарычнае «не», на твары Свірыда не праглядвалася разуменне становішча. Ён не быў заклапочаны кіраваннем Пушчай, не быў абураны самавольствам дырэктара, урэшце, як дэпутат, не шукаў выйсця ў папраўках да закона.

— А хіба можна ў такіх умовах працаваць?— спытаў я дэпутата. — Вы прапануеце замірэнне там, дзе яно несумяшчальнае з чалавечай годнасцю. Паводзіны дырэктара, стыль кіравання паркам даўно пакінулі рамкі прафесійнай прыстойнасці, гэта выклік грамадству і ўсім нам, і Вам як дэпутату парламента... Вы хочаце працаўладкаваць Яўгена. А хто ўладкуе ўсіх астатніх? Вы падумалі, дзе тут прычына і дзе наступствы?..

Дэпутат злосна адказаў:

— Вы ўмешваецеся не ў сваю справу. Я з Вамі наогул не збіраюся размаўляць, бо добра ведаю, чаго Вы сюды прыехалі. Лезеце ў палітыку, навязваеце сваю думку, сунеце нос, куды не трэба...

Рэакцыя Свірыда была хоць і нечаканай, але цалкам зразумелай. Мяне ўразіла, як павёўся Яўген. Ён не спяшаўся займаць мой бок, зрэшты, гэтага ад яго

вымагала гасціннасць. Але ён сказаў: «Валерый, Вы і праўда шукаеце палітыку. Як гаспадар дома, я б не хацеў канфрантацыі і скандалаў. Палітыкай можна ўсё сапсаваць».

На што я мусіў яму адказаць:

— Палітыку нам не трэба шукаць, Яўген. Яна ў Вашым доме. І не мной навязаная, а Вамі запрошаная. Вы ладзіце сёння палітычную вечарыну, парламенцкія слуханні на кватэры, прыём асобаў. Гэта вымагае адпаведных слоў і паводзін. Вам, карэннаму пушчанцу, не даюць жыць на карысць Пушчы. Вас ізалююць, палохаюць, шантажуюць. Парушаюць Вашы правы. А сёння Вам соваюць пернік, прапануюць дамовіцца «без палітыкі». Яны хочуць запрэгчы, каб паганяць. Вы ім патрэбны не дзеля Пушчы, а дзеля іх інтарэсаў, чарговых праектаў... Пабачыце — заўтра гэта будзе палітычным вынікам, кампрамісам на іх карысць і, магчыма, нашым пройгрышам.

І яшчэ адзін штрых . Падчас візіту прадстаўнік адміністрацыі парка, прыстаўлены да непрыстойнасці недарэчы, катэгарычна запатрабаваў ад мяне выключыць дыктафон і не фатаграфаваць. Знаёмая рэакцыя на прэсу. Папросту — нахабнасць. Не хочаш, каб цябе запісвалі, не гавары. Ты — штатны гаварун пры адміністрацыі. Цябе ніхто сюды не клікаў, з тваіх каментароў вядомая «карысць» — затлуміць думкі, скрасці час. Я ўспрацівіўся, адказаў з той жа катэгарычнасцю, пры гэтым неабачліва ўсумніўся ў добрых намерах прысутнасці гэтага чалавека, як і ў ягоным праве ставіць зараз умовы. У рэшце рэшт, атрымалася прыкладна так: «А калі я папрашу Вас выйсці адсюль, Вы выйдзеце?..». На мяне зашумелі, я адчуў халадок непрыязнасці. Маўляў, лепш зрабіць так, як чалавек жадае... Калі ён гаварыў, доўга і нудна, марнуючы лепшыя хвіліны ў чужым доме, з павагі да ягонага ўзросту (даўно на пенсіі) я адключаў дыктафон. Слухаючы гэтага рэліктавага спецыяліста, ставіў дыягназ: сёняшнія выканаўцы баяцца свайго следу, ба-

яцца асуджэння з боку тых, хто ідзе за імі, спрабуюць хоць неяк схавацца, скінуць з сябе адказнасць. А з другога боку, не хочуць рызыкаваць: сказанае можа раптам не спадабацца галоўнаму пушчанскаму начальніку — і службе канец.

*** Другі дзень. Ужо не раніца. Але не поўдзень. Ліпеньская спякота. І блізкі халадок пад соснамі...

У двары сельсавета сабралася трохі людзей: хто ў цесным коле, хто назіраючы здаля. Мясцовы дэпутат, старшыня сельсавета, лідэр «ад бога» Алена Мазгова гаворыць пра ліхое жыццё сваіх выбарцаў як пра сваё, сямейнае — пра звальненне мясцовых мужыкоў, пра кантрактныя пасткі, пра дыскрымінацыю жыхароў-пушчанцаў ды іншыя нахабствы трымальнікаў і кіраўнікоў парка. Бачна, жанчына з характарам, цвёрдая духам, а на нейкім слове-паўслове змахвае слязу, жаліцца. І тут жа бярэ сябе ў рукі, працягвае. Маладзейшыя кабеты, слухаючы яе, пацвярджаюць: «Праўда, усё праўда...». М. Худая пытаецца, ці хадзіла А. Мазгова са сваімі прэтэнзіямі і патрабаваннямі да М. Бамбізы.

*А. Мазгова.* — Хадзіла, чаму ж не хадзіла.

*М. Худая.* — І што ён?

*А. Мазгова.* — Паслаў мяне....

*Худая.* — Куды?

*А. Мазгова.* — На тры літары.

Худая без эмоцый трымае паўзу, затым пытаецца пра галоўную спраўніцу прэзідэнта — Г. Жураўкову. Як часта бывае ў Пушчы, ці знаёмыя?

*А. Мазгова.* — Праляціць на машыне — і ўсё знаёмства... Бываць бывае. Апошнім часам раз ці два на тыдзень. Якія ў яе тут справы, не ведаю. Ніколі не сустракаліся.

*М. Худая.* — А хацелі б сустрэцца, перамовіцца? Вам ёсць што сказаць Галіне Анісімаўне? Па-жаночы, вось так як зараз?

*А. Мазгова.* — Не ведаю... Скажу ўсё, што я думаю пра яе.

*М. Худая.* — Я абяцаю Вам. Арганізую вочную стаўку. Рыхтуйцеся, што сказаць...

Улучаю момант, каб давесці інфармацыю ад нашай грамадскай ініцыятывы «TERRA-Канвенцыя».

— Абодва лісты жыхароў Пушчы, — звяртаюся да людзей, — і першы, пад якім падпісаліся старэйшыны, і другі, пад якім падпісаліся 260 чалавек, мной асабіста развезены па ўсіх прызначаных адрасах, найперш, як прасілі мяне Вашы каардынатары, асабіста прэзідэнту А. Лукашэнку, а таксама ў Парламент, Савет міністраў, Мінюст, Дзяржкантроль, Канстытуцыйны суд і іншыя — разам у 12 інстанцый. Мушу расчараваць Вас. Ні першы, ні другі ліст да Лукашэнкі не трапілі. Мне патлумачылі ў ягонай адміністрацыі, што інфармацыя пакуль што сырая, многія факты патрабуюць праверкі, проста так нічога не даюць чытаць... Але гэта не самае страшнае. Варта расчаравання тое, што справядлівай аб'ектыўнай праверкі фактаў Вы можаце так і не дачакацца. Пакуль «сырая інфармацыя» будзе прасыхаць на сталах Кіраўніцтва спраў, жулікі будуць круціць тут свой маскарад, рабаваць Пушчу, знішчаць архівы, паліць справаздачы і абніжаць мясцовых жыхароў. Вось побач са мной мой даўні знаёмца Аляксандр Міхайлавіч Максімовіч, прэзідэнцкі спраўнік з вялікім стажам. Вы папытайце ў яго, чаго ён сюды прыехаў. Думаеце, правяраць факты? Давесці да кандыцыі тую «сырую інфармацыю»? Пацвердзіць Вашу рацыю і Вашы правы? Хутчэй за ўсё, Вы правільна думаеце — толькі што чулі рэплікі Аляксандра Міхайлавіча. Ён тут не дзеля таго, каб дапамагчы Вам адолець хамства і дэспатызм, а дзеля таго, каб адолець Ваш справядлівы гнеў і Вашае абурэнне, умацаваць пазіцыі сілы і не даць прахапіцца Вашым нармальным чалавечым пачуццям. Магчыма, я гэтага не выключаю, што менавіта ён, Максімовіч, напіша адмысловую адпіску на Вашы звароты, у якіх факты «не адпавядаюць сапраўднасці».

Непрыемна ўразіла сустрэча Худой з Уладзімірам Дацкевічам. Што ведае М. М. пра гэтага чалавека? Нічога. Што яна хоча ведаць пра яго? Здаецца, таксама нічога.

М. Худая цудоўна валодае вулічнай агітацыяй, умее лёгка разгаварыць простых вясковых кабет: павітацца за руку, цярпліва і ўважліва іх паслухаць, даць параду ці нешта паабяцаць. Дагэтуль яе суразмоўцы не гаварылі пра лес, пра лясныя праблемы. Тэма прыродакарыстання, лесааховы Пушчы была адсюль вельмі далёка і амаль не закраналася. Праца, заробак, здароўе, адсутнасць вулічных ліхтароў, незанятая моладзь... Гэтыя пытанні «грэлі» больш, горача абмяркоўваліся. Хоць і тут здымаўся верхні пласт, прычыны заставаліся «да наступнага разу», аднак увага да тутэйшага соцыуму мела пэўны свой знак.

Дацкевіч вымагаў ад М.М. зусім іншай увагі. Найперш, трэба было нестандартна ўбачыць гэтага чалавека, вучонага-натураліста, глыбокага краязнаўца, арганізатара музейнай справы ў Пушчы і... ярага апазіцыянера да любой бюракратыі, у тым ліку і навуковай. Прасякнуцца ягонай ідэяй, ягоным гледзішчам. Запэўніцца думкай, досведам, светаглядам. Марна. Атрымаўся стандарт — Худая «прайшла» міма. Не ставала часу і замінала мноства абставінаў.

У. Дацкевіч давёў сваю галоўную пазіцыю — адмена зон, на якія штучна падзелены прыродны помнік, і пашырэнне запаведніка да памераў сённяшняга нацыянальнага парка. Чыноўнік Мінпрыроды, нядаўна прызначаны на адну з ключавых ахоўна-кантрольных інспекцый, пачуўшы такія словы, ажно ўсклікнуў: «Вы што! Не-не-не! Гэта не па-гаспадарску, дзяржаве такое нявыгадна. Хіба можна папускаць марнатраўства? Вы што!...» Шчыра здзіўлены «захопам» наменклатурных багаццяў, ён і сам выклікаў здзіўленне. Я сказаў яму пра гэта і дадаў, што краіне ў цэнтры Еўропы сёння выгадна *захаваць* Пушчу, хоць бы такой,

якая яна ёсць, аддаць ёй усе правы, стварыць тут своеасаблівы ўсясветны «касмадром» для вышэйшых экалагічных палётаў ды раз на год склікаць свет прасіць пакаяння ў Пушчы за прычыненыя ёй калецтвы.

Час па абедзе. Група М. Худой вярнулася з Пушчы. Сяджу на лаўцы ў цяньку, чакаю, калі спадарства пакіне рэстаран і згодна з праграмай пакіруе ў бок музея — аглядаць састарэлыя ўшчэнт экспазіцыі.

Планую далучыцца. А пакуль колькі слоў у нататнік.

Што цікавіць мяне найбольш — адэкватнасць падыходаў гэтага рэйду, тыя меркі, з якімі парламенцкія эксперты прыехалі ў Пушчу. Мне важна запэўніцца, якія крытэрыі прысутнічаюць, якая сістэма каардынат ім бліжэй і даражэй і чаму. Я мушу браць пад увагу, якія паняцці, артыкулы, прынцыпы запатрабаваныя, якія — не. Якіх кантрольных дзеянняў сёння пільна бракуе і хто зацікаўлены ў тым, каб адводзіць вочы ад фінансавых справаздач ці архіўных шуфлядаў.

Выглядае ўсё далёка не так. Камісія, але без праверкі. Паездка, але без «яркіх уражанняў».

Сітуацыя ў Пушчы даўно выйшла за межы навуковых дыскусій. У гэтых межах яе штучна трымаюць. Яна брыняе крыміналам, а прэзідэнцкая шаць, шчыльна апякаючы галоўны прыродны рэзерват краіны, кардынуе доступ да яе такім чынам, каб уяўленні грамадзянаў Беларусі і сусветнай грамадскасці заставаліся ў межах тых самых здакучаных размоў пра караеда-тыпографа або наступствы даўняй меліярацыі.

Выйдзі з гасцінічнага пакоя, прайдзіся, прыгледзься. Ідзе замена агароджаў, лавак, дэкарацый. Калі гэта прафесійны дызайнерскі праект, я хацеў бы аўтараў выклікаць на... не, проста ўбачыць. І тут гэтая

пагоня за пластыкавым бляскам — на сценах, столі, паддашках. Паўсюль нарошчванне вытворчасці і будаўніцтва. Гасцініцы — «пад еўра», вулічныя прылегласці рухава запаўняюцца дарагой пліткай (і чаму пліткай, а не брукам з ваколічных камянёў, напрыклад?). Дый пытанне: а ці было горш? і ці стала лепш? «Фарбуецца фасад», адным словам. І на гэта трацяцца грошы, грошы, грошы. Але што *за фасадам*? Заглыбімся ў лес. Прыслухаемся, прыгледзімся. Пушчу пранізвае віск бензапілаў, рокат машын. Пах саляркі і дыму ад спаленых рэшткаў. Рэха валютных стрэлаў, крык адчаю лясных жыхароў. На месцах так званых санітарных рубак застаюцца пні, прагаліны, плешыны ад кастроў...

15.40. Нарэшце, дачакаўся.

На ўваходзе ў музей прадстаўнік аховы (мясцовы «амон»?) спрабуе мяне запыніць: «Вам нельга». «Што значыць — нельга?» Паказваю дакументы, кажу, што іду на запланаваную сустрэчу, і адчыняю дзверы. Ахоўнік спрабуе ўгаварыць мяне, папярэджвае, што ўсё можа дрэнна скончыцца. На жаль, можа скончыцца для яго: у фае лаўлю затоена каменны позірк галоўнага начальніка Пушчы. Якіх дзеянняў ад аховы чакае генеральны працанаймальнік, здагадацца няцяжка.

Аднак «амонавец» на каманду «фас» рэагаваць не можа. У залах музея пакуль што знаходзяцца чальцы камісіі. Калі міма праходзіла М. Худая, я голасна звярнуўся да яе: «Цяпер Вы бачыце, Марыя Мікалаеўна, што нацыянальны парк ператвараецца ў закрытую тэрыторыю? На журналістаў робяць аблавы, насылаюць «амон». Дэпутатка нервова кінула вокам і, як мне падалося, дакладна ацаніла становішча, панура адказала: *«Мы обязательно отразим это в своей справке»*. І па вузкай музейнай лесвіцы — паволі і асцярожна — пачала падымацца на другі паверх. За ёй, паспешліва абмінаючы «грамадскае хваляванне», прайшлі ўсе астатнія. Сярод іх і Віктар Іванавіч Парфёнаў.

Прашу яго сказаць колькі слоў пра ўдзел у парламенцкай камісіі, выказаць першыя ўражанні. Мне замінаюць, той жа ахоўнік настойвае пакінуць будынак музея. Акадэмік спрабуе гэтага не заўважыць, хоча моўчкі адысці ўбок. Я пачынаю запіс.

— Віктар Іванавіч, у Вашай прысутнасці выдвараюць журналіста. Вы збіраецеся прамаўчаць?

— Я... А што я магу яму сказаць?.. *(Пасміхаецца, паказвае на дырэктара музея)*. Вунь Раманюк няхай скажа.

— Скажыце Вы. Падзяліцеся ўражаннямі.

— Ну якія ўражанні? Мы не першы раз гэта ўсё робім. Паглядзім... Пагавары з Марыяй Мікалаеўнай.

— Я прыйшоў да Вас...

*(Вялікая паўза. Дыктафон застаецца ўключаны. Віктар Іванавіч вырашае)*.

— Значыць, цяжкавата?

— Ды не, якое тут цяжка! Я не ведаю, што табе сказаць. Што б ты хацеў, каб я сказаў? Ну што? У мяне ўжо няма жадання гаварыць, баліць галава, разумееш?

— Добра, дзякуй. Праз дзве гадзіны я пакідаю Пушчу. Выбачайце. Сустрэнемся хіба ў Мінску...

*(Віктар Іванавіч, мне ўслед)*. — Ну што, ну што ты хацеў ад мяне пачуць?

— Хіба журналіст можа ў такой сітуацыі падказваць, што прамаўляць акадэміку? — сказаў я на развітанне.

І ўсё ж такі — каюся! — мусіў гэта зрабіць. Яшчэ не позна, я прашу Вас: кажыце праўду, акадэмік Парфёнаў. Вы сабраліся з думкамі, у Вас багата ўражанняў, Вам ёсць што сказаць. Вы прыехалі ў Пушчу, каб паслухаць яе скаргу. Вам нельга маўчаць. Нават калі за Вамі сочыць даўгавязы пушчанскі «амонавец». І мацёра свідруе вачыма ягоны працадаўца — сённяшні гаспадар Пушчы, які ўчора паслаў на тры літары жанчыну, старшыню сельсавета, а заўтра, не выключаю, пашле і Вас, тытулаванага акадэміка. Ён ба-

чыць Вашую разгубленасць, Вашую няпэўнасць. Пакуль акадэмік вагаецца і вырашае, гаспадар можа напускаць на журналіста гайню аховы.

*** Чарговае паведамленне БелаПАН — «ДЗЯРЖАВА НЕ КАНТРАЛЮЕ СІТУАЦЫЮ Ў БЕЛАВЕЖСКАЙ ПУШЧЫ, — УПЭЎНЕНЫ ЭКОЛАГ ВАЛЕРЫ ДРАНЧУК».

«Брэст, 31 ліпеня. Сітуацыя ў Дзяржаўным нацыянальным парку «Белавежская пушча» не кантралюецца дзяржавай. Пра гэта заявіў прыродаабаронца, кіраўнік ініцыятывы «TERRA-Канвенцыя» Валеры Дранчук, які на гэтым тыдні пабываў у Белавежскай пушчы.

Як раней паведамляў БелаПАН, 29-30 ліпеня ў нацыянальным парку пабывала камісія на чале з дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Марыяй Худой. Валеры Дранчук не быў уключаны ў склад камісіі, аднак суправаджаў яе ў якасці назіральніка.

Як расказаў БелаПАН Валеры Дранчук, дэпутат сустрэлася не толькі з адміністрацыяй нацыянальнага парка, але і з жыхарамі Камянюкаў: ветэранам запаведнай справы, вучоным-арнітолагам Уладзімірам Дацкевічам, былым дырэктарам нацыянальнага парка і былым галоўным ляснічым Яўгенам Смактуновічам, былым намеснікам дырэктара па навуковай працы Георгіем Казулькам, старшынёй Камянюкскага сельсавета Аленай Мазговай.

«Марыя Худая мела магчымасць пачуць з першых вуснаў пра ўсе сацыяльныя праблемы, якія ёсць сёння ў Пушчы. Яна атрымала досыць поўныя адказы на свае пытанні і мае багаты фактычны матэрыял пра тое, што наогул адбываецца ў гэтай слыннай тытулаванай мясціне», — паведаміў Валеры Дранчук.

Аднак, мяркуе эколаг, пра вынікі паездкі гаварыць яшчэ рана. «Ніхто з камісіі выразнага голасу на абарону Пушчы так і не падаў». Марыя Худая абяцала, што пра ўсё ўбачанае і пачутае пойдзе гаворка на

пашыраным паседжанні экалагічнай камісіі парламента, магчыма, будуць парламенцкія слуханні, прысвечаныя ўсім падахоўным тэрыторыям краіны. Але якія высновы з гэтай паездкі зробіць парламенцкая камісія, цяжка сказаць, мяркуе Валеры Дранчук.

Паводле слоў эколага, у час паездкі ён «чарговы раз пераканаўся, што сітуацыя ў Пушчы не кантралюецца дзяржавай». «Я схільны далучыцца да меркавання пушчанцаў, якія лічаць, што кіраўнік дзяржавы хутчэй за ўсё не ведае пра сітуацыю. Іхні ліст з 260 подпісамі не трапіў да прэзідэнта, я гэта ведаю. Я гатовы адкінуць свае палітычныя амбіцыі і прапанаваць Лукашэнку прыехаць у Пушчу без спінінга і «ролікаў», а з міністрам юстыцыі і старшынёй Камітэта дзяржкантролю — там пахне крыміналам. Сёння ўратаванне Пушчы над палітыкай і палітыкамі», — упэўнены Валеры Дранчук.

Валянціна К а з л о в і ч . БелаПАН»

ЖНІВЕНЬ

*** На днях мае з'явіцца дакумент з высновамі праверкі. Наша ініцыятыва, дзякуючы каардынатару Здзіславу Мураўёву, які штодня тэлефануе М.Худой, здаецца, атрымае яго зусім гарачым. Але трэба глядзець рэальна. Як мы не падымалі хмару, грому з яе не будзе. Разлічваць на нешта сур'ёзнае немагчыма. З таго, што напішуць парламенцкія эксперты, палову выкінуць «рэцэнзенты». Пакінуць парачку-другую так званых пагрозлівых тэндэнцый, не больш. З боку КС будзе навязаны нейкі сярэднедапушчальны стэрэатып, праз які не ўбачыш нічога «надзвычайнага».

Не выключаю, што і Марыя Худая будзе з кожным днём змякчаць акцэнты, падбіраць словы і выразы, якія патрэбны адказным асобам, а не грамадскасці, якая спрабуе з дапамогай дэпутатаў прарваць белавежскі гнайнік. Усё будзе стылістычна зараўна-

вана, замазана і нават месцамі залакавана, каб зніве-ляваць адказнасць КС за становішча ў Пушчы. Але «хмара» неабходная, з ёй абуджаецца вецер і кропелькі дажджу падаюць на глебу.

Я вельмі ўдзячны Здзіславу Феліксавічу, радуюся, з якім напорам і энтузіязмам дамагаецца ён вынікаў і канкрэтных ацэнак, як бескампрамісна кантралюе працэс і патрабуе ад «роднай» айчыннай бюракратыі выразных меркаванняў на пастаўленыя пытанні.

*** З’яўленне на свет дакумента, падрыхтаванага групай М. Худой і названага «даведкай па праверцы...».

Ці тое, чаго так чакалі?

Канстатацыя асобных недахопаў (злачынстваў?). Крызіс без прычынаў, стыль кіраўніцтва не закранаецца. Прыземленая будзённасць развалу, крымінальнага гаспадарання, экалагічнага ліхадзейства. Будова фраз такая, што рэчы не называюцца сваімі імёнамі. Рыторыка апраўдальнасці і ўсёдаравальнасці...

Дапускаю: паводле выкладзенага, на падставе Канстытуцыі і законаў Рэспублікі Беларусь, а таксама з улікам міжнародных абавязкаў краіны на захаванне ўсясветнай Спадчыны можна напісаць усяго адну старонку тэксту з трох-пяці абзацаў, якая з запасам пераважыць усе дванаццаць старонак «даведкі». На гэтай адной старонцы назваць вінаватага (вінаватых), вызначыць меру адказнасці — і прыняць рашэнне. Гэта справа ўрада або прэзідэнта. Без праекта такой пастановы нельга было вяртацца з Пушчы.

І ўсё ж, і ўсё ж... Засведчанае на паперы, пад якой, дарэчы, падпісаліся М. Худая і А. Свірыд, пераўзышло мае чаканні.

ВЕРАСЕНЬ

*** Раптоўна адышоў навечна Здзіслаў Феліксавіч Мураўёў. Мне будзе мроіцца, напэўна, заўсёды: ён выйшаў на прыпынку «Верасы», адляцеў ад нас ліло-

вай верасовай аблачынкай... Бывай, гарачае лета! Бывайце, дарагі светлы Здзіслаў Феліксавіч!..

*** Учора адправіў ліст на імя К. Мацууры (ЮНЭСКА).

«Шаноўны Генеральны дырэктар!

Дазвольце Вам нагадаць, што больш як год таму група прадстаўнікоў культурнай і навуковай грамадскасці Беларусі звярнулася да Вас з лістом, у якім выказвала вялікую трывогу за лёс усясветнай прыроднай Спадчыны — Белавежскага лесу.

За час, які прайшоў, мы не маем больш ніякага водгуку, апроч першага адзінага знаку ветлівасці і добрых намераў з боку спадарыні Мунір Бучэнакі ад 22 жніўня 2002. Гэты ліст, вядома, таксама мае сваю вагу ў нашых стасунках, аднак мы разлічвалі на большае.

Ёсць прапанова. З афіцыйных крыніц вядома, што ў Беларусь маюць прыехаць эксперты ЮНЭСКА па выяўленні помнікаў на залучэнне іх у рэестр усясветнай культурнай Спадчыны. Вітаючы гэтую місію ў нашу краіну, грамадская экалагічная ініцыятыва «TERRA-Канвенцыя» звяртаецца з просьбай накіраваць у Беларусь таксама эксперта, які б, апіраючыся на альтэрнатыўны грамадскі досвед у дачыненні Белавежскага лесу, ацаніў стан кансервацыі гэтага аб’екта і экалагічныя пагрозы, якія ў апошнія гады сталі тут відавочныя».

ЛІСТАПАД

*** Ліст у адказ (атрыманы, паводле адпасыльных звестак, з вялікім спазненнем):

«Дарагі спадар Дранчук, я ўдзячны Вам за e-mail ад 20 верасня 2003 года, які датычыць аб’екта ўсясветнай Спадчыны *Белавежская пушча*, што быў занесены ў рэестр ЮНЭСКА 1979 года і пашыраны ў 1992 годзе.

Цэнтр усясветнай Спадчыны зараз рыхтуе сумесную місію ЮНЭСКА і МСАП (Міжнародны саюз аховы прыроды — *В.Д.*) на запыт Камітэта па ўсясветнай Спадчыне, які быў зроблены на 27-й сесіі ў 2003 годзе (рашэнне 27 COM 7.B.14).

Мы прынялі да ўвагі Вашу прыхільную прапанову паслаць эксперта ад грамадскай арганізацыі «TERRA-Канвенцыя». Зараз мы просім, каб улады прызначылі нам сустрэчы з трымальнікамі запаведніка. Мы таксама прапануем Вам скантактавацца з Нацыянальнай камісіяй ЮНЭСКА ў Беларусі (тэл/факс 220 36 97).

Карыстаючыся нагодай, дзякую Вам за цікавасць да Канвецыі ўсясветнай Спадчыны ў чыне яе падтрымкі.

Шчыра Ваш,
*Франчэска Бандарын*
Дырэктар Цэнтра
Ўсясветнай спадчыны ЮНЭСКА»

Паведамляецца, што копіі ліста адпасланыя таксама Сталым прадстаўніцтвам Беларусі і Польшчы ў ЮНЭСКА (Парыж), Нацыянальным камісіям па справах ЮНЭСКА абедзвюх краін (Мінск, Варшава) і Міжнароднаму Саюзу аховы прыроды (МСАП).

Дадаецца і вытрымка з прынятага рашэння 27-ай сесіі Камітэта па ўсясветнай Спадчыне (Парыж, 30 чэрвеня — 5 ліпеня 2003).

«Камітэт па ўсясветнай Спадчыне,

1. Прыняць да ўвагі інфармацыю, пададзеную арганізацыямі абедзвюх краін;

2. Заклікаць ЮНЭСКА і МСАП наладзіць назіральную Місію ў супрацоўніцтве з краінамі, на чыёй тэрыторыі размешчана Пушча, каб ацаніць стан захаванасці і магчымасць трансгранічнага супрацоўніцтва, а таксама сустрэцца з усімі, хто мае цікавасць да Пушчы ў Беларусі і Польшчы;

3. Замовіць справаздачу Місіі дзеля таго, каб Камітэт па ўсясветнай Спадчыне змог спраўдзіць стан захаванасці аб'екта на 28-й сесіі ў 2004 годзе».

*** Праз колькі дзён, як і дарадзіў мне спадар Бандарын, звяртаюся да У. Шчаснага (Нацыянальная камісія па справах ЮНЭСКА). Ён лагодна прапануе пачакаць, маўляў, яшчэ рана, куды спяшацца, два месяцы наперадзе. Але я настойваю, лічу такі падыход беспадстаўным. Трэба вызначыць прадстаўніцтва, атрымаць ад улады гарантыі ўдзелу, калі што, інфармаваць камітэт у Парыжы. Яшчэ я сказаў, што днямі еду ў Пушчу, буду грунтоўна рыхтавацца, гутарыць з жыхарамі, каб ведаць стаўленне людзей, іх думкі, настрой. Запрасіў паехаць і Шчаснага. Ён катэгарычна адмовіўся. Мне даў параду паводзіцца спакойна, не ўзнімаць вялікага шуму. Тут я ўспомніў пра тое, на што часцяком забываюся. Чыноўнікі ёсць чыноўнікі, і я маю справу яшчэ з адным, які нічога не зробіць на карысць ініцыятывы. Яна для яго шкодная, бо ён — служка гэтай сістэмы, гэтай дзяржавы, скручанай нябачным калючым дротам. Ён не будзе табе спрыяць, усё якраз наадварот.

Дамовіліся, што да размовы можна вярнуцца праз два тыдні (!). Зазначаю ў календары.

*** З Маратам Гаравым даем першую інфармацыю БелаПАН пра місію ЮНЭСКА.

СНЕЖАНЬ

*** Візіт да Шчаснага. Пайсці разам запрасіў і Марата Гаравога. Пушчанская тэматыка яму даўно блізкая.

Галоўнае пытанне — ці будзе забяспечаны ўдзел нашай Грамадскай ініцыятывы ў місіі ЮНЭСКА і МСАП. Шчасны просіць Марата выключыць дыктафон. Выказвае фармальнае спадзяванне, што перашкодаў не будзе. Спасылаецца на ліст сп. Бандарына. Маўляў, ёсць карт-бланш міжнароднай арганізацыі. Аднак дае зразумець, што асабіста ад яго тое мала залежыць. Ад каго, не ўдакладняе: «Яшчэ рана казаць. Мяркую, гэта будзе нейкая камісія, а не адзін

чалавек». Пытаюся, якая камісія, хто яе ўзначаліць. Шчасны пакуль «не ведае».

Са свайго боку я ўдакладніў пазіцыю ўдзелу. Папершае, сказаў я, маецца на ўвазе самы непасрэдны ўдзел: працуем побач з экспертамі, куды эксперты — туды і мы. З правам голасу і думкі, адпаведна з пратаколам і агульнай працэдурай. Шчасны папрасіў назваць людзей, якіх замаўляе наша ініцыятыва. Я назваў іх. На выпадак жорсткага абмежавання «грамадскага прадстаўніцтва» абачліва прашу пакінуць мяне — кіраўніка Ініцыятывы і Марата Гаравога — карэспандэнта недзяржаўнага інфармацыйнага агенцтва. Шчасны ўсё як след занатаваў і паабяцаў перадаць на разгляд.

Што да фармата Місіі, ніякіх звестак Шчасны не даў. Ад астатніх пытанняў далікатна ўхіляўся: «Яшчэ рана казаць», «Не ведаю», «Давайце пачакаем». Было добра бачна, што роля Камісіі тут цалкам ангажаваная. Шчаснаму далі зразумець і ён здагадаўся наперад, што павінен паводзіцца ціха і чакаць указанняў. Я парушаю гэты расклад, гэтую схему. Бяздушны штамп, на які разлічвае Шчасны, у выпадку са мной не праходзіць.

У Белавежскае пытанне, як мне здалося, Шчасны наогул залазіць не хоча. Шкада. Мяркуе па-дылетанцку, фармальна. Тое, што пішуць газеты, у большасці, кажа ён, не адпавядае сапраўднасці. Бо ёсць, маўляў, запаведная частка Пушчы і ёсць астатняя, дзе высечкі дазволеныя законам... Гэта самая зручная схема, за якую хаваюцца многія клеркі.

## 2004

СТУДЗЕНЬ

*** На 2003-ці я ўскладаў вялікія надзеі. На жаль, змены не наступілі. Зладжаныя акцыі мелі немалы рэзананс, аднак Пушча па-ранейшаму ў зубах дра-

пежніка. Злыдзень шалее, тапырыць поўсць, хітра віжуе і не збіраецца выпускаць жаданую здабычу.

*** Візіт экспертаў пераносіцца з другой паловы студзеня на сакавік. Каб нашы «беларускія» папкі ў міжнародных арганізацыях не былі пустыя, дасылаю ліст у Цэнтр усясветнай Спадчыны.

«Дарагі і вельмі шаноўны спадар Франчэска Бандарын!

Дзякуй за паведамленне і абнадзейванне ў справе захавання ўсясветнай Спадчыны, якой з'яўляецца Белавежская пушча. Прыезд Місіі мы ўспрынялі як прыемную вестку і ўжо скарысталіся Вашай прапановай — сустрэліся з кіраўніком Нацыянальнай камісіі па справах ЮНЭСКА спадаром Шчасным. Адразу мушу заўважыць, што гэты кантакт не пакідае ў нас надзеі, бо намаганні з боку Нацыянальнай камісіі і непасрэдна сп.Шчаснага будуць скіраваны на тое, каб як мага абмежаваць удзел нашай грамадскай арганізацыі ў рабоце Місіі. У нас на гэты конт ёсць горкі вопыт, на які мы вымушаны азірацца, каб не дапусціць памылкі.

У прыватнасці, мы вельмі мала дазналіся ад сп. Шчаснага пра фармат высокай Місіі на беларускім баку. Канкрэтна называлася агульная працягласць візіту (18—24 студзеня) і прозвішчы экспертаў. Са свайго боку, я давёў да сп.Шчаснага вялікую зацікаўленасць беларускай грамадскасці ў рабоце Місіі на беларускім баку, у магчымасці ўдзелу прадстаўніка грамадскай экалагічнай ініцыятывы «TERRA-Канвенцыя» і прадстаўніка незалежнага інфармацыйнага агенцтва, у не абмежаваных уладай кантактах экспертаў з прадстаўнікамі грамадскасці, якія маюць альтэрнатыўны погляд на рэчы і сённяшні стан аб'екта ўсясветнай Спадчыны. Галоўнае, чаго мы дамагаемся, гэта Сустрэча з экспертамі за адным сталом і свабодны абмен думкамі цягам паўтары гадзіны ці больш непасрэдна ў Белавежскай пушчы.

Гэтым лістом, дарагі спадар Бандарын, я хачу пацвердзіць нашы рашучыя намеры і гатовасць браць чынны ўдзел ва ўсіх дачыненнях з Місіяй ЮНЭСКА і МСАП падчас яе працы ў Белавежскай пушчы, а таксама напярэдадні візіту экспертаў. Маючы такія намеры, наша грамадская ініцыятыва будзе настойваць на шчыльным дыялогу з Нацыянальнай камісіяй Беларусі па справах ЮНЭСКА напярэдадні Місіі, працягваць інфармацыйную кампанію з мэтай прыцягнення ўвагі да візіту міжнародных экспертаў.

Днямі спадар Шчасны паведаміў на мой чарговы запыт, што па просьбе польскага боку Місія пераносіцца на сакавік бягучага года.

Яшчэ раз дзякую за ліст, за надзею быць карысным у добрай і важнай справе.

Шчыра Ваш».

*** Спрабую наладзіць прэсавую канферэнцыю. Мэта — прымусіць айчынную бюракратыю выказацца: чаго чакаць ад візіту, ці гарантуе ўлада прадстаўніцтва і ўдзел грамадскасці, якія сустрэчныя дзеянні і інш. На імя Жураўковай Г. А. (Кіраўнічка спраў прэзідэнта — *В. Д.)* падаў адпаведны ліст. Раблю гэта загадзя, бо адказ (калі ён будзе наогул) атрымаю праз месяц-паўтары. Словам, акурат.

*** Ліст у Пушчу.

«Шаноўны калега!

У Вашым лісьце прачытваецца небясьпечны «выклік», што выглядае на пагрозу нашым, хай сабе і мізэрным паводле выніку, як Вы лічыце, намаганням супрацву. Вы ўжо ня першы раз выстаўляеце аргумант пад назовам «граматныя спэцыялісты»: на выбары павінны йсьці «граматныя спэцыялісты», з экспэртамі ЮНЭСКА павінны размаўляць «граматныя спэцыялісты» і гэтак далей.

Мяркую, калега, што такім падыходам Вы несьвядома або сьвядома звужаеце кантэкст супрацыву, уно-

сіце расколіну на карысьць «граматных» зьнішчальнікаў, такіх як (...) і плойма іншых. Між тым, Вы, калега, як «граматны спэцыяліст», не падпісалі двух Зваротаў — у Раду Эўропы і ЮНЭСКА на абарону Пушчы, хоць я спадзяваўся на Вас. Вы пабаяліся. Яго падпісалі пераважна НЕ-спэцыялісты.

Як «граматнага спэцыяліста», Вас могуць заўважыць у Кіраўніцтве спраў прэзыдэнта і нават прапанаваць пасаду. Калабарацыяністы ім цяпер страшна патрэбны. Ад Вас, канешне ж, я гэтага не чакаю, выбачайце, але вопыт — вялікі Настаўнік. Улада заўжды рабіла стаўку на вузкіх «граматных спэцыялістаў», каб не лічыцца зь «некампэтэнтнай» грамадзкай думкай.

Адкажыце, мой дарагі дружа, на пытаньне:

ці ёсьць «граматныя спэцыялісты» паводле маралі, сумленьня, дэмакратычных ды іншых якасьцяў і каштоўнасьцяў? Вы ня думалі, што менавіта гэтых спэцыялістаў Пушчы не хапала і не хапае, каб яе бараніць? Хто, як ня Вы з захапленьнем гаварылі мне пра спадара Ганчарэнку — ён, між іншым, спэцыяліст зусім іншых сфэраў... Прыкладаў шмат.

Усё проста і няпроста. На маю думку, чалавек, які мае сьвядомасьць і непаганы інтэлект, да таго ж, калі ён не прыстасоўнік і ня лжэц, абавязкова будзе ратаваць каштоўнасьці Радзімы ад гвалту. І калі пры гэтым застанецца шчырым і пасьлядоўным — шмат чаго здолее дамагчыся. Адным словам, перагледзьце сваю тэзу. Наперадзе ў нас шмат выпрабаваньняў.

І яшчэ. Калі Вы пішаце «мы», хто маецца на ўвазе?

Шчыра Ваш».

ЛЮТЫ

*** Шчасны трымае дыстанцыю. Я настойваю на дзвюх-трох рабочых сустрэчах з удзелам Кіраўніцтва спраў і Міністэрства прыроды. Галоўнае пытанне — гарантыя нашага ўдзелу, прэс-канферэнцыя напя-

рэдадні, артыкуляцыя стаўлення і намераў з боку ўлады. Шчасны выдатна разумее, у якую крапіву яго пасадзілі. Працаваў амбасадарам у Вялікабрытаніі, збольшага ведае нормы шляхетнасці — што падвучыўся, што пры сабе... А тут — цягні «па-воўчаму». Вельмі «шляхетная» дыпламатыя! На ўсе пытанні вымушаны адказваць «не ведаю». Затое ведае сваё месца, на якое яму паказалі прэзідэнцкія клеркі.

*** Размова з Лучковым. Ліст на імя Жураўковай, паводле яе рэзалюцыі, трапіў да яго, значыць, ён і трымае чарговы раз цытадэль улады. Усе паўнамоцтвы, звязаныя з прыездам экспертаў, будзе ажыццяўляць ён. Аблічча знаёмае.

Цікаўлюся прэс-канферэнцыяй. Ягоны тон лагодна-ветлівы. Нават не верыцца, што гэта ён год таму ваяўніча даводзіў мне, што я, маўляў, «наездзіўся ў Пушчу» і мне ўжо «няма там чаго глядзець». Таму і чынілі аблавы, напускалі ахову... Сёння Лучкоў раіць мне «быць патрыётам», гэта значыць, прыняць ягоны бок, спыніць барацьбу, змаўчаць перад экспертамі. Я не заўважаю «нажыўку» і пытаюся пра Сустрэчу з журналістамі. «Не плануецца»...

*** Шчасны пацвердзіў дыстанцыю.

«Ніякіх шоў не будзе»,— у такім нечаканым тоне.

Гэта што да прэсавай канферэнцыі.

На жаль, гэта ўжо датычыць і гарантый нашага ўдзелу ў супрацы з Місіяй. Дый не толькі. Трэба рыхтавацца да горшага.

САКАВІК

*** Пушчанцы паводзяцца млява і паасобку. Для іх грамадская структура, нават такая, як наша Ініцыятыва, — гэта палітыка, якой яны асцерагаюцца. Г.К., як вынікае з ліста і ягоных намераў, будзе даводзіць сваё «асаблівае меркаванне». Пакуль непразрыстае. Склаў, адным словам, свой планчык — і ў поўным

спакоі. Быццам эксперты спяшаюцца ў Беларусь, каб паслухаць адну ягоную асаблівую думку, а Лучкоў спіць і марыць, каб даць слова спадару Г.К.

Толькі гуртавацца і выступаць адным фронтам! З патрабаваннямі, якія грунтуюцца на прынцыпах Канвенцыі, адпавядаюць яе духу і літары. Гэтыя патрабаванні ёсць. Летась, роўна год таму, разам з З. Ф. Мураўёвым (светлая яму памяць!) мы выклалі іх адмыслова да прэс-канферэнцыі ў Пушчы. Марат Гаравы ўручыў іх кожнаму журналісту. У той жа дзень, калі на прэс-канферэнцыю нас не пусцілі, мы ў Пушчы, сабраўшыся цесным колам позна ўвечары, абмеркавалі кожны пункт і прынялі сумесна. Цяпер з тых патрабаванняў трэба пакінуць дзве-тры пазіцыі, найперш аб пашырэнні запаведнай часткі, і, магчыма, далучыць пункт, які датычыў бы Грамадскай назіральнай рады (пры садзеянні Цэнтра і Камітэта па Спадчыне).

*** Шчасны: «Сустракацца не мае сэнсу. Мне няма вам чаго сказаць». Тон адчужаны і нервовы. «Хвілінку! У нас засталіся пытанні... Шмат пытанняў». Кароткія гудкі.

*** Ліст Грабнеру (разумее па-руску).

«Многоуважаемый господин Ули Грабнер!

Спасибо за Ваше согласие участвовать в Миссии по оценке состояния Беловежской пущи. Я один из тех, кто, возможно, также примет участие в Ваших встречах на белорусской стороне. (...)

Меня, господин Грабнер, чрезвычайно беспокоит предстоящая (оценочная) экспертиза, так как белорусские государственные структуры не первый год скрывают правду, утаивают истинные причины истощения биологических богатств Беловежской пущи как места всемирного Наследия. Об этом мы, представители независимой общественности сообщали в своих посланиях в адрес Совета Европы (ян-

варь 2002) и ЮНЕСКО (июнь 2002). Надеюсь, эти документы Вам известны.

Господин Счастный, к сожалению, не проявляет заинтересованности говорить с журналистами о подробностях Вашей высокой Миссии, на наш взгляд, чрезвычайно важной для Беларуси. На сегодняшний день я не имею гарантий, что смогу полноценно участвовать в предстоящих встречах. От инициативы TERRA-Конвенция я месяц тому настаивал провести пресс-конференцию, но господин Счастный, как и другие официальные лица — держатели национального парка, отказывают в этом, что уже является нарушением духа и буквы Конвенции о наследии.

Будьте любезны, господин Грабнер, напишите мне, если можно, о каких-либо подробностях, имеющих значение в качестве необходимой первоначальной информации. Например, сто*и*т ли вопрос о возможности переноса Беловежской пущи в отдельный *список объектов Всемирного наследия ЮНЕСКО, которым угрожает опасность*? Планируются ли встречи с населением Пущи (пущанцами), представителями альтернативной точки зрения, журналистами?..

Сообщаю свои координаты и сведения о инициативе TERRA-Конвенция.

Надеюсь на отклик. Спасибо».

*** Да прыезду экспертаў застаецца роўна тыдзень. Зранку звязваюся з галоўнай кантактнай асобай. Шчасны просіць мой электронны адрас і паведамляе, што праз некалькі хвілінаў я атрымаю запрашэнне. Цікаўлюся дэталямі, найперш, грамадскім прадстаўніцтвам. Пытанні канкрэтныя. Адказы бессаромныя. Удзел незалежнай грамадскасці ў працы Місіі выключаны. Сярод запрошаных няма прадстаўніка БелаПАН, як і наогул журналіста. Ніхто з мясцовых жыхароў не ўключаны ў спіс удзельнікаў Сустрэчы, на якую запрошаны я і некалькі прадстаўнікоў іншых ГА.

Чаму не ўключаны мясцовыя жыхары — Смактуновіч, Казулька, Дацкевіч, Мазгова? «Вы не пацвердзілі сваю просьбу пісьмова», — без прабачэнняў адрэзаў старшыня Нацыянальнай камісіі.

«Добра, я зраблю гэта сёння. Зараз жа».

*** Ліст у Пушчу.

«Даводжу апошнюю інфармацыю, якую атрымаў ад У. Шчаснага.

18 сакавіка з 12.30 да 13.30 (!) плануецца Сустрэча экспертаў з грамадскасцю, якая цікавіцца праблемамі Пушчы. Я высвятляў: сярод «запрошаных» — людзі, якія не ўсе пра гэта і ведаюць. Напрыклад, Сухій, Швяцоў, Шырокаў, Каралёва, Казулін. У спісе ёсць і я. Аднак няма Смактуновіча, Казулькі, Дацкевіча, Мазговай (яны замаўляліся тры месяцы таму). Запрашальны ліст, які я атрымаў сёння пасля гаворкі з У. Шчасным, Вы пачытаеце.

У гаворцы я настойваў на Вашай прысутнасці, на што чыноўнік параіў даслаць на ягоны электронны адрас альбо факсам Вашу асабістую адносіну (магчыма, і калектыўную, але пажадана са спасылкай на сяброўства ў TERRA-Канвенцыі) з прапановай узяць удзел у Сустрэчы...

У нас ёсць колькі дзён, каб абмяняцца думкамі — спакойна і разважліва. Справа не ў тым, чаго *мы чакаем* ад гэтай сустрэчы, а ў тым, што *заставацца ў баку нельга*. Вы абавязаны там быць і мець годнае слова. Мяркую, мы здолеем дамагчыся інтэрв'ю аднаго з экспертаў па выніках Сустрэчы.

Сёння ж чакаю адказу.

З павагай».

*** З Ігарам Куталоўскім (сацыяльна-экалагічны саюз «Чарнобыль») прыехалі ў Пушчу напярэдадні позна вечарам. Першай праблемай было жыллё. Па шчаслівай акалічнасці ўдалося звязацца з «умоўнай кантактнай асобай» — намеснікам міністра прырод-

ных рэсурсаў Валянцінам Малішэўскім, якога адміністратарка гасцініцы запрасіла да тэлефона. З папярэдняй інфармацыі, вельмі няпоўнай і блытанай, я мог арыентавацца хіба на яго, адзінага магчымага каардынатара Місіі з беларускага боку. Шчасны заабавязаўся прыехаць заўтра, пра іншых удзельнікаў мы нічога не ведалі. «Умоўная-кантактная-асоба-каардынатар» паспрабавала нас не прыпомніць, не заўважыць, у рэшце рэшт, наогул не прызнаць. «Хто, хто вы такія?.. Сустрэцца? Дзе і навошта?.. Я вось таксама прыехаў, падаю з ног... Пагаварыць?.. Пра што?.. Сустрэнемся ў Мінску і ўсё абгаворым, га... Абавязкова сёння? Але ж Вы і даставучы!.. Добра. Пятнаццаць хвілін — каб вы былі тут...»

Мы былі «тут» праз дзесяць.

Цяпер я мог разгледзець свайго суразмоўца, сёетое нават прыпомніць. Напрыклад, як год таму Валянцін Іванавіч даў згоду на інтэрв'ю, а перад маім з'яўленнем пакінуў кабінет, сказаў сакратарцы, што ў яго наспела паседжанне. Акурат у наш прызначаны час. Я пакінуў яму зацемку з прапановай паправіць «стылёвую» памылку. Аднак ягонае маўчанне толькі пацвердзіла маю нясмелую версію, што Валянцін Іванавіч элементарна ўцёк ад журналіста. Прычына — чыноўніцкае рабства, залежнасць ад Кіраўніцтва спраў... Але і ў гэтай прычыны свой нюанс: ён абыходзіў белавежскае пытанне...

Мы селі за светлы адлакаваны драўляны столік на другім паверсе. У праём памяшкання па чарзе зазірнулі два міліцыянты.

— Пра што Вы хацелі ў мяне спытаць, толькі коратка...

На гадзінніку было 22.10, я сказаў, што мы, як афіцыйна запрошаныя, хацелі б пачуць ад афіцыйнай асобы колькі слоў пра фармат сустрэчы, а таксама атрымаць праграму Місіі на беларускім баку.

Валянцін Іванавіч паведаміў, што праграмы ніякай не бачыў, пра Місію і фармат сустрэчы сказаў наступнае.

«Гэта іхні аб'ект, іхняя тэрыторыя. І гэта іхняе поўнае права сюды прыйсці, калі захочуць, і ўсё паглядзець, даць ацэнку».

Малішэўскі старанна артыкуляваў гэтую фразу, асабліва вылучаючы словы «іхні аб'ект», «іхняя тэрыторыя», «іхняе права». Пастулат паўтараўся ў мностве варыяцыяў. Пэўна ж, невыпадкова.

Мэты Місіі, з падачы Малішэўскага, *абмяжоўваліся* менавіта кавалачкам Пушчы, так званым ядром. Гэта азначала, што і гаворка заўтра можа ісці пра *гэтую*, досыць мізэрную частачку Вялікага лесу, якая занесена ў Спіс усясветнае спадчыны. Гэта азначала, што і абмеркаванне праблемы, зыходзячы з «іхняга аб'екта», «іхняй тэрыторыі», мусіць звузіцца да кавалачка, «які ніхто не чапае».

У гэты прымітыўны спосаб, у гэтую клетку з драўляных дручкоў спраўнік Лучкоў і «кадр» з валожынскай вертыкалі хочуць запакаваць наша разуменне праблемы.

Цікавімся ў Валянціна Іванавіча, ці гарантаваны ўдзел у Сустрэчы прадстаўнікоў мясцовай грамадскасці — тых, хто захоча прыйсці. «Думаю, праблемы не будзе», — адказаў  Малішэўскі.

Спыталі пра начлег — «У гасцініцы месцаў няма».

На выхадзе пры дзвярах яшчэ ўсё стаялі міліцыянты. Спытацца, каго яны ахоўваюць, ужо не выпадала: дзесьці астывала вячэра, на якую Валянцін Іванавіч яўна спазняўся.

*** Спіс арганізацый, якія былі запрошаны, не патрабуе глыбокага аналізу на іх лаяльнасць да ўладаў: гэта спіс «акрэдытаваных» пры Міністэрстве прыродных рэсурсаў паводле адпаведнай сумяшчальнасці (НГА і ўладнай бюракратыі). Я не хачу каго-небудзь пакрыўдзіць з калегаў альбо прыменшыць іх значнасць, але мушу глядзець на рэчы рэальна. Ніводная з гэтых арганізацый апошнім часам не выяўляла вымоўнай заклапочанасці станам біялагічнай спадчы-

ны Пушчы, а некаторыя наадварот, дагаджаючы ўладам, імкнуліся не заўважаць экалагічных бедаў, якія чыніліся трымальнікамі парка. Усе арганізацыі да таго ж мінскія, нібыта ў рэгіёнах, найперш у Берасці і Гародні, яны вымерлі. На Сустрэчу з ліку запрошаных прыехаў у рэшце рэшт эколаг-ландшафтнік Ігар Куталоўскі ды я.

*** Спыніліся ў доме Смактуновічаў. Разумею, што гэтыя турботы для іх сям'і ўжо наўрад ці патрэбныя. І без таго праследу хапае.

Аднак прымаюць ахвотна і ветліва, хоць і ахвярна. Тры гады як Яўген без працы ў лесе. Ганна вымушана была змяніць спецыяльнасць, пайсці на працу ў банк. Змаганне за Пушчу марна для іх не праходзіць, адміністрацыя тут жа знаходзіць спосаб адпомсціць. І з'яўленне ў доме «непажаданых» людзей, далучэнне да незалежнай думкі, дэманстрацыя самастойнасці і трываласці — усё разам каштуе Смактуновічам і спакою, і сталага ладу. Асабліва тут, у глыбокай аселіцы.

Размеркаванне акцэнтаў. Кожны будзе казаць слова. Актыўна падключаецца і Куталоўскі, лес — ягоная спецыяльнасць, а ўпершыню пачутае ім слова «пушчанцы» надае Ігару змястоўнага імпэту.

Урок этыкі... Георгій «самастойна», неяк збоку і ўпотай падрыхтаваў тэкст (асаблівае меркаванне), каб перадаць яго экспертам *ад сябе асабіста*. Але справа не ў асабістым. «Там будзе стаяць Ваш подпіс, — звярнуўся я да Г. К., — хоць у сваім меркаванні Вы пераказалі шэраг пазіцый, якія ўпершыню выразна былі замоўлены ў калектыўных зваротах незалежнай грамадскасці: у Раду Еўропы, ЮНЭСКА, а таксама ў нашых леташніх патрабаваннях. Лічу, Вы зрабілі не лепшым чынам. Вы не заўважылі, як прысвоілі чужое, хоць лепш было б сваё дадаць да калектыўнага, і гэты ліст падрыхтаваць разам, з папраўкамі, з улікам заўтрашняй сустрэчы. Я прапаную Вам так зрабіць. А мы падтрымаем...»

Частковы кампраміс: усе падпісваемся пад тэкстам, але ўжо нічога ў ім не мяняем.

*** На варотах у парк нарад міліцыі і ахова. 8.15. Паказваю запрашэнне, пасведчанне журналіста. Не прапускаюць. «Чакайце спецыяльнага дазволу». Высвятляецца, што ёсць загад мяне не прапускаць на тэрыторыю парка да пачатку Сустрэчы...

З раніцы ўдзельнікі Місіі на аб'екце. Ацэнка ягонага стану — ці не самая галоўная задача міжнародных экспертаў. Які падбор інструментаў дзеля яе выканання ў сённяшняй практыцы светна вядомых арганізацый? Калі мы кажам: кантраляванасць тэрыторыі Спадчыны ў рэшце рэшт ёсць цалкам праблемай краіны-трымальніцы, яе грамадства і каштоўнасцяў, якія яны выбіраюць, дык маем на ўвазе і тое, што *гэткая* Спадчына вартая самых бездакорных і дасканалых ацэнак, крытэрыяў і падыходаў супольнае практыкі, на якія мусім раўняцца ўсе *без выключэння*.

Раніцай Яўген Смактуновіч паведаміў пра Сустрэчу з экспертамі ўсім, хто мае крытычную думку на стан спраў у Пушчы (вядома ж, сярод камянюкоўцаў) і хто папярэдне даў згоду. Сёння пацвердзілі свой намер толькі двое — пенсіянеры Ніна Каляда і Вадзім Сіняк. На Алену Мазгову, якая яшчэ гадзіну таму збіралася браць удзел, нечакана «наехала» праверка з раёна. Стан здароўя прымусіў засцерагчыся ад непажаданых сітуацый Уладзіміра Дацкевіча. «Калі што, скажаце за мяне, маю пазіцыю Вы добра ведаеце... Хто прыдумаў гэту жахлівую схему — разбіць Лес на зоны? У ядры няма пушчанскага набору. Гэта нейкі абсурд, поўная недарэчнасць. Якая, прабачце, запаведная зона! Там няма чаго ўзяць — вось і ўся палітыка нашых прыродаахоўнікаў, гэтых жулікаў і верхаглядаў. Праблема Пушчы не ў гэтым кавалачку, дзе «нічога не чапаюць», праблема ў тым, што на ўсёй астатняй тэрыторыі Пушчы не спыняецца жорсткая эксплуатацыя... Скажыце ім гэта».

Добра, Уладзімір Апанасавіч, я скажу, Вы толькі трымайцеся!

12.15. З Мінску прыехалі Шчасны, Нікіфараў, Пугачэўскі ды іншыя. Ласкава, ужо зусім па-вясноваму свяціла сонца. Спадар Шчасны выйшаў за шлагбаўм, без паліто, у адным пінжаку, расшпіленым на ўсе гузікі. Прайшоўся да рэчкі Лясной і хутка вярнуўся. «Запрошаных не прапускаюць на тэрыторыю парка. Вас не шакіруюць такія парадкі, Уладзімір Рыгоравіч?» «У 12.30 прапусцяць, не хвалюйцеся», — адказаў пасол па асаблівых даручэннях.

Сустрэча пачалася з затрымкай на дзве з паловай гадзіны. Увесь гэты час старыя людзі — Вадзім Сіняк і Ніна Каляда, а з імі Яўген Смактуновіч і Георгій Казулька — адстаялі ногі каля варотаў пад наглядам міліцыі. Нават калі пачалася Сустрэча, у перапоўненай залі не было толькі іх: ахова чакала адмысловага загаду. Малішэўскі, нягледзячы на мае настойванні забяспечыць прысутнасць людзей, распачаў Сустрэчу. Я мусіў узняць «працэдурнае пытанне» і нечакана ўзяў слова.

З дыктафона:

*Малішэўскі.* — Абаждзіце...

*Дранчук.* — Гэта вельмі важнае пытанне, якое нам трэба вырашыць, — удзел мясцовых жыхароў у нашай гаворцы. Яны ўжо тры гадзіны стаяць і чакаюць. Мы павінны зараз прыняць рашэнне, будуць яны запрошаны сюды або не.

*Малішэўскі.* — Дайте представить, кто у нас есть.

*Дранчук.* — Не менее важно, кого сейчас нет, господин Малишевский. Вы обещали обсудить и решить этот вопрос. Люди ждут Вашего решения. Если вопрос не будет решен, мы сделаем отдельное заявление. Мы — это представители независимых общественных организаций...

*Малішэўскі.* — Извините, дайте я закончу по процедуре... Итак. У нас присутствуют представители:

«Экодом», Анатолий Швецов и Ирина Сухий... Их нет, они не присутствуют? Дали заявку, но не приехали... Белорусский социально-экологический союз «Чернобыль», Игорь Куталовский. Ассоциация по защите птицы (маецца на ўвазе ГА «Ахова птушак Беларусі» — *В.Д.*), Михаил Ефимович Никифоров. Присутствует здесь организация «TERRA-Конвенция», господин Дранчук. Также Национальный комитет «МАБ», Наталья Максимовна Рыбинец. Белорусское общество лесоводов, Александр Викторович Пугачевский, наш ученый. Кого еще не назвал? «Экополюс»... и... кто еще? «Экологическая инициатива», Алексей Геннадьевич Артюшевский. Все? Тогда позвольте продолжить нашу встречу. Слово предоставляется...

*Дранчук.* — Извините, но мы так и не решили... *(Малішэўскі перабівае, просіць паважаць экспертаў і ўсіх прысутных)*. Я уважаю... Но я даю отчет себе в том, что происходит. Вы хотите все замять. Рассадили здесь полный зал бюрократии, а люди, которые сюда пришли по своей доброй воле, вон они, видно в окно, местные жители, также имеющие право голоса или послушать, стоят и ждут уже третий час — это что, уважение к ним?.. Я вынужден обратиться к Вам, господин Грабнер и господин Фландер. Мы благодарим Вас. Но дальнейшее наше участие сегодня становится вряд ли возможным. Если Вы согласитесь, если это возможно, мы просили бы встречи с Вами завтра, в любое время.

*Грабнер (з разуменнем).* — Да, это возможно...

Бадай, першы, хто адчуў пагрозу спланаванаму ходу Сустрэчы, быў Шчасны. Дагэтуль непрыкметны, у шэрым пінжаку, ён нечакана падняўся з залы і рушыў у прэзідыум, штосьці шапнуў Малішэўскаму і Лучкову і сеў на месца. Пасля кароткай дарадчай паўзы Малішэўскі мусіў такі даць «адмашку»: «Пусть заходят»...

Я выйшаў з будынка і ўбачыў, што мае «падабаронныя» паволі рушылі ў... процілеглы бок. Я дагнаў

і ледзьве ўгаварыў іх вярнуцца. Стомленыя прыніжэннем, знявераныя, людзі страцілі апошнюю надзею. Тут рашучую пазіцыю заняў Г. Казулька: «Мы павінны стаяць да канца. Інакш гэта несур’ёзна».

Слова далі эколагу з Германіі Улі Грабнеру (Маскоўскае бюро ЮНЭСКА). Ён першым чынам зрэагаваў на сітуацыю напружання і новых прысутных у зале. «Я вельмі рады, — сказаў ён, — што нарэшце кожны можа выказацца. Я не думаю, што з-за гэтага могуць быць якія-небудзь пагрозы або складанасці... Жывы абмен думкамі, хай сабе часам крыху канфліктны, толькі насычае дыскусію...» Яго падтрымаў і калега з Фінляндыі Юка-Пека Фландэр (Міжнародны саюз аховы прыроды). «Мы зусім мала часу прабылі на аб’екце і нам вельмі цяжка будзе даць дакладную ацэнку яго стану. Таму я адкрыты для дыскусій, якія датычаць праблемы захавання і абароны тэрыторыі сусветнай Спадчыны».

Замежныя калегі дэманстравалі адкрытасць, гатовасць да шчырага зычлівага дыялогу. Беларуская ўлада дзейнічала цалкам процілегла. Яе найпершай задачай было адваротнае — «дыскусію прыкрыць». Таму яе людзі (не выключаю, што рабілася ўсё даволі сістэмна, былі падключаны «прафесіяналы») употай ставілі пасткі, чынілі пераслед, напускалі псіхозу. У залі — гэта было фае музея, дзе расставілі крэслы і змастачылі страхотны прэзідыум з чырвоным абрусам, — панавала цяжкая энергетыка, адчувалася атмасфера ўціску. Гэта прыгнятала і скоўвала ініцыятыву і ўжо ані не схіляла да «жывога абмену думкамі». Да таго ж перакладчыкі гаварылі ціха і невыразна, асобныя фразы (часам ключавыя), як падалося, перакладаліся выключна «для сябе».

Не пакідала ўражанне, што ўвесь падуладны «адміністратыўны рэсурс» быў прыгнаны сюды з-пад палкі і кінуты зараз на гэтую амбразуру — стварыць уладам «сваю» аўдыторыю, запоўніць залю «баластавай» свядомасцю, прыціснуць масай, абмежаваць доступ

апанентаў. Як мае быць, свае пазіцыі заняла ахова, у залі былі вайскоўцы, з’ехалася раённае і абласное чынавенства.

Дыскусія, свабодны абмен думкамі не ў жарт пужалі трымальнікаў Спадчыны. Прэвентыўныя захады «па недапушчэнні», іх памеры і спланаваныя дзеянні (цяжка ўсё пералічыць) яскрава сведчылі, наколькі непажаданая тут альтэрнатыўная думка, незалежны погляд на сапраўдны стан сённяшняй Пушчы, непасрэдны кантакт з экспертамі.

Не менш адметнымі ў гэтым кантэксце выглядаюць і два выступы гэтак званай зялёнай грамадскасці. Чаму «гэтак званай»? Таму што ні «наш ученый» А.Пугачэўскі (Беларускае таварыства лесаводаў), ні М.Нікіфараў («Ахова птушак Беларусі») не з’яўляюцца, вобразна кажучы, «чыстымі» прадстаўнікамі грамадскага сектару. Абодва на дзяржаўнай працы, займаюць кіраўніцкія крэслы ў Нацыянальнай акадэміі навук, дзе, як вядома, прэзідэнта ўжо не выбіраюць, а прызначаюць. Абодва, так бы мовіць, з наменклатурнай абоймы.

У лепшым выпадку яны прадстаўлялі на Сустрэчы навуковую грамадскасць, але ніяк не «зялёную». Яны гулялі паводле правіл, распісаных і распланаваных Кіраўніцтвам спраў прэзідэнта. Мне лёгка запярэчыць. Я гатовы ўсумніцца і сам. Таму карыстаюся паслугамі дыктафона, каб засведчыць некаторыя *знакавыя асаблівасці* іх выступленняў. Чытаць, вядома, трэба ўважліва... На якой мове яны гавораць? Толькі не на мове прыроды... Яны знаходзяць годныя выразы і абароты, за якімі не ўбачыш прафесіянальнае здрады. Яны вельмі кантралююць сябе, каб словы ўмацоўвалі іхнія крэслы, а не пазіцыі прыродных вартасцяў. Гэта надзвычай важна, на якой мове сёння гаварылі А.П. і М.Н.

*А. Пугачэўскі.* (...) В контексте Миссии экспертов я не вижу большой проблемы на сегодняшний день в сохранении самого Объекта мирового насле-

дия. На этой территории режим соблюдается. Здесь возникает проблема понимания, что такое угроза этому объекту. Если вспышка массового размножения вредителей леса — это угроза, то она существует. Но угроза, созданная изменением природных условий.

Другое дело, что на сопредельных территориях мы действительно можем говорить о неадекватном менеджменте. Плохом или не очень хорошем, может быть, и хорошем — об этом есть много мнений. И мое мнение, оно тоже не единственное. Я считаю, что лесохозяйственная деятельность, которая реализуется в национальном парке, она сейчас неадекватна ситуации. Слишком активны рубки, они не подобны природным и, может быть, еще большая проблема — не совсем адекватные меры по лесовосстановлению. Но это, повторяю, моя точка зрения. И здесь долг не только тех, кто работает в Пуще и ею руководит, но и долг ученых, и, видимо, общественности — разработать и разрешить эту проблему, чтобы пущанцы знали, что делать. Насколько я понимаю, они готовы поступать правильно, но не знают, как поступать правильно. А учитывая определенные особенности нынешнего генерального директора как очень активного человека и активного руководителя... (он пытается сделать и очень активно пытается сделать так, как считает правильным, возможно, он прав, возможно, не прав, но тут нет, к сожалению, единого мнения ни у наших ученых, ни у хозяйственников, ни у польских специалистов, ну и тем более нет согласия между всеми названными категориями и общественностью зеленых: экологами, экологистами, зелеными движениями), тут трудно однозначно ответить. Но, повторяю, если целью сохранения Объекта мирового наследия является сохранение естественной динамики вот этой части Беловежской пущи, если так, то проблемы в границах этого объекта, в общем-то, не существует.

*М. Нікіфараў*. (...) Мы должны сегодня ставить вопрос: достаточно ли этой территории — абсолютно заповедной зоны, чтобы сохранить Беловежскую пущу как таковую, поскольку мы знаем, что процент этой зоны достаточно небольшой? Это раз. Во-вторых, оставшаяся часть пущи, она тоже не менее ценна, то есть, там есть участки, ...имеющие не меньшую ценность и по возрасту, и по происхождению, и по своему генезису, и так далее. Безусловно, больше всего проблем как раз с этими территориями, которые как бы в меньшей степени находятся под охраной. Ну, исходя из своего статуса. Они могут попадать, наверное, в зону частичного или регулируемого использования, либо в зону еще какую-то, в рекреационную даже, я точно не знаю. Поэтому, мне кажется, проблема сохранения Беловежской пущи и решение этой проблемы все-таки в увеличении абсолютно охраняемой территории до уровня, до размеров, которые гарантированно сохранят Беловежскую пущу как объект именно векового леса в центре Европы, девственного леса, самовозобновляемого  и так далее.

Платформа абодвух прамоўцаў тут відавочная. Аднак гэты жэст — на пашырэнне абсалютнай запаведнай зоны, агучаны вельмі выразна ў якасці альтэрнатывы, не можа ўспрымацца як паслядоўны і шчыры. На жаль, пра гэта таксама трэба казаць — аддзяляць, так бы мовіць, авец ад козлішчаў.

Прыняць сёння гэты пасыл як далучэнне да «рэзалюцыі-SOS» было б усё адно што страціць памяць... Шмат гатовых гэта зрабіць... Але «рука добрай волі», працягнутая з калідораў улады, яшчэ не знак добрых намераў.

Колькі гадоў (!) Кіраўніцтва спраў, Мінпрыроды як не заўважалі гэтай *відавочнай неабходнасці*, якую настойліва, грукаючы ў дзверы, дэлегавала грамадская ініцыятыва. Яны выконвалі знішчальны праект, які і пацягнуў за сабой увесь злавесна-скандаль-

ны набор сродкаў — высокапрадукцыйную пілараму за вокнамі адміністрацыі, караеда-спусташальніка, вахты наёмных лесарубаў, масавыя звальненні пушчанцаў і інш. Ім было не да пашырэння запаведнай зоны. І «нашы вучоныя» — Аляксандр і Міхаіл — тады не ў кароткіх штоніках бегалі, а займалі ці не тыя ж пасады… Як тут пра гэта не казаць…

Палітыку (тактыку) замоўчвання праблемы Белавежскай пушчы ўлада пад націскам той жа грамадскасці (лакальнага руху «зялёных») змяніла на перахоп грамадскай ініцыятывы… Яшчэ год таму КС прэзідэнта хавалася ад праўды, сёння хаваецца ад адказнасці за цяжкі стан запаведнай тэрыторыі, месца ўсясветнай Спадчыны. Адбылося гэта толькі таму, што грамадскасць здолела разамкнуць «злыднева кола», расставіла акцэнты так, што гэтую адказнасць трэба несці не каму-небудзь, а прэзідэнцкім гаспадарнікам, і несці не перад прэзідэнтам, а перад міжнароднай супольнасцю.

На адной сцяне фае, за прылаўкам сувенірнай крамы віселі шкуры жывёл на продаж. На нейкі час продаж спынілі з этычных падставаў (катэгарычна супраць выступала наша газета), аднак гэты след жывадзёрства зноў тут узнік. Сцяна была акурат насупраць «чырвонага прэзідыума», і я не ведаю, што маглі думаць пры гэтым, хай сабе вельмі беглым, сузіранні Грабнер і Фландэр.

У залі не спадала напружанне. Асабліва я адчуў гэта, калі мне далі слова. Адразу сказаў пра тое, што пытанні захавання і абароны Спадчыны складалі адметную фарбу тэматычнага спектра газеты «Белавежская пушча», якую выдаю з 1995 года. Газета першай звярнула ўвагу на тое, што Белавежская пушча не толькі ахоўная тэрыторыя і міжнародны біясферны запаведнік, але — і месца слыннай у свеце Спадчыны чалавецтва. Гэта, дадаў я, былі выключна вострыя публікацыі, поўныя грамадзянскай турботы,

часам падобныя да крыку Касандры. На жаль, структуры ўлады, перш-наперш Кіраўніцтва спраў, трымаліся зусім іншага курсу — на камерцыйна-гаспадарчае асваенне гэтай запаведнай тэрыторыі — і грамадскую думку цалкам ігнаравалі.

«Сёння, — сказаў я, — у адрозненне ад некаторых папярэдніх прамоўцаў я паспрабую называць рэчы так, як яны ёсць, і не хавацца ад праўды. Я хацеў бы, каб Вы, спадары эксперты, сапраўды зразумелі, з чым маеце справу ў беларускай частцы Белавежскай пушчы.

*Першае.* Тут ігнаруецца статус біясфернага запаведніка і аб'екта ўсясветнай прыроднай Спадчыны. Растлумачу, што гэта значыць. Гэта значыць, што невялікі лапік дзікай прыроды, якую мы кантралюем як Спадчыну, знаходзіцца пад уціскам некантраляванага, няўстойлівага, я б сказаў, дзікага прыродакарыстання.

Узяты жорсткі курс на эксплуатацыю Пушчы, на атрыманне прыбыткаў за кошт запаведных біялагічных запасаў.

Укараніліся эксплуатацыйныя нормы гаспадарання, Пушча канчаткова ператварылася ў аб'ект прамыслова-тэхнічнага выкарыстання.

Пашыраецца вытворчая і паляўнічая база за кошт навуковай, культурна-адукацыйнай і рэкрэацыйнай.

У штодзённай практыцы адсутнічаюць прыродаахоўныя крытэры, няма юрыдычнага кіраўніцтва — праўнага Палажэння аб нацыянальным парку, якога вымагае закон.

Пануе валюнтарызм кіравання.

Маюць месца прамыя парушэнні артыкулаў Канвенцыі 1972 года.

*Другое* — экалагічныя пагрозы. Назіраецца гідралагічны заняпад, збядненне біяразнастайнасці, распад дрэвастояў, антрапагенная эрозія. Навуковыя даследванні не скіраваныя на хваробныя працэсы, якія абвастрыліся ў апошнія гады.

Лесаўзнаўленне вядзецца метадамі і сродкамі, якія

несумяшчальныя з месцам прыроднай Спадчыны.

Штат навуковага аддзела не здольны вырашаць задачы адэкватна статусу Пушчы і яе стану.

*Трэцяе.* Абвастрыліся сацыяльныя праблемы на тэрыторыі парка. Пра гэтыя беды, спадзяюся, скажуць самі жыхары, якія прыйшлі сюды са сваімі крыўдамі і меркаваннямі. Скажу толькі... Шмат звальненняў, дыскрымінацыя. Парушаюцца правы карэнных пушчанцаў, кадравая палітыка ставіць на наёмную працу, дэманстратыўна ігнаруючы мясцовы рэсурс.

І *апошняе*. Усё, што я сказаў, непасрэдна датычыць прадмета гаворкі — захавання і абароны ўсясветнай Спадчыны, з'яўляецца несумяшчальным — ні біясферна, ні канцэптуальна — з месцам прыроднага помніка. Штучна створаныя межы — гэта Спадчына, гэта не-Спадчына — не павінны нас заспакойваць, прытупляць наша стаўленне да ўсяго, што адбываецца вакол невялічкага кавалачка вялікага суцэльнага лесу. Ізаляцыя гэтая выгадная тым, хто нажываецца з Пушчы.

Таму яшчэ год таму, у лютым 2003 года мы, актывісты ініцыятывы «TERRA-Канвенцыя», выставілі шэраг патрабаванняў да ўрада і трымальнікаў парка. Асобныя з іх мушу нагадаць зараз дзеля канструктыву далейшай гаворкі:

спыніць у Белавежскай пушчы гаспадарча-эканамічную дзейнасць, якая супярэчыць закону «Аб асабліва ахоўных прыродных тэрыторыях», шэрагу міжнародных Канвенцый, умовам і рэкамендацыям Дыплома Еўропы,

давесці плошчу абсалютна запаведнай зоны да мінімальных памераў — 50 працэнтаў тэрыторыі Пушчы — і вышэй (*даведка:* сёння менш як 18%),

распрацаваць і перадаць на суд грамадскасці План устойлівага кіравання Пушчай да 2020 года.

Хачу перадаць экспертам таксама асаблівае хадайнічанне ці, лепш сказаць, звярнуцца з трымя просьбамі непасрэдна ў Камітэт па Спадчыне:

наладзіць незалежную экспертызу стану Белавежскай пушчы як м е с ц а ўсясветнай прыроднай Спадчыны і помніка прыроды;

паводле вынікаў экспертызы разгледзець пытанне аб мэтазгоднасці пераносу Белавежскай пушчы ў *Спіс усясветнай спадчыны, якой пагражае небяспека*;

падтрымаць ініцыятыву экалагічнай грамадскасці Беларусі аб стварэнні незалежнай Назіральнай рады па пытаннях стану і нацыянальнага захавання Белавежскай пушчы».

Што казалі астатнія... Г. Казулька вылучыў думку, што менавіта астатняя Пушча патрабуе ўвагі і аховы як патэнцыяльная каштоўнасць... «Калі не захаваць гэтыя тэрыторыі, мы страцім патэнцыял Пушчы». А колькі ўжо страцілі!

І. Куталоўскі гаварыў пра неабходнасць зберагчы саміх пушчанцаў, так бы мовіць, этнічны патэнцыял Пушчы, яе адметныя традыцыі. Гэта таксама спадчына і каштоўнасць, да якіх патрэбен падыход і навуковыя ацэнкі, але найперш — разуменне, павага з боку дзяржавы, структур улады. Спакойна і досыць выразна давёў пра нездаровы сацыяльны клімат у пушчанскім асяроддзі і метады адміністрацыйнага ўціску. Прагучала сентэнцыя кшталту: «Белавежская пушча — індыкатар устойлівага развіцця краіны: ці ёсць устойлівасць, або яе няма — відаць з Пушчы».

Шкада, не сказаў слова Я.Смактуновіч. Яму было што сказаць, чым падзяліцца. Разумею: абставіны не спрыялі — шмат мясцовай бюракратыі, людзей, з якімі блізка знаёмы і якія цяпер так ад цябе далёка... Раптам здаецца сумнеўным, што слова тваё мае сэнс і вагу...

Пенсіянеры Н. Каляда і В. Сіняк, якія прыйшлі на Сустрэчу з трывогай за лёс Пушчы і яе людзей, таксама змаўчалі... Аднак я рады, што яны прыйшлі, шмат пачулі і падалі прыклад іншым сваёй апальнай прысутнасцю...

Не выступіла Валянціна Фралова, дырэктарка Камянюкскай школы, дэпутат райсавета. Яе пазіцыя, педагагічнае стаўленне, ацэнкі як дэпутата маглі быць вельмі станоўча ўспрынятыя. На жаль, не паднялася, не сказала... Няўжо дапускае, згодная з тым, каб тэрыторыя нацыянальнага парка развівалася так, як развіваецца сёння? Няўжо яе вучні гатовыя прыйсці працаваць у Пушчу, ведаючы, што іх чакае? Рытарычныя пытанні...

«Начальнік чырвонага прэзідыума» В. Малішэўскі звяртаецца да залі, ці ёсць пытанні. На твары добра прапісанае жаданне... І — тыповая з’ява: усім усё ясна.

Не, пачакайце. Задаю пытанне М. Бамбізе (каб і эксперты паслухалі, і прысутныя): «Чаму няма Палажэння пра нацыянальным парк — наўзамен ушчэнт састарэлага, датаванага аж 1992 годам?» Каментую пры гэтым дзеля экспертаў: за дванаццаць гадоў адбыўся такі заканадаўчы прарыў, што прыкрывацца старым Палажэннем можна хіба што пры лютай нянавісці да прававых нормаў. І «начальнік Пушчы» тут жа пацвярджае гэта, кажа: «Канстытуцыя ЗША дзейнічае 300 гадоў, але гэта не замінае ім весці разбой ва ўсім свеце...» Пасля дадае: «Новае Палажэнне ёсць, на разглядзе ў міністэрстве...» Гэта ж самае чуў я ад Бамбізы роўна год таму на прэсавай канферэнцыі.

Яшчэ звяртаюся да Бамбізы. «Вось Вы давялі нам пра перспектывы экалагічнага турызму ў Пушчы. Але на чым грунтуецца Ваш дзіўны аптымізм, калі ўслед сказалі пра генеральны курс на «ўборку сухастойных дрэў», на санітарны стан і парадак... У натуральным лесе. Як гэта сумясціць: Вашы падыходы на прыбіранне (а гэта не што іншае, як лесанарыхтоўкі), суцэльныя санітарныя рубкі, месячныя ландшафты — з экалагічным турызмам?»

Адказ бестурботны: «Вось і будуць прыязджаць да нас і глядзець на месячныя ландшафты». Маўляў, чым не люботы.

На прапановы павялічыць запаведную зону з меркаваным залучэннем новых тэрыторый да Спадчыны эксперты адрэагавалі аднолькава. «Гэта не рашэнне ЮНЭСКА, гэта рашэнне вашых краін. Такая магчымасць не выключаецца, калі тэрыторыі «прырастання» будуць адпавядаць патрабаванням Канвенцыі», — сказаў Улі. І дадаў, што гатовы парадавацца, калі ўсё будзе так. Гэта ж паўтарыў і ягоны калега. «Тое, што мяркуецца далучыць, мусіць адпавядаць трэцяму крытэру Канвенцыі».

На колькі гадоў мы спазніліся? І ці *спазніліся*? «Трэці крытэр» — наш рахунак уладам... Там нашы нацыянальныя страты, там уладны вандалізм, лесазнішчальны праект, чарговая «дрымучая справа» ў Пушчы.

Які «крытэр» спаўняла ўлада цягам дзесяці год?..

Нашы, нашы праблемы. Грабнер даў зразумець, хоць і вельмі нязграбна артыкулюючы свае думкі паруску, што задача Місіі не можа ахапіць усё, што нас сёння хвалюе. «Вельмі шмат каментароў,— сказаў ён,— датычаць прадметаў, якія Місія не павінна і не будзе ацэньваць».

*** Раніца другога дня. Інтэрв'ю ў Фландэра, пра якое дамовіліся ўчора.

Да эксперта Міжнароднага саюза аховы прыроды ў мяне чатыры пытанні. Галоўнае — наколькі будзе ўважаны пры разглядзе пытання ў Камітэце ф а к т а р п а г р о з а ў белавежскай Спадчыне і ці стае двух дзён, каб ацаніць меры садзеяння выкананню Канвенцыі, захавання і абароны Спадчыны на беларускім баку? На сустрэчу ахвотна выбраўся і І.Куталоўскі.

8.20. «На варотах» шчыльны кардон: нарад аховы на чале з начальнікам С. Дзягелем, два міліцыянты. Перамовіліся. З першых слоў зразумела: гэта абсалютна фізічная сіла, фізічны бар'ер. Яны пастаўлены, каб мы засталіся на гэтым баку. Загадана не пускаць. Выг-

лядае няёмка, але зноў такі мушу заўважыць: высвятляецца, што загад датычыць выключна мяне.

«Трэба было прызначаць сустрэчу на варотах»,— крыху празаічна, затое зусім разумна заўважыў Ігар. «Добрая мысля... — сумна даю згоду. – Але ў мяне, Ігар, відаць, птушыны розум. Быццам не хаджу па зямлі...»

Прыгадваю, як некалькі год таму, у зазімак я вырашыў прайсціся па пушчанскім бальшаку да самай мяжы, паглядзець на «калючы дрот». Мне пашанцавала, я прабыўся сам-насам з тым дротам каля гадзіны ці болей. Сфатаграфаваў, з'еў бутэрброт, пасядзеў на пяньку. А па дарозе назад, крыху блукаючы, набрыў на жалезныя вароты, за якімі служывы падмятаў сцежкі. Гэта была «пагранзастава». Мяне заўважылі, правялі да начальства, а пасля высвятлення ды нязлоснае гутаркі адпусцілі. Што было б сёння – вялікае пытанне.

Гэта дарэчы, на тое, што падумаў Ігар: інтэрв'ю, маўляў, на нейтральнай паласе, праз «дрот» і шлагбаум, пад наглядам аховы... І на тое, што сёння Беларусь і Польшча акурат спрабуюць дамовіцца наконт межавых разгародак – адкрыць Пушчу звярам, даць магчымасць хадзіць ім па сваім доме без перашкодаў. Пушчанцы сведчаць: бывалі выпадкі, калі жывёлы ахвярна ламалі шыю, ногі, хрыбет у няўкорным гарачым парыве адолець заслону з «калючкі». Гэты архіважны праект – Пушча без межаў – таксама абмяркоўваўся ў рамках Місіі...

У сотні метраў ад нас мы ўбачылі зачаканага ўжо Юка-Пека Фландэра. Было 8.40. Я голасна паклікаў яго і памахаў рукою. Начальнік шлагбаўма С.Дзягель падбег да мяне і ў лютай ярасці заматлашыў рукамі. Аперацыя па ўтрыманні магла стаць непрадказальнай. Мяне засланілі цесным кальцом і вомегам падагналі «варанок»...

Я не магу ўявіць, што падумаў калега з Фінляндыі, назіраючы гэтую, хутчэй за ўсё незразумелую яму

сцэну… Паміж намі быў дрот. Нябачны як радыяцыя. На які натыкаешся розумам, а не целам. Птушыным розумам. Можа, едучы сюды, і трэба было б забыцца, што ты чалавек. І глядзець навокал іншымі вачыма. Але…

Працытую, што вельмі дарэчы: «У каго на зямлі больш надзейнае, вечнае месца – у чалавека альбо ў іх: у птушак, пчолаў, майскіх жукоў, раслінаў? Можна было б навучыцца гэтаму (іхняму – *В.Д.*) імкненню да выжывання. Трэба было б навучыцца таму, што ведаюць яны, што хаваюць яны ў сваёй памяці, у сваёй культуры, у сваёй цывілізацыі…». *Святлана Алексіевіч*. З іншага поваду, з іншага месца. Але насамрэч, едучы сюды, у Белавежскую пушчу, я хацеў бы, вельмі хацеў бы, дабіраючы элементарнага сэнсу, разумець і адчуваць *іхнюю* цывілізацыю, *іхнюю* культуру…

*** Ліст у Прадстаўніцтва Беларусі ў ЮНЭСКА. Копія ў 10 іншых інстанцый:

«22 сакавіка 2004

Сянько У. Л.

Паважаны Уладзімір Лявонавіч!

Даводзім да Вас звесткі, на падставе якіх Вы можаце больш аб'ектыўна скласці ўяўленне і меркаваць пра краіну, якую прадстаўляеце ў свеце.

18 і 19 сакавіка г.г. па запрашэнні старшыні Нацыянальнай камісіі па справах ЮНЭСКА спадара Шчаснага ў рамках Місіі ЮНЭСКА/МСАП мы знаходзіліся ў нацыянальным парку і біясферным запаведніку «Белавежская пушча».

Мы былі запрошаныя на Сустрэчу экспертаў Місіі з прадстаўнікамі незалежнай беларускай грамадскасці (афіцыйнае запрашэнне сп. Шчаснага перасылаю Вам дзеля пэўнасці).

(…)

На працягу двух дзён свайго перабывання ў нацыянальным парку мы сутыкнуліся з жорсткім пера-

следам, парушэннем нашых правоў і абмежаваннем элементарнай свабоды перамяшчэння ў тым месцы, куды нас афіцыйна запрасілі.

Наш доступ на тэрыторыю нацыянальнага парка быў звужаны да гадзіны часу — з 12.30 да 13.30 18 сакавіка.

На ўязных варотах, дзе так званы «кантрольна-прапускны пункт», не пакідаючы месца, дзяжурылі тры супрацоўнікі мясцовай аховы і два міліцыянты. Яны не далі нам тлумачэнняў, чый загад выконваецца, не забяспечылі сувязь з каардынатарам Сустрэчы.

З тлумачэння начальніка аховы мы зразумелі, што пастаўлены заслон выконвае нібыта адну задачу – захаваць бяспеку экспертаў (атрымліваецца, мы, запрошаныя ўдзельнікі Сустрэчы, стваралі ім пагрозу).

На другі дзень, 19 сакавіка мы ішлі на сустрэчу з экспертам Міжнароднага саюза аховы прыроды (МСАП) спадаром Фландэрам, каб узяць у яго інтэрв'ю, на якое ён прыязна даў згоду напярэдадні 18 сакавіка. Ён выбраў для нас час да сняданку, 8.30. Аднак пра нашу сустрэчу ўжо добра ведалі, нас зноў спынілі, спаслаўшыся на загад, і заявілі, што мы не акрэдытаваныя для кантактаў з экспертамі. Я, Валеры Дранчук, паказаў пасведчанне аб камандзіроўцы і нагадаў пра свае правы журналіста і галоўнага рэдактара газеты «Белавежская пушча». Нашы довады не прымаліся пад увагу. Калі мы спрабавалі паклікаць Фландэра, які знаходзіўся непадалёку, да варотаў імгненна прыгналі «уазік», цесна акружылі аднаго з нас, учынілі фізічныя дзеянні і пагразілі прымусова адвезці «далей»...

Мяркуем, так званая Сустрэча экспертаў з грамадскасцю была старанна спланаваная прэзідэнцкай бюракратыяй выключна на сваю карысць, дзеля прыхавання злачынных дзеянняў, якія маюць месца ў нацыянальным парку і шкодзяць стану і статусу Сусветнай спадчыны. Найперш нас абураюць тыя намаганні ўлады, якія не спрыялі, а супярэчылі дыскусіі з

шырокім спектрам пазіцый, цалкам выключаючы мясцовы грамадскі рэсурс.

Трымальнік нацыянальнага парка — Кіраўніцтва спраў прэзідэнта — і Нацыянальная камісія па справах ЮНЭСКА адмовіліся даць напярэдадні падзеі прэс-канферэнцыю, маючы ад «TERRA-Канвенцыі» адпаведную просьбу.

У рэшце рэшт нам прапанавалі не ўмовы дыялогу, а сапраўдную пастку. Сцэнар афіцыйнага беларускага боку са згоды і з непасрэдным удзелам Нацыянальнай камісіі па справах ЮНЭСКА і асабіста спадара Шчаснага быў разлічаны на хлусню і дэзінфармацыю, не зважаючы на высакародныя мэты захавання і абароны Белавежскай пушчы і прыроднай Спадчыны чалавецтва.

*Валеры Дранчук*
Незалежная экалагічная ініцыятыва
«TERRA-Канвенцыя»
*Ігар Куталоўскі*
Беларускі сацыяльна-экалагічны саюз
«Чарнобыль»

КРАСАВІК

*** Тэлефанаванне з Лунінца. Школьны псіхолаг Наталля Бойка цікавіцца, як падпісацца на газету «Белавежская пушча». Ліцэй мае падшыўку выдання з даволі задаўненым апошнім нумарам, адсюль, відаць, і жаданне ўзнавіць падпіску. Карыстаю выпадак (прыемны і досыць тыповы), дапытваюся, чым прывабіла газета, што спадабалася. Словы ў адказ, як здалося, зусім маладой выхавацелькі, поўныя захаплення і ўдзячнасці. А сам, у сваю чаргу, засмучаю: упадабанае выданне перыядычна не выходзіць і падпіскі не мае. І цяжка вось так, чарговы раз патлумачыць, што аўтарскі праект прыпыніўся не толькі праз матэрыяльныя і бюракратычныя цяжкасці, якія пачалі «наязджаць» на недзяржаўную прэсу як танк, але і таму, што давялося выбіраць паміж ініцыятыў-

ным выданнем і новымі, больш мабільнымі абарончымі ініцыятывамі. Аднак... падшыўка гаворыць сама за сябе. І ўсё ж сказаў пра запланаваную кнігу, выпуск бюлетэня «TERRA-Канвенцыя» ды падрыхтоўку гадавіка «Белавежская пушча» (2004). Паабяцаў прыслаць усё для ліцэю і заадно папрасіў перадаць прывітанне маім даўнім прыхільнікам і аднадумцам — педагогам-руплiўцам «зялёнай» нівы Панасюкам і разумна клапатлівай інспектарцы «райпрыроды» Тамары А.

*** Ліст з Украіны ад Пятра Чыгоркі, арнітолага-тэрыёлага, рэдактара і выдаўца часопіса «Свята справа». Зялёны мой брат неяк хмура-мінорна піша: «Даўно не ліставаліся, а дужа не хацелася б згубіцца ў гэтым свеце. Ведаю пра барацьбу, якую ты вёў за Белавежскую пушчу. Чым усё скончылася? У наш час подлай улады надзей на перамогу надта мала...»

Год пяць-шэсць таму Пятро даслаў водгук на нашу газету, дзе былі і такія радкі: «На мой погляд, «БП» сёння — найлепшае («найкрашчэ» паводле арыгінала — *В.Д.*) з вядомых мне экалагічных выданняў постсавецкай прасторы... Асабіста мне імпануе ўсё — і структура ды падбор матэрыялаў, і дызайн, і лірычнасць...» Ліст быў змешчаны ў паласе «Кола» на мове арыгінала. Што цікава, у тым жа лісце Пятро Чыгорка ўдзячна прызнаўся, што менавіта газета «Белавежская пушча» дала яму штуршок, *надзею* на выданне бюлетэня «Свята справа», за якую, скажу ад сябе, ён люба-горача ўзяўся...

...Не ведаю, шчыра не ведаю, дружа Пятро, *«чым скончылася...»* Але ведаю, перакананы: мы не можам сабе дазволіць згубіць надзею. Нават пры гэтай ліхой непрыгоднай уладзе. У іншым выпадку нас справядліва не зразумеюць тыя, хто рушыў за намі.

А ў т а р не аспрэчвае ўсёй грэшнасці таго, што старанна і шчыра ім выкладзена ў гэтых старонках — ад першай і да апошняй, і загадзя перапрашае чытачоў, найперш сваіх апанентаў, хто гатовы папракнуць яго за празмерную адказнасць, якую ён узяў на сябе, а таксама тых, каго нечакана ахінуў ценем гэтай кнігі замест светла шчаслівага сонечнага ўзрушэння. Аўтар асабліва ўдзячны боку нязгодных за ўсе падставы і выклікі, што спрычыніліся да крытычных выказванняў і меркаванняў на абарону прыроднай вартасці. Ён жа, аўтар, ані не прэтэндуе на Яе Веліч Існіну, пакідаючы гэтае права ўсім нязгодным, але радасна сведчыць, што быў палонены неадольнай прывабнасцю Яе Велічы, і мае за апраўданне выключную пакору перад Ёю ў рэдкія імгненні існасці. Нарэшце, аўтар знаходзіць сабе адзінае суцяшэнне ў тым, што ўважае за прынцып: захаванне Прыроды ёсць справай святой.

# Пра аўтара

Валеры Дранчук нарадзіўся ў заходняй частцы Мінскай вобласці паміж Стоўбцамі і Нясвіжам на ціхай рачулцы, якая ўпадае ў Нёман. У 1974 закончыў універсітэт, атрымаў дыплом журналіста. Працаваў у раённых газетах і газеце «Звязда», у Сакратарыяце Вярхоўнага Савета і Савета Міністраў. Быў галоўным рэдактарам часопіса «Родная прырода», сябрам рэдкалегіі і вядучым грамадска-палітычных рубрык часопіса «Беларусь». У 1995 годзе заснаваў першую аўтарскую газету «Белавежская пушча». За час працы шмат разоў наведваўся ў Пушчу, вывучаў гісторыю і сучасны стан старога лесу, знаёміўся з людзьмі, браў ад іх тое, што мацавала апірышча на альтэрнатыўны рэсурс, на разуменне неабходнасці кардынальных зменаў у Пушчы.

Аўтар грамадзянскіх ініцыятываў і праектаў на абарону Белавежскага лесу: Года зубра (1997), ліста-звароту незалежнай грамадскасці ў Савет Еўропы (2002), паслання Генеральнаму дырэктару ЮНЭСКА К. Мацуура (2002) ў сувязі з невыкананнем Рэспублікай Беларусь канвенцыйных абавязкаў, умоў і рэкамендацый на захаванне біяразнастайнасці Пушчы, прэс-тураў да «месцаў здарэння» (2002, 2003), парламенцкай праверкі стану Пушчы на адпаведнасць заканадаўству (2003), альтэрнатыўных прэс-канферэнцый, шматлікіх інфармацыйных кампаній і інш.

З 2001 кіраўнік незалежнай экалагічнай ініцыятывы «TERRA-Канвенцыя».

Вольны журналіст. Друкуецца ў незалежных газетах, супрацоўнічае з радыё «Свабода» ў якасці грамадскага эксперта і аўтара перадач.

Займаецца літаратурнай і педагагічнай дзейнасцю. Аўтар праекта першага ў Беларусі Экалагічнага дзіцячага пленэра «Маляўнічая Бацькаўшчына» (у рамках заснаванай на сваёй радзіме Летняй школы экалагічнай журналістыкі і ландшафта).

Фатографік, выкладаў курс фотарэжысуры на аддзяленні журналістыкі.

Лаўрэат нацыянальнай прэміі Генры Форда «За захаванне культурнай спадчыны і навакольнага асяроддзя» (1999) і літаратурнай прэміі імя Алеся Адамовіча (Беларускі ПЭН-цэнтр, 2001).

Жыве ў Мінску. З жонкай Валянцінай мае дачку Юлію і сына Цімафея.

## Пра газету «Белавежская пушча»

Заснавана ў 1995 годзе як прыродалюбнае асветна-публіцыстычнае выданне дзеля абароны прыроднай спадчыны і ландшафтаў, інтэрпрэтацыі біялагічных і духоўна-культурных каштоўнасцяў.

Заснавальнік і выдавец Валеры Дранчук. Сумяшчае функцыі галоўнага рэдактара з выкананнем усіх рэдакцыйна-выдавецкіх абавязкаў (падрыхтоўка матэрыялаў, вёрстка, тэхнічнае рэдагаванне, маркетынг і г.д.).

Газета набыла папулярнасць, увайшла ў адкрыты інфармацыйны рынак, стала рупарам зялёнай апазіцыі. Поспех дасягнуты не толькі праз гранічна абмежаваны кошт бюджэту; ва ўмовах Беларусі пасля 1994 года выданне стала магчымым дзякуючы рэдкай прафесіянальнай самадастатковасці яго заснавальніка, аўтара і выдаўца. Кола абавязкаў, з якімі спраўляўся В. Дранчук, у іншым выпадку запатрабавала б штату і памяшкання, а гэта шматразова павялічыла б бюджэт і ў рэшце рэшт прыгожая задума засталася б чарговым пражэктам, на які «няма грошай». У дадзеным выпадку прыватная ініцыятыва дала вынік на карысць грамадству.

Выпушчаны 21 шматпалосны тэматычны нумар фармата А3, з 2000 года выданне выходзіць у часопісным фармаце з рознай перыядычнасцю.

З першых нумароў выданне выкрывала лесапрамысловыя гаспадарчыя тэндэнцыі ў дачыненні да Белавежскай пушчы, канстатавала экалагічныя пагрозы, якія набылі перманентны характар з часоў камуністычнага кіраўніцтва і асабліва абвастрыліся з прыходам да ўлады А.Лукашэнкі.

Газета першай абвясціла пра небяспеку незваротных стратаў біялагічнай разнастайнасці на тэрыторыі Белавежскай пушчы як сусветнай прыроднай спадчыны, пачала выкрываць фальшыва-хлуслівыя заявы афіцыйных беларускіх чыноўнікаў «пра небывалы росквіт» гэтай запаведнай тэрыторыі на фоне нарастаючай камерцыялізацыі, незаконных здзелак і спусташэння. Выказала рэзкі пратэст супраць размяшчэння сучаснай высокапрадукцыйнай пілармы на сядзібе нацыянальнага парка «Белавежская пушча», шматлікіх парушэнняў экалагічнага заканадаўства і ўмоў Савета Еўропы, які ганараваў Белавежскую пушчу Еўрапейскім Дыпломам.

Валеры Дранчук першым выступіў супраць камерцыйнага адстрэлу чырвонакніжнага зубра ў выпадках выбракоўкі хворых асобін, а таксама супраць продажу шкур гэтай жывёліны на тэрыторыі нацыянальнага парка.

В. Дранчук – ініцыятар шматлікіх інфармацыйных кампаній у абарону Белавежскага лесу ў беларускіх, пераважна недзяржаўных, і замежных мас-медыях, а за ягоным выданнем застаецца роля пачынальніка і стратэгічнага кампанента гэтай працяглай барацьбы, якая наўрад ці калінебудзь скончыцца.

Шэраг публікацый быў прысвечаны таксама абароне статусу асаблівай ахоўнасці іншых прыродных тэрыторый Беларусі, у прыватнасці, нацыянальнага парка «Прыпяцкі» – галоўнага рэзервата Беларускага Палесся.

Выданне надавала асаблівую ўвагу якасці і ахове ландшафтаў Беларусі па-за межамі ахоўных (запаведных) тэрыторый, першым распачало кампанію за ўразуменне ролі ландшафтаў як з’явы культурнага кшталту, за ўсведамленне таго, што сувязь культуры і самабытнага прыроднага асяроддзя недаацэньва-

ецца грамадскай думкай. Газета першай і адзінай засведчыла ў 1999 годзе надзвычайную важнасць прыняцця Еўрапейскай канвенцыі на кіраванне і ахову ландшафтаў, надрукавала шэраг іншых міжнародных канвенцый, у тым ліку Орхускую, Рамсарскую.

Выданне развівала і асвятляла экаспансорынг у Беларусі, падавала ўзоры сацыяльна-экалагічнай рэкламы, прыцягваючы нацыянальны бізнес, пераважна банкаўскі. На працягу апошніх шасці гадоў В. Дранчук вёў адпаведную рэкламную кампанію акцыянернага *Беларускага народнага банка* з выкарыстаннем разнастайнага дабору сюжэтаў экалагічнага зместу.

Газета «Белавежская пушча» адзначана міжнароднай прэміяй імя Генры Форда «За захаванне культурнай спадчыны і ахову навакольнага асяроддзя», 1999.

У 2001 годзе Беларускі Пэн-цэнтр ганараваў В. Дранчука медалём Алеся Адамовіча за публіцыстычныя артыкулы на абарону беларускай прыроды.

# Грамадскія экалагічныя ініцыятывы В. Дранчука (1998–2004)

**1998.** *Батанічна-ландшафтны заказнік «Хутар Гавязна».*

*Мэта:* ахова асяродку, дзе пасля меліярацыйных работ узнавіўся і пачаў разрастацца белакапытнік гібрыдны, занесены ў Чырвоную кнігу Беларусі.

*Удзел:* ідэнтыфікацыя расліны, абгрунтаванне намераў, прыняцце адпаведнага рашэння раённай уладай.

**2000.** *Адукацыйны цэнтр «Устойлівы хутар у цэнтры Еўропы» (батанічна-ландшафтны заказнік «Хутар Гавязна»).*

*Мэта:* заснаванне Летняй школы экалагічнай журналістыкі і ландшафта, захаванне біялагічнай разнастайнасці, інтэрпрэтацыя мясцовай культурнай і прыроднай спадчыны.

*Удзел:* кіраўніцтва, духоўнае адраджэнне хутара, курс выкладання.

**2000.** *«Нясвіж. Водна-паркавы ландшафт». Каляндар на 2001 год.* 12 аркушаў, 50х75. Тэкст па-беларуску, па-руску і па-ангельску. Наклад 1000 асобнікаў.

*Мэта:* папулярызацыя заснаванага ў 1878 годзе пейзажнага парка як прыродна-культурнай спадчыны Еўропы.

*Удзел:* ідэя, укладанне, кіраўніцтва праектам.

**2001.** *Рэспубліканскі конкурс школьных экалагічных сачыненняў у рамках грамадскай акцыі «Дзень Зямлі».*

*Удзел:* кіраўніцтва майстар-класам экажурналістыкі, вызначэнне пераможцаў у сямі намінацыях.

**2001.** *Першы экалагічны дзіцячы пленэр «Маляўнічая Бацькаўшчына» на ўлонні батанічна-ландшафтнага заказніка «Хутар Гавязна».*

*Мэта:* інтэрпрэтацыя прыроднай спадчыны і разнастайнасці краявіду ў творчасці дзяцей сродкамі выяўленчага мастацтва.

*Удзел:* кіраўніцтва праектам, супрацоўніцтва з мясцовай школай і Стаўбцоўскім аддзелам культуры.

**2001.** *Заснаванне школьнай экалагічнай газеты «Сьвятаяньнік» — першага спадарожніка газеты «Белавежская пушча».*

*Мэта:* захаванне мясцовай культурнай і прыроднай спадчыны, арганізацыя акцый на абарону прыроды.

*Удзел:* кіраўніцтва праектам.

**2001.** *Эксперыментальныя ўрокі выяўленчага мастацтва ў роднай сельскай школе.*

*Мэта:* засваенне дзецьмі прыродных вартасцяў, увага да зберажэння «звычайных» мясцовых ландшафтаў як своеасаблівых культурных аб’ектаў.

*Удзел:* аўтарскі курс выкладання, кіраўніцтва студыяй «Сьвятаяньнік».

**2001.** *Усталяванне і адкрыццё Мемарыяльнага (апакроўнага) крыжа на месцы былой смеццезвалкі — першага Знака на ахову краявідаў Беларусі.*

*Мэта:* экалагічнае выхаванне, праца з насельніцтвам, урок этыкі.

*Удзел:* ідэя мемарыялізацыі мясціны, эскіз Крыжа, выкананне работ, прыбіранне смеццезвалкі, супрацоўніцтва з мясцовай царквой, школай, раённай уладай, установамі культуры.

**2002.** *Заснаванне творчай майстэрні «ЭкаАрт» (Прырода ў выяўленчым мастацтве). Выстава-прэзентацыя.*
*Мэта:* правядзенне «прэвентыўных» пленэраў.
*Удзел:* выстава, прэс-канферэнцыя.

**2002.** *Зварот прадстаўнікоў беларускай дэмакратычнай грамадскасці ў Савет Еўропы.*
*Мэта:* увага на рэгламент Еўрапейскага дыплома што да нацыянальнага парка «Белавежская пушча» ў сувязі з прамысловай эксплуатацыяй Пушчы і парушэннем умоваў Дыплома.
*Удзел:* ініцыяванне і падпісанне Звароту, інфармацыйная кампанія, шэраг інтэрв'ю.

**2002.** *Зварот прадстаўнікоў беларускай дэмакратычнай грамадскасці ў ЮНЭСКА (да візіту ў Беларусь Генеральнага дырэктара К.Мацууры).*
*Мэта:* правядзенне міжнароднай экспертызы Белавежскай пушчы як месца сусветнай спадчыны на мэтазгоднасць залучэння яе ў спіс сусветнай спадчыны, якая знаходзіцца пад пагрозай.
*Удзел:* ініцыяванне і падпісанне Звароту, інфармацыйная кампанія, шэраг інтэрв'ю.

**2002.** *Выпуск-акцыя АДНАасобніка газеты «Белавежская пушча» (№26).*
*Мэта:* грамадзянскі пратэст; каштоўнасці, якія выданне абараняе ўжо цягам сямі гадоў, не здольныя тыражавацца — яны адзіныя і апошнія.
*Удзел:* аўтарскае выданне.

**2002.** *Конкурс-выстава «Фарбы «Пралескі», Стоўбцы.* Гран-пры для студыі «Сьвятаяньнік».
*Мэта:* прэзентацыя студыі і першага экалагічнага пленэра, інтэрпрэтацыя прыроднай спадчыны і разнастайнасці краявіду ў творчасці дзяцей.
*Удзел:* кіраўніцтва студыяй, падрыхтоўка экспазіцыі.

**2002.** *Другі экалагічны дзіцячы пленэр «Маляўнічая Бацькаўшчына»* (заказнік «Хутар Гавязна», сакавік).
*Удзел:* кіраўніцтва праектам.

**2002.** *Трэці экалагічны дзіцячы пленэр «Маляўнічая Бацькаўшчына»* (заказнік «Хутар Гавязна», ліпень).
*Удзел:* кіраўніцтва праектам.

**2002.** *Летняя школа экалагічнай журналістыкі і ландшафта пры газеце «Белавежская пушча»* (заказнік «Хутар Гавязна», чэрвень – жнівень).
*Мэта:* выхаванне творчай змены, скіраванай на інтэрпрэтацыю прыроднай спадчыны і экажурналістыку (заняткі ў прыродным асяроддзі, навучанне асновам жанраў, выпуск газеты з публікацыямі дзяцей).
*Удзел:* распрацоўка навучальнай праграмы, правядзенне заняткаў, выданне газеты.

**2002.** *Дзень біялагічнай разнастайнасці ў сельскай школе* (Стаўбцоўскі раён, в. Вішнявец, да 1964 года мястэчка Гавязна).
*Мэта:* ганараванне школьных экалагістаў, якія прайшлі пачатковы курс Летняй школы экажурналістыкі і ландшафта, адмысловымі Дыпломамі і каштоўнымі падарункамі. Прэзентацыя газеты «Сьвятаяньнік» з творамі дзяцей.
*Удзел:* арганізацыя імпрэзы, супрацоўніцтва са школай, Прадстаўніцтвам ААН у Беларусі.

**2002.** *Аўтарская дабрачынная акцыя «Сустрэнемся на Пакровы»*. Выстава пейзажнага ваколічнага малюнка ў вёсцы Амлынцы Нясвіжскага раёна ў будынку сельскай крамы – былой пачатковай школы (14 кастрычніка, свята Пакроў).
*Удзел:* падрыхтоўка работ і экспазіцыі, сустрэчы з жыхарамі, сельскімі школьнікамі.

**2002.** *«Графіка травы і лісця. Са спадчыны Міхала Сейрука. Нясвіж»*. Каляндар на 2003 год. 12 аркушаў, 30х40. Наклад 500 асобнікаў. Тэкст па-беларуску, па-руску і па-ангельску.
*Мэта:* інтэрпрэтацыя біялагічнай і культурнай спадчыны ў пейзажным малюнку.
*Удзел:* укладанне, кіраўніцтва праектам.

**2003.** *Ліст 12 беларускіх і замежных журналістаў да*

*Прадстаўніка ААН у Беларусі Ніла Бунэ.*

*Мэта:* арганізацыя прэс-экспедыцыі ў Белавежскую пушчу, атрыманне поўнай і праўдзівай інфармацыі з месца сусветнай Спадчыны.

*Удзел:* ініцыяванне, падпісанне ліста, інфармацыйнае забеспячэнне.

**2003.** *Сустрэча з Прадстаўніком ААН у Беларусі.*

*Мэта:* прыцягненне міжнароднай арганізацыі да прэс-экспедыцыі ў Белавежскую пушчу, спрыянне дыялогу грамадскасці з трымальнікамі нацыянальнага парка.

*Удзел:* перамовы ад імя падпісаных.

**2003.** *Альтэрнатыўны ўдзел у прэс-экспедыцыі* (куратар паездкі — Кіраўніцтва спраў прэзідэнта — адмовіў В. Дранчуку ў акрэдытацыі і забараніў прысутнічаць на прэсавай канферэнцыі ў Белавежскай пушчы). Інфармацыйная кампанія ў экстрэмальных умовах. Актуалізацыя выступаў у прэсе, акцэнтаванне ўвагі прадстаўнікоў мас-медыяў на канвенцыйных абавязках Беларусі, выкрыванне антызаконнай дзейнасці ў Белавежскай пушчы, процідзеянне ілжывым заявам адміністрацыі парка і Кіраўніцтва спраў прэзідэнта.

*Кансультацыйнае забеспячэнне*, сустрэчы з мясцовым насельніцтвам, індывідуальная работа з журналістамі на «месцы здарэння», шэраг інтэрв'ю (БелаПАН, RenTV і інш.)

**2003.** *Чацверты экалагічны дзіцячы пленэр «Маляўнічая Бацькаўшчына»* (заказнік «Хутар Гавязна», красавік).

*Удзел:* кіраўніцтва праектам.

**2003.** *Пяты экалагічны дзіцячы пленэр «Маляўнічая Бацькаўшчына»* (заказнік «Хутар Гавязна», ліпень).

*Удзел:* кіраўніцтва праектам.

**2003.** *Парламенцкая праверка дзейнасці нацыянальнага парка на адпаведнасць заканадаўству краіны і канвенцыйным міжнародным нормам.*

*Удзел:* ініцыяванне, грамадскае назіранне за ходам праверкі, лабіяванне ідэі маратору на гаспадарчую дзейнасць, якая супярэчыць умовам нацыянальнай аховы прыроднай Спадчыны, пашырэння абсалютнай запаведнай зоны да 50 адсоткаў тэрыторыі Пушчы і вышэй, інфармацыйнае забеспячэнне.

**2003.** *«Нёманскі клас»*. Эксперыментальныя міжшкольныя экалагічныя слуханні з удзелам тых, хто прымае рашэнні. Да Міжнароднага дня біялагічнай разнастайнасці — 29 снежня.

*Мэта:* збераджэнне прытокаў Нёмана, захаванне прырэчных ландшафтаў і берагавой разнастайнасці Панямоння.

*Удзел:* ідэя, падрыхтоўка дакладаў па актуальнай тэматыцы, выстава дзіцячага малюнка па выніках экалагічных пленэраў, правядзенне слуханняў з удзелам 5-ці школ Стаўбцоўскага раёна, прэс-канферэнцыя, інтэрв'ю мясцовай прэсе.

**2003.** *Заснаванне літаратурна-мастацкай серыі «Мне сонцам свеціць Наднямонне»*. Выпуск паэтычных зборнікаў Якуба Коласа «Вянок з аблокаў» і Уладзіслава Сыракомлі «Дамок арганіста».

*Мэта:* паэтызацыя Наднямоння праз творы, якія належаць багатай «нёманскай школе».

*Удзел:* распрацоўка праекта, укладанне, дызайн серыі, афармленне, прадмова.

**2003.** *Аўтарскія перадачы на экалагічную тэму (культурна-прыродны ландшафт, біялагічная спадчына, пагрозы і выклікі)*. Беларуская служба радыё «Свабода».

*Удзел:* падрыхтоўка перадач.

**2004.** *Шосты экалагічны дзіцячы пленэр «Маляўнічая Бацькаўшчына»*. Упершыню бралі ўдзел дзіцячыя мастацкія студыі Стаўбцоўскага раёна (заказнік «Хутар Гавязна», красавік).

*Удзел:* кіраўніцтва праектам.

**2004.** *Інфармацыйны бюлетэнь грамадскай ініцыятывы TERRA-Канвенцыя*. Першы нумар, прысвечаны Місіі экспертаў ЮНЭСКА ў Белавежскую пушчу.

*Мэта:* інтэрпрэтацыя канвенцыйных абавязкаў, якія ўзяла на сябе Беларусь, падвышэнне экалагічнай свядомасці праз міжнародныя дакументы экалагічнага права.

*Удзел:* заснаванне, кіраўніцтва праектам.

**2004.** *«Гадавік «Белавежская пушча»*. На мове самой прыроды». Адмысловы нумар газеты «Белавежская пушча».

*Удзел:* аўтарскае выданне.

# Belavezhskaya Pushcha. The SOS Resolution. A Chronicle Of Beauty And Struggle

This is a book penned by one author — Valery Dranchuk, journalist, founder, publisher and editor-in-chief of his own newspaper «*Belavezhskaya Pushcha*».

The world-famous Belavezha Forest has suffered long years of exploitation in the form of planned cuttings, timber exports, and other types of commercial activity, thus contradicting its status as a European Biosphere Reserve and UNESCO World Heritage Site. The book contains some 50 entries — articles, interviews, short reports, comments, and appeals to international bodies (*e.g.* the Council of Europe and UNESCO). All of them are written uncompromisingly and astutely, in the language of Nature itself — a language which society (not to mention the politicians, scientists, and even leaders of the green movement) is starting to forget how to speak, due to a variety of reasons and circumstances.

# About the author

Valery Dranchuk was born in the Western Minsk region, between Stoubcy and Niasvizh, near a quiet stream which flows into the River Nioman. He graduated as a journalist in 1974, then worked for several regional newspapers, the national daily «*Zviazda*», and then at the secretariat of the Supreme Soviet and the Cabinet of Ministers. He was also editor-in-chief of

*«Rodnaya Priroda» («Local Countryside»)* magazine, and head of socio-political sections for *«Belarus»* magazine (1991-92).

In 1995, he founded his newspaper *«Belavezhskaya Pushcha»*. Since then, he has visited the reserve many times, studied the history and current state of the ancient forest, and met the local people. What he learned from them reinforced his understanding of the need for alternative resources and radical changes inside the Belavezhskaya Pushcha. He was responsible for numerous civic initiatives and projects to protect the Pushcha, including: *«Year Of The Bison»* (1997); a letter of appeal to the Council of Europe (2001); a letter to UNESCO director-general Koïchiro Matsuura concerning Belarus's failure to uphold previously signed conventions, agreements and recommendations to preserve the Pushcha's biodiversity (2002); press expeditions to «hot spots» in the Pushcha during a renewal of vandalistic cutting operations (2002-03); a parliamentary inspection of the state of the forest for compliance with international standards and legislation (2003); alternative press conferences; information campaigns, etc.

Since 2001, he has headed the civic environmental initiative *«TERRA-Convention»*. His work as a freelance journalist and publisher has appeared in the independent press, he has made various broadcasts for Radio Liberty, and also organises publishing projects aimed at conserving environmental and cultural heritage. Equally involved in literary work and teaching, he took part in an exhibition / presentation entitled *«Nature In Fine Art»* (as a graphic artist and co-founder of the *«EkaArt»* group). He also developed the first Belarusian children's ecology workshop *«Our Picturesque Homeland»* (as part of an environmental journalism and landscape summer school based near his birthplace). As a photographer, he has given lectures in photo layout design at the journalism faculty of the Non-State Institute of Entrepreneurship and Parliamentarism.

He was also winner of a Henry Ford European Conservation Award (1999), and the Ales Adamovich Literary Prize from the Belarusian PEN-Centre (2001).

He lives in Minsk with his wife and two grown-up children.

# About the newspaper «Belavezhskaya Pushcha»

The newspaper was created in 1995 as a pro-ecological publication to promote the preservation of natural heritage and landscapes, and to discuss natural biological and cultural assets. Its founder and publisher is Valery Dranchuk, who combines the functions of editor-in-chief with all other editorial and publishing duties (preparing material, layout design, technical editing, marketing, etc.).

The paper became popular and started being sold on the open market, where it became the mouthpiece of the green opposition. With minimal financial resources, its success was mostly achieved thanks to considerable professional efforts from its publisher. In post-1994 Belarus, publishing was only possible thanks to the founder, author and publisher's rare professional self-sufficiency. The range of duties Valery Dranchuk performed would normally have required staff and an office, which would have considerably increased the paper's budget, and it would have ended up as another nice but penniless project idea. In this situation, a private initiative was able to offer beneficial results for society. 21 thematic 16-page A3 issues were produced during the first five years and, after 2000, it became a magazine appearing at more irregular intervals.

The first issues detailed the state forestry industry's trends regarding the Belavezhskaya Pushcha, and provided facts about environmental hazards which had always existed since the days of Soviet rule, but which grew increasingly acute following Aleksandr Lukashenko's rise to power. The paper was the first to warn of the dangers of irrevocable damage to the Belavezhskaya Pushcha's biodiversity, part of the world's ecological heritage. It also began to expose Belarusian officialdom's fabricated statements about the reserve's «unprecedented burgeoning» against the actual backdrop of increasing commercialisation, illegal deals, and overall deterioration. It condemned the installation of modern high-output saw equipment at Belavezhskaya Pushcha national park headquarters, as well as numerous violations of the environmental legislation and agreements of the Council of

Europe (which awarded the Pushcha a European Diploma in 1997).

Valery Dranchuk was the first to protest against the commercialised shooting of Red-Listed bison under the pretext of culling sick animals, and he also denounced the sale of these animals' skins inside national park grounds. Various of his ecological and ethical demands have been heeded and satisfied by the authorities, but hunting for hard currency still goes on surreptitiously, and is now one of his main concerns. Valery Dranchuk has initiated a range of information campaigns to protect the Belavezhskaya Pushcha, published mainly in independent Belarusian and foreign media. His newspaper was the origin of this ongoing battle, and it still remains as a strategic component today.

Another series of articles was dedicated to protecting the strict reserve status of other Belarusian natural areas, particularly Pripyat – the largest reserve in Belarusian Palessie. The paper focused on the quality and conservation of Belarusian landscapes which lie outside protected reserve areas, and was the first to launch an awareness campaign to make people perceive landscapes as cultural phenomena, and to realise that the public underestimates the connection between culture and the environment. In 1999, it was also the first and only paper to stress the exceptional importance for Belarus to adopt the European Landscape Convention, and it reprinted several other international conventions (including the Orhus Convention) with editorial annotations.

The paper also publicised and developed eco-sponsorship in Belarus, giving examples of socio-ecological advertising designed to attract support from local business, particularly banks. Over the last six years, Valery Dranchuk has been producing advertising campaigns for the Belarusian National Bank, involving a wide range of ecological content. «*Belavezhskaya Pushcha*» was awarded a Henry Ford European Conservation Award in 1999, and in 2001, the Belarusian PEN-Centre presented Valery Dranchuk with the Ales Adamovich Literary Medal for his articles in defence of the Belarusian countryside.

# Valery Dranchuk's civic initiatives (1998–2004)

**1998 –** *«Khutar Haviazna»* botanical landscape reserve.

*Aim:* To conserve an area where hybrid butterbur (a plant on the Belarusian Red List) started growing again following drainage work.

*Involvement:* Plant identification; explanation of intent. This resulted in the adoption of an official resolution by the local authorities.

**2000 –** The *«Sustainable Village In The Heart Of Europe»* Educational Centre (based at the *«Khutar Haviazna»* micro-reserve). First lessons of the summer school of environmental journalism and landscape.

*Involvement:* Ideas; organising; cultural renaissance of the village.

**2000 –** *«Niasvizh, A Landscape Of Lakes And Parks».* 12–page calendar for 2001, 50x75cm, 1000 copies. Text in Belarusian, Russian and English. Demonstrates the might and uniqueness of these landscapes as part of the natural cultural heritage of Europe.

*Involvement:* Ideas; design; project manager.

**2001 –** A school ecological essay competition as part of the Earth Day events.

*Involvement:* Held seminars on journalism; chose the winners in seven categories.

**2001 –** The first Belarusian children's ecology workshop *«Our Picturesque Homeland»* at the botanical landscape reserve.

*Aim:* To interpret natural heritage through fine art, and draw the children's attention to the diversity of landscapes.

*Involvement:* Project manager; worked with the local school and cultural institutions.

**2001 –** Created a school environmental newspaper *«Sviatajannik»* (*«St. John's Wort»*) as a companion publication to *«Belavezhskaya Pushcha»*.

*Aim:* To preserve local cultural heritage and organise action to protect the local countryside.
*Involvement:* Project manager; produced six issues.

**2001 –** Experimental fine arts lessons at his former village school (every Thursday since September 2001).
*Aim:* To help children understand the value of nature in rural areas, and encourage them and their parents to preserve the unique cultural phenomena of «ordinary» local landscapes.
*Involvement:* Devised a special teaching course; head of the *«Sviatajannik»* natural ethics club and the *«Picturesque Heritage»* children's art studio.

**2001 –** Erecting and unveiling a memorial cross on the site of a former rubbish tip – the first environmental protection sign in Belarus.
*Involvement:* Cleaned up the rubbish tip; had the idea to erect a memorial; designed and constructed the cross; worked with the local school, local authorities and cultural institutions.

**2002 –** Set up a creative group (workshop) as part of the Belarusian *«EkaArt»* Union (*«Nature In Fine Art»*).
*Aim:* To start up «preventive» workshops, particularly in famous natural beauty spots which are in environmental danger, and organise an exhibition and presentation.
*Involvement:* Co-headed the group; prepared and participated in the exhibition.

**2002 –** An appeal to the Council of Europe by representatives of democratic Belarusian society.
*Aim:* To draw attention to the binding regulations of the European Diploma awarded to Belavezhskaya Pushcha national park (in which biological heritage is being exploited industrially, in violation of the Diploma's conditions).
*Involvement:* Initiated and signed the appeal; information campaign; various interviews.

**2002 –** An appeal to UNESCO by representatives of democratic Belarusian society (to coincide with director-general Koпchiro Matsuura's visit to Belarus).
*Aim:* To carry out an international expert inspection of the Belavezhskaya Pushcha heritage site in order to consider its inclusion on the list of world heritage in danger.

*Involvement:* Initiated and signed the appeal; information campaign; various interviews.

**2002** – Publication of *«Belavezhskaya Pushcha»* №26, the ONE-copy issue.

*Idea:* The nature reserves which the paper has been defending for seven years (including the Belavezhskaya Pushcha) are the last of their kind, and they cannot be replicated. This issue was only distributed by e-mail.

*Involvement:* One-man publication.

**2002** – Regional exhibition *«The Colours Of Spring Flowers»*, which won first prize in the *«Picturesque Heritage»* children's art studio competition, Stoubcy.

*Involvement:* In charge of the studio; prepared the exhibition.

**2002** – The second children's ecology workshop *«Our Picturesque Homeland»* at the *«Khutar Haviazna»* botanical landscape reserve (March).

*Involvement:* Project manager; worked with the local school and cultural institutions.

**2002** – The third children's ecology workshop *«Our Picturesque Homeland»* at the *«Khutar Haviazna»* botanical landscape reserve (July).

*Involvement:* Project manager; worked with the local school and cultural institutions.

**2002** – The summer school of environmental journalism and landscape, held under the auspices of the *«Belavezhskaya Pushcha»* newspaper (June – August).

*Aim:* To teach new generations the basics of environmental journalism and interpretation of natural heritage (lessons in a natural setting; teaching of newspaper styles; publishing a newspaper with articles by the children).

*Involvement:* Ideas; devised the curriculum; held lessons; published the newspaper.

**2002** – Biodiversity Day at Vishniaviec rural school, Stoubcy region. Young ecologists from the school were awarded valuable prizes and special diplomas after passing the basic course of the summer school of environmental journalism and landscape. A

presentation of the children's newspaper «*Sviatajannik*» was also held.

*Involvement*: Organised the event; worked with the school, the Belarusian UN Office, and the local natural resources committee.

**2002 –** Voluntary event «*Let's Meet On Protection Day*»: an exhibition of landscape painting at the local shop (former primary school) building in Amlyncy, Niasvizh region, to commemorate the Feast of the Protection (October 14).

*Involvement:* Ideas; prepared the works for exhibition; organised a related cultural education programme.

**2002 –** «*Graphic Art Of Grass And Leaves. From The Mikhal Sieuruk Collection, Niasvizh*». 12-page calendar for 2003, 30x40cm, 500 copies. Text in Belarusian, Russian and English.

*Aim:* To promote biological and cultural heritage through landscape paintings.

*Involvement:* Ideas; design; project manager.

**2003 –** A letter to Neil Buhne, the UN Resident Coordinator in Belarus, from 12 Belarusian and Russian journalists who write in defence of the environment. They proposed that a press expedition into the Belavezhskaya Pushcha be organised in order to get full, reliable on-the-spot information.

*Involvement:* Initiated and signed the appeal; provided information.

**2003 –** Meeting with Neil Buhne, the UN Resident Coordinator in Belarus.

*Aim:* To organise a joint press expedition into the Belavezhskaya Pushcha and begin a dialogue involving members of the public.

*Involvement:* Negotiated on behalf of the signatories.

**2003 –** «Alternative» participation in the press expedition (the presidential affairs department, which was in charge of the trip, refused Valery Dranchuk accreditation and prohibited him from being present at the Belavezhskaya Pushcha press conference). An information campaign was carried out under these extreme circumstances.

*Aim:* To ensure the availability of up-to-date information and focus media attention on Belarus's obligations according to various conventions; to expose illegal activity in the Belavezhskaya Pushcha; and to counter false statements made by the park administration and the presidential affairs department.

*Involvement:* Provided consultations; met with the local population; worked individually with journalists on the spot; gave interviews (BelaPAN agency, REN-TV, etc.)

**2003 –** *«Nioman Class»*: experimental inter-school ecological meetings involving decision-makers.

*Aim:* To preserve the tributaries of the River Nioman, as well as riverside landscapes and the biodiversity of the Nioman waterways. This was an event to mark International Biodiversity Day (December 29).

*Involvement:* Ideas; prepared reports on relevant topics; organised an exhibition of children's paintings following the ecology workshops; held meetings that covered five schools in the Stoubcy area; gave a press conference and an interview for the local paper.

**2003 –** Created a literary series called *«The Upper Nioman Shines Like The Sun For Me»*. Published poetry anthologies by Jakub Kolas (*«A Garland Of Clouds»*) and Uladzislau Syrakomlia (*«The Organist's Cottage»*).

*Aim:* To poeticise the Nioman waterways through works written by members of the diverse «Nioman school».

*Involvement:* Project writer; layout designer for the series; wrote the introductions.

**2003 –** Radio Liberty's Belarusian service: programmes on environmental issues presented by the author (cultural and natural landscapes, biological heritage, dangers and challenges).

*Involvement:* Prepared the programmes.

**2004 –** *«Belavezhskaya Pushcha Yearbook. In the language of Nature itself»*. A special issue of *«Belavezhskaya Pushcha»*.

*Involvement:* Author.

Over the last few years, Valery Dranchuk has given numerous lectures in schools and student auditoria. During these meetings, he appeals for his audience to love and learn to appreciate nature, to save it from destruction, and to share it humanely with fellow members of the ecosystem.

He prepared an alternative information package entitled *«Belavezhskaya Pushcha: Falsehood On A Background Of Degradation»* for participants of the international scientific conference *«The Belavezhskaya forest at the turn of the Millennium»*.

Valery Dranchuk has given numerous interviews on programmes from the independent stations Radio Liberty and Radio Racyja, and for Polish National Television.

He also led the Belarusian Green Association to protest at the destructive commercial activity going on inside the Belavezhskaya Pushcha, and has recently become head of the civic environmental initiative *«TERRA-Convention»* (in support of various conventions for the preservation of world natural and cultural heritage).

УДК 502.4 (476.7)
ББК 20.1 (4 Беи)
Д 72

*Водгук на кнігу ці іншы кантакт
на спрыянне справе выратавання
Белавежскай пушчы і лясоў Беларусі,
а таксама на прыдбанне (распаўсюджанне) кнігі
і працяг серыі, Вы можаце ажыццявіць
праз наступныя адрасы:*

*220088 Іванаўская 38-16 Мінск*

*E-mail: pushcha@promedia.by*

*Тэл. 8017 236 50 76 або 80296 56 66 70*

**Дранчук В.**

Д 72 Белавежская пушча. Рэзалюцыя SOS. Хроніка красы і змагання. 1995–200?/ Валеры Дранчук. — Мн.: «Каўчэг», 2004 г. — 302 с., 28 с. іл.

ISBN 985-6056-76-4.

Кніга належыць пяру вядомага аўтара — публіцыста, заснавальніка, выдаўца і галоўнага рэдактара аўтарскай газеты «Белавежская пушча» В. Дранчука. Змест выдання складаюць больш як 50 публікацый: артыкулы, інтэрв'ю, кароткія паведамленні, каментарыі, пасланні ў міжнародныя арганізацыі, лісты і дзённікі, напісаныя мовай самой прыроды, на якой грамадствы, з розных абставінаў і прычын, развучваюцца гаварыць вуснамі палітыкаў, вучоных і нават лідэраў зялёнага руху.

**УДК 502.4 (476.7)**
**ББК 20.1(4Беи)**

Літаратурна-мастацкае выданне

**Дранчук** Валеры Аркадзевіч

БЕЛАВЕЖСКАЯ ПУШЧА
Рэзалюцыя SOS.
Хроніка красы і змагання. 1995–200?

Аўтарская рэдакцыя
Тэхнічны рэдактар А. Глекаў
Камп'ютэрная вёрстка А. Глекава

Падпісана да друку 28. 04. 2004 г.
Фармат 84х108 1/32. Папера афсетная. Гарнітура Antiqa.
Друк афсетны. Ум. друк. арк. 12,38. Ул.-выд. арк. 11,97.
Наклад 1000 асобнікаў. Зак. № 31.

ТАА «Каўчэг».
220072 г. Мінск, пр. Ф. Скарыны, 68-19,
тэл/факс: 284 04 33
Ліцэнзія ЛВ № 180 ад 23.01.2003 г.
Ліцэнзія ЛП № 445 ад 01.03.2001 г.